ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ



ЧАСТКА II

11

Свет пасля Другой сусветнай вайны



- Пекін — Сталіцы дзяржаў
- Шанхай — Іншыя гарады
- Граніцы дзяржаў да 1984 г.
- 1971 — Буйнейшыя лакальныя войны і канфлікты пасля Другой сусветнай вайны (з гадамі)

Дзяржавы, якія ўваходзілі ў ваенна-палітычныя блокі

- ТУРЦЫЯ — СЕНТО (1955–1979)
- МАЛАЙЗІЯ — АНЗЮК (1971–1975)

Тэрыторыі дзяржаў (палітычных рухаў), якім аказваў ваенную дапамогу СССР

① Кітай (1945–1950 гг.) ② КНДР (1950–1953 гг.)
③ Венгрыя (1956 г.) ④ В'етнам (1964–1973 гг.)
⑤ Чэхаславакія (1968 г.) ⑥ Афганістан (1979–1989 гг.)
⑦ Інданезія (Заходні Ірыян) (1961–1962 гг.)
⑧ Лаос (1960–1970 гг.) ⑨ Камбоджа (1970–1975 гг.)
⑩ Егіпет, Сірыя, Іарданія, Палесцінскі рух супраціву (1956, 1967, 1969–1970, 1973, 1982 гг.)
⑪ Емен (1963–1967 гг.) ⑫ Ірак (1980–1987 гг.)
⑬ Ангола (1975–1991 гг.) ⑭ Мазамбік (1975–1991 гг.)
⑮ Эфіопія (1977–1978 гг.) ⑯ Лівія (1987 гг.)
⑰ Судан (1980-е гг.)
⑱ Алжыр (размініраванне) (1962–1964 гг.)


МІНСК Сталіцы саюзных рэспублік СССР
ГОМЕЛЬ Цэнтры абласцей у саюзных рэспубліках (да 1954 г.)
Слуцк Цэнтры раёнаў БССР з 16 жніўня 1945 г.
Ракаў Іншыя населеныя пункты
Чыгункі
Тэрыторыя БССР, перададзеная Польшчы згодна з дагаворам ад 16 жніўня 1945 г.
БССР у 1945—1954 гг.
ГРАНІЦЫ
СССР згодна з дагаворам паміж СССР і Польшчай ад 16 жніўня 1945 г.
БССР і іншых рэспублік СССР з 16 жніўня 1945 г.
абласцей БССР з 16 жніўня 1945 г.
ВІЛЬНЮС
МІНСК
ПОЛАЦК
ВІЦЕБСК
МАЛАДЗЕЧНА
БАРАНАВІЧЫ
БАБРУЙСК
МАГІЛЁЎ
ГОМЕЛЬ
ГРОДНА
БРЭСТ
ПІНСК
МАЗЫР
ЧАРНІГАЎ
Каўнас
Мінск
Гомель
Полацк
Віцебск
Магілёў
Баранавічы
Бабруйск
Брэст
Пінск
Гродна
Мазыр
Чарнігаў


Свет
у пачатку XXI ст.
ПАЎНОЧНЫ ЛЕДАВІТЫ АКІЯН
ЗША
КАНАДА
ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ АМЕРЫКІ
РАСІЙСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ
КАЗАХСТАН
МАНГОЛІЯ
КІТАЙ
ІНДЫЯ
ІНДАНЕЗІЯ
БРАЗІЛІЯ
АЎСТРАЛІЯ
НОВАЯ ЗЕЛАНДЫЯ
ІСЛАНДЫЯ
ЯПОНІЯ
ІНДЫЙСКІ АКІЯН
ЦІХІ АКІЯН
АТЛАНТЫЧНЫ АКІЯН
Сталіцы дзяржаў
Іншыя гарады
Граніцы дзяржаў у пачатку XXI ст.
Лічбамі на карце пазначаны:
1. Гаіці
2. Дамініканская рэспубліка
3. Беліз
4. Гандурас
5. Сальвадор
6. Уругвай
7. Туніс
8. Гвінея-Бісау
9. Гвінея
10. Кот-д'Івуар
11. Буркіна-Фасо
12. Бенін
13. Цэнтральнаафрыканская рэспубліка
14. Эрытрэя
15. Экватарыяльная Гвінея
16. Габон
17. Уганда
18. Руанда
19. Бурундзі
20. Зімбабвэ
21. Данія
22. Эстонія
23. Латвія
24. Літва
25. Беларусь
26. Польшча
27. Аўстрыя
28. Венгрыя
29. Сербія
30. Грэцыя
31. Грузія
32. Арменія
33. Азербайджан
34. Ізраіль
35. Іарданія
36. Аб'яднаныя Арабскія Эміраты
37. Кыргызстан
38. Таджыкістан
39. Пакістан
40. Бутан
41. Бангладэш
42. Лаос
43. Камбоджа
44. КНДР
45. Паўднёвая Карэя

Сучасная Рэспубліка Беларусь


Шаўляй
Біржай
Паневяжыс
Расяйней
Кедайней
Укмяргe
Уцяна
Швянчоніс
Каўнас
Пабрадзе
Нямунас
Нёман
Шчара
Марыямпале
Сувалкі
Друскінінкай
Аўгустаў
Сапоцкін
Алітус
ВІЛЬНЮС
Смаргонь
Ашмяны
Астравец
Воранава
Радунь
Іўе
Ліда
ГРОДНА
Беразіно
Скідзель
Навагрудак
Шчучын
Масты
Дзятлава
Сакулка
Беласток
Бераставіца
Гарадзішча
Вайкавыск
Зэльва
Свіслач
Слонім
Ваўкавыск
Баранавічы
Ляхавічы
Поразава
Бельск-Падляшскі
Ружаны
Косава
Шарашова
Іванцэвічы
Ганцавічы
Камянец
Пружаны
Бяроза
Целяханы
Высокае
Белаазёрск
Лагішын
Жабінка
Кобрын
Драгічын
Луцінец
БРЭСТ
Пінск
Мікашэвічы
Іванава
Давыд-Гарадок
Маларыта
Столін
Дамачава
Камень-Кашырскі
Уладава
Прыпяць
Стыр
Стахад
Дубровіца
Сарны
Ковель
Шантой
Віса
Уса
Нарач
Вілія
Свіслач
Гараднічанка
Лідзея
Мядзел
Докшыцы
Бешанковічы
Чашнікі
Сянно
Бягомль
Лепель
Полацк
Наваполацк
Верхнядзвінск
Асвея
Расоны
Браслаў
Друя
Мёры
Дзісна
Шаркаўшчына
Відзы
Ветрына
Ушачы
Глыбокае
Паставы
Лынтупы
Шлісяць
Друсвяты
Друсвета
Друсвята
Друсвяцкае
Друсвяты
Друсвяты
Друсвяты

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

ў кантэксце сусветнай гісторыі

Вучэбны дапаможнік для 11 класа
ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай мовай навучання і выхавання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук
прафесара А. Г. Каханоўскага

У дзвюх частках
Частка 2

Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2025

УДК 94(476)(075.3)
ББК 63.3(4Беи)я721
К30

Аўтары:

А. Г. Каханоўскі, У. С. Кошалеў, С. М. Цемушаў, А. М. Мох, М. М. Мязга, А. І. Корсак, Г. І. Маскевіч, С. М. Ходзін

Аўтары метадычнага забеспячэння:

Л. М. Гурыновіч, А. В. Пікаловіч

Навуковы кансультант:

доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі *І. А. Марзалюк*

Пераклад на беларускую мову *В. М. Іванова*

Рэцэнзенты:

кафедра археалогіі, гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін; кафедра гісторыі і філасофіі ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»; настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 3 г. Брэста імя В. М. Верамяюк» *В. В. Куц*

Рэцэнзенты ад дзяржаўнай камісіі:

доктар гістарычных навук, дацэнт, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь *В. В. Даніловіч*;
настаўнік гісторыі кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Ленінская сярэдняя школа Бабруйскага раёна» *С. М. Герасімовіч*

Каханоўскі, А. Г.

К30 Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. — 318, [2] с. : іл.

ISBN 978-985-553-852-4.

УДК 94(476)(075.3)
ББК 63.3(4Беи)я721

ISBN 978-985-553-852-4 (ч. 2)
ISBN 978-985-553-842-5

© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2025

Правообладатель Издательский центр БГУ

Змест

Як працаваць з вучэбным дапаможнікам 5

Раздзел II. **БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У 1917–1945 гг.** **6**

§ 27. Другая сусветная вайна 6
§ 28–29. Вялікая Айчынная вайна 19
§ 30. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыя БССР 40
§ 31. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Барацьба супраць акупантаў 55
Практыкум па раздзеле «Беларусь і свет у 1917–1945 гг.» 68
Абагульненне па раздзеле «Беларусь і свет у 1917–1945 гг.» 72
Наш край у 1917–1945 гг. 76

Раздзел III. **БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х — ПАЧАТКУ 1990-х гг.** **80**

§ 32. Свет у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. 80
§ 33. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і фарміраванне постіндустрыяльнага грамадства 90
§ 34. Краіны Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. 101
§ 35. СССР у пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.) 113
§ 36. Грамадска-палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1991 г. 128
§ 37. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1991 г. 139
§ 38. Навука, культура, адукацыя ў БССР у другой палове 1940-х — 1991 г. 149
Практыкум па раздзеле «Беларусь і свет у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.» 161
Абагульненне па раздзеле «Беларусь і свет у другой палове 1940-х гг. — пачатку 1990-х гг.» 165
Наш край у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. 169

Раздзел IV. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У КАНЦЫ XX — ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст. 170

§ 39. Свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст. 172
§ 40. Краіны Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст. 184
§ 41. Расійская Федэрацыя 194
§ 42. Рэспубліка Беларусь у першай палове 1990-х гг. 208
§ 43–44. Прэзідэнцкая рэспубліка — гістарычны выбар беларускага народа 218
§ 45. Эканамічнае развіццё сучаснай Беларусі 233
§ 46. Сацыяльная палітыка ў сучаснай Беларусі 243
§ 47. Сучаснае беларускае грамадства 254
§ 48. Рэспубліка Беларусь у свеце 268
§ 49. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі 278
§ 50. Навука і культура сучаснай Беларусі 287
Практыкум па раздзеле «Рэспубліка Беларусь і свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.» 296
Абагульненне па раздзеле «Рэспубліка Беларусь і свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.» 301
Наш край у канцы XX — першай чвэрці XXI ст. 306

Заключэнне. Свет у першай чвэрці XXI ст. 307

Выніковае абагульненне 310

Храналагічная табліца 313

Паказальнік абрэвіятур 316

Паказальнік тэрмінаў 318

Правообладатель Издательский центр БГУ

Як працаваць з вучэбным дапаможнікам

Шаноўныя адзінаццацікласнікі!

Вы працягваеце вывучэнне вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». Другая частка вучэбнага дапаможніка ахоплівае перыяд з 1939 да 2025 г. Гэта вельмі значны перыяд гісторыі Беларусі.

У верасні-кастрычніку 1939 г. актам гістарычнай справядлівасці стала ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

Коштам вялікіх намаганняў, разам з усімі народамі Савецкага Саюза, беларускі народ атрымаў Вялікую Перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх саюзнікамі. Міжнародная супольнасць прызнала значны ўклад БССР у перамогу над германскім нацызмам, і яна стала адной з дзяржаў — заснавальніц ААН.

Ужо за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе беларускі народ, абапіраючыся на дапамогу братніх саюзных рэспублік, здолеў аднавіць разбураную эканоміку.

Паслядоўнае развіццё эканомікі ў спалучэнні з дасягненнямі навукі і адукацыі ў 1950–1970-я гг. зрабіла БССР адной з самых высокаразвітых рэспублік Савецкага Саюза. Аднак палітыка непрадуманых рэформаў другой паловы 1980-х гг. у сукупнасці са знешнепалітычнымі фактарамі прывяла да распаду СССР.

Пасля 1991 г. у гісторыі беларускай дзяржаўнасці пачаўся новы этап, які працягваецца да нашых дзён. Рэспубліка Беларусь стала суверэннай дзяржавай. Палітычнае развіццё нашай краіны ў гады незалежнасці грунтуецца на ўзнікненні і ўмацаванні інстытута ўлады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і рэалізацыі рашэнняў усенародных рэферэндумаў. Дзякуючы палітычнай волі кіраўніцтва дзяржавы, якая адлюстроўвае інтарэсы беларускага народа, наша краіна, захаваўшы асноўныя сацыяльныя, эканамічныя і культурныя заваёвы савецкага перыяду, паспяхова супрацьстаіць выклікам сучаснасці. У складаных геапалітычных умовах Рэспубліка Беларусь імкнецца захаваць баланс шматвектарнасці, развіваць адносіны з усімі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі на прынцыпах раўнапраўя, узаемавагі і неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы.

Вам, нашчадкам герояў-пераможцаў, належыць жыць, працаваць і ўмацоўваць патэнцыял нашай Радзімы. Няхай веданне гісторыі Беларусі стане трывалым падмуркам вашых дзеянняў на карысць нашай краіны!

Аўтары

§ 27. Другая сусветная вайна

АНТЫГІТЛЕРАЎСКАЯ КААЛІЦЫЯ
СУПРАЦІЎЛЕННЕ
ЛЕНД-ЛІЗ АКУПАЦЫЯ
ПАРТЫЗАНСКІ РУХ
ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА
«ДЗІЎНАЯ ВАЙНА» ДРУГІ ФРОНТ

Агрэсія — ужыванне сілы адной дзяржавай супраць іншай з мэтай захопу яе тэрыторыі, ліквідацыі незалежнасці, змянення палітычнага і грамадскага ладу.

1. Асноўныя ўдзельнікі і іх геапалітычныя мэты.

Другая сусветная вайна пачалася 1 верасня 1939 г. нападам нацысцкай Германіі на Польшчу. Вялікабрытанія і Францыя як саюзнікі апошняй абвясцілі вайну **агрэсару** 3 верасня 1939 г., аднак рэальнай дапамогі не аказалі. Германія таксама не вяла супраць іх актыўных баявых дзеянняў. Першы этап вайны атрымаў назву *«дзіўнай вайны»*. Пазіцыя Вялікабрытаніі і Францыі тлумачылася спадзяваннем іх кіруючых колаў на дасягненне кампраміснага пагаднення з нацысцкай Германіяй. Акрамя таго, стратэгія заходніх дзяржаў не прадугледжвала неадкладных актыўных баявых дзеянняў супраць агрэсара, яны меркавалі весці працяглую вайну на знясіленне.

Успомніце, што такое Мюнхенская змова. Які ўдзел прыняла ў ёй Польшча?

Польшча апынулася сам-насам з агрэсарам і была не здольная адбіць удар германскай арміі. Напачатку кастрычніка супраціўленне польскіх войскаў было канчаткова зламанае.

Германія, не сустрэўшы адпору, працягнула свае агрэсіўныя дзеянні. У красавіку 1940 г. германскія войскі захапілі Нарвегію і Данію, а ў маі 1940 г., абышоўшы ўмацаваную лінію Мажыно з поўначы, адначасова напалі на Францыю, Бельгію, Галандыю, Люксембург і хутка акупавалі гэтыя краіны. Французская армія пратрымалася шэсць тыдняў, краіна

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Другая сусветная вайна. Ваенныя дзеянні ад 1.09.1939 г. да 21.06.1941 г.

1. Выкарыстоўваючы гістарычную картасхему (гл. с. 7):
– ахарактарызуйце вынікі ваенных дзеянняў Германіі і яе саюзнікаў у перыяд ад 1 верасня 1939 г. да 21 чэрвеня 1941 г.;
– назавіце саюзнікаў (сатэлітаў) нацысцкай Германіі.
2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце табліцу і адлюструйце ў ёй працягласць ваенных дзеянняў розных краін Еўропы супраць нацысцкай Германіі.

капітулявала і пайшла на супрацоўніцтва з Германіяй. У чэрвені 1940 г. у вайну ўступіла Італія, у верасні 1940 г. было падпісанае пагадненне аб ваенным саюзе Германіі, Італіі і Японіі *(Трайсты пакт)*. Да яго неўзабаве далучыліся Венгрыя, Румынія, Славакія, Балгарыя і некаторыя іншыя краіны.

Да чэрвеня 1941 г. у Еўропе заставаліся толькі дзве дзяржавы, здольныя супраціўляцца нацысцкай Германіі: СССР і Вялікабрытанія. Ваенна-эканамічны патэнцыял кантынентальнай Еўропы быў пастаўлены на службу нацысцкай Германіі.

Мэты дзяржаў — удзельніц Другой сусветнай вайны

Другая сусветная вайна была вынікам мэтанакіраванай палітыкі дзяржаў-агрэсараў, якія рэалізоўвалі свае знешнія геапалітычныя задачы. Агульнымі іх мэтамі з'яўляліся тэрытарыяльны перадзел свету, усталяванне сусветнага панавання, барацьба супраць камуністычнай ідэалогіі і заходняй дэмакратыі. Разам з тым мэты Германіі, Італіі і Японіі мелі сваю спецыфіку.

МЭТЫ ДЗЯРЖАЎ-АГРЭСАРАЎ

ГЕРМАНІЯ	• усталяванне поўнага панавання Германіі ў Еўропе; • знішчэнне «расава непаўнавартасных» народаў; «ачыстка» тэрыторый еўразійскага кантынента для прадстаўнікоў нардычнай расы
ІТАЛІЯ	• пашырэнне каланіяльных уладанняў у Афрыцы (за кошт англійскіх і французскіх калоній); • аднаўленне былой магутнасці Рымскай імперыі
ЯПОНІЯ	• усталяванне кантролю над азіяцкім рэгіёнам; • аслабленне ЗША на моры; • захоп нафтавых радовішчаў у каланіяльных уладаннях Нідэрландаў


Правообладатель Издательский центр БГУ

Антыгітлераўская кааліцыя складвалася па меры пашырэння маштабаў вайны. Пасля нападу Японіі на амерыканскую ваенна-марскую базу Пёрл-Харбар (7 снежня 1941 г.) у вайну ўступілі ЗША. У ваенных дзеяннях супраць нацысцкіх захопнікаў таксама бралі ўдзел асобныя злучэнні Польшчы, Чэхаславакіі, Югаславіі, Аўстраліі, Бельгіі, Бразіліі, Індыі, Канады, Філіпін і іншых краін.

Мэтамі СССР, ЗША і Вялікабрытаніі ў Другой сусветнай вайне былі разгром Германіі і яе сатэлітаў, вызваленне народаў Еўропы ад нацысцкай акупацыі. Пры гэтым заходнія краіны імкнуліся не дапусціць пашырэння ўплыву камунізму і аднавіць па магчымасці даваенны міжнародны парадак, а ЗША — значна ўзмацніць свае пазіцыі ў свеце.

Напад Германіі і яе саюзнікаў на СССР **22 чэрвеня 1941 г.** прывёў да таго, што менавіта Савецкая дзяржава зрабілася асноўным удзельнікам ваенных дзеянняў і галоўным — антыгітлераўскай кааліцыі.

2. Перыядызацыя Другой сусветнай вайны. У ходзе Другой сусветнай вайны вылучаюць пяць перыядаў.



Успомніце, якія падзеі адзначаюць сабой пачатак і заканчэнне кожнага перыяду Другой сусветнай вайны.
Якое месца ў гісторыі Другой сусветнай вайны займае Вялікая Айчынная вайна савецкага народа?

Вызваленчы паход Чырвонай арміі

Успомніце, якія гістарычныя падзеі прывялі да падзелу Беларусі на Заходнюю Беларусь і БССР.

3. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. На працягу двух тыдняў пасля пачатку Другой сусветнай вайны Польшча пацярпела знішчальнае паражэнне ад войскаў вермахта. Яе кіраўніцтва пакінула краіну. У абставінах краху Польскай дзяржавы СССР вырашыў узяць пад сваю абарону насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Вызваленчы паход Чырвонай арміі пачаўся **17 верасня 1939 г.** і прывёў да ўз'яднання беларускага і ўкраінскага народаў у складзе СССР. Народны сход, абраны жыхарамі краю, праходзіў у Беластоку **28–30 кастрычніка 1939 г.** Ён аднагалосна абвясціў на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі савецкую ўладу і прыняў Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад СССР.

У выніку ўз'яднання беларускага народа тэрыторыя рэспублікі павялічылася амаль удвая. Насельніцтва склала больш за 10 млн чалавек. Беларусы атрымалі магчымасць развіваць сваю дзяржаўнасць у межах адзінага нацыянальна-дзяржаўнага ўтварэння.

Гістарычнае значэнне ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР мае вялікае гістарычнае значэнне для беларусаў. Яно прадухіліла пагрозу іх паланізацыі, спрыяла кансалідацыі нацыі. Абапіраючыся на эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял усёй краіны, Заходняя Беларусь пасля ўз'яднання зрабіла вялікі крок у сацыяльна-эканамічным развіцці і ажыццяўленні культурных пераўтварэнняў.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР выступіла адным з фактараў, якія дазволілі сарваць гітлераўскі план «маланкавай вайны» ўлетку 1941 г. і ў рэшце рэшт разграміць Германію і яе саюзнікаў.

Для Беларусі і яе народа ўз'яднанне — гэта акт гістарычнай справядлівасці, адна з найважнейшых падзей XX стагоддзя. З улікам таго, што дата 17 верасня 1939 г. з'яўляецца сімвалам аднаўлення гістарычнай справядлівасці ў дачыненні да белару-

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Калі ў 1938 г. у заходніх абласцях Беларусі было толькі каля 80 бальніц і 1000 урачоў, дык у канцы 1940 г. тут мелася 243 бальніцы і радзільні, 207 паліклінік і амбулаторый, дзе працавалі 1755 урачоў і 5585 медыцынскіх работнікаў сярэдняга звяна.

Напрыканцы 1940-х гг. была ліквідаваная непісьменнасць сярод дарослага насельніцтва. Калі ў 1937/1938 вучэбным годзе ў Заходняй Беларусі дзейнічала каля 4670 школ, у якіх навучанне вялося на польскай мове, дык у 1940/1941 вучэбным годзе іх было ўжо 5959, прычым больш за 4500 школ вялі навучанне на беларускай мове, а астатнія — на рускай, польскай, яўрэйскай і літоўскай мовах. У заходніх абласцях БССР былі адкрытыя 5 вышэйшых і 25 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Пачалося будаўніцтва новых фабрык і заводаў. Абсталяванне для іх завозілі з Расіі, Украіны і ўсходніх абласцей БССР. Напрыканцы 1940-х гг. у заходніх абласцях дзейнічалі 392 прамысловых прадпрыемствы, на якіх было занята каля 40 тыс. рабочых. Аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся амаль у два разы ў параўнанні з 1938 г. і склаў 27,6 % прамысловай вытворчасці рэспублікі.

Да 1941 г. беспрацоўе ў рэгіёне практычна было ліквідаванае.

Больш за 1 млн га зямлі было раздадзена сялянам.

1. *Ахарактарызуйце асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі пасля ўз'яднання з БССР. Дайце ім ацэнку. У чыіх інтарэсах яны былі праведзены?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія змены адбываліся ў 1939–1941 гг. на тэрыторыі вашага раёна (вобласці).*

скага народа, падзеленага супраць яго волі ў 1921 г. паводле Рыжскай мірнай дамовы, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2021 г. у нашай краіне заснавана дзяржаўнае свята — **Дзень народнага адзінства**, які адзначаецца 17 верасня.

Тэатры ваенных дзеянняў

4. Асноўныя тэатры ваенных дзеянняў. У Другой сусветнай вайне ўдзельнічалі 62 дзяржавы. Непасрэдна ваенныя дзеянні вяліся на тэрыторыі 40 краін, размешчаных на трох кантынентах (Еўропа, Афрыка, Азія), і ў водах усіх акіянаў. У гісторыі Другой сусветнай вайны вылучаюць пяць тэатраў

ваенных дзеянняў: заходнееўрапейскі, міжземнаморскі, усходнееўрапейскі, афрыканскі, азіяцка-ціхаакіянскі.

Але найважнейшыя падзеі Другой сусветнай вайны адбываліся на тэрыторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы і былі звязаныя з адказам СССР на агрэсію Германіі і яе саюзнікаў **(Вялікая Айчынная вайна савецкага народа).**

Размеркаванне сухапутных войскаў Германіі і яе еўрапейскіх саюзнікаў па дзеючых франтах у 1941–1945 гг. (колькасць дывізій)

Фронт	22 чэрвеня 1941 г.	Красавік 1942 г.	Лістапад 1942 г.	Красавік 1943 г.	Студзень 1944 г.	Чэрвень 1944 г.	Студзень 1945 г.
Савецка-германскі	190	219	266	233	245	239,5	195,5
Іншыя	9	11	12,5	14,5	21	85	107

Прааналізуйце звесткі з табліцы.
Які вывад аб значэнні франтоў Другой сусветнай вайны можна зрабіць?

5. Супраціўленне. Ва ўсіх краінах, акупаваных Германіяй і яе саюзнікамі, і ў самой Германіі разгарнулася *Супраціўленне*. Узброенае супраціўленне фіксавалі і ў краінах, акупаваных Японіяй, — у В'етнаме, Лаосе, Камбоджы, Малаі, Інданезіі і на Філіпінах.

Формы Супраціўлення

Супраціўленне мела розныя формы ў залежнасці ад асаблівасцей тэрыторыі і дзяржавы. У краінах, дзе эфектыўна дзейнічаў нацысцкі рэпрэсіўны апарат або размяшчаліся значныя кантынгенты акупацыйных войскаў, яно праявілася галоўным чынам у форме прапаганды і агітацыі, распаўсюджвання праўдзівай інфармацыі пра сітуацыю на франтах, выдання забароненай літаратуры. У іншых краінах насельніцтва здзяйсняла больш

Правообладатель Издательский центр БГУ

рашучыя захады: забастоўкі, дыверсіі і сабатаж на прадпрыемствах і транспартных камунікацыях, збор звестак і перадачу іх краінам, што супрацьстаялі фашысцкай агрэсіі.

Насельніцтва еўрапейскіх краін аказвала дапамогу ваеннапалонным, што збеглі з канцлагераў, закінутым у тыл ворага дыверсантам, хавала яўрэяў. Нянавісць да акупантаў магла выяўляцца ў забойстве службовых асоб акупацыйнай адміністрацыі і здраднікаў **(калабарацыяністаў)** з ліку мясцовага насельніцтва.

Самай значнай формай Супраціўлення была *партызанская* і *падпольная барацьба*. Найбольшага размаху гэтыя формы барацьбы дасягнулі ў СССР, Польшчы, Югаславіі і Грэцыі. Значную дапамогу рэгулярным часцям Чырвонай арміі, што змагаліся супраць нацыстаў, аказвалі беларускія партызаны і падпольшчыкі.

У некаторых краінах партызанская барацьба перарастала ва ўзброенае паўстанне (Югаславія, Польшча, Чэхаславакія, Францыя).

Супраціўленне ў акупаваных краінах было адным з фактараў перамогі антыгітлераўскай каліцыі ў Другой сусветнай вайне.

У гады Другой сусветнай вайны ў акупаваных Германіяй і яе саюзнікамі краінах частка насельніцтва і шэраг палітыкаў выявілі гатоўнасць супрацоўнічаць з акупантамі. Агрэсары пачалі прыцягваць іх да кіравання акупаванымі краінамі. Пасля капітуляцыі Францыі з нацыстамі актыўна супрацоўнічаў урад А. Ф. Петэна. У Нарвегіі В. Квіслінг, які ўзначаліў марыянетачны «ўрад», быў абвешчаны правадыром нарвежскага народа. Кароль Бельгіі Леапольд III падпісаў акт аб капітуляцыі бельгійскай арміі і ў лістападзе 1940 г. падчас сустрэчы з А. Гітлерам выказаў яму падзяку за лаяльную палітыку ў дачыненні да Бельгіі.

10 красавіка — Міжнародны дзень Супраціўлення

Калабарацыянізм — свядомае, добраахвотнае і наўмыснае супрацоўніцтва з ворагам у яго інтарэсах і на шкоду сваёй дзяржаве.



Партызаны ідуць на заданне. 1943 г.

Найбольш актыўнай формай калабарацыянізму была ваенная дапамога ворагу са зброяй у руках. У войсках СС было сфарміравана 26 дывізій з грамадзян розных дзяржаў (албанцы, галандцы, венгры, датчане, бельгійцы, французы, латышы, літоўцы, эстонцы, украінцы і інш.). На 1 чэрвеня 1944 г. у гэтыя фарміраванні ўваходзіла 486,6 тыс. чалавек, з іх 333,4 тыс. дзейнічалі на савецка-германскім фронце.

У акупаваных краінах ствараліся паліцэйскія фарміраванні калабарацыяністаў, якія мусілі падтрымліваць усталяваны нацыстамі «новы парадак», выкарыстоўваліся ў барацьбе супраць сіл Супраціўлення, бралі актыўны ўдзел у ажыццяўленні нацысцкага тэрору. Ад студзеня 1942 г. нацысты пачалі прыцягваць іх да здзяйснення генацыду яўрэйскага насельніцтва Еўропы.

Эканамічны калабарацыянізм заключаўся ў вырабе ў акупаваных краінах зброі, іншых матэрыялаў, неабходных фашысцкім дзяржавам для вядзення вайны.

6. Дзейнасць антыгітлераўскай кааліцыі: дасягненні і праблемы. Першы крок да стварэння *антыгітлераўскай кааліцыі* («Аб'яднаныя Нацыі») быў зроблены неўзабаве пасля нападу нацысцкай Германіі на СССР.

ЭТАПЫ СТВАРЭННЯ АНТЫГІТЛЕРАЎСКАЙ КААЛІЦЫІ

12 ліпеня 1941 г.	Савецка-брытанскае пагадненне аб барацьбе супраць Германіі
14 жніўня 1941 г.	«Атлантычная хартыя» (Вялікабрытанія і ЗША), вызначэнне мэт вайны
29 верасня — 1 кастрычніка 1941 г.	Маскоўская канферэнцыя дыпламатычных прадстаўнікоў СССР, Вялікабрытаніі і ЗША: вырашэнне пытанняў эканамічнай дапамогі
1 студзеня 1942 г.	26 дзяржаў падпісалі Вашынгтонскую дэкларацыю («Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый») аб мэтах вайны супраць фашызму
26 мая 1942 г.	Савецка-брытанскі дагавор аб вайне супраць Германіі
11 чэрвеня 1942 г.	Савецка-амерыканскі дагавор аб вайне супраць Германіі

Правообладатель Издательский центр БГУ

Характар уцягнення ў вайну краін — удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі быў розны. Найбольшы цяжар вядзення ваенных дзеянняў у гады Другой сусветнай вайны выпаў на долю СССР. Удзел у баявых аперацыях прынялі Вялікабрытанія і ЗША. Дапамога шэрагу краін заключалася ў эканамічным і фінансавым унёску.

Успомніце, што такое ленд-ліз.

Супярэчнасці, якія існавалі паміж галоўнымі краінамі антыгітлераўскай кааліцыі — СССР, ЗША і Вялікабрытаніяй — напярэдадні Другой сусветнай вайны, захоўваліся. Нягледзячы на тое што заходнія дзяржавы валодалі значнымі людскімі і матэрыяльнымі рэсурсамі, *другі фронт* быў адкрыты на поўначы Францыі (у Нармандыі) толькі **6 чэрвеня 1944 г.**

Міжнародныя канферэнцыі

Шмат у чым супярэчнасці паміж вядучымі дзяржавамі антыгітлераўскай кааліцыі ўдавалася вырашыць дзякуючы волі іх лідараў. Кіраўнікі СССР, ЗША і Вялікабрытаніі тройчы правялі асабістыя сустрэчы ў фармаце міжнародных канферэнцый.

МІЖНАРОДНЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ ЛІДАРАЎ КРАІН АНТЫГІТЛЕРАЎСКАЙ КААЛІЦЫІ

Даты	Месца	Удзельнікі	Прынятыя рашэнні
28 лістапада — 1 снежня 1943 г.	Тэгеран (Іран)	І. В. Сталін, Ф. Рузвельт, У. Чэрчыль	• Адкрыццё другога фронту ў маі 1944 г.; • сумесныя дзеянні ў вайне супраць Германіі і пасляваеннае супрацоўніцтва; • уступленне СССР у вайну супраць Японіі праз тры месяцы пасля капітуляцыі Германіі
4–11 лютага 1945 г.	Ялта (СССР)	І. В. Сталін, Ф. Рузвельт, У. Чэрчыль	• Планы разгрому і ўмовы безумоўнай капітуляцыі Германіі; • лёс Германіі пасля яе паражэння ў вайне; • стварэнне міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру — ААН; • пасляваенныя межы Польшчы

Даты	Месца	Удзельнікі	Прынятыя рашэнні
17 ліпеня — 2 жніўня 1945 г.	Патсдам (Германія)	І. В. Сталін, Г. Трумэн, У. Чэрчыль, К. Этлі	• Пасляваеннае палітычнае ўладкаванне Германіі; • памер рэпарацый і падзел германскага флоту; • стварэнне Міжнароднага ваеннага трыбунала для суду над галоўнымі нацысцкімі злачынцамі; • змяненне пасляваенных межаў еўрапейскіх дзяржаў

Якія падзеі адбываліся на франтах Другой сусветнай вайны ў перыяд правядзення кожнай з канферэнцый? Як яны паўплывалі на кола пытанняў, што абмяркоўваліся?

Успомніце, якія гарады ЗША падверглі атамнай бамбардзіроўцы. Калі гэта адбылося?

Ваенна-палітычнае супрацоўніцтва саюзнікаў рабілася ўсё больш напружаным з ростам поспехаў СССР у вайне з Германіяй. Напрыканцы Другой сусветнай вайны ЗША прадэманстравалі знішчальныя магчымасці атамнай зброі.

7. Наступствы Другой сусветнай вайны. Адным з найважнейшых вынікаў Другой сусветнай вайны была дыскрэдытацыя ў вачах сусветнай супольнасці асноў нацыянал-сацыялістычнай ідэалогіі. На паказальным судовым працэсе, які адбыўся ў лістападзе 1945 г. — кастрычніку 1946 г. у Нюрнбергу, было прызнана, што злачынствы нацыстаў не маюць тэрміну даўніны.

Чым, на вашу думку, было абумоўлена рашэнне прызнаць, што злачынствы нацыстаў не маюць тэрміну даўніны?

Вайна карэнным чынам змяніла грамадска-палітычную сітуацыю ў Еўропе. У пасляваенны час назіралася павышэнне сімпатый насельніцтва да сацыялістычных (і нават камуністычных) ідэй. Рост уплыву камуністаў быў абумоўлены іх актыўным удзелам у антыфашысцкай барацьбе.

Рост аўтарытэту СССР

Міжнародны аўтарытэт СССР вырас, у Савецкім Саюзе пачалі бачыць перш за ўсё сілу, якая разграміла нацыстаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Змяненне расстаноўкі сіл у свеце

Другая сусветная вайна карэнным чынам змяніла расстаноўку сіл ва ўсім свеце:

- СССР разам з ЗША ператварыўся ў асноўны дзеючы суб'ект міжнароднай палітыкі;
- Германія, Японія і Італія некаторы час адыгрывалі пасіўную ролю ў міжнародных справах;
- Францыя страціла былую магутнасць;
- Вялікабрытанія засталася адной з найбуйнейшых сусветных дзяржаў, але распад каланіяльных уладанняў аслабіў яе эканоміку.

Вайна выступіла прычынай радыкальных перамен у каланіяльным свеце. Быў аслаблены кантроль над калоніямі. Камуністы здолелі ўсталяваць сваю ўладу ў Кітаі. Запатрабавала незалежнасці ад Вялікабрытаніі Індыя. На Блізкім Усходзе Сірыя і Ліван адмовіліся ад аднаўлення ўлады Францыі. Пазней працэс вызвалення разгарнуўся і ў Афрыцы.

Новае супрацьстаянне

Аднак Другая сусветная вайна не паклала канец канфрантацыі. Пасля яе заканчэння значна пашырыўся ўплыў сацыялістычнага лагера на чале з СССР. Яму супрацьстаялі заходнія дзяржавы на чале з ЗША. Гэта прывяло да складвання *біпалярнага свету*, нядаўнія саюзнікі аказаліся падзеленыя «жалезнай заслонай». Супрацьстаянне паміж двума галоўнымі палітычнымі полюсамі набыло характар *«халоднай вайны»*.

Другая сусветная вайна, якая зрабілася вынікам мэтанакіраванай палітыкі дзяржаў-агрэсараў (Германіі, Італіі, Японіі), што імкнуліся ажыццявіць тэрытарыяльны перадзел свету і ўсталяваць сусветнае панаванне, скончылася перамогай СССР і краін антыгітлераўскай кааліцыі. Вайна карэнным чынам змяніла палітычную сітуацыю ў свеце. Рост міжнароднага аўтарытэту СССР стаў сведчаннем прызнання ўнёску савецкага народа ў разгром нацыстаў. Падзеі верасня — кастрычніка 1939 г. (вызваленчы паход Чырвонай арміі, Народны сход Заходняй Беларусі) выступілі важным этапам у працэсах дзяржаўнага будаўніцтва нашай краіны, паклалі канец гістарычнай несправядлівасці — раз'яднанню беларускага народа.

калі ў свеце...	на тэрыторыі Беларусі...
Лістапад 1945 г. — кастрычнік 1946 г. — Нюрнбергскі судовы працэс над ваеннымі злачынцамі	15–29 студзеня 1946 г. — судовы працэс над нацысцкімі ваеннымі злачынцамі ў Мінску

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Зыходзячы з мэт, якія ставілі ў Другой сусветнай вайне розныя дзяржавы, сфармулюйце найважнейшыя прычыны гэтага сусветнага канфлікту. Хто, на вашу думку, вінаваты ў развязванні Другой сусветнай вайны?
2. На якія перыяды дзеліцца гісторыя Другой сусветнай вайны?
3. Чаму ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР з'яўляецца актам гістарычнай справядлівасці?
4. Ахарактарызуйце ролю савецка-германскага фронту ў гады Другой сусветнай вайны.
5. Назавіце формы Супраціўлення. Якое значэнне яно мела для перамогі краін — удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі?
6. У чым заключаецца гістарычнае значэнне Другой сусветнай вайны? Якія яе наступствы для сучаснасці?
7. Як вы лічыце, што выступіла асноўнай прычынай супрацьстаяння краін — саюзніц па антыгітлераўскай кааліцыі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны?

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 28–29. Вялікая Айчынная вайна

БІТВА ЗА МАСКВУ МАБІЛІЗАЦЫЯ
СТАЛІНГРАДСКАЯ БІТВА
БІТВА НА КУРСКАЙ ДУЗЕ
БЛАКАДА ЛЕНІНГРАДА
КАРЭННЫ ПЕРАЛОМ ГЕНАЦЫД
ПАРТЫЗАНСКІ РУХ
ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА
ПЛАН «БАРБАРОСА»
НАРОДНАЕ АПАЛЧЭННЕ

План «Барбароса»


1. Планы нацысцкай Германіі адносна СССР. Пасля акупацыі шэрагу еўрапейскіх краін германскае ваенна-палітычнае кіраўніцтва пачало распрацоўку плана вайны супраць СССР, які атрымаў назву *план «Барбароса»*. Ён прадугледжваў рэалізацыю тэорый татальнай і *«маланкавай»* войнаў. У снежні 1940 г. гэты план быў зацверджаны.

Успомніце, у чым заключаецца сутнасць «маланкавай вайны».

Наступ германскіх войскаў планаваўся па трох напрамках — «Поўнач», «Цэнтр» і «Поўдзень». Арміі, якія рухаліся па іх, мелі захапіць Ленінград, Маскву і Кіеў адпаведна.

Мэтамі вайны Германіі супраць СССР былі: захоп тэрыторыі Савецкага Саюза для пашырэння «жыццёвай прасторы» немцаў, выкарыстанне эканамічнага і чалавечага патэнцыялу СССР на акупаваных тэрыторыях, вываз сельскагаспадарчых і прамысловых тавараў, а таксама грамадзян СССР у якасці бясплатнай рабочай сілы ў Германію.

На акупаванай тэрыторыі агрэсары рыхтаваліся да правядзення мэтанакіраванай *палітыкі*



МАСКВА Сталіцы дзяржаў
МІНСК Сталіцы рэспублік СССР
Казань Іншыя гарады

ГРАНІЦЫ
дзяржаў напярэдадні 1.09.1939
саюзных рэспублік СССР

ТЭРЫТОРЫІ
нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў
дзяржаў, акупаваных Германіяй да чэрвеня 1941 г.
дзяржаў, якія абвясцілі аб сваім нейтралітэце

Раёны засяроджвання войскаў
Германіі
Фінляндыі
Венгрыі
Румыніі

Планаваныя напрамкі ўдараў войскаў нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў
для дасягнення бліжэйшых задач
для вырашэння наступных задач

Мяжа, да якой павінны былі выйсці нямецка-фашысцкія войскі да зімы 1941 г.

Планаваныя бомбавыя ўдары па прамысловых цэнтрах Урала

АДЭСКАЯ ВАЕННАЯ АКРУГА Назвы заходніх ваенных акруг СССР

Лічбамі на карце пазначаны:
1 – Германія; 2 – «Вольны горад Данцыг»; 3 – Чэхаславакія; 4 – Венгрыя; 5 – Албанія (акупавана Італіяй у 1939 г.)

План «Барбароса»

Успомніце, што такое генацыд.

генацыду. На дзяржаўным узроўні імі былі распрацаваныя механізмы рэалізацыі чалавеканенавісніцкай палітыкі ў дачыненні да ўсходніх славян (у тым ліку беларусаў) і іншых нацыянальнасцей, якія жылі на тэрыторыі СССР (яўрэі, цыганы, палякі і інш.), планы знішчэння грамадзянскага насельніцтва Беларусі.

Вышэйшае ваенна-палітычнае кіраўніцтва нацысцкай Германіі прыняло нарматыўна-прававыя дакументы, якія здымалі з салдат вермахта ўсякую

Правообладатель Издательский центр БГУ

адказнасць за злачынствы супраць мірнага насельніцтва Савецкага Саюза. Былі арганізаваныя спецыяльныя карныя падраздзяленні, якія ад першых дзён вайны пачалі праводзіць масавыя знішчэнні грамадзянскага насельніцтва. Ключавым дакументам, які характарызаваў «намеры» гітлераўцаў ажыццяўляць злачынствы супраць мірнага насельніцтва, быў генеральны *план «Ост»*. Гэты нацысцкі план каланізацыі і германізацыі акупаваных зямель

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З заўваг і прапаноў Э. Ветцаля па генеральным плане «Ост»

Генеральны план «Ост» прадугледжвае, што пасля заканчэння вайны колькасць перасяленцаў для неадкладнай каланізацыі ўсходніх тэрыторый павінна складаць <…> 4 550 тыс. чал. Гэты лік не здаецца мне завялікім, калі ўлічыць перыяд каланізацыі, роўны 30 гадам. Цалкам магчыма, што ён мог бы быць і большы. Бо трэба мець на ўвазе, што гэтыя 4 550 тыс. немцаў павінны быць размеркаваны на такіх тэрыторыях, як вобласць Данцыг — Заходняя Прусія, Варцкая вобл., Верхняя Сілезія, генерал-губернатарства, Паўднёва-Усходняя Прусія, Беластоцкая вобл., Прыбалтыка, Інгерманландыя, Беларусь, часткова таксама вобласці Украіны <…>

в) Да пытання аб беларусах.

Згодна з планам, прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з тэрыторыі, якую яны займаюць. Значыць, 25 працэнтаў беларусаў паводле плана галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягаюць анямечванню <…>

Непажаданае ў расавым сэнсе беларускае насельніцтва будзе яшчэ на працягу многіх гадоў знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым уяўляецца надзвычай неабходным як мага больш пільна адабраць беларусаў нардычнага тыпу, прыдатных паводле расавых прыкмет і палітычных меркаванняў для анямечвання, і адправіць іх у імперыю з мэтай выкарыстання ў якасці рабочай сілы. Іх можна было б выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы ў якасці сельскагаспадарчых рабочых, а таксама ў прамысловасці, або як рамеснікаў. Паколькі з імі абыходзіліся б як з немцамі і з прычыны адсутнасці ў іх нацыянальнага пачуцця, яны ў хуткім часе, прынамсі ў найбліжэйшым пакаленні, маглі б быць цалкам анямечаны.

Абапіраючыся на тэкст дакумента, дакажыце, што план «Ост» быў заснаваны на «расавай дактрыне» і тэорыі пашырэння «жыццёвай прасторы» немцаў.

Як нацысты вырашылі пытанне аб беларусах?

Як вы лічыце, якія якасці беларусаў не дазволілі рэалізаваць планы нацыстаў?

Усходняй Еўропы, у тым ліку захопленых тэрыторый СССР, быў заснаваны на «расавай дактрыне» і тэорыі «жыццёвай прасторы».

План «Ост» належаў да самых сакрэтных дакументаў Трэцяга рэйха і распрацоўваўся пад асабістым наглядам і кантролем рэйхсфюрара СС Г. Гімлера.

Раніцай **22 чэрвеня 1941 г.** пачаўся маштабны наступ гітлераўскіх войскаў на СССР па ўсіх напрамках. Савецка-германскі фронт зрабіўся найважнейшым тэатрам ваенных дзеянняў Другой сусветнай вайны. Для народаў СССР гэта была *Вялікая Айчынная вайна*.

Айчынная вайна

2. Характар вайны. Паводле свайго характару Вялікая Айчынная вайна была для Савецкага Саюза вайной *вызваленчай*, накіраванай на захаванне тэрыторыі, савецкай дзяржаўнасці і грамадскага ладу, народаў і народнасцей, што насялялі шматнацыянальны СССР, захаванне культуры і жыццяў людзей. Характар Вялікай Айчыннай вайны вельмі пераканаўча паказаны ў вершы В. І. Лебедзева-Кумача «Свяшчэнная вайна», напісаным на трэці дзень вайны. Музыку да верша

Як вы лічыце, чаму вайна савецкага народа супраць нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў увайшла ў гісторыю як Вялікая Айчынная вайна?

Знайдзіце і праслухайце песню «Свяшчэнная вайна». Як вы лічыце, чаму гэтая песня ператварылася ў сімвал усенароднай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны?



Ансамбль Аляксандрава на Беларускім вакзале, 26 чэрвеня 1941 г. Мастак Д. Ананьеў

Правообладатель Издательский центр БГУ

напісаў А. В. Аляксандраў. Песня зрабілася сімвалам Вялікай Айчыннай вайны. Яе спявалі на пярэднім краі фронту, у партызанскіх атрадах, у тыле, дзе кавалася зброя для перамогі. Шораніцы, а 6-й гадзіне, пасля бою крамлёўскіх курантаў яна гучала па радыё.

3. Арганізацыя ўлады і кіравання грамадствам. Надзвычайныя абставіны ваеннага часу запатрабавалі поўнай мабілізацыі рэсурсаў краіны, у сувязі з чым адбылося ўзмацненне *цэнтралізацыі кіравання* ва ўсіх сферах дзяржаўнага, гаспадарчага і грамадскага жыцця.

Яшчэ напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў СССР рабіліся захады па ўмацаванні працоўнай і вытворчай дысцыпліны, былі пашыраныя паўнамоцтвы агульнасаюзных органаў, прынятыя меры па павышэнні аператыўнасці дзейнасці ўрада.

З пачаткам вайны ў еўрапейскай частцы СССР было ўведзена ваеннае становішча, у сувязі з чым ваенным органам перадаваліся ўсе функцыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, звязаныя з арганізацыяй абароны краіны, захаваннем грамадскага парадку і забеспячэннем дзяржаўнай бяспекі.

Вельмі важнае месца ў структуры органаў кіравання СССР у гады вайны належала надзвычайным органам, створаным для больш эфектыўнай работы ў розных галінах. Ім была перададзена ўся паўната ўлады на месцах з правам ускладаць на грамадзян, установы і прадпрыемствы новыя абавязкі ў інтарэсах абароны СССР.

Максімальная цэнтралізацыя ўлады і гераізм савецкага народа дазволілі СССР вырашыць на першым этапе вайны найскладанейшыя задачы — правесці *эвакуацыю* насельніцтва, прадпрыемстваў, матэрыяльных каштоўнасцей і наладзіць вытворчасць на ўсходзе краіны, а ў далейшым —

Узмацненне цэнтралізацыі кіравання

Лета 1940 г.

- уведзена крымінальная адказнасць за спазненне на працу, за выраб недабраякаснай прадукцыі і інш.;
- 6-дзённы рабочы тыдзень заменены на 7-дзённы;
- 7-гадзінны рабочы дзень заменены на 8-гадзінны.

Выкажыце здагадку, чым былі абумоўлены гэтыя змены ў заканадаўстве.

Сістэма органаў дзяржаўнай улады

СІСТЭМА ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ І КІРАВАННЯ СССР У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



Вывучыце структуру органаў дзяржаўнай улады і кіравання СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вызначце, якім пытанням кіравання надавалася найбольшая ўвага. Чаму яны былі ў прыярытэце?

павялічыць выраб ваеннай прадукцыі і забяспечыць патрэбы Чырвонай арміі.

Добраахвотнікі

4. Добраахвотная самамабілізацыя грамадства. Падступны напад нацысцкай Германіі на Савецкі Саюз выклікаў вялікі патрыятычны ўздым сярод савецкіх грамадзян. Адметнай з'явай першых дзён Вялікай Айчыннай вайны была падача заяў аб добраахвотным уступленні ў шэрагі ўзброеных сіл нават тых грамадзян, якія не адпавядалі па ўзросце або былі вызвалены ад ваеннай службы. У выніку ў Чырвоную Армію ўлілося каля 2 млн добраахвотнікаў, а агулам за гады Вялікай Айчыннай вайны савецкія войскі папоўніліся на 34,5 млн чалавек.



Плакат 1920 г. Выкарыстоўваўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Правообладатель Издательский центр БГУ

З прычыны імклівага наступу германскіх войскаў не атрымалася правесці *мабілізацыю* ў заходніх абласцях БССР. Між тым арганізавана гэта было зроблена ў Палескай і Гомельскай абласцях і ў шэрагу раёнаў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. У выніку дзеючую армію папоўніла больш за 500 тыс. жыхароў БССР, апроч таго, у войскі было перададзена 2,5 тыс. аўтамабіляў, звыш 35 тыс. коней, 23 тыс. вазоў.

Успомніце, што такое мабілізацыя.

Апроч рэгулярных узброеных сіл актыўны ўдзел у барацьбе супраць нацыстаў бралі добраахвотніцкія вайсковыя фарміраванні.

Атрады народнага апалчэння	**Знішчальныя батальёны**
Фарміраваліся партыйнымі органамі	Фарміраваліся органамі ўнутраных спраў
Склад: асобы, якія не падлягалі першачарговай мабілізацыі, добраахвотнікі	Склад: партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя актывісты, якія не падлягалі прызыву ва Узброеныя Сілы СССР
Бралі ўдзел у ваенных дзеяннях толькі ў выпадку крайняй неабходнасці	Змагаліся з закінутымі ў савецкі тыл дыверсантамі, шпіёнамі, а таксама дэзерцірамі, бандытамі і марадзёрамі. Падтрымлівалі грамадскі парадак і бяспеку на савецкай тэрыторыі

У добраахвотніцкім руху выявілася характэрная для ўсходнеславянскага менталітэту рыса — калектыўная самасвядомасць. Для многіх савецкіх грамадзян уяўлялася непрымальным заставацца ў тыле, калі іх блізкія біліся на фронце.

«Усё для фронту, усё для перамогі!»

Добраахвотная дапамога насельніцтва дзеючай арміі праяўлялася і ў іншых формах. Каля 2 млн чалавек удзельнічалі ва ўзвядзенні абарончых збудаванняў. У фонд абароны краіны савецкія людзі накіроўвалі матэрыяльныя рэсурсы — аўтатранспарт, трактары, жывёлу, мяса, збожжа і інш. У гады Вялікай Айчыннай вайны насельніцтва

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ





1. Што паказана на фотаздымках?
2. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі выявіце гісторыю гэтых фотаздымкаў.

добраахвотна перадавала свае грашовыя зберажэнні і частку заробку на патрэбы Чырвонай арміі.

Грашовыя сродкі збіраліся нават на акупаваных гітлераўцамі тэрыторыях. Так, ад кастрычніка 1942 г. да вызвалення тэрыторыі БССР улетку 1944 г. мясцовае насельніцтва з дапамогай партызан перадало ў Фонд абароны краіны каля 7,5 кг залатых манет царскай чаканкі, 50 кг срэбра, 2,45 млн савецкіх рублёў і аблігацый дзяржаўных пазык на суму звыш 6,5 млн рублёў.

Свой унёсак у барацьбу супраць нацыстаў рабілі і дзеячы культуры. Ад першых дзён Вялікай Айчыннай вайны пачалі камплектаваць мастацкія франтавыя брыгады работнікаў сцэны. Яны выязджалі на перадавую, давалі канцэрты ў шпіталях, на заводах. Усеагульную любоў салдат і працаўнікоў тылу здабылі франтавыя тэатры

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ



Выступленне аркестра Л. Уцёсава на фронце. 1942 г.

„Пад моцнай залевай выступалі мы ў парадным адзенні. У якіх бы ўмовах ні праходзіла прадстаўленне, яно мае быць святам, а тым больш — на фронце ... мы былі шчаслівыя, што па-сапраўднаму ўдзельнічаем у барацьбе супраць фашыстаў".

Л. Уцёсаў, народны артыст СССР

1. *Чаму кіраўнік аркестра Л. Уцёсаў надаваў вялікае значэнне вонкаваму выгляду музыкантаў?*
2. *Як вы разумееце яго словы наконт удзелу ў барацьбе супраць фашызму?*

Усесаюзнага тэатральнага таварыства, а таксама дзеячы мастацтва Л. А. Русланава, К. І. Шульжэнка, Л. В. Уцёсаў, С. Я. Лемешаў.

5. Рэлігійная палітыка Савецкай дзяржавы. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны праваслаўная царква ўсяляк падтрымала Савецкую дзяржаву ў барацьбе супраць нацысцкіх агрэсараў. У першы ж дзень вайны мітрапаліт Сергій (Страгародскі) напісаў адозву, у якой заклікаў праваслаўны народ на абарону Айчыны. Адозва была распаўсюджана па ўсёй краіне. Нягледзячы на мінулыя гады ганенняў, закрыццё храмаў і знішчэнне духавенства, Руская праваслаўная царква стала на абарону свайго народа і Айчыны, на справе паказваючы традыцыі патрыятычнага служэння рускага праваслаўя.

Палітыка ўлады ў дачыненні да Рускай праваслаўнай царквы


Патрыятычная дзейнасць царквы ў гады вайны знаходзіла выяўленне ў розных формах.

Формы патрыятычнай дзейнасці царквы ў гады вайны

Маральная падтрымка	Непасрэдны ўдзел у барацьбе	Матэрыяльная дапамога
Па ўсёй краіне праходзілі малебны аб дараванні перамогі Чырвонай арміі	Сотні святароў біліся ў шэрагах дзеючай арміі	Ад 23 чэрвеня 1941 г. пачаўся збор ахвяраванняў у фонд абароны і савецкага Чырвонага Крыжа
Вера зрабілася апорай людзей у ваенныя гады	На акупаваных тэрыторыях святары ўдзельнічалі ў партызанскай і падпольнай барацьбе	На сродкі царквы будавалі самалёты, танкі (напрыклад, была сфарміраваная танкавая калона імя Дзмітрыя Данскога)

Успомніце, чым знакаміты князь Дзмітрый Данскі. Чаму танкавая калона, сфарміраваная на сродкі Рускай праваслаўнай царквы, атрымала яго імя?

Патрыятычная пазіцыя Рускай праваслаўнай царквы



Паштоўка. Ленінград. 25.03.1942 г.

Успомніце, якое было становішча Ленінграда ў сакавіку 1942 г.

Пазіцыя царквы падштурхнула кіраўніцтва СССР змяніць рэлігійную палітыку. У краіне пачалі адкрываць храмы, закрытыя ў 1930-я гг., святароў вызвалялі з лагераў і аднаўлялі службы. Спынілася антырэлігійная кампанія ў друку.

У верасні 1943 г. з дазволу кіраўніцтва СССР адбыўся Сабор іерархаў Рускай праваслаўнай царквы, галоўнай задачай якога было абранне патрыярха. Аднагалосна быў абраны мітрапаліт Сергій (Страгародскі), які фактычна ўжо на працягу 17 гадоў выконваў гэтыя абавязкі.

Быў створаны спецыяльны дзяржаўны орган, закліканы ажыццяўляць сувязь паміж урадам і кіраўніцтвам царквы, — Савет па справах Рускай праваслаўнай царквы.

Напрыканцы вайны склаліся асноўныя прынцыпы новай рэлігійнай палітыкі савецкай улады. Яна характарызавалася большай цярпімасцю ў дачыненні да праваслаўя. У выніку ў жніўні 1945 г. на тэ-

Правообладатель Издательский центр БГУ

рыторыі СССР дзейнічалі 10 243 царквы і 75 манастыроў. Саўнаркам СССР прапанаваў мясцовым органам улады не перашкаджаць іх дзейнасці. Пастанова ўрада ад 23 жніўня 1945 г. дазволіла званіць у званы ў гарадах і вёсках. Гэта сведчыла як пра пэўны рост рэлігійных настрояў сярод насельніцтва, так і пра прызнанне дзяржавай заслуг царквы ў ваенныя гады.

6. Асноўныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Бескампраміснасцю ўзброенай барацьбы, рашучасцю і актыўнасцю ваенных дзеянняў, напругай і крывавасцю бітваў савецка-германскі фронт не меў сабе роўных сярод іншых франтоў Другой сусветнай вайны.

Размах баявых дзеянняў на франтах Вялікай Айчыннай вайны

Чырвоная армія спыніла нямецкія войскі пад Масквой і Ленінградам, разграміла ворага ў Сталінградскай і Курскай бітвах, паспяхова правяла шэраг буйны́х наступальных аперацый, у тым ліку Беларускую, Вісла-Одэрскую.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Параўнанне размаху дзеянняў варожых бакоў на франтах у 1941–1945 гг.

Паказчыкі	Савецка-германскі фронт	Паўночна-афрыканскі фронт	Заходне-еўрапейскі фронт	Італьянскі фронт
Агульная працягласць ваенных дзеянняў (у сутках)	1418	1068	338	663
Працягласць актыўных дзеянняў (у сутках)	1320	309	293	492
Даўжыня лініі судакранання бакоў (км)	6200	350	800	300

1. *Прааналізуйце звесткі з табліцы. Зрабіце вывады.*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, дакажыце, што падзеі на савецка-германскім фронце аказалі вызначальны ўплыў на ход вайны.*



Сцяг Перамогі над рэйхстагам. Фатограф Я. Халдзей. 1945 г.

Асаблівае значэнне мела *Сталінградская бітва*. Пад Сталінградам не толькі былі знішчаны адборныя гітлераўскія арміі, але і зламаны маральны дух нацыстаў. Пасля Сталінграда Чырвоная армія захапіла стратэгічную ініцыятыву і ўтрымлівала яе да канца вайны. Карэнны пералом у Вялікай Айчыннай вайне быў замацаваны ў *бітве на Курскай дузе*.

Велізарнае значэнне для перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне мелі аперацыі савецкіх узброеных сіл у 1944 г., у выніку якіх тэрыторыя СССР была вызвалена.

На заключным этапе вайны ў Еўропе, у 1945 г., Чырвоная армія, разгарнуўшы магутны стратэгічны наступ з усходу і пры садзеянні саюзных сіл, што наступалі з захаду, дабілася поўнага разгрому вермахта і безумоўнай капітуляцыі гітлераўскай Германіі.

«Новы парадак» на акупаванай тэрыторыі СССР

7. Палітыка нямецкіх улад на акупаваных тэрыторыях. «Новы парадак». Згодна з генеральным планам «Ост» захопленыя тэрыторыі СССР падлягалі германскай каланізацыі і германізацыі. Фактычна гэта быў план ліквідацыі СССР як дзяржавы.

На ўсёй акупаванай нацыстамі тэрыторыі СССР быў усталяваны жорсткі акупацыйны рэжым — так званы *«новы парадак»*, які ўяўляў сабой сістэму ваенных, палітычных, эканамічных і ідэалагічных мерапрыемстваў, накіраваных на знішчэнне савецкага ладу, ліквідацыю тэрытарыяльнай цэласнасці савецкай дзяржавы, рабаванне народнай гаспадаркі і грамадзян, знішчэнне цэлых народаў і сацыяльных груп, непажаданых для нацысцкага рэжыму. Сродкам яго рэалізацыі выступіла *палітыка генацыду* — тэрор супраць грамадзянскага насельніцтва, знішчэнне савецкіх ваеннапалонных і вываз мільёнаў людзей на прымусовыя работы ў Германію.



Бабруйскі лагер ваеннапалонных. Дулаг-131. 1941 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

8. Партызанскі рух і падпольная барацьба. Барацьба супраць нацыстаў на акупаваных тэрыторыях СССР набыла агульнанародны характар. Формы і метады барацьбы былі розныя: дыверсійныя акцыі, забастоўкі, сабатаж на прадпрыемствах, што выраблялі прадукцыю для акупацыйных улад, распаўсюджванне падпольнага друку.

Найважнейшымі формамі барацьбы на акупаванай тэрыторыі СССР выступілі *партызанскі рух* і *падпольная барацьба*. Партызанскія атрады былі створаны ў Беларусі ўжо ў першыя дні вайны. Арганізатарамі партызанскага руху былі камуністы, беспартыйныя актывісты, былыя воіны і камандзіры Чырвонай арміі, што апынуліся на акупаванай ворагам тэрыторыі. Сярод вядомых камандзіраў партызанскіх атрадаў былі А. М. Сабураў, С. А. Каўпак, А. Ф. Фёдараў, А. В. Герман, М. І. Дука, у Беларусі — В. З. Корж, Ц. П. Бумажкоў, Ф. І. Паўлоўскі, М. Ф. Шмыроў і інш. Партызанскія атрады папаўняліся за кошт мірнага насельніцтва і атрымлівалі ад яго падтрымку. Для каардынацыі партызанскага руху **30 мая 1942 г.** быў створаны *Цэнтральны штаб партызанскага руху* (ЦШПР) пад кіраўніцтвам **П. К. Панамарэнкі**.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на акупаванай тэрыторыі СССР супраць нацыстаў змагалася каля 6 тыс. партызанскіх атрадаў, якія аб'ядноўвалі больш за 1 млн партызан. Колькасць беларускіх партызан перавышала 374 тыс. чалавек.

Актыўна супраціўляліся нацыстам жыхары акупаваных населеных пунктаў Савецкага Саюза. У большасці акупаваных гарадоў і іншых населеных пунктах былі створаны нелегальныя арганізацыі. Вядомай на ўсю краіну стала дзейнасць падпольнай камсамольскай арганізацыі «Маладая гвардыя» ў г. Краснадон (Украіна). У Беларусі падпольныя арганізацыі дзейнічалі практычна ва



Партызанская ўлётка, надрукаваная на бяросце

У якім годзе была выпушчаная ўлётка? Як вы лічыце, чым тлумачыцца выбар матэрыялу?



Партызанскі парад у Мінску. 16 ліпеня 1944 г.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Помнік на месцы партызанскага аэрадрома. В. Зыслаў



Газеты з тыпаграфіі на в. Зыслаў

Ад 1941 да 1944 г. на востраве Зыслаў (Любанскі раён, Мінская вобл.) размяшчаліся партызанскія атрады, рэдакцыі газет «Звязда» і «Чырвоная змена», у 1942 г. быў адкрыты першы ў Беларусі партызанскі аэрадром.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне пра ролю в. Зыслаў у барацьбе з акупантамі.

ўсіх абласных цэнтрах, яны падпарадкоўваліся ЦК КП(б)Б. Маладзёжнымі падпольнымі групамі кіраваў ЦК ЛКСМБ. Усяго на акупаванай тэрыторыі Беларусі дзейнічала каля 4 тыс. падпольных арганізацый, у якіх змагалася больш за 70 тыс. патрыётаў.

9. Прычыны і крыніцы перамогі СССР. Вялікая Айчынная вайна скончылася перамогай савецкага народа, поўнай і безумоўнай капітуляцыяй гітлераўскай Германіі.

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне была дасягнута дзякуючы *гераізму* і *патрыятызму савецкага народа*. У гады вайны праявіліся найвялікшая мужнасць воінаў, партызан, удзельнікаў падполля, самаадданасць працаўнікоў тылу. За подзвігі на франтах Вялікай Айчыннай вайны ордэнамі і медалямі былі ўзнагароджаны больш за 7 млн чалавек. Гарады

Правообладатель Издательский центр БГУ

Масква, Ленінград (Санкт-Пецярбург), Сталінград (Валгаград), Кіеў, Мінск, Адэса, Севастопаль, Керч, Новарасійск, Тула, Мурманск, Смаленск за мужнасць, стойкасць і масавы гераізм, праяўленыя іх жыхарамі і абаронцамі, былі ўшанаваны *званнем «горад-герой»*. Брэсцкая крэпасць за выдатную вайсковую доблесць, гераізм і мужнасць яе абаронцаў — *званнем «крэпасць-герой»*.

Дружба народаў СССР

Перамога Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне зрабілася магчымай дзякуючы *дружбе народаў СССР*. Стаўка А. Гітлера на раз'яднанне шматнацыянальнага савецкага народа не апраўдала сябе. На барацьбу за незалежнасць Радзімы ўзняліся ўсе народы Савецкага Саюза. У шэрагах Чырвонай арміі, партызанскіх атрадах і падпольных групах ваявалі прадстаўнікі ўсіх саюзных рэспублік.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Унікальны трыпціх помнікаў «Меч Перамогі» складаецца з серыі манументаў у Магнітагорску, Валгаградзе (Расійская Федэрацыя) і Берліне (Германія).

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, знайдзіце тлумачэнне сюжэтам помнікаў і сувязі паміж імі.*
2. *Знайдзіце інфармацыю пра помнік «Асілак» у г. Свіслач (Рэспубліка Беларусь) (ілюстрацыя справа). Як яго сюжэт звязаны з ідэяй трыпціха «Меч Перамогі»?*

Кіруючая роля Камуністычнай партыі

Крыніцай перамогі СССР з'яўляліся *самаадданасць і мужнасць савецкіх людзей, савецкі дзяржаўны і грамадскі лад, кіруючая роля Камуністычнай партыі*. Жорсткая цэнтралізацыя кіравання і дысцыпліна разам з гераічнай працай савецкіх рабочых, калгаснікаў і служачых абумовілі перавагу савецкага тылу над германскім і дазволілі стварыць матэрыяльную аснову ваенных перамог. Лозунг «Усё для фронту, усё для перамогі!» стаў вызначальным у жыцці савецкага тылу.

10. Крыніцы духоўнай стойкасці савецкага народа. Смяротная пагроза, што навісла над савецкай краінай, паспрыяла згуртаванню народа і нечуванаму росту патрыятычных настрояў. Згуртаванасць і еднасць савецкіх людзей ашаламілі замежных назіральнікаў. Так, Клеменціна Чэрчыль, жонка прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі, пісала ў 1941 г.: *«Мы ўражаны магутнасцю рускага супраціўлення і майстэрствам, з якім яно вядзецца. Мы шчыра захапляемся адвагай, стойкасцю і патрыятычным самаахвяраваннем рускага народа»*.

Зварот да мінуўшчыны народа

Любоў да Радзімы і гатоўнасць даць адпор ворагу фарміраваліся ў грамадзян нашай краіны стагоддзямі. Напярэдадні вайны ў СССР была разгорнута шырокая кампанія па прапагандзе рускай гісторыі. У кіно, літаратуры, мастацтве, у перыядычным друку адметным зрабілася праслаўленне нацыянальных герояў, дзяржаўных і ваенных дзеячаў мінуўшчыны, якія паспрыялі ўмацаванню сваёй краіны, — Аляксандра Неўскага, Дзмітрыя Данскога, Пятра Вялікага, А. В. Суворава, М. І. Кутузава, Ф. Ф. Ушакова.

Ва ўмовах падступнага нападу нацысцкай Германіі на СССР савецкае кіраўніцтва звярнулася да нацыянальных і патрыятычных каштоўнасцей рускага народа. У афіцыйных выступленнях савецкіх кіраўнікоў пачалі часта згадвацца прыклады гераізму з рускай гісторыі, выкарыстоўваліся вобразы вялікіх

Правообладатель Издательский центр БГУ

Заснаваны 29 ліпеня 1942 г. Узнагароджваліся камандзіры, што праявілі ў баях за Радзіму асабістую адвагу, мужнасць, смеласць і ўмелым камандаваннем забяспечылі паспяховыя дзеянні сваіх часцей.




Ордэн Аляксандра Неўскага

гістарычных дзеячаў. Для згуртавання шматнацыянальнага савецкага грамадства вялікую ролю адыграла прапаганда ідэй роўнасці ўсіх нацый і народнасцей, якія аб'ядналіся ў межах СССР у свабодную федэрацыю.

Пераважная большасць савецкіх людзей лічыла значным дасягненнем грамадска-палітычны лад, што склаўся ў краіне і быў замацаваны Канстытуцыяй

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



1943 г.



1943 г.



1944 г.



1944 г.

Разгледзьце афішы кінастужак, знятых у СССР у 1943–1944 гг. Выкажыце здагадку, пра што яны расказвалі гледачу. Якія сучасныя фільмы на тэму Вялікай Айчыннай вайны вы ведаеце? Як у іх паказаны подзвіг савецкага народа?

1936 г. Для іх цалкам відавочнымі былі сацыяльныя дасягненні савецкай улады: бясплатныя адукацыя, медыцынскае абслугоўванне і жыллё (без уліку камунальных плацяжоў), а таксама адсутнасць беспрацоўя, павага да працоўных і іх дасягненняў.

11. Роля Савецкага Саюза ў Вялікай Перамозе. Савецкі Саюз адыграў вырашальную ролю ў разгроме Германіі і яе саюзнікаў.

Размеркаванне сіл Германіі па тэатрах ваенных дзеянняў

На працягу ўсёй вайны 60–75 % сіл і сродкаў гітлераўскай арміі было задзейнічана на савецка-германскім фронце. Да сярэдзіны 1944 г. тут адначасова дзейнічала ад 190 да 270 дывізій праціўніка, у той час як супраць англа-амерыканскіх

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Помнік савецкаму салдату. Скульптар А. Карабцоў, архітэктар К. Фамін

30 чэрвеня 2020 г. у Расійскай Федэрацыі быў адкрыты мемарыяльны комплекс, прысвечаны памяці савецкіх воінаў, што палі ў баях пад Ржэвам у 1942–1943 гг.

У адкрыцці мемарыяла ўзялі ўдзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія падзеі адбываліся падчас Ржэўскай бітвы 5 студзеня 1942 г. — 31 сакавіка 1943 г. Якое яе значэнне ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны?*
2. *Прачытайце верш А. Твардоўскага «Я забіты пад Ржэвам». Як яго змест адлюстраваны ў скульптуры савецкага салдата?*
3. *Як вы лічыце, ці павінна цяперашняе пакаленне — нашчадкі пераможцаў у Вялікай Айчыннай вайне — захоўваць памяць пра гераічныя і трагічныя падзеі вайны? Сваю думку абгрунтуйце.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

войскаў у Паўночнай Афрыцы — ад 9 да 20, у Італіі — ад 7 да 26 дывізій. Нават пасля адкрыцця другога фронту ў Еўропе ў чэрвені 1944 г. колькасць германскіх войскаў на Усходзе ў 2–2,5 раза перавышала сілы гітлераўцаў на заходнееўрапейскім і італьянскім тэатрах ваенных дзеянняў. За гады Вялікай Айчыннай вайны на савецка-германскім фронце было знішчана 607 дывізій вермахта, у баях з савецкімі войскамі Германія страціла 75 % баявой тэхнікі і зброі. Саюзнікі ўзялі ў палон і знішчылі ў Заходняй Еўропе і Паўночнай Афрыцы ўсяго 176 дывізій праціўніка.

Напруга і размах баявых дзеянняў

Савецка-германскі фронт адрозніваўся ад іншых напругай і размахам баявых дзеянняў. Калі працягласць франтоў у Італіі і Паўночнай Афрыцы складала 300–350 км, у Заходняй Еўропе — 800 км, дык працягласць савецка-германскага фронту на розных этапах вайны складала ад 3000 да 6200 км.

Не адыграў значнай ролі наступ ваенна-паветраных сіл ЗША і Вялікабрытаніі пасля адкрыцця другога фронту на поўначы Францыі. Асноўнымі аб’ектамі бамбардзіровак англа-амерыканскай авіяцыі былі фашысцкія марскія і авіябазы, аэрадромы ў Заходняй Еўропе. Аднак танка- і самалётабудаўнічыя заводы Германіі бамбардзіраваліся нязначна. Многія ваенныя заводы Рура, якія былі звязаныя з англа-амерыканскімі манаполіямі, увогуле не бамбардзіравалі.

Самыя вялікія чалавечыя страты ў барацьбе супраць нацыстаў зазнаў Савецкі Саюз — каля 27 млн чалавек.

Роля саюзнікаў у разгроме мілітарысцкай Японіі

ЗША не адыгралі вырашальнай ролі і ў разгроме мілітарысцкай Японіі. Кіраўніцтва Японіі і пасля прымянення ЗША атамных бомбаў мела намер працягваць вайну. Толькі 9 жніўня 1945 г. прэм’ер-міністр Японіі Кантара Судзукі заявіў: «Уступленне ў вайну СССР ставіць нас канчаткова ў бязвыхаднае



„Будучыя пакаленні прызнаюць, што яны абавязаныя Чырвонай арміі, гэтаксама безумоўна, як гэта робім мы, якія дажылі да таго, каб быць сведкамі гэтых выдатных перамог“.
1945 г.

У. Чэрчыль, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі (1940–1945 гг., 1951–1955 гг.)

„Свет не бачыў большай адданасці справе, большай рашучасці і самаадданасці, чым тыя, што былі праяўлены рускім народам і яго арміяй... Ратуючы сябе, Расія разлічвае ўратаваць свет ад нацызму. Мы павінны быць удзячныя гэтай краіне“.
1943 г.



Ф. Рузвельт, прэзідэнт ЗША (1933–1945 гг.)

Як вы лічыце, чаму сёння краіны Захаду «забыліся» пра ролю СССР у Перамозе над нацызмам?

становішча і робіць немагчымым далейшы працяг вайны». Японія прыняла безумоўную капітуляцыю пасля таго, як Чырвоная армія разграміла Квантунскую армію — галоўную апору мілітарыстаў Японіі.

Такім чынам, менавіта Савецкі Саюз і савецкі народ вынеслі на сабе асноўны цяжар вайны, адыгралі вырашальную ролю ў разгроме нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў. Увесь свет прызнаў, што савецкі народ, Савецкі Саюз — галоўная сіла, якая перамагла нацызм.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Напад нацысцкай Германіі і яе сатэлітаў на СССР паставіў пад пытанне далейшае існаванне народаў Савецкага Саюза, у тым ліку і беларускага. Вялікая Айчынная вайна была для Савецкага Саюза вызваленчай, накіраванай на захаванне тэрыторыі, савецкай дзяржаўнасці, народаў і народнасцей, якія насялялі шматнацыянальны СССР. Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг. была дасягнута дзякуючы надзвычайнай стойкасці, гераізму, мужнасці і самаадданасці савецкіх людзей.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
14 чэрвеня 1940 г. — сталіца Францыі — горад Парыж — без бою здадзена нямецкім войскам	3–26 ліпеня 1941 г. — абарона Магілёва. Горад быў узяты германскімі войскамі пасля 23 дзён упартых баёў

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У якіх дакументах былі вызначаныя мэты Германіі ў дачыненні да СССР і БССР? Што сведчыць пра злачынны характар гэтых дакументаў?
2. Якім быў характар Вялікай Айчыннай вайны для савецкіх людзей?
3. З дапамогай статыстычных звестак дакажыце, што савецка-германскі фронт быў асноўным фронтам Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.
4. Чаму партызанскі рух і падпольная барацьба з'яўляюцца найважнейшымі фактарамі Перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне?
5. Складзіце ментальную карту (лагічную схему) па тэме «Дапамога савецкіх грамадзян фронту». Адлюструйце ў ёй усе аспекты падтрымкі, якую аказвалі фронту савецкія людзі.
6. Якія аргументы вы можаце прывесці для абгрунтавання вызначальнай ролі СССР у перамозе над нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі?
7. Складзіце тэзісны план адказу на пытанне «Прычыны Перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне».
8. Напішыце эсэ на тэму «Захаванне гістарычнай памяці пра Вялікую Айчынную вайну — абавязак цяперашніх пакаленняў».


§ 30. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыя БССР

ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА
«НОВЫ ПАРАДАК»
ПЛАН «ОСТ» ГЕНАЦЫД ГЕТА
ХАЛАКОСТ ОСТАРБАЙТАРЫ
ЛАГЕРЫ СМЕРЦІ
КАРНЫЯ АПЕРАЦЫІ
КАЛАБАРАЦЫЯНІЗМ

1. Абарончыя баі на тэрыторыі БССР і іх значэнне. Вялікая Айчынная вайна была надзвычай цяжкім выпрабаваннем для беларускага народа. Улетку 1941 г. на тэрыторыі Беларусі наступала самая магутная група нямецкіх армій — «Цэнтр». Асноўнымі яе задачамі з'яўляліся разгром часцей Чырвонай арміі на тэрыторыі БССР і стварэнне ўмоў для наступу на Маскву. Групе армій «Цэнтр» супрацьстаялі войскі Заходняй Асобай ваеннай акругі (ад 22 чэрвеня 1941 г. — Заходняга фронту), камандуючы — генерал арміі Д. Г. Паўлаў.

Першымі на дзяржаўнай мяжы СССР прынялі ўдар вермахта памежнікі. Яны мужна баранілі даверaныя ім участкі дзяржаўнай мяжы. Баі працягваліся ад некалькіх гадзін да некалькіх сутак.

Ад **22 чэрвеня** да **канца ліпеня 1941 г.** стойка змагаўся гарнізон Брэсцкай крэпасці. Пра стойкасць воінаў сведчаць надпісы на сценах крэпасці: «Памром, але з крэпасці не сыдзем», «Я паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!».



Надпіс на сцяне аднаго з казематаў Брэсцкай крэпасці

Правообладатель Издательский центр БГУ

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

ІХ ІМЁНЫ НОСЯЦЬ ПАМЕЖНЫЯ ЗАСТАВЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



В. М. Усаў
(1916–1941)
Герой Савецкага Саюза. Начальнік 3-й памежнай заставы Аўгустоўскага памежнага атрада



А. М. Сівачоў
(1918–1941)
Начальнік 1-й памежнай заставы Аўгустоўскага памежнага атрада



Ф. П. Кірычэнка
(1908–1941)
Начальнік 4-й памежнай заставы Аўгустоўскага памежнага атрада



А. М. Кіжаватаў
(1907–1941)
Герой Савецкага Саюза. Начальнік 9-й памежнай заставы Брэсцкага памежнага атрада

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія подзвігі здзейснілі героі-памежнікі ўлетку 1941 г. Якія памежныя заставы Рэспублікі Беларусь носяць імёны герояў-памежнікаў? Дзе яны размешчаны?*
2. *Якія каштоўнасці памежнікаў — герояў Вялікай Айчыннай вайны знайшлі працяг у традыцыях і каштоўнасцях сучасных беларускіх памежнікаў?*

Абарончыя баі на тэрыторыі БССР

Аднак войскі Заходняга фронту не здолелі затрымаць праціўніка ў прыгранічнай паласе. Да канца 25 чэрвеня танкавыя злучэнні групы армій «Цэнтр» прасунуліся ўглыб БССР да 200 кіламетраў. **28 чэрвеня 1941 г.** быў узяты Мінск.

Актыўны адпор праціўніку пад Мінскам давала 100-я дывізія пад камандаваннем генерал-маёра І. М. Русіянава. Ва ўмовах адсутнасці супрацьтанкавых гармат упершыню ў барацьбе супраць варожых



Мемарыяльны комплекс «Загінулым, але не пераможаным воінам-памежнікам Беларускай памежнай акругі» адкрыты ў г. Гродна. Цэнтральная кампазіцыя мемарыяла — «Мяжа ў агні». 15 памежных слупоў сімвалізуюць удзел у абароне мяжы байцоў з усіх саюзных рэспублік

танкаў былі выкарыстаныя бутэлькі з гаручай сумессю. Але пасля трох сутак жорсткага бою дывізія мусіла пакінуць пазіцыі.

У ліпені — жніўні 1941 г. ішлі цяжкія абарончыя баі ў раёне Бабруйска, Барысава, Сянно, Лепеля, Оршы, Гомеля, Магілёва. **6 ліпеня 1941 г.** адбылася адна з найбуйнейшых танкавых бітваў пачатку Вялікай Айчыннай вайны — «Лепельскі контрудар». З абодвух бакоў удзельнічала каля 1600 танкаў. Гітлераўскія войскі панеслі значныя страты, быў запаволены тэмп іх прасоўвання на ўсход. Толькі 11 ліпеня 1941 г. немцы здолелі захапіць Віцебск.


Ад **3** да **26 ліпеня 1941 г.** працягвалася абарона Магілёва. Напружаныя баі тут вяла 172-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М. Ц. Раманава. У раёне в. Буйнічы германскія войскі сустрэлі эфектыўную агнявую абарону савецкіх артылерыстаў, танкістаў і пехацінцаў, а таксама мінныя палі. Абарона Магілёва адыграла важную ролю ў запаволенні тэмпаў наступу вермахта і спрыяла зрыву германскага плана «маланкавай вайны».

Баі пад Оршай сталі вядомыя дзякуючы не толькі стойкасці байцоў Чырвонай арміі, але і магутнаму ўдару батарэі рэактыўнай артылерыі

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ўлетку 1941 г.



1. *З дапамогай гістарычнай картасхемы і тэксту вучэбнага дапаможніка складзіце храналагічную табліцу «Абарончыя баі на тэрыторыі БССР улетку 1941 г.».*
2. *Успомніце, што такое «бліцкрыг». Дакажыце, што падчас баёў на тэрыторыі БССР гэты план нацысцкай Германіі пацярпеў крах.*



„Я не быў салдатам, быў усяго толькі карэспандэнтам, аднак я маю кавалачак зямлі, які мне век не забыць, — поле пад Магілёвам, дзе я ўпершыню ў ліпені 1941 года бачыў, як нашы на працягу аднаго дня падбілі і спалілі 39 нямецкіх танкаў...“.

К. Сіманаў, франтавы карэспандэнт, савецкі пісьменнік

(«Кацюша»), якая ўпершыню была выкарыстана падчас абстрэлу варожых эшалонаў на чыгуначным вузле горада **14 ліпеня 1941 г.**

У ліпені — жніўні 1941 г. на р. Дняпро ў раёне Рагачова і Жлобіна германскія войскі былі вымушаны на працягу тыдня весці абарончыя баі.

Нягледзячы на гераізм, самаадданасць і велізарныя ахвяры, што зазнала Чырвоная армія ў абарончых баях на тэрыторыі БССР, стрымаць напор ворага не атрымалася. Да канца лета 1941 г. уся тэрыторыя БССР была акупаваная германскімі войскамі.

Значэнне абарончых баёў на тэрыторыі БССР

Тым не менш сваім упартым супраціўленнем на тэрыторыі Беларусі Чырвоная армія нанесла адчувальную шкоду галоўнай групоўцы вермахта — групе армій «Цэнтр» — і запаволіла тэмпы яе наступу на Маскву. Нямецкі бліцкрыг улетку 1941 г. пацярпеў крах.



Дзмітрый Карбышаў (1880–1945). Генерал-лейтэнант інжынерных войскаў. Трапіў у палон у жніўні 1941 г. пад Магілёвам. Адмовіўся супрацоўнічаць з немцамі. Пакараны смерцю ў канцлагеры Маўтхаўзен 18 лютага 1945 г.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, як загінуў Д. Карбышаў.*
2. *Як вы лічыце, чаму савецкія людзі нават пад страхам смерці адмаўляліся супрацоўнічаць з ворагам?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі. Генацыд беларускага народа. Для рэалізацыі сваёй захопніцкай палітыкі нацысты падзялілі акупаваную тэрыторыю БССР на 5 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

Успомніце, што такое акупацыя.

Палітыка генацыду

На акупаванай тэрыторыі Беларусі нацысты праводзілі мэтанакіраваную палітыку *генацыду беларускага народа*. Яна прадугледжвала поўнае або часткавае знішчэнне груп насельніцтва па расавых, нацыянальных, этнічных, палітычных або рэлігійных прыкметах. Вынікам гэтай палітыкі на тэрыторыі Беларусі было знішчэнне больш чым 3 млн чалавек.

Успомніце, якія планы нацысцкая Германія будавала адносна беларусаў. Якімі дакументамі яны рэгламентаваліся?

Нацысты стварылі сістэму месцаў прымусовага ўтрымання і вынішчэння грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных — *лагераў смерці*. Усяго на акупаванай ворагам тэрыторыі Беларусі было больш за 580 лагераў смерці. Паводле далёка не поўных звестак, у лагерах смерці на тэрыторыі нашай краіны нацысты знішчылі звыш 1,4 млн чалавек.

Адным з найбуйнейшых лагераў смерці ў Еўропе і па тэрыторыі, і па колькасці забітых быў Трасцянец пад Мінскам, дзе было знішчана не менш за 546 тыс. чалавек.

Трагічны лёс напаткаў яўрэяў. Знішчэнне нацыстамі ў гады Другой сусветнай вайны яўрэйскага насельніцтва Еўропы атрымала назву *халакост*. Яўрэйскае насельніцтва прымусова зганялі ў спецыяльныя месцы зняволення — *гета*. Гета на тэрыторыі Беларусі пачалі ствараць адразу пасля ўварвання Германіі. У Беларусі было больш за 170 гета. Найбольш вялікія — у Мінску, Гродне, Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Пінску, Слоніме, Гомелі. За час вайны ў гета было знішчана звыш 600 тыс. беларускіх яўрэяў.




Яўрэі Магілёўскага гета з нагруднымі нашыўкамі ў выглядзе зоркі Давіда

Карныя аперацыі

Сродкам рэалізацыі палітыкі генацыду былі *карныя аперацыі*. Яны пераследавалі тры асноўныя задачы: вырашэнне «партызанскага пытання»

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ



МІНСК — Сталіцы саюзных рэспублік СССР

БРЭСТ — Цэнтры абласцей СССР

Орша — Іншыя населеныя пункты

ГРАНІЦЫ

дзяржаў да 1941 г.

саюзных рэспублік СССР

сучаснай Рэспублікі Беларусь

Межы адміністрацыйных адзінак, створаных акупантамі

рэйхскамісарыятаў

генеральных акруг і ахоўных дывізій вермахта

Штабы ахоўных дывізій і 59-га армейскага корпуса

Палявыя камендатуры вермахта

Ваенна-адміністрацыйны падзел акупаванай тэрыторыі БССР. 1942 г.

Выявіце, у склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак акупанты ўключылі тэрыторыю БССР.

(акружэнне і знішчэнне партызан, адцясненне іх ад камунікацый, «зразанне» партызанскіх зон і г. д.); рэквізіцыі і захоп сельскагаспадарчай прадукцыі, харчоў і жывёлы; захоп у палон мірнага насельніцтва для наступнай адпраўкі на прымусовыя работы ў Германію і краіны Заходняй Еўропы.

Усяго на тэрыторыі Беларусі нацысты правялі 187 карных аперацый. Іх вынікам было больш за

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Карныя аперацыі нацысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі

Назва аперацыі	Тэрыторыя	Дата правядзення
«Балотная ліхаманка»	Брэсцкая, Віцебская, Мінская вобл.	25 жніўня — 20 верасня 1942 г.
«Свята ўраджаю»	Грэскі, Капыльскі, Пухавіцкі, Слуцкі, Уздзенскі раёны	Студзень — люты 1943 г.
«Шаравая маланка»	Суражская партызанская зона	14 лютага — 19 сакавіка 1943 г.
«Зімовае чарадзейства»	Дрысенскі, Асвейскі, Полацкі, Расонскі раёны	14 лютага — 20 сакавіка 1943 г.
«Русалка»	Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Любанскі, Старобінскі, Капаткевіцкі раёны	24 лютага — 1 сакавіка 1943 г.
«Дырлевангер»	Лагойскі, Смалявіцкі раёны	Сакавік 1943 г.
«Майская навальніца»	Віцебскі, Гарадоцкі, Лёзненскі, Суражскі раёны	17–22 мая 1943 г.
«Паляванне на зайцоў»	Бялыніцкі, Круглянскі, Шклоўскі раёны	14–15 кастрычніка 1943 г.
«Асвячэнне храма»	Васілевіцкі, Калінкавіцкі, Хойніцкі раёны	20–21 кастрычніка 1943 г.
«Вясенняе свята»	Докшыцкі, Лепельскі, Полацкі, Ушацкі раёны	17 красавіка — 5 мая 1944 г.
«Шпацыр на Тройцу»	Бягомльскі, Барысаўскі, Плешчаніцкі раёны	22 красавіка — 12 мая 1944 г.

1. *Вывучыце табліцу «Карныя аперацыі нацысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі». Знайдзіце згаданыя раёны правядзення аперацый на карце Беларусі. Як вы лічыце, чаму нацысцкія злачынцы давалі карным аперацыям такія назвы?*
2. *У вучэбным дапаможніку «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» для 10–11 класаў знайдзіце інфармацыю пра карныя аперацыі нацыстаў, іх мэты і вынікі.*

12 тыс. спаленых і разбураных сельскіх населеных пунктаў. Сімвалам генацыду беларускага народа зрабілася вёска Хатынь, жыхары якой 22 сакавіка 1943 г. былі жыўцом спалены нацыстамі і ўкраінскімі калабарацыяністамі.

5 студзеня 2022 г. прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа», якім



Скульптура «Няскораны чалавек» у в. Хатынь

прадугледжана юрыдычнае прызнанне генацыду беларускага народа і ўсталяваная крымінальная адказнасць за яго адмаўленне. Згодна з Законам пад генацыдам беларускага народа разумеюць здзейсненыя нацысцкімі злачынцамі і нацыяналістычнымі фарміраваннямі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд злачынствы, накіраваныя на планамернае знішчэнне беларускага народа шляхам забойства і іншых дзеянняў, якія прызнаюцца генацыдам у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі і нормамі міжнароднага права.

У 2022 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзень **22 чэрвеня** абвешчаны Днём усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь у красавіку 2021 г. распачала крымінальную справу па факце генацыду насельніцтва Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд.

Мэты расследавання крымінальнай справы:

- збор доказаў, што пацвярджаюць сапраўдны маштаб трагедыі, якую перажыў беларускі народ у гады акупацыі;
- устанаўленне ўсіх фактаў злачынных дзеянняў карнікаў на тэрыторыі БССР;
- прыцягненне да адказнасці нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых, што пазбеглі пакарання;
- захаванне гістарычнай памяці, кансалідацыя беларускага грамадства, выхаванне яго ў духу патрыятызму і любові да Радзімы, забеспячэнне ідэалагічнай пераемнасці пакаленняў.

З ініцыятывы Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь у маі 2021 г. прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму», накіраваны на недапушчэнне ўсіх формаў і праяў нацызму, апраўдання яго дактрыны і практыкі, гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых.

1. *У чым заключаецца значнасць расследавання крымінальнай справы, распачатай Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь у 2021 г., для сучасных беларусаў?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады, якія паказваюць ролю Беларусі ў недапушчэнні рэабілітацыі нацызму.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

3. Эканамічная эксплуатацыя акупаваных тэрыторый. Эканамічная палітыка акупантаў будавалася на аснове «Дырэктывы па кіраванні эканомікай у акупаваных усходніх абласцях» і была накіраваная на эканамічнае рабаўніцтва і каланізацыю захопленых тэрыторый.

Усё насельніцтва акупаваных тэрыторый ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў у абавязковым парадку прыцягвалі да *прымусовых работ* па будаўніцтве абарончых аб'ектаў, мастоў, дарог. На фабрыках і заводах рабочыя працавалі ў прымусовым парадку праз сістэму абавязковай рэгістрацыі на біржах працы.

Беларуская вёска была абкладзена высокімі натуральнымі і грашовымі падаткамі, абавязковымі пастаўкамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Уся зямля, інвентар і жывёла былі абвешчаныя ўласнасцю германскай дзяржавы.

Эканамічная палітыка акупантаў прадугледжвала вываз з БССР максімальнай колькасці харчоў і сыравіны. Ужо з 1942 г. акупацыйныя ўлады пачалі шырока выкарыстоўваць савецкіх ваеннапалонных у якасці рабочай сілы і *адпраўляць насельніцтва* акупаваных тэрыторый, перш за ўсё моладзь, *на прымусовыя работы ў Германію*.



Рабочая каманда са Шталага-352 адпраўляецца на будаўніцтва дарогі. В. Масюкоўшчына (цяпер г. Мінск)

У фашысцкае рабства было сагнана больш за 380 тыс. чалавек, сярод якіх шмат хто загінуў у выніку невыносных умоў працы, нягод і катаванняў.

Разам з эксплуатацыяй мясцовага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных акупанты вывозілі з тэрыторыі Беларусі прамысловае абсталяванне і сыравіну. Рэквізаваліся або знішчаліся таксама і культурныя каштоўнасці рэспублікі.



Будынак Акадэміі навук БССР у гады вайны



К. Гораў, прэзідэнт Акадэміі навук Беларускай ССР

„З прыходам у Мінск нямецкіх захопнікаў кнігасховішча з замежнай літаратурай і яўрэйскай было занятае пад склад, а кнігі выкінутыя пад лесвіцу, засыпаныя смеццем і залітыя вадой. У далейшым разгром зазнала і астатняя частка бібліятэкі... З мікраскопаў былі павыкручваны акуляры і аб'ектывы. Лабараторыі былі ператвораны ў прыбіральні. Быў выкінуты на вуліцу архіў Акадэміі навук і спалены... Уцякаючы з Мінска, гітлераўцы спалілі лабараторны корпус Акадэміі, галоўны корпус, лабараторны будынак батанічнага саду і 30-кватэрны дом“.

Выканаўцы палітыкі генацыду

Успомніце, што такое калабарацыянізм.

4. Калабарацыянізм: прычыны, формы. У рэалізацыі палітыкі генацыду на акупаванай тэрыторыі БССР удзельнічалі нацысцкія акупацыйныя органы (часці і фарміраванні СС і СД, ахоўныя часці вермахта, Тайная палявая паліцыя, ваенная жандармерыя, органы абвера — нямецкай разведкі і контрразведкі), а таксама створаныя гітлераўцамі нацыяналістычныя фарміраванні — беларускія, літоўскія, латышскія, польскія, украінскія, прадстаўнікі якіх займалі антысавецкія пазіцыі, падзялялі ідэалогію Трэцяга рэйха.

Першапачаткова нацысцкае кіраўніцтва не надавала супрацоўніцтву з мясцовым насельніцтвам вялікага значэння. Аднак немагчымасць атрымаць перамогу над СССР у ходзе «маланкавай вайны»,

Правообладатель Издательский центр БГУ

недахоп уласных сіл для вядзення баявых дзеянняў і барацьбы з партызанскім рухам, падтрымання дысцыпліны на акупаваных тэрыторыях паставілі на парадак дня пытанне аб выкарыстанні вайсковых фарміраванняў з мясцовага насельніцтва.

Акупацыйныя ўлады разлічвалі на падтрымку сваёй палітыкі з боку пэўнай часткі беларускага насельніцтва — перш за ўсё тых, хто быў незадаволены або пакрыўджаны савецкай уладай. З ліку такіх людзей стваралі паліцэйскія атрады, нацысцкія арганізацыі: «Беларуская народная самапомач», «Саюз беларускай моладзі» і іншыя, а таксама «дарадчыя органы кіравання» — «Беларускую раду даверу пры генеральным камісарыяце „Беларусь“» (ад 21 снежня 1943 г. — «Беларуская цэнтральная рада»).

Актыўную палітыку прыцягнення да супрацоўніцтва беларускага насельніцтва праводзіў у генеральнай акрузе «Беларусь» гаўляйтар В. Кубэ. Апору сваім намерам ён знайшоў у беларускіх нацыяналістах, якія намагаліся выкарыстаць супрацоўніцтва з акупантамі для дасягнення сваёй мэты — прыходу да ўлады і стварэння «беларускай дзяржаўнасці» на аснове фашысцкай ідэалогіі.

Сімволіка калабарацыяністаў

У асяродку добраахвотных памочнікаў нацысцкага рэжыму, у тым ліку ўзброеных фарміраванняў, што ўдзельнічалі ў карных аперацыях, пачалі выкарыстоўваць для абазначэння беларускай нацыянальнай прыналежнасці бела-чырвона-белую сімволіку, выявы «Пагоні».

Бела-чырвона-белы сцяг вывешвалі на мерапрыемствах з удзелам германскіх акупацыйных улад, а таксама на будынках, у якіх размяшчаліся калабарацыянісцкія структуры; ён выкарыстоўваўся практычна ўсімі памагатымі нямецкіх захопнікаў на акупаванай тэрыторыі БССР: паліцыяй, Беларускім корпусам самаабароны, Беларускай краёвай абаронай, Беларускай цэнтральнай радай і інш.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Прафесар Гарвардскага ўніверсітэта А. Далін у 1957 г. выдаў кнігу «Захопленыя тэрыторыі СССР пад кантролем нацыстаў». Паводле яго ацэнкі, у савецкай Беларусі антыкамуністычныя настроі прысутнічалі ў сялянскім асяродку і тонкай праслойцы беларускай інтэлігенцыі. Але нават сярод гэтай часткі беларускіх нацыяналістаў жаданне супрацоўнічаць з немцамі пачало знікаць, як толькі яны пачалі разумець, што нацысты ніколі не мелі мэты стварэння незалежнай Беларусі. А палітыка масавага тэрору ўвогуле прымусіла насельніцтва акупаваных тэрыторый адмовіцца ад супрацоўніцтва з нямецкімі ўладамі. Сепаратызм у Беларусі ў параўнанні з іншымі акупаванымі савецкімі рэспублікамі, асабліва з Украінай, аказаўся значна слабейшы. У выніку масавага калабарацыянізму, на які спадзяваўся Трэці рэйх, у Беларусі не здарылася.

«…некаторая частка жыхароў Беларусі аказалася ўцягнутая ў шэрагі палітычнай калабарацыі. Гэта былі людзі, якія адназначна не прымалі савецкую ўладу і свядома супрацоўнічалі з нямецкімі ўладамі, частка аказалася ўцягнутая ў супрацоўніцтва з акупантамі з прычыны маладушнасці або несвядомасці. У гэтых шэрагах знаходзіліся і асацыяльныя элементы, людзі з крымінальным мінулым, зацікаўленыя ў гвалце і атрыманні матэрыяльных даброт. Былі і тыя, хто з карыслівых мэт імкнуўся, абапіраючыся на германскія ўлады, захаваць свой уплыў і рычагі кіравання ў структуры акупацыйнага рэжыму, каб уладарыць над людзьмі. Аднак на месцах германскія акупацыйныя органы не мелі ні грамадскай падтрымкі, ні адабрэння насельніцтва. Абсалютная большасць беларускага народа ўспрымала акупацыйную ўладу як чужую, як уладу гвалту, рабаўніцтва і тэрору» (Каваленя А. А., Даніловіч В. В. і інш. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці, 2019 г. Т. 4. С. 252).

1. *Параўнайце дзве думкі вучоных наконт калабарацыянізму ў Беларусі. Што ў іх агульнага і чым яны адрозніваюцца?*
2. *Як бы вы адказалі на пытанне: чаму калабарацыянізм на акупаванай тэрыторыі Беларусі не зрабіўся масавым?*

Беларускія калабарацыяністы, паліцэйскія, якія выконвалі злачынныя загады германскіх улад, насілі на левым рукаве ўніформы бела-чырвона-белыя павязкі або шэўроны-нашыўкі ў выглядзе бела-чырвона-белага сцяжка, на галаўных уборах — бела-чырвона-белы аколышак і кукарду з «Пагоняй».

Правообладатель Издательский центр БГУ

Спробы стварыць так званыя «органы самакіравання» не спыняліся на працягу ўсяго перыяду акупацыі. На месцах прызначалі бургамістраў, старастаў, іх памочнікаў, стваралі аддзелы з узброеных паліцэйскіх, якіх прыцягвалі да карных аперацый. Аднак усе намаганні акупантаў і іх прыспешнікаў не мелі таго эфекту, на які яны разлічвалі. Калабарацыянізм у Беларусі не мог адыграць істотнай ролі, якая б паспрыяла ўмацаванню пазіцый акупацыйных улад, задушэнню партызанскага руху або забеспячэнню перавагі вермахта ў баях з Чырвонай арміяй.

У гады Вялікай Айчыннай вайны нацысты і іх памагатыя на тэрыторыі Беларусі праводзілі паслядоўную чалавеканенавісніцкую палітыку — генацыд беларускага народа. Злачынствы нацыстаў і іх памагатых не маюць тэрміну даўніны. Рэспубліка Беларусь праводзіць мэтанакіраваную палітыку па захаванні гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне.

калі ў свеце…

28 лістапада — 1 снежня 1943 г. — Тэгеранская канферэнцыя

на тэрыторыі Беларусі…

22 верасня 1943 г. — мінскія падпольшчыкі выканалі смяротны прысуд кіраўніку акупацыйнай адміністрацыі, ката савецкага народа гаўляйтару В. Кубэ

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якое стратэгічнае значэнне мелі абарончыя баі на тэрыторыі БССР улетку 1941 г.?
2. У чым праяўлялася палітыка генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны? Канкрэтызуйце свой адказ фактамі.
3. Якія былі мэты эканамічнай палітыкі акупантаў?
4. Выказванне «Мэта апраўдвае сродкі» адны прыпісваюць езуітам, іншыя — італьянскаму мысляру Н. Мак'явелі. Паразважайце, ці можна пагадзіцца з гэтым меркаваннем на прыкладзе дзейнасці беларускіх нацыяналістаў на акупаванай нацыстамі тэрыторыі Беларусі.
5. Чаму важна захоўваць гістарычную памяць аб подзвігу і трагедыі беларускага народа ўгады Вялікай Айчыннай вайны?

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 31. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Барацьба супраць акупантаў

ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА
ПАРТЫЗАНСКІ РУХ
ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА
«РЭЙКАВАЯ ВАЙНА»
ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗОНА
ПАРТЫЗАНСКІ РЭЙД
«ВІЦЕБСКІЯ ВАРОТЫ»
АПЕРАЦЫЯ «БАГРАЦІЁН»


Арганізацыя ўсенароднай барацьбы

1. Масавая барацьба супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Партызанскі рух і падпольная барацьба на тэрыторыі Беларусі. Беларускі народ ад першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўзняўся на барацьбу з захопнікамі. У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, барацьба супраць акупантаў у БССР насіла агульнанародны характар. Яе арганізатарам была Камуністычная партыя. Для нелегальнай працы ў Беларусі ўлетку 1941 г. было пакінута 9 тыс. камуністаў і больш за 5 тыс. камсамольцаў. У час акупацыі на тэрыторыі нашай краіны дзейнічалі падпольныя партыйныя і камсамольскія органы (райкамы, абкамы).

Асноўнымі формамі барацьбы беларускага народа супраць акупантаў былі *партызанскі рух, падпольная барацьба*, а таксама зрыў мірным насельніцтвам, якое не ўваходзіла ў склад партызанскіх фарміраванняў і падпольных груп, эканамічных, палітычных і ваенных планаў акупантаў.

Паводле свайго складу шэрагі партызан былі шматнацыянальныя (беларусы, рускія, украінцы,

УДЗЕЛЬНІКІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ Ў БЕЛАРУСІ



Прааналізуйце звесткі з дыяграм. Дакажыце, што барацьба супраць акупантаў у Беларусі была ўсенародная.

Партызанскі рух

Успомніце:
- прозвішчы кіраўнікоў першых партызанскіх атрадаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі;
- калі быў створаны ЦШПР і хто ім кіраваў.

прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей СССР) і рознаўзроставыя.

Арганізатарамі партызанскага руху выступалі камуністы, беспартыйныя актывісты, ваеннаслужачыя і камандзіры Чырвонай арміі. Сярод вядомых кіраўнікоў партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі — П. М. Машэраў, А. С. Азончык, У. Е. Лабанок, К. П. Арлоўскі, Ф. Ф. Дубровскі, Ф. Р. Маркаў, В. І. Казлоў, В. І. Лівенцаў і інш.

Для кіравання партызанскім рухам на тэрыторыі Беларусі ў верасні 1942 г. быў створаны *Беларускі штаб партызанскага руху* (БШПР) пад кіраўніцтвам П. З. Калініна.

У разгортванні партызанскай барацьбы важнае значэнне мелі *«Віцебскія (Суражскія) вароты»* — 40-кіламетровы разрыў у лініі фронту на стыку нямецкіх армій «Поўнач» і «Цэнтр», які ўтварыўся ў выніку контрнаступу Чырвонай арміі ў снежні 1941 г. пад Масквой. Праз «Суражскія вароты»

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў 1942 г. на тэрыторыю БССР, акупаваную ворагам, накіроўвалі зброю, медыкаменты, з акупаванай тэрыторыі выводзілі мірнае насельніцтва.

Дыверсійная дзейнасць партызан

Адным з галоўных кірункаў дзейнасці беларускіх партызан была *дыверсійная дзейнасць на чыгунках і шашэйных дарогах, чыгуначных вузлах*. Гэта было невыпадкова. Па тэрыторыі Беларусі праходзілі важныя чыгуначныя і шашэйныя магістралі, што звязвалі тыл Германіі з фронтам. Тут размяшчаліся найбуйнейшыя чыгуначныя вузлы, праз якія забяспечваліся войскі не толькі групы армій «Цэнтр», але часткова і груп армій «Поўнач» і «Поўдзень».

З якімі падзеямі на савецка-германскім фронце былі звязаныя тры этапы «рэйкавай вайны»?

У 1943–1944 гг. з удзелам партызан была праведзена аперацыя па адначасовым масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый ворага, вядомая пад назвай *«рэйкавая вайна»*. Яна праводзілася ў тры этапы: першы — у жніўні — верасні 1943 г.; другі (кодавая назва «Канцэрт») — ад сярэдзіны верасня да пачатку лістапада 1943 г.; трэці пачаўся ў ноч на 20 чэрвеня 1944 г. і цягнуўся да поўнага вызвалення Беларусі.

Народныя мсціўцы мэтанакіравана нападалі на гарнізоны праціўніка. Павелічэнне партызанскіх сіл дазваляла ім не толькі ажыццяўляць аперацыі па вызваленні раённых цэнтраў, але і ўтрымліваць іх і навакольныя населеныя пункты пад сваім кантролем. Першым раённым цэнтрам Беларусі, вызваленым у студзені 1942 г. партызанамі, былі Капаткевічы.

Партызанскія зоны

Напрыканцы 1943 г. беларускія партызаны кантралявалі каля 60 % акупаванай тэрыторыі рэспублікі, значная частка якой была цалкам вызвалена ад захопнікаў. На тэрыторыі Беларусі існавала больш за 20 *партызанскіх зон*, сярод іх — Клічаўская, Полацка-Лепельская, Барысаўска-Бягомльская і інш. Тут дзейнічалі абласныя і раённыя камітэты партыі і камсамола, райвыканкамы. У населеных пунктах

аднаўлялі работу сельскія саветы, школы, працавалі невялікія прадпрыемствы і майстэрні, былі пабудаваныя аэрадромы для дастаўкі зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў, адпраўкі параненых і хворых у савецкі тыл. Тут выдавалася каля 170 падпольных газет, працавала 168 радыёстанцый.

Партызанскія рэйды

У мэтах пашырэння партызанскага руху, дэзарганізацыі дзейнасці акупацыйных улад, збору разведвальнай інфармацыі партызаны праводзілі *рэйды* па тылах праціўніка. Адным з першых быў санны рэйд у сакавіку 1942 г., у ім удзельнічала звыш 400 партызан Мінскай, Пінскай і Палескай абласцей.

Адным з найважнейшых кірункаў дзейнасці патрыётаў з'яўлялася агітацыйна-прапагандысцкая работа з мясцовым насельніцтвам. Партызаны праводзілі гутаркі, сходы, мітынгі, выдавалі і распаўсюджвалі падпольныя газеты, улёткі, якія змяшчалі заклікі да барацьбы з захопнікамі.

Дзейнасць партызан падтрымлівала большасць жыхароў Беларусі. Насельніцтва дапамагала партызанам прадуктамі, адзеннем, зборам і рамонтам зброі. Многія жыхары разам з партызанамі ўдзельнічалі ў баявых і дыверсійных аперацыях.

Асноўныя кірункі партызанскай барацьбы

- Партызанская разведка
- Дыверсіі на ваенных аб'ектах
- Разбурэнне камунікацый праціўніка (дарогі, масты, лініі сувязі)
- Сумесныя баявыя аперацыі з Чырвонай арміяй
- Стварэнне партызанскіх зон
- Агітацыйна-прапагандысцкая работа з мірным насельніцтвам
- Знішчэнне варожых гарнізонаў
- Партызанскія рэйды

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, матэрыялы кнігі «Памяць», даведайцеся пра дзеянні партызан на тэрыторыі вашага раёна, вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Асноўныя кірункі падпольнай барацьбы


- Агітацыйна-прапагандысцкая работа сярод насельніцтва
- Дыверсійна-баявая дзейнасць, арганізацыя масавага сабатажу
- Знішчэнне акупантаў

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, матэрыялы кнігі «Памяць», даведайцеся пра дзейнасць падпольшчыкаў на тэрыторыі вашага раёна, вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Антыфашысцкае падполле

У 1942–1943 гг. на акупаванай тэрыторыі Беларусі была створана разгалінаваная сетка падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый. Яны дзейнічалі ў Мінску, Гомелі, Бабруйску, Магілёве, Полацку, Баранавічах, Асіповічах, Віцебску і іншых населеных пунктах рэспублікі.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ


Г. п. Радашковічы


Г. Віцебск


Г. Мінск


Г. Асіповічы


Г. Любань

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, выканайце заданні.

1. *Назавіце імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны, помнікі якім устаноўлены ў беларускіх гарадах (гл. ілюстрацыі). Які подзвіг яны здзейснілі?*
2. *Як звязаныя помнік у г. Любань і манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў г. Жодзіна?*
3. *Імёны якіх герояў Вялікай Айчыннай вайны — воінаў Чырвонай арміі, партызан, падпольшчыкаў — увекавечаны ў назвах вуліц вашага населенага пункта?*

У ноч на 22 верасня 1943 г. удзельніцы Мінскага падполля А. Р. Мазанік, Н. В. Траян і М. Б. Осіпава ажыццявілі аперацыю па знішчэнні генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. За гэты подзвіг падпольшчыцы былі ўшанаваны званнем «Герой Савецкага Саюза».

Навек упісаныя ў гісторыю імёны мінскіх падпольшчыкаў З. З. Гало, І. К. Кавалёва, Д. А. Караткевіча, М. К. Каржанеўскага, І. І. Матусевіча, Л. Я. Адзінцова і інш. За перыяд акупацыі патрыёты Мінска здзейснілі звыш 1500 дыверсій, знішчылі некалькі тысяч германскіх салдат, афіцэраў і тых, хто супрацоўнічаў з акупацыйнай уладай. Многія мінскія падпольшчыкі былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Восем мінскіх падпольшчыкаў ушанаваныя званнем «Герой Савецкага Саюза», у іх ліку — І. К. Кабушкін, І. П. Казінец, М. А. Кедышка. За мужнасць і гераізм у барацьбе з нацыстамі г. Мінску ў **1974 г.** нададзена званне «горад-герой».



Значок «Горад-герой Мінск». 1976 г.

Пад кіраўніцтвам К. С. Заслонава ўдзельнікі Аршанскага падполля толькі ад лістапада 1941 г. да лютага 1942 г. вывелі са строю больш за 170 паравозаў. Адну з найбуйнейшых дыверсій здзейсніў падпольшчык Ф. А. Крыловіч на чыгуначнай станцыі Асіповічы ў ноч на 30 ліпеня 1943 г. — у выніку згарэлі 4 эшалоны, у тым ліку эшалон з новымі танкамі «Тыгр», што рухаўся ў раён Курска (было знішчана 30 танкаў).

Дзейснай формай барацьбы былі дыверсіі на ваенных складах, у сховішчах паліва праціўніка. Падпольшчыкі псавалі абсталяванне прамысловых прадпрыемстваў, знішчалі гатовую прадукцыю. З набліжэннем войскаў Чырвонай арміі патрыёты намагаліся зберагчы каштоўнае абсталяванне, прадухілялі разбурэнне прамысловых прадпрыемстваў.

Шырокую вядомасць атрымалі подзвігі обальскіх падпольшчыкаў. Камсамольская арганізацыя

Правообладатель Издательский центр БГУ

«Юныя мсціўцы» ў пасёлку Обаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці была створана ўвесну 1942 г. Маладыя падпольшчыкі здзейснілі 21 дыверсію. Пасля вайны Зінаідзе Партновай (пасмяротна) і Ефрасінні Зяньковай прысвоена званне «Герой Савецкага Саюза».

На акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны супраць ворага змагаліся 374 тыс. партызан і больш за 70 тыс. падпольшчыкаў.

2. Захаванне беларускай дзяржаўнасці ў гады вайны. Адна з задач нацысцкага кіраўніцтва Германіі заключалася ў знішчэнні савецкай дзяржаўнасці і яе органаў улады. Аднак на працягу ўсяго перыяду Вялікай Айчыннай вайны беларуская дзяржаўнасць, прадстаўленая ўсімі ўзроўнямі дзяржаўнага кіраўніцтва і партыйных органаў, захоўвалася.

У сувязі з германскім наступам улетку 1941 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, СНК БССР і асобныя наркаматы пераехалі ў Магілёў, пасля ў Гомель, а пасля акупацыі тэрыторыі Беларусі — у Маскву.



Помнік Обальскаму камсамольскаму падполлю. Г. п. Обаль

Партыйныя органы — арганізатары ўсенароднай барацьбы

Ва ўмовах акупацыі на тэрыторыі нашай краіны працягвалі працаваць партыйныя органы. Абкамы, гаркамы, райкамы КП(б)Б перайшлі да падпольнай работы, што ахапіла ўсе раёны Беларусі. Пад кіраўніцтвам камуністаў была таксама створана сетка камсамольскіх падпольных арганізацый.

Савецкая ўлада была адноўлена на тэрыторыі партызанскіх зон, там дзейнічалі абкамы і райкамы партыі, выканкамы Саветаў.

Аднаўленне савецкай улады ў БССР

З пачаткам вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вышэйшыя органы дзяржаўнай улады вярнуліся ў рэспубліку. 26 лістапада 1943 г. Чырвоная армія вызваліла першы абласны цэнтр БССР — г. Гомель. Неўзабаве сюды з Масквы перамясціліся ЦК КП(б)Б, СНК БССР

СЯРОД ВЫШЭЙШАГА КІРАЎНІЦТВА БССР ПАСЛЯ ВАЙНЫ БЫЛІ ЧАТЫРЫ ГЕРОІ САВЕЦКАГА САЮЗА



П. М. Машэраў. Першы сакратар ЦК КПБ (1965–1980)



В. І. Казлоў. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1948–1967)



У. Е. Лабанок. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1976–1977)



А. Я. Кляшчоў. Старшыня Савета Міністраў БССР (1948–1953)

Як вы лічыце, чаму кіраўнікамі рознага ўзроўню ў пасляваеннай БССР рабіліся арганізатары вызваленчай барацьбы? У якіх галінах улады займалі пасады В. І. Казлоў, У. Е. Лабанок і А. Я. Кляшчоў? Назавіце прозвішчы цяперашніх кіраўнікоў гэтых галін улады ў Рэспубліцы Беларусь.



Дом урада. Г. Мінск. 1944 г.

і Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР. Ужо ў сакавіку 1944 г. на беларускай зямлі (у гомельскім прадмесці Навабеліца) упершыню за гады вайны адбылася сесія Вярхоўнага Савета БССР. Дэпутатамі былі ваеннаслужачыя, партызаны, падпольшчыкі і працаўнікі савецкага тылу.

Пасля вызвалення Мінска сюды ў сціслыя тэрміны былі пераведзены ЦК КП(б)Б, Прэзідыум Вярхоўнага Савета і СНК БССР.

На заключным этапе вайны беларуская дзяржаўнасць набыла геапалітычную вагу, што знайшло выяўленне ва ўдзеле БССР у стварэнні і дзейнасці пасляваенных міжнародных арганізацый.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пачатак вызвалення БССР

3. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» (23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.). Разгром нацысцкіх войскаў на Курскай дузе, паспяховы наступ Чырвонай арміі стварылі ўмовы для вызвалення Беларусі ад акупантаў. **23 верасня 1943 г.** быў вызвалены першы раённы цэнтр БССР — Камарын, **26 лістапада 1943 г.** — першы абласны цэнтр — г. Гомель.

Усяго ў выніку наступу Чырвонай арміі восенню — зімой 1943–1944 гг. было вызвалена 36 раёнаў БССР, 36 раённых і 2 абласныя цэнтры — Гомель і Мазыр. У раёне Азарыч войскі Чырвонай арміі ўратавалі вязняў трох лагераў смерці (больш за 33 тыс. савецкіх грамадзян).

У 1944 г. Чырвоная армія здзейсніла 10 удараў па ворагу, у выніку якіх дзяржаўная мяжа СССР была адноўлена на ўсёй працягласці ад Баранцава да Чорнага мораў. Сярод іх асаблівае месца займае разгром нацысцкіх войскаў на тэрыторыі Беларусі, які ўвайшоў у гісторыю пад кодавай назвай «Аперацыя „Баграціён“». Гэта была адна з найбуйнейшых наступальных аперацый Чырвонай арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У аперацыі ўдзельнічалі войскі чатырох франтоў: 1-га Беларускага (камандуючы К. К. Ракасоўскі), 2-га Беларускага (камандуючы Г. Ф. Захараў), 3-га Беларускага (камандуючы І. Д. Чарняхоўскі), 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы І. Х. Баграмян) і сілы Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Каардынацыю дзеянняў франтоў ажыццяўлялі прадстаўнікі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання — маршалы Савецкага Саюза Г. К. Жукаў і А. М. Васілеўскі.

Магутныя ўдары па камунікацыях ворага нанеслі беларускія партызаны. У ноч на 20 чэрвеня 1944 г. пачаўся трэці этап «рэйкавай вайны».



Паглядзіце фільм «Час вярнуцца» (кінастудыя «Беларусьфільм», 2024 г.). Як паказана ў фільме роля беларускіх партызан у вызваленні БССР ад нацыстаў?

Аперацыя «Баграціён»

Аперацыя «Баграціён» пачалася **23 чэрвеня 1944 г.** з наступу Чырвонай арміі на віцебскім, аршанскім і магілёўскім напрамках. За некалькі дзён былі знішчаны асноўныя сілы вермахта пад Віцебскам, Бабруйскам і Магілёвам, а 3 ліпеня 1944 г. перадавыя часці Чырвонай арміі вызвалілі Мінск.

У раёне Мінска, Віцебска і Бабруйска было акружана і знішчана 30 гітлераўскіх дывізій. На ўсход ад Мінска ў «кацёл» трапіла 105-тысячная варожая групоўка. Больш за 50 тыс. узятых у палон падчас вызвалення Беларусі салдат вермахта прайшлі пад канвоем у ліпені 1944 г. вуліцамі Масквы — гэта быў «Парад пераможаных».

Да канца лета 1944 г. уся тэрыторыя БССР была вызвалена, войскі вермахта зазналі сакрушальнае паражэнне.



Як звязаныя аперацыя «Баграціён» і мемарыял «Курган Славы»?

4. Унёсак беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй. У гістарычнай памяці беларускага народа Вялікая Айчынная вайна захавалася, з аднаго боку, як нацыянальная і агульначалавечая трагедыя, з дру-

Правообладатель Издательский центр БГУ

гога — як прыклад масавага гераізму, трыумф сілы волі і еднасці. Беларускі народ ад першых і да апошніх дзён вайны браў удзел ва ўзброенай барацьбе: на франтах, у партызанскіх атрадах, падпольных арганізацыях.

Мужна змагаліся ўраджэнцы Беларусі і супраць Японіі, бралі актыўны ўдзел у Маньчжурскай аперацыі СССР па разгроме Квантунскай арміі.


Унёсак партызан і падпольшчыкаў

Вялікі ўнёсак у разгром германскіх акупантаў зрабілі партызаны і падпольшчыкі. Яны знішчылі каля 500 тыс. гітлераўцаў, пусцілі пад адхон больш за 11 тыс. эшалонаў, разгромілі каля 1 тыс. штабоў і гарнізонаў праціўніка. Гітлераўцы вымушаны былі адцягваць для барацьбы з імі велізарныя сілы. Больш за 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў Беларусі былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, а 91 з іх атрымалі званне «Герой Савецкага Саюза».

Сотні тысяч ураджэнцаў Беларусі працавалі ў савецкім тыле: у Паволжы, на Урале, у Заходняй Сібіры, іншых рэгіёнах СССР. Дзякуючы іх штодзённай гераічнай працы прадпрыемствы, эвакуяваныя ва ўсходнія рэгіёны Савецкага Саюза, давалі неабходную для Чырвонай арміі прадукцыю.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія прадпрыемствы БССР былі эвакуяваныя ў 1941 г. Якую прадукцыю яны выраблялі для патрэб фронту ў эвакуацыі?

БЕЛАРУСЫ НА ФРАНТАХ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



Звыш 1,3 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны



449 ушанаваныя званнем **Героя Савецкага Саюза**; чацвёра з іх — П. Я. Галавачоў, І. І. Гусакоўскі, С. Ф. Шутаў, І. І. Якубоўскі — двойчы



Больш за 400 тыс. ураджэнцаў Беларусі былі ўзнагароджаныя баявымі ордэнамі і медалямі

Нямала беларусаў удзельнічала ў еўрапейскім Супраціўленні.

Міжнародная супольнасць прызнала ўнёсак беларускага народа ў Перамогу над гітлераўскай Германіяй і яе саюзнікамі. БССР зрабілася адной з дзяржаў — заснавальніц ААН.

5. Наступствы вайны для Беларусі. Перамога над нацызмам у Вялікай Айчыннай вайне была дасягнута велізарным коштам. Загінуў практычна кожны трэці жыхар Беларусі.

Нацысцкія захопнікі знішчылі або вывезлі ў Германію больш за 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, знішчылі больш за 8 тыс. школ, нанеслі матэрыяльны ўрон на суму 75 млрд рублёў (у цэнах 1941 г.).

Знішчана нацыстамі	**Сагнана на прымусовыя работы ў Германію**	**Разбурана і спалена**
больш за 3 млн мірных грамадзян і ваеннапалонных	**больш за 380 тыс.** чалавек. Многія з іх загінулі ў выніку невыносных умоў працы, нягод і катаванняў	**209 гарадоў**, не менш за **12 868** сельскіх населеных пунктаў, не менш за **290** вёсак падзялілі лёс Хатыні

Правообладатель Издательский центр БГУ

Вялікая Айчынная вайна стала цяжкім выпрабаваннем для народа Беларусі і разам з тым — часам праявы стойкасці, мужнасці і гераізму. Беларускі народ набліжаў Перамогу партызанскай і падпольнай барацьбой на акупаванай тэрыторыі, змагаючыся ў шэрагах Чырвонай арміі і на працоўным фронце. Захаванне гістарычнай памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны — канстытуцыйны абавязак кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

калі ў свеце…

5 мая — 23 жніўня 1943 г. — Курская бітва, завяршэнне карэннага пералому ў ходзе Другой сусветнай вайны

на тэрыторыі Беларусі…

Ноч з 3 на 4 жніўня 1943 г. — пачатак першага этапу «рэйкавай вайны» ў БССР

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Канкрэтызуйце прыкладамі тэзіс: «Барацьба беларускага народа супраць нацысцкіх захопнікаў была агульнанароднай».
2. Ахарактарызуйце кірункі партызанскага руху і падпольнай барацьбы супраць германскіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі.
3. Якую ролю адыгралі савецкія, партыйныя, камсамольскія органы ў арганізацыі барацьбы супраць акупантаў і захаванні беларускай дзяржаўнасці?
4. Падрыхтуйце паведамленне (або прэзентацыю) аб вызваленні БССР (вашага раёна, вобласці) ад германскіх захопнікаў. Адлюструйце ў ім удзел вашых сваякоў у барацьбе супраць акупантаў.
5. Ахарактарызуйце ўнёсак беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў.

Практыкум па раздзеле «Беларусь і свет у 1917–1945 гг.»

Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

Адной з самых знакавых падзей XX ст. з'яўляецца Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі. У выніку гэтай рэвалюцыі быў зрынуты Часовы ўрад, да ўлады прыйшла партыя бальшавікоў, устаўлялася дыктатура пралетарыяту. З Кастрычніцкай рэвалюцыяй у Расіі звязаныя глабальныя змены ў сістэме міжнародных адносін, актывізацыя рэвалюцыйных працэсаў і нацыянальна-вызваленчага руху ў свеце.

Разглядаючы перадумовы гэтай гістарычнай падзеі, большасць даследчыкаў звяртаюць увагу на тое, што ў 1917 г. у Расіі адбыліся дзве рэвалюцыі — Лютаўская і Кастрычніцкая. Часовы ўрад, што прыйшоў да ўлады ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі, аказаўся нездольны вырашыць усе пытанні, якія стаялі перад дзяржаўнай уладай. Таму лагічным і заканамерным вынікам стала Кастрычніцкая рэвалюцыя.

Аднак частка даследчыкаў разглядаюць Кастрычніцкую рэвалюцыю як выпадковасць, што прывяла бальшавікоў да ўлады. У прыватнасці, доктар гістарычных навук, прафесар А. У. Шубін адзначае наступнае: «Хутчэй да перамогі бальшавізму прывёў ланцуг выпадковасцей. У той момант патрабавалася вырашыць надзвычай складаныя задачы. Розныя партыі прапаноўвалі свае праекты. Кадэты, меншавікі і эсэры напачатку мелі нават большую палітычную вагу, чым бальшавікі, але не здолелі скарыстацца сваім шанцам. Улада выпала з іх рук, бальшавікі яе падабралі і здолелі ўтрымаць».

1. Якія задачы стаялі перад Часовым урадам пасля Лютаўскай рэвалюцыі? Ахарактарызуйце пазіцыю Часовага ўрада наконт вырашэння гэтых задач. Як бачылі вырашэнне гэтых задач бальшавікі?

2. Якія фактары дазволілі бальшавікам павялічыць сваю палітычную вагу? Сярод якіх груп насельніцтва бальшавікі карысталіся найбольшай папулярнасцю?

3. Якія фактары паспрыялі поспеху бальшавікоў у кастрычніку 1917 г.?

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Як вы лічыце, прыход да ўлады бальшавікоў у выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі быў выпадковы ці заканамерны? Сваю думку аргументуйце.

Адрозненне факта ад думкі

2 лістапада 1942 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў указ аб утварэнні Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх прыспешнікаў і ўчыненага імі ўрону. За час карпатлівай працы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі было апублікавана 2 тамы дакументаў аб злачынствах нацысцкага рэжыму. Акты і паведамленні Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі былі адным з найважнейшых доказаў абвінавачвання ў Нюрнбергу.

У красавіку 2021 г. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь узбудзіла крымінальную справу па фактах генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. За апошнія гады расследаванне выявіла мноства новых фактаў знішчэння нацыстамі мірнага насельніцтва Беларусі.

Пазнаёмцеся з урыўкамі з матэрыялаў расследаванняў і адкажыце на прапанаваныя пытанні.

1. З акта камісіі з прадстаўнікоў вайсковай часці Чырвонай арміі і мясцовай грамадскасці пра зверствы і здзекі нямецкіх фашыстаў над савецкімі людзьмі ў канцлагеры каля мяст. Азарычы Даманавіцкага раёна Палескай вобл.

> Нягледзячы на тое што перад эвакуацыяй з родных вёсак і гарадоў нямецкія ўлады аб'явілі жыхарам, што ім дазваляецца браць з сабой неабмежаваную колькасць рэчаў і прадуктаў харчавання, нямецкія афіцэры і салдаты адабралі ўсе ўзятыя жыхарамі каштоўнасці, а па прыбыцці на месца абрабавалі іх зноў. Людзей распранулі і разулі, адабралі прадукты харчавання, што ў іх былі, не пакінуўшы хлеба нават для маленькіх дзяцей.
>
> Распранутыя і галодныя людзі не мелі права разводзіць вогнішчы, хадзіць у бліжэйшае балота, каб дастаць з-пад імху колькі кропель балотнай вады. Катэгарычна забаранялася набліжацца да дроту. За спробу наблізіцца да загароды расстрэльвалі.

Раз на тыдзень немцы падвозілі да дроту хлеб і кавалкамі, як сабакам, кідалі яго ў натоўп знямоганых людзей. Маленькі кавалачак хлеба пасля сістэматычнага галадання яшчэ больш узмацняў пакуты зняволеных.

Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944. — Минск: Беларусь, 1965. — С. 147–149.

2. У гады нацысцкай акупацыі (1941–1944 гг.) на тэрыторыі Беларусі:

- знішчана больш за 3 млн мірных грамадзян і ваеннапалонных;
- сагнана ў нямецкае рабства пад пагрозай смерці больш за 380 тыс. чалавек, з якіх шмат хто загінуў у выніку невыносных умоў працы, нягод і катаванняў;
- разбурана і спалена 209 гарадоў, у тым ліку гарады Мінск, Гомель, Віцебск, Полацк, Орша, Барысаў, Слуцк;
- разбурана і спалена больш за 12 000 сельскіх населеных пунктаў;
- знішчана больш за 1270 тысяч пабудоў у гарадах і на сяле.

Геноцид белорусского народа: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общей редакцией А. И. Шведа. — Минск: Беларусь, 2022. — 175 с.: ил.

Пацвердзіце фактамі думку: нацысцкая Германія праводзіла на акупаванай тэрыторыі Беларусі палітыку генацыду.

Устанаўленне прычынна-выніковых сувязей

А. З рэзалюцыі аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК ВКП(б)

«7–12 студзеня 1933 г. У выніку няўхільнага правядзення палітыкі індустрыялізацыі і разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсім фронце рабочы клас СССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі паспяхова выканаў асноўную задачу пяцігодкі — стварэнне ўласнай перадавой тэхналагічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Ва ўмовах развалу эканомікі капіталістычных краін, пры нечуваным росце ў гэтых краінах беспрацоўя, галечы, голаду — выкананне пяцігодкі ў СССР не за пяць, а за чатыры гады (дакладней, за чатыры гады і тры месяцы) ёсць факт найбольш выдатны ў сучаснай гісторыі...

Правообладатель Издательский центр БГУ

За перыяд першай пяцігодкі створана ўласная індустрыяльная база рэканструкцыі прамысловасці, транспарту і сельскай гаспадаркі. З адсталай, дробнасялянскай краіны, якой была старая Расія, СССР выйшаў у першыя шэрагі найбольш развітых у тэхніка-эканамічных адносінах краін».

Б. Суадносіны вытворчасці ў СССР і найбуйнейшых капіталістычных краінах

Краіны	1928 г.			Канец 1930-х гг.		
	Электраэнергія, млрд кВт/гадз	Сталь, млн т	Чыгун, млн т	Электраэнергія, млрд кВт/гадз	Сталь, млн т	Чыгун, млн т
СССР	5	4	3	48	18	15
Германія	17	15	14	37	18	15
Англія	16	9	7	40	13	8
Францыя	15	9	10	20	8	8
ЗША	113	52	39	188	62	43

1. Чаму ў СССР быў узяты курс на індустрыялізацыю? Якія задачы стаялі перад краінай пры яе правядзенні?

2. Чаму прыярытэтная ўвага надавалася развіццю цяжкай прамысловасці?

3. Якое значэнне мела індустрыялізацыя для СССР?

Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

А. Выканайце заданне на выбар.

- Складзіце топ-5 «Асоба ў гісторыі 1917–1945 гг.». Свой выбар аргументуйце.
- Зрабіце постар, прысвечаны пэўнай асобе і яе ролі ў гісторыі.
- Складзіце аповед ад імя пэўнай асобы пра гістарычныя падзеі, у якіх яна ўдзельнічала.

Б. Вызначце трох асоб, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у развіццё Беларусі ў 1917–1945 гг. Сваю думку аргументуйце.

Абагульненне па раздзеле «Беларусь і свет у 1917–1945 гг.»

Працуем з паняццямі

1. Прачытайце прапанаваны пералік паняццяў і падзяліце іх на групы. Крытэрыі падзелу на групы вызначце самастойна.

Агрэсія, акупацыя, асадніцтва, атэізм, аўтарытарны рэжым, беларусізацыя, беларуская нацыянальная дзяржаўнасць, Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, генацыд, індустрыялізацыя, калабарацыянізм, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, культурная рэвалюцыя, метад сацыялістычнага рэалізму, нацызм, новая эканамічная палітыка, падпольная барацьба, партызанскі рух, сацыялістычная рэвалюцыя, сусветны эканамічны крызіс, фашызм.

2. Вызначце паняцці, якія адносяцца да гісторыі Беларусі. Канкрэтызуйце іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з'яў, працэсаў).

Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

3. На аснове прапанаваных крыніц інфармацыі складзіце тэзісны план адказу на пытанне «Уз'яднанне Заходняй Беларусі і БССР — акт гістарычнай справядлівасці і воля народа Беларусі».

З прамовы па радыё старшыні Савета Народных Камісараў СССР тав. В. М. Молатава

17 верасня 1939 г.

Таварышы! Грамадзяне і грамадзянкі нашай вялікай краіны!


Польская дзяржава і яе ўрад фактычна перасталі існаваць. З прычыны такога становішча заключаныя паміж Савецкім Саюзам і Польшчай дамовы спынілі сваё дзеянне.

...Савецкі ўрад да апошняга часу заставаўся нейтральным. Але ён... не можа больш нейтральна ставіцца да становішча, якое склалася.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Сустрэча Чырвонай арміі жыхарамі Гродзеншчыны (1939 г., з архіва БЕЛТА)



Нацыянальны склад Народнага сходу Заходняй Беларусі (чал.)

Ад Савецкага ўрада нельга таксама патрабаваць абыякавага стаўлення да лёсу адзінакроўных украінцаў і беларусаў, якія ў Польшчы і раней знаходзіліся на становішчы бяспраўных нацый, а цяпер і наогул кінуты на волю лёсу. Савецкі ўрад лічыць сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам-украінцам і братам-беларусам, што насяляюць Польшчу.

З прычыны ўсяго гэтага ўрад СССР уручыў сёння раніцай ноту польскаму паслу ў Маскве, у якой заявіў, што Савецкі ўрад аддаў распараджэнне Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсці мяжу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

«Праўда», 18 верасня 1939 г.

Аналізуем, тлумачым, разважаем

4. Прааналізуйце звесткі са статыстычнай табліцы «Страты насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны». Зрабіце вывады.

Краіны	Ваеннаслужачыя, тыс. чал.	Грамадзянскае насельніцтва, тыс. чал.
СССР	8700	17 900,0
ЗША	416,8	Каля 6

Краіны	Ваеннаслужачыя, тыс. чал.	Грамадзянскае насельніцтва, тыс. чал.
Вялікабрытанія	382,6	67,1
Польшча	123	Каля 6000
Францыя	217,6	Каля 400
Германія	6 923,7, з іх 3/4 на савецка-германскім фронце	Каля 3300
Італія	301,4	153,1

5. Чым, на вашу думку, тлумачацца суадносіны страт сярод ваеннаслужачых і мірнага насельніцтва розных краін? Канкрэтызуйце сваю думку вывучанымі гістарычнымі фактамі.

6. Выявіце ўзаемасувязь гістарычных фактаў:

- Версальская дамова — прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі;
- заканчэнне Першай сусветнай вайны — узмацненне нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі;
- Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі — Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі;
- сусветны эканамічны крызіс — узмацненне ўплыву фашысцкіх партый;
- утварэнне СССР — узбуйненне тэрыторыі БССР;
- індустрыялізацыя ў СССР — перамога СССР у Вялікай Айчыннай вайне.

Сістэматызуем веды

7. Выкарыстоўваючы стужку часу, прадстаўленую ў пачатку раздзела II, выканайце наступныя заданні.

- Якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу? Чаму?
- Прапануйце форму для іх абазначэння (карціна, картасхема, цытата, фотаздымак і інш.).

Правообладатель Издательский центр БГУ

• Прадстаўце развіццё Беларусі ў 1917–1945 гг. у выглядзе лагічнай схемы (ментальнай карты). Адлюструйце ў ёй эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае і духоўнае развіццё рэспублікі ў згаданы перыяд.

8. Праца ў міні-групах. Якія сацыяльныя, эканамічныя і культурныя заваёвы вывучанага перыяду Беларусь захоўвае сёння?

Наш край у 1917–1945 гг.

1. Праца ў міні-групах. Выкарыстоўваючы картасхемы, матэрыялы вучэбнага дапаможніка і гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» вашага раёна, вызначце:

А. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіў ваш населены пункт у 1917–1945 гг.? Як змяняўся яго статус?

Б. Якія прамысловыя або сельскагаспадарчыя прадпрыемствы былі пабудаваныя ў вашай мясцовасці ў 1921–1941 гг.?

В. Якія гістарычныя падзеі 1917–1945 гг. закранулі жыхароў вашага населенага пункта, раёна? Якім чынам?

Прэзентуйце вынікі сваёй працы класу, параўнайце з вынікамі іншых міні-груп. Падрыхтуйце агульную прэзентацыю «Мая малая радзіма ў 1917–1945 гг.». Параўнайце яе з прэзентацыяй «Мая малая радзіма ў XIX — пачатку XX ст.», зрабіце вывад наконт развіцця сваёй мясцовасці ў першай палове XX ст.

2. Экскурсія па родным краі. З дапамогай матэрыялаў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць», карты спаленых вёсак на Публічнай кадастравай карце (https://map.nca.by), электроннай базы даных «Беларускія вёскі, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (http://db.narb.by), дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, якія месцы знішчэння мірных грамадзян у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама мемарыялы і месцы памяці ёсць у вашай мясцовасці. Складзіце план экскурсіі па вуліцах населенага пункта «Мой горад (мястэчка, вёска) у гады Вялікай Айчыннай вайны».

3. Славутыя землякі. З дапамогай матэрыялаў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» і дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, жыццё і / або дзейнасць якіх славутых людзей першай паловы XX ст. звязаная з вашай мясцовасцю. Знайдзіце пры магчымасці іх успаміны або творы пра ваш родны край. Прэзентуйце вынікі вашага даследавання ў выглядзе артыкула ў СМІ або поста ў сацыяльнай сетцы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Мая сям'я. Даведайцеся пра гісторыю сваёй сям'і ў 1917–1945 гг.: імёны прабабуль і прадзядуляў, дзе жылі, чым займаліся, які ўдзел бралі ў гістарычных падзеях. Для пошуку звестак пра сваіх продкаў выкарыстайце пошукавыя сайты, напрыклад Партызаны Беларусі (https://partizany.by), АБД Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь (https://memory.mil.by).

Падрыхтуйце аповед пра лёс сваёй сям'і ў 1917–1945 гг. Як змяніліся заняткі, месца жыхарства вашых продкаў у параўнанні з перыядам XIX — пачатку XX ст.?

БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ









1946 г. — Пачатак «халоднай вайны»

1949 г. — Утварэнне ФРГ і ГДР

1957 г. — Стварэнне Еўрапейскай эканамічнай супольнасці

1945 г. — Падпісанне дэлегацыяй БССР статута ААН

1951 г. — Зацвярджэнне Дзяржаўнага сцяга БССР

1958 г. — Пачатак выпуску самазвалаў БелАЗ







Правообладатель Издательский центр БГУ

1940-х — ПАЧАТКУ 1990-Х гг.







1961 г. — Першы палёт чалавека ў космас

1973 г. — Першы палёт П. Клімука ў космас




1975 г. — Хельсінкскія пагадненні

1978 г. — Прыняцце Канстытуцыі БССР



1985 г. — Пачатак перабудовы

1990 г. — Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР



ДЕКЛАРАЦИЯ

Верховного Совета

Белорусской Советской Социалистической Республики

О государственном суверенитете Белорусской Советской Социалистической Республики

Верховный Совет Белорусской Советской Социалистической Республики,

выражая волю народа Белорусской ССР,

осознавая ответственность за судьбу белорусской нации,

подтверждая уважение достоинства и прав людей всех национальностей, проживающих в Белорусской ССР,

свидетельствуя уважение к суверенным правам всех народов Союза ССР и мира,

считая республику полноправным и независимым членом мирового сообщества,

действуя в соответствии с принципами Всеобщей декларации прав человека и другими общепризнанными международно-правовыми актами,

торжественно провозглашает полный государственный суверенитет Белорусской ССР как верховенство, самостоятельность и полноту государственной власти республики в границах ее территории, правомочность ее законов, независимость республики во внешних сношениях и заявляет о решительности создать правовое государство.

Статья 1.

Белорусская Советская Социалистическая Республика - суверенное государство, утверждающееся на основе осуществления белорусской нацией ее неотъемлемого права на самоопределение, государственности белорусского языка, верховенства народа в определении своей судьбы.

Неотъемлемые права Белорусской ССР как суверенного государства реализуются в соответствии с общепризнанными нормами международного права. Белорусская ССР охраняет и защищает национальную государственность белорусского народа.

Белорусская ССР имеет свой герб, флаг и гимн.

Любые насильственные действия против национальной государственности Белорусской ССР со стороны политических партий, общественных объединений или лиц преследуются по закону.

Раздзел III. БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-Х — ПАЧАТКУ 1990-Х гг.

§ 32. Свет у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.

ЯЛЦІНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
ПАТСДАМСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
ААН «ХАЛОДНАЯ ВАЙНА»
ДЭКАЛАНІЗАЦЫЯ АВД
НАТА ПЛАН МАРШАЛЛА

1. Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін. Асноўныя прынцыпы міжнародных адносін па выніках Другой сусветнай вайны былі выпрацаваны падчас дзвюх канферэнцый саюзных дзяржаў — Ялцінскай і Патсдамскай. На гэтых сустрэчах лідары краін *антыгітлераўскай кааліцыі* — СССР, ЗША і Вялікабрытаніі — узгаднілі ключавыя пытанні наконт будучыні пасляваеннай Еўропы і свету ў цэлым.

На канферэнцыі ў Сан-Францыска (25 красавіка — 26 чэрвеня 1945 г.) былі падпісаныя пагадненні аб стварэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) — міжнароднай арганізацыі, закліканай гарантаваць бяспеку і супрацоўніцтва паміж краінамі. У Статуце ААН мэтай арганізацыі было прапісана «пазбавіць наступныя пакаленні ад бедстваў вайны».

Успомніце, якую ролю адыграла БССР у заснаванні ААН. Чым была абумоўленая роля БССР у стварэнні міжнароднай арганізацыі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Рашэнні Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый	
Ялцінская канферэнцыя (4–11 лютага 1945 г.)	**Патсдамская канферэнцыя** (17 ліпеня — 2 жніўня 1945 г.)
Аб пасляваенным уладкаванні Германіі. Падзел Германіі на чатыры акупацыйныя зоны — савецкую, амерыканскую, брытанскую і французскую, а г. Берліна — на чатыры акупацыйныя сектары	**Пасляваеннае кіраванне Германіяй.** Пацверджаны і ўдакладнены ўмовы акупацыі, дэмілітарызацыі, дэнацыфікацыі краіны. Узгоднены прынцыпы дэмакратызацыі Германіі, у тым ліку аднаўленне грамадзянскіх свабод (слова, прэсы, рэлігіі і інш.), падзел улады, дазвол дзейнасці дэмакратычных партый. Вырашана арганізаваць міжнародны суд над лідарамі злачыннага фашысцкага рэжыму
Аб дэмілітарызацыі і дэнацыфікацыі Германіі. Пасляваенная дэмілітарызацыя — ліквідацыя ўзброеных сіл, запасаў зброі, ваенна-прамысловага комплексу; дэнацыфікацыя — ліквідацыя нацыянал-сацыялістычнай ідэалогіі, знішчэнне нацысцкай партыі і іншых нацысцкіх арганізацый, «ачышчэнне» нямецкага грамадства ад усялякага нацыянал-сацыялістычнага ўплыву, а таксама пакаранне ваенных злачынцаў	**Ваенныя рэпарацыі.** Дамовіліся наконт сістэмы рэпарацый, згодна з якой СССР мог забіраць прамысловае абсталяванне і рэсурсы са сваёй зоны акупацыі, ЗША і Вялікабрытанія атрымлівалі свае рэпарацыі з заходніх зон Германіі
	Тэрытарыяльныя змены ў Еўропе. Пацверджана перадача Усходняй Прусіі і некаторых іншых тэрыторый СССР і Польшчы. СССР перадавалася частка Усходняй Прусіі з горадам Кёнігсберг (цяпер г. Калінінград, Калінінградская вобласць Расійскай Федэрацыі). Гэтыя тэрытарыяльныя змены вызначалі новыя межы і былі накіраваныя на ўмацаванне геапалітычнай стабільнасці ў Еўропе
Польскае пытанне. Замацаваны ўваход у склад СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Польшча атрымала значную частку нямецкіх тэрыторый на захадзе і поўначы. Урад краіны ствараўся на аснове камуністычнага Часовага ўрада, што размяшчаўся ў Любліне	**Японскае пытанне.** Ад імя трох дзяржаў — ЗША, Вялікабрытаніі і Кітая — была прынятая Патсдамская дэкларацыя па Японіі. Дакумент патрабаваў ад Японіі безадмоўнай капітуляцыі, у выпадку адмовы саюзнікі пагражалі «хуткім і поўным знішчэннем». СССР, верны сваім саюзніцкім абавязацельствам, пацвердзіў свой удзел у вайне супраць Японіі ў абмен на атрыманне Курыльскіх астравоў і Паўднёвага Сахаліна, страчанага ў выніку руска-японскай вайны 1904–1905 гг.

У чым заключаліся дэмілітарызацыя, дэнацыфікацыя і дэмакратызацыя Германіі пасля Другой сусветнай вайны?
Якім чынам рашэнні Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый паўплывалі на расстаноўку сіл на міжнароднай арэне?

Значэнне Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін

Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін заклала асновы пасляваеннага светаўладкавання. Яна вызначыла зоны ўплыву, тэрытарыяльныя змены і прынцыпы міжнароднага ўзаемадзеяння. Гэта быў своеасаблівы кампраміс паміж вялікімі дзяржавамі, інтарэсы і ідэалогіі якіх не супадалі.

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Са Статута ААН

Прэамбула.

Мы, народы аб'яднаных нацый, поўныя рашучасці пазбавіць наступныя пакаленні ад бедстваў вайны, якая двойчы ў нашым жыцці прынесла чалавецтву невыказнае гора, і зноў зацвердзіць веру ў асноўныя правы чалавека, у вартасць і каштоўнасць чалавечай асобы, у раўнапраўе мужчын і жанчын і ў роўнасць правоў вялікіх і малых нацый, і стварыць умовы, пры якіх могуць выконвацца справядлівасць і павага да абавязкаў, … і спрыяць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоў жыцця пры большай свабодзе…

Арт. 41.

Савет Бяспекі ААН упаўнаважваецца вырашаць, якія захады, не звязаныя з выкарыстаннем узброеных сіл, павінны рабіцца для ажыццяўлення яго рашэнняў, і ён можа запатрабаваць ад членаў Арганізацыі здзяйснення гэтых захадаў. Гэтыя захады могуць уключаць поўны або частковы разрыў эканамічных адносін, чыгуначных, марскіх, паветраных, паштовых, тэлеграфных, радыё- або іншых сродкаў зносін, а таксама разрыў дыпламатычных адносін.

Арт. 42.

Калі Савет Бяспекі палічыць, што захады, прадугледжаныя ў арт. 41, могуць аказацца недастатковымі або ўжо аказаліся недастатковымі, ён упаўнаважваецца ажыццяўляць такія дзеянні паветранымі, марскімі або сухапутнымі сіламі, якія акажуцца неабходнымі для падтрымання або аднаўлення міжнароднага міру і бяспекі. Такія дзеянні могуць уключаць дэманстрацыі, блакаду і іншыя аперацыі паветраных, марскіх або сухапутных сіл членаў Арганізацыі.

1. Якія задачы ставіць перад сабой ААН?
2. Якія захады, згодна са Статутам ААН, павінны рабіцца для вырашэння дадзеных задач?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Сістэма таксама зацвердзіла прынцыпы калектыўнай бяспекі, у прыватнасці, ролю ААН у вырашэнні канфліктаў.

2. Фарміраванне двухполюснага свету. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны найбольшым уплывам у свеце карысталіся дзве вялікія дзяржавы — СССР і ЗША. Свет падзяліўся на два

Дзве грамадска-палітычныя сістэмы — два блокі

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З выступлення Уінстана Чэрчыля ў г. Фултан, ЗША, 5 сакавіка 1946 г.

Ніхто не можа сказаць, чаго можна спадзявацца ў найбліжэйшай будучыні ад Савецкай Расіі і міжнароднай камуністычнай супольнасці, якой яна кіруе, і якія межы… іх экспансіянісцкіх памкненняў і настойлівых намаганняў звярнуць увесь свет у сваю веру…

Кантактуючы ў гады вайны з нашымі рускімі сябрамі і саюзнікамі, я прыйшоў да вываду, што больш за ўсё яны захапляюцца сілай і менш за ўсё паважаюць слабасць, асабліва ваенную.

Таму мы мусім адмовіцца ад дактрыны раўнавагі сіл, або, як яе яшчэ называюць, дактрыны палітычнай раўнавагі паміж дзяржавамі, бо яна вычарпала сябе. Мы не можам і не павінны будаваць сваю палітыку, зыходзячы з мінімальнай перавагі і тым самым правакуючы каго б там ні было падужацца з намі.

Мне цяжка ўявіць, каб забеспячэнне эфектыўных захадаў па прадухіленні новай вайны… было магчымае без стварэння таго, што я назваў бы братнім саюзам англамоўных краін. Пад гэтым я маю на ўвазе асаблівыя адносіны паміж Вялікабрытаніяй і Брытанскай Садружнасцю нацый, з аднаго боку, і Злучанымі Штатамі Амерыкі — з другога…

1. *У чым У. Чэрчыль бачыў узмацненне СССР?*
2. *Што ён прапаноўваў супрацьпаставіць СССР?*
3. *Якія словы з выступлення У. Чэрчыля, на вашу думку, можна лічыць заклікам да гонкі ўзбраенняў? Сваю думку растлумачце.*
4. *На думку сучасных палітолагаў, прамова У. Чэрчыля ў г. Фултан паклала пачатак новай эпосе ў гісторыі чалавецтва, для якой характэрная гатоўнасць заходніх англамоўных краін «на аснове ваеннай сілы» навязваць любым дзяржавам свой вобраз дэмакратыі. Якія меркаванні з выступлення У. Чэрчыля дазваляюць зрабіць такі вывад?*

Успомніце, як змянілася знешняя палітыка ЗША пасля Другой сусветнай вайны. У чым заключалася дактрына Трумэна?

супрацьлеглыя блокі (полюсы): заходні, капіталістычны, на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі і ўсходні, сацыялістычны, на чале з Савецкім Саюзам. Гэты раскол быў абумоўлены ідэалагічнымі, палітычнымі і эканамічнымі адрозненнямі паміж дзвюма грамадска-палітычнымі сістэмамі — капіталізмам і сацыялізмам. Супрацьстаянне паміж імі ўвайшло ў гісторыю пад назвай *«халодная вайна»*. Пачатак ёй паклала выступленне У. Чэрчыля ў г. Фултан (ЗША).

Стварэнне НАТА і АВД

Успомніце, у чым заключаўся план Маршала. Чаму яго рэалізацыя азначала рост уплыву ЗША ў Заходняй Еўропе?

У 1947 г. пачалася агрэсіўная кансалідацыя сіл Захаду ў барацьбе супраць СССР. Асноўным сродкам уплыву ЗША на краіны Заходняй Еўропы выступілі *план Маршала* і ваенна-палітычны блок *НАТА* (Арганізацыя Паўночнаатлантычнай дамовы, 1949 г.).

Рэакцыяй на фарміраванне НАТА і ўмацаванне заходніх краін было аб'яднанне сацыялістычных дзяржаў спачатку ў рамках *Савета Эканамічнай Узаемадапамогі* (СЭУ, 1949 г.), затым *Арганізацыі Варшаўскага дагавора* (АВД, 1955 г.). Удзельнікі СЭУ імкнуліся да інтэграцыі сваіх эканомік і каардынацыі планаў развіцця. АВД стваралася як ваенна-палітычны саюз у адказ на ўваход ФРГ у НАТА.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую даведку пра Карыбскі крызіс: час, месца, удзельнікі, прычыны, сутнасць, наступствы.

Стварэнне ваенна-палітычных блокаў паклала пачатак гонцы ўзбраенняў, у тым ліку ядзерных. Ваенныя канфлікты, такія як *Карэйская вайна* (1950–1953 гг.) і *вайна ў В'етнаме* (1965–1973 гг.), абвастрылі супрацьстаянне. Вельмі вострым міжнародным канфліктам быў *Карыбскі крызіс* 1962 г.: паводле ацэнкі палітыкаў, свет быў на мяжы сусветнай ядзернай вайны.

Разрадка міжнароднай напружанасці

Успышкі «халоднай вайны» паміж дзвюма грамадска-палітычнымі сістэмамі чаргаваліся з перыядамі разрадкі міжнароднай напружанасці. Так, у 1972 г. былі заключаныя савецка-амерыканскія дамовы аб абмежаванні сістэм супрацьракетнай

Правообладатель Издательский центр БГУ

абароны (СРА) і аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў (АСУ-1). Абодва бакі прызналі парытэт роўнасці сваіх стратэгічных сіл і неабходнасць яго захавання як асновы ўстойлівых мірных адносін.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Разгледзьце плакат і адкажыце на пытанні:

1. *Якому перыяду міжнародных адносін прысвечаны гэты плакат?*
2. *Якія падзеі прадстаўлены на плакаце? Складзіце кароткую гістарычную даведку пра адну з іх (час, месца, удзельнікі, прычыны, сутнасць, наступствы).*
3. *Хто з палітычных дзеячаў паказаны на плакаце? Складзіце кароткую гістарычную даведку пра аднаго з іх.*
4. *Дайце назву гэтаму плакату.*

У 1975 г. у Хельсінкі адбылася *Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе* (НБСЕ) з удзелам ЗША, Канады і 33 еўрапейскіх дзяржаў. Удзельнікі нарады падпісалі Заключны акт, у якім давалі ўзаемныя абавязацельствы паважаць цэласнасць існуючых межаў дзяржаў, іх суверэнітэт, базавыя правы чалавека, рабіць захады па ўмацаванні міжнароднай бяспекі.

Паварот да канфрантацыі

Аднак на мяжы 1970–1980-х гг. у міжнародных адносінах адбыўся новы віток канфрантацыі паміж СССР і ЗША. У 1983 г. Вялікабрытанія, ФРГ і Італія ўзгаднілі размяшчэнне амерыканскіх ядзерных ракет на сваіх тэрыторыях. Савецкае кіраўніцтва ўспрыняла гэта як прамую пагрозу для бяспекі краіны і як агрэсію, якая патрабуе актыўных дзеянняў. Адказам на такія захады было не толькі нарошчванне ваеннай магутнасці, але і ўзмацненне дыпламатычных і прапагандысцкіх намаганняў, скіраваных на абарону інтарэсаў СССР і прадухіленне магчымых канфліктаў.

3. Крах каланіяльнай сістэмы. Крах каланіяльнай сістэмы стаў важнай падзеяй другой паловы XX ст., якая паўплывала на палітычную карту свету. Актыўная фаза гэтага працэсу ахоплівае 1945–1970-я гг., калі найбуйнейшыя каланіяльныя імперыі Еўропы пачалі губляць кантроль над сваімі заморскімі тэрыторыямі. Адбывалася *дэкаланізацыя* — калоніі еўрапейскіх краін у Азіі і Афрыцы набывалі палітычную незалежнасць.

Успомніце, што такое каланіялізм. Калі сфарміравалася каланіяльная сістэма?

Краху каланіяльнай сістэмы спрыялі таксама сацыяльныя і культурныя фактары. Да гэтага часу ў многіх краінах Азіі і Афрыкі вырасла новае пакаленне, якое атрымала еўрапейскую адукацыю. Яно крытычна ставілася да каланіялізму і было прыхільнікам ідэй нацыянальнага вызвалення. Маладыя лідары ўзначалілі рух антыкаланіяльнага і сацыяльнага пратэсту, барацьбу за незалежнасць

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Разгледзьце картасхему і адкажыце на пытанні.



1. *Якія тэрыторыі знаходзіліся ў каланіяльнай залежнасці пасля канца Другой сусветнай вайны? Якія дзяржавы валодалі калоніямі?*
2. *1960 год быў абвешчаны «Годам Афрыкі». Як вы лічыце, з якімі падзеямі гэта звязана?*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, што такое Рух недалучэння. З якой мэтай ён быў створаны?*

і аднаўленне культурных традыцый, падарваных у каланіяльны перыяд.

Сродкі дасягнення незалежнасці

Да пачатку 1970-х гг. большасць былых калоній у Азіі і Афрыцы атрымалі незалежнасць. Сродкі дасягнення незалежнасці былі розныя. Індыя, напрыклад, здабыла незалежнасць у 1947 г. мірным шляхам. А народу Алжыра давялося ад 1954 да 1962 г. весці працяглую ўзброеную барацьбу супраць французскіх каланізатараў, якая суправаджалася вялікімі чалавечымі стратамі.

Вынікі дэкаланізацыі

Дэкаланізацыя завяршыла эпоху каланіяльных імперый, паспрыяла фарміраванню свету, заснаванага на імкненні да рэальнага суверэнітэту і роўнасці новых дзяржаў. Аднак каланіяльная спадчына дасюль нагадвае аб сабе. Многія юрыдычна самастойныя краіны Азіі і Афрыкі апынуліся ў рознай ступені залежнасці ад сваіх былых метраполій, што стала сур'ёзнай перашкодай на шляху іх сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пасля Другой сусветнай вайны свет аказаўся падзелены на два праціглых лагеры — капіталістычны і сацыялістычны, што прывяло да эпохі «халоднай вайны». Гэтая напружаная атмасфера вызначыла міжнародныя адносіны на многія гады. Адначасова з гэтым у Азіі і Афрыцы адбываўся актыўны працэс дэкаланізацыі, у выніку якога многія былыя калоніі здолелі здабыць палітычную незалежнасць. Гэты гістарычны перыяд стаў важнай вяхой у барацьбе народаў за свае правы і свабоды, радыкальна змяніўшы палітычную карту свету і паўплываўшы на далейшае развіццё міжнароднай палітыкі.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
25 красавіка — 26 чэрвеня 1945 г. — канферэнцыя ў г. Сан-Францыска (ЗША), на якой створана ААН	26 чэрвеня 1945 г. — беларуская дэлегацыя ў ліку іншых дэлегацый падпісала ў Сан-Францыска Статут ААН. БССР стала заснавальнікам ААН

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія рашэнні, прынятыя на Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцыях, на вашу думку, былі ў першую чаргу скіраваныя на прадухіленне новай сусветнай вайны? Сваю думку аргументуйце.
2. На падставе тэксту параграфа вызначце прыкметы двухполюснага свету, які сфарміраваўся пасля Другой сусветнай вайны. Канкрэтызуйце фактамі прыкметы двухполюснага свету.
3. Назавіце фактары, якія паспрыялі дэкаланізацыі краін Азіі і Афрыкі пасля Другой сусветнай вайны.
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, ахарактарызуйце асноўныя кірункі дзейнасці нашай рэспублікі ў складзе ААН.

§ 33. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і фарміраванне постіндустрыяльнага грамадства

ПРАМЫСЛОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА
ІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА
ІНТЭГРАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ
НАВУКА ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ

Сутнасць НТП

Навукова-тэхнічны прагрэс (НТП) — гэта паступальны працэс удасканальвання тэхнікі, тэхналогій, тавараў і паслуг на аснове выкарыстання вынікаў навуковых даследаванняў.

1. Навукова-тэхнічны прагрэс. Пачатак **навукова-тэхнічнага прагрэсу** адносяць да XVII ст., калі адбываецца станаўленне навукі як сацыяльнага інстытута, які аказвае актыўны ўплыў на розныя бакі жыцця грамадства. У перыяд прамысловай рэвалюцыі XVIII–XIX стст. адбывалася паступальнае развіццё тэхнікі ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці. Вынікі НТП выявіліся ў стварэнні новых прылад працы, матэрыялаў, тэхналогій, крыніц энергіі, вырабе прынцыпова новых відаў прадукцыі. Так, у плане выкарыстання энергіі чалавецтва з XVIII ст.

Вынікі НТП

- Распрацоўка і шырокае выкарыстанне прынцыпова новых машын, якія працуюць у аўтаматычным рэжыме
- Стварэнне і ўкараненне якасна новых тэхналогій вытворчасці
- Адкрыццё і выкарыстанне новых відаў і крыніц энергіі
- Развіццё аўтаматызацыі вытворчых працэсаў на базе выкарыстання станкоў з праграмным кіраваннем, прамысловых робатаў
- Стварэнне і шырокае выкарыстанне новых відаў матэрыялаў

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце прыкладамі вынікі НТП у другой палове XX ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Навукова-тэхнічны прагрэс людзі ўспрымаюць па-рознаму. Адны бачаць у тэхналогіях вялікае зло, якое паволі забівае чалавецтва, іншыя ж, наадварот, успрымаюць іх як спосаб вырашэння найбуйнейшых сусветных праблем.

Савецкі фізік, акадэмік Акадэміі навук СССР А. Д. Сахараў лічыў, што «навукова-тэхнічны прагрэс не прынясе шчасця, калі не будзе дапаўняцца надзвычай глыбокімі зменамі ў сацыяльным, маральным і культурным жыцці чалавецтва».

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце топ-5 найважнейшых тэхналогій, вынайдзеных у другой палове XX ст. Растлумачце свой выбар. Вызначце станоўчы і адмоўны ўплыў гэтых тэхналогій на жыццё чалавека.*
2. *Як вы разумееце меркаванне А. Д. Сахарава? Ці згодныя вы з ім? Аргументуйце сваю думку.*
3. *Ад чаго, на вашу думку, залежыць, выступае НТП злом або дабром?*

прайшло шлях ад першых паравых рухавікоў да сучасных ядзерных рэактараў. На змену ручной працы прыйшло выкарыстанне станкоў з праграмным кіраваннем і аўтаматызаваных вытворчых сістэм.

НТП аказвае ўплыў не толькі на вытворчасць. Ён мяняе побыт чалавека, паляпшае ўмовы яго жыцця. Гэта звязана з выкарыстаннем бытавой тэхнікі, сучасных сродкаў сувязі. Крыніцай НТП выступае творчая дзейнасць чалавека ў працэсе навуковых даследаванняў.

Успомніце, што такое прамысловая рэвалюцыя.

2. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя: сутнасць і кірункі. У сярэдзіне XX ст. развіццё навукі і тэхнікі, укараненне іх дасягненняў у вытворчасць выйшлі на якасна іншы ўзровень. Пачалася **навукова-тэхнічная рэвалюцыя**. Дасягненні навукі і тэхнікі не толькі істотна змянілі характар вытворчых працэсаў, але і кардынальна паўплывалі на паўсядзённае жыццё чалавека. Ад таго, наколькі хутка ўкараняліся ў вытворчасць новыя адкрыцці, цяпер залежала канкурэнтаздольнасць не асобных прадпрыемстваў, а цэлых галін эканомікі і нават краін.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР) — карэннае якаснае пераўтварэнне прадукцыйных сіл грамадства, заснаванае на рэзкім скачку ў развіцці навукі і ператварэнні яе ў непасрэдную прадукцыйную сілу, вядучы фактар развіцця вытворчасці.

Асноўныя прыкметы НТР

Універсальнасць і ўсёахопнасць — НТР праяўляецца ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці (ад побыту да сучаснай вытворчасці) і датычыцца ў той ці іншай ступені ўсіх рэгіёнаў і краін свету

Паскарэнне навукова-тэхнічных пераўтварэнняў — адбываецца скарачэнне часавага адрэзка ад вынаходства да ўкаранення яго ў практыку, пастаяннае абнаўленне прадукцыі

Змяненне ролі чалавека ў працэсе вытворчасці — павышаюцца патрабаванні да ўзроўню кваліфікацыі працоўных рэсурсаў, павялічваецца доля разумовай працы

Змяненне структуры матэрыяльнай вытворчасці — расце доля апрацоўчых галін (машынабудавання, хімічнай прамысловасці, электраэнергетыкі), сельская гаспадарка набывае індустрыяльны характар, павялічваецца роля невытворчай сферы

Абапіраючыся на веды, засвоеныя на ўроках фізікі, хіміі і біялогіі, успомніце, якія навуковыя адкрыцці былі зроблены ў сярэдзіне XX ст.

Найважнейшай перадумовай НТР выступілі навуковыя адкрыцці ў галіне ядзернай фізікі і квантавай механікі, дасягненні кібернетыкі, мікрабіялогіі і біяхіміі.

Ядзерная энергетыка

На першым этапе НТР (сярэдзіна 1940-х — першая палова 1970-х гг.) яе асноўнымі кірункамі зрабіліся развіццё ядзернай энергетыкі, электронна-вылічальнай тэхнікі, асваенне космасу, выкарыстанне новых хімічных тэхналогій. Распрацоўкі, атрыманыя ў працэсе рэалізацыі ядзерных праектаў у СССР, ЗША і іншых краінах, пачалі актыўна выкарыстоўвацца ў мірных мэтах. З'явілася новая галіна — ядзерная энергетыка. У 1954 г. у СССР была ўведзена ў дзеянне першая ў свеце атамная электрастанцыя (г. Обнінск). Значны ўнёсак у развіццё ядзернай фізікі ў СССР зрабіў ураджэнец Мінска Я. Б. Зяльдовіч. Дзякуючы развіццю ракетабудаўніцтва пачалося асваенне космасу. У кастрычніку 1957 г. СССР запусціў на калязямную арбіту першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі, а ў 1961 г. Ю. А. Гагарын здзейсніў першы палёт чалавека ў космас. У 1969 г. адбылася высадка амерыканскіх астранаўтаў Н. Армстранга і Э. Олдрына на Месяц.

Асваенне космасу

Правообладатель Издательский центр БГУ

12 красавіка 1961 г. усе радыёстанцыі Зямлі спынялі свае перадачы, каб паведаміць сенсацыйную навіну — чалавек у космасе! У 9 гадз 57 хв паводле маскоўскага часу ТАСС перадаў паведамленне: «12 красавіка 1961 г. у Савецкім Саюзе выведзены на арбіту вакол Зямлі першы ў свеце карабель-спадарожнік „Усход“ з чалавекам на борце. Пілотам-касманаўтам касмічнага карабля-спадарожніка „Усход“ з'яўляецца грамадзянін Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік лётчык маёр Гагарын Юрый Аляксеевіч».

Дайце ацэнку гэтаму гістарычнаму факту.



Юрый Гагарын — першы ў свеце касманаўт

У 1965 г. савецкі касманаўт А. А. Лявонаў упершыню ажыццявіў выхад у адкрыты космас, даказаўшы такім чынам, што ў космасе можна працаваць, праводзіць навуковыя даследаванні.

Рэвалюцыйным адкрыццём, зробленым у 1940-я гг., было вынаходства электронна-вылічальных машын — правобразу сучаснага камп'ютара. Адна з першых амерыканскіх камп'ютарных машын ENIAC важыла 28 т і займала цэлы пакой. З'яўленне ЭВМ дазволіла перайсці да аснашчэння вытворчасці станкамі з праграмным кіраваннем, аўтаматызаванымі вытворчымі лініямі. Комплексная механізацыя вытворчасці зрабілася найважнейшым кірункам НТР.



ЭВМ «Страла». У 1954 г. у СССР пачаўся яе серыйны выраб. За чатыры гады было выпушчана восем машын

У паўсядзённым жыцці людзей з'явіліся транзістары, тэлевізары, пральныя машыны, аўтамабілі. З 1950-х гг. у важны сродак пасажырскіх перавозак ператварыўся самалёт. У 1955 г. міжнародны статус набыў аэрапорт Мінск-1.

3. Інфармацыйная рэвалюцыя як складнік НТР і яе ўплыў на развіццё грамадства. У другой палове 1970-х гг. пачаўся новы этап НТР, які атрымаў назву **інфармацыйнай рэвалюцыі**. Яе пачатак звязаны з вынаходствам міні-працэсара, які манціраваўся на адной мікрасхеме (чыпе). Гэта здзейсніла рэвалюцыю ў камп'ютарнай тэхніцы і апрацоўцы інфармацыі.

Інфармацыйная рэвалюцыя — якасныя змены ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства, якія адбываюцца ў выніку шырокага ўкаранення інфармацыйных тэхналогій.

Вынаходства дазволіла ствараць кампактныя і магутныя камп'ютары, якія зрабіліся даступнымі шырокаму колу карыстальнікаў. Развіццё мікрапрацэсараў і камп'ютарных тэхналогій прывяло да ўзнікнення новых галін, такіх як вытворчасць камп'ютараў, праграмнага забеспячэння, тэлекамунікацыі і інш. Поспехі ў развіцці камп'ютарных тэхналогій выступілі ключавой умовай ператварэння інфармацыі ў галоўны рэсурс развіцця сучаснай эканомікі.

Камп'ютарызацыя

Інтэрнэт

Найважнейшым элементам інфармацыйнай рэвалюцыі было ўкараненне сусветнай сеткі Інтэрнэт, што пачалося ў 1990-я гг. Без баз дадзеных, сістэм пошуку інтэрнэту не можа абыходзіцца ні вытворца тавараў і паслуг, ні іх спажывец. Мабільны тэлефон даў чалавеку магчымасць быць увесь час уключаным у інфармацыйнае асяроддзе інтэрнэту. Сектар інфармацыйных паслуг зрабіўся найбольш хуткім у развіцці элементам новай інфармацыйнай эканомікі.

Развіваліся біятэхналогіі і генная інжынерыя. На новы ўзровень выйшла вывучэнне касмічнай прасторы. Адбыліся сур'ёзныя змены ў побыце. Жыццё чалавека стала немагчыма ўявіць без інтэрнэту, ноўтбукаў, мабільных тэлефонаў, хатніх электронных прылад.

У апошняй траціне XX ст. адбылася трансфармацыя індустрыяльнага грамадства ў **постіндустрыяльнае**. У сваім развіцці яно абапіралася на веды, інфармацыю і створаныя на іх аснове найноўшыя тэхналогіі. Доля прамысловасці ў агульным аб'ёме вытворчасці ў развітых краінах скарацілася да 20–25 %. У эканоміцы развітых краін усё большую ролю пачала адыгрываць вытворчасць інфармацыі, якая ператварылася ў найважнейшы тавар.

Прамысловыя прадпрыемствы, каб быць канкурэнтаздольнымі, павінны пастаянна ўкараняць у вытворчасць найноўшыя дасягненні НТР.

Постіндустрыяльнае грамадства — грамадства, у якім сфера паслуг атрымлівае прыярытэтнае развіццё і пераважае над аб'ёмам прамысловай вытворчасці і вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

Чаму постіндустрыяльнае грамадства называюць інфармацыйным?

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Ці можна гэтую ілюстрацыю выкарыстаць у якасці сімвала постіндустрыяльнага грамадства? Чаму?*
2. *Сярод якасцей, што забяспечваюць канкурэнтаздольнасць чалавека постіндустрыяльнага грамадства, называюць: уменне знаходзіць і пастаянна паляпшаць веды, карыстацца імі ў розных жыццёвых сітуацыях; імкненне павышаць кваліфікацыю; уменне праяўляць ініцыятыву, самастойнасць і адказнасць, прымаючы рашэнні. Растлумачце сувязь згаданых якасцей з канкурэнтаздольнасцю чалавека. Дапоўніце спіс якасцямі, якіх постіндустрыяльнае грамадства патрабуе ад чалавека.*



Змены ў характары працы чалавека

У постіндустрыяльным грамадстве мяняецца характар працы чалавека. Аўтаматызаваная вытворчасць паступова выцясняе фізічную працу чалавека. Адбываецца масавы адток рабочай сілы з прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў сферу паслуг. Тут цяпер занята каля 2/3 тых, хто працуе. Першае месца займаюць паслугі, звязаныя з інтэлектуальнай дзейнасцю.

У новых умовах значна павялічыўся попыт на высокакваліфікаваных спецыялістаў разумовай працы.

Інфармацыйная рэвалюцыя стварае і пэўныя сацыяльныя праблемы. Адной з іх з'яўляецца віртуалізацыя жыцця чалавека. Віртуальная прастора зрабілася для шэрагу людзей найважнейшым асяродкам зносін, выцясняючы рэальныя міжасабовыя кантакты.

4. НТР і глабалізацыя. НТР была адной з найважнейшых перадумоў для ўзнікнення ў 1990-я гг. такой з'явы, як *глабалізацыя*.

Успомніце, што такое глабалізацыя.

Дзякуючы развіццю інфармацыйных тэхналогій, камунікацый усё большая колькасць краін актыўна выходзіць на сусветны рынак тавараў і паслуг.

Узаемазалежнасць эканомік

У яго межах фарміруецца новы міжнародны падзел працы. Вытворчасць камплектуючых, а пасля і іх зборка ажыццяўляюцца ў розных краінах свету. Гэта вядзе да росту ўзаемазалежнасці паміж эканомікамі розных краін, з'яўлення сусветнага спажыўца.

Міграцыя капіталу, рабочай сілы і тавараў

Усю планету ахоплівае рух капіталу, тавараў, паслуг і рабочай сілы. Месца той ці іншай краіны ў сусветнай эканоміцы ва ўмовах глабалізацыі вызначаецца перш за ўсё яе здольнасцю ствараць новыя веды і хутка іх выкарыстоўваць у розных сферах чалавечай дзейнасці.

Як вы лічыце, чыім інтарэсам адпавядае сусветны рух капіталу? Якія прычыны і мэты гэтага руху?

Праявай глабалізацыйных працэсаў у паўсядзённым жыцці выступае з'яўленне сусветных брэндаў (напрыклад, «Кока-Кола», «Хуавэй», «Ленова», «Адыдас»), якія робяцца даступнымі па ўсім свеце і аказваюць уплыў на густы спажыўцоў. Глабалізацыя праяўляецца і ў развіцці міжнароднай сеткі Інтэрнэт, якая аб'ядноўвае людзей з усіх куткоў планеты і забяспечвае доступ да інфармацыі і паслуг без межаў.

Каардынацыя эканамічнай дзейнасці

Глабалізацыя спараджае неабходнасць каардынацыі эканамічнай дзейнасці ў сусветным маштабе. Гэтую функцыю выконвае ў тым ліку створаная ў 1995 г. Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА).

Роля ТНК

Важная роля ў працэсе глабалізацыі належыць транснацыянальным карпарацыям (ТНК) — кампаніям, якія валодаюць вытворчымі падраздзяленнямі ў некалькіх краінах. Ствараючы свае прадпрыемствы па ўсім свеце, яны занялі ключавыя пазіцыі ў міжнародным гандлі, вытворчасці найважнейшых відаў тавараў. ТНК кантралююць асноўную масу тэхнічных распрацовак і фінансавых плыняў. Сваім фінансава-эканамічным патэнцыялам найбуйнейшыя ТНК пераўзыходзяць многія дзяржавы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

НАСТУПСТВЫ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

Станоўчыя

- Развіццё НТП;
- павышэнне якасці і даступнасці выпрацаваных тавараў і аказаных паслуг, узроўню жыцця людзей;
- магчымасць працаўладкавання ў краінах з дэфіцытам капіталу і рабочых рук;
- выкарыстанне ў нацыянальнай эканоміцы тэхналогій, інавацыйных дасягненняў іншых краін;
- развіццё сусветнага фінансавага рынку і інфармацыйных тэхналогій (ІТ-сектара);
- забеспячэнне свабоднага доступу да інфармацыі;
- культурнае збліжэнне розных краін

Адмоўныя

- Вычарпанне прыродных рэсурсаў, пагаршэнне экалогіі;
- высокая канкурэнцыя паміж нацыянальнымі прадпрыемствамі і ТНК;
- рост манапалізацыі рынкаў;
- павелічэнне разрыву ў эканамічным развіцці паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца;
- з'яўленне пагроз страты нацыянальнага суверэнітэту дзяржаў;
- страта самабытнасці народаў і культур

У чым, на вашу думку, заключаецца супярэчлівы характар глабалізацыі? Якім чынам глабалізацыя можа пагражаць нацыянальнаму суверэнітэту дзяржаў, самабытнасці народаў і культур?

5. Наступствы НТР. НТР аказала ўплыў на самыя розныя аспекты жыцця чалавека.

Рост ролі адукацыі

Ва ўмовах НТР значна ўскладняецца тэхніка. Вытворчасць патрабуе ад работніка здольнасці пастаянна вучыцца, таму істотна расце роля адукацыі.

Павелічэнне працягласці жыцця

Дзякуючы поспехам медыцыны заўважна выраслa сярэдняя працягласць жыцця людзей. У развітых краінах яна перавышае 80 гадоў. Шырокае выкарыстанне вакцын стварыла заслон на шляху эпідэмій многіх хвароб, якія раней прыводзілі да масавай смяротнасці. Аднак гэта не азначае вырашэння ўсіх праблем у барацьбе з эпідэміямі.

Развіццё медыцыны

Адным з найбольш важных кірункаў развіцця медыцыны з'яўляецца трансплантацыя органаў.

У 1970 г. у Беларусі акадэмік М. Я. Саўчанка выканаў першую перасадку ныркі. Гэта было вялікім поспехам у медыцыне нашай краіны: у іншых рэспубліках СССР і свеце такую аперацыю пачалі выконваць крыху пазней (Украіна — 1972 г., Вялікабрытанія — 1974 г.).

Пры правядзенні аперацый пачалі выкарыстоўваць лазер, што зрабіла іх больш бяспечнымі. Дасягнуты прагрэс у лячэнні ракавых захворванняў. Ствараць новыя прэпараты для барацьбы з хваробамі дазволілі дасягненні ў галіне геннай інжынерыі. Яе развіццё паставіла на парадак дня вельмі важнае пытанне аб тым, наколькі далёка можа зайсці навука ў справе змянення жыцця, стварэнні новай жывой істоты. Разам з тым дасягненні сучаснай медыцыны застаюцца недасяжнымі для значнай часткі насельніцтва Зямлі з прычыны рознага ўзроўню развіцця краін, разрыву ў даходах людзей.

«Зялёная рэвалюцыя»

НТР дала штуршок «зялёнай рэвалюцыі». Пад ёй разумеюць актыўнае ўкараненне агратэхнічных наватвораў у сельскай гаспадарцы, накіраваных на павелічэнне ўрадлівасці глебы і павышэнне прадукцыйнасці працы. Гаворка ідзе пра шырокае выкарыстанне хімічных угнаенняў, прымяненне сучаснай тэхнікі, вывядзенне новых сартоў раслін і парод жывёл. Дасягненні «зялёнай рэвалюцыі» шмат у чым звязаныя з развіццём генетыкі, значны ўнёсак у якую зрабіў беларускі вучоны А. Р. Жэбрак.

«Зялёная рэвалюцыя» паспрыяла росту сельскагаспадарчай вытворчасці і дала шанц накарміць насельніцтва Зямлі, якое расце. Аднак яе вынікі моцна адрозніваліся ў розных краінах. Прыкладам паспяховага ажыццяўлення «зялёнай рэвалюцыі» з'яўляюцца Індыя, Пакістан і Мексіка. У афрыканскіх краінах станоўчыя змены ў сельскай гаспадарцы былі мінімальныя. Гэта

Правообладатель Издательский центр БГУ

звязана з неспрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі, пастаяннымі ўнутранымі і міждзяржаўнымі канфліктамі, неэфектыўным выкарыстаннем выдзеленых на пераўтварэнні сродкаў. Шырокае ўжыванне хімічных прэпаратаў у сельскай гаспадарцы ў асобных краінах узмацняла экалагічныя праблемы.

НТР істотна палегчыла працу чалавека як на вытворчасці, так і ў побыце. Значнае пашырэнне ў паўсядзённым жыцці атрымалі такія прадметы масавага ўжытку, як аўтамабіль, бытавая тэхніка, сродкі сувязі. Паменшыўся кошт тавараў, што дазволіла чалавеку купляць іх больш, часцей абнаўляць. Удасканаленне транспарту паспрыяла развіццю турызму.

Уплыў НТР на паўсядзённае жыццё чалавека

Як вы лічыце, якія катэгорыі рабочых у першую чаргу закранула беспрацоўе?

Да негатыўных наступстваў НТР варта аднесці рост беспрацоўя, экалагічныя праблемы, шкодны ўплыў рознага кшталту сінтэтычных матэрыялаў на асяродак пражывання чалавека. Тэхнагенныя катастрофы могуць прывесці да непапраўных наступстваў і ў выніку да гібелі ўсяго чалавецтва. Такую самую пагрозу ўяўляюць і велізарныя запасы ядзернай зброі. Такім чынам, НТР стварыла комплекс новых праблем, якія ўяўляюць пагрозу для існавання чалавецтва ў цэлым.

Негатыўныя наступствы НТР

Назавіце найбуйнейшыя тэхнагенныя катастрофы апошніх дзесяцігоддзяў. Да якіх наступстваў яны прывялі?

Адным з фактараў, якія вызначылі гісторыю сучаснага грамадства, выступіла НТР. Дасягненні навукі і тэхнікі не толькі істотна змянілі характар вытворчых працэсаў, але і карэнным чынам пераўтварылі чалавечае жыццё. НТР спрыяе збліжэнню шляхоў развіцця асобных краін і народаў, з'яўляецца адным з фактараў глабалізацыі. Але ў той жа час развіццё навукі і тэхнікі спараджае шэраг сацыяльных і экалагічных праблем, якія ўяўляюць пагрозу для чалавецтва.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
1964 г. — у ЗША пачынаецца выраб серыі камп'ютараў IBM 360	1963 г. — вынаходства акадэмікам Ж. І. Алфёравым паўправадніковага лазера, на выкарыстанні якога заснаваная работа мабільных тэлефонаў, інтэрнэту, лазерных указак, сонечных батарэй і інш.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Растлумачце значэнне паняццяў «навукова-тэхнічны прагрэс» і «навукова-тэхнічная рэвалюцыя». Што ў іх агульнага? Чым яны адрозніваюцца?
2. Якім чынам НТР спрыяе глабалізацыі?
3. Складзіце схему, якая адлюструе змены, што адбыліся ў розных сферах грамадскага жыцця ў выніку ўкаранення інфармацыйных тэхналогій. Дайце ім ацэнку.
4. Што такое глабалізацыя? Як яна ўплывае на сучаснае грамадства?
5. Ахарактарызуйце станоўчыя і адмоўныя наступствы НТР.

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 34. Краіны Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.

РЫНАЧНАЯ ЭКАНОМІКА
ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ
ДЗЯРЖАВА ДАБРАБЫТУ
ІНТЭГРАЦЫЯ **НЕАКАНСЕРВАТЫЗМ**
ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ **ПЛАН МАРШАЛА**
ДЭКАЛАНІЗАЦЫЯ

Краіны заходняга свету

1. Паняцце «заходні свет». Паняцце «заходні свет», або «заходняя цывілізацыя», аб'ядноўвае краіны, што прытрымліваюцца агульных каштоўнасцей, у аснове якіх ляжыць каталіцкае або пратэстанцкае хрысціянства. Заходні свет уключае краіны Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, ЗША, Канаду, Аўстралію, Новую Зеландыю. Некаторыя навукоўцы адносяць да яго і Японію.

Успомніце, што такое цывілізацыя.

Асноўныя прыкметы заходняй цывілізацыі

Першапачаткова аснову каштоўнасцей заходняй цывілізацыі складала антычная спадчына. Сінтэз хрысціянскіх каштоўнасцей і антычных традыцый спарадзіў заходні лад жыцця, у аснове якога абвяшчалася павага да правоў чалавека, прыватнай уласнасці, вяршэнства закону. У наш час для краін Захаду характэрныя рыначная эканоміка і парламенцкая дэмакратыя.

Успомніце, што такое парламент. У якой краіне і калі ён з'явіўся?

У канцы 80-х — пачатку 90-х гг. XX ст. у сацыялістычных краінах Еўропы адбыліся глыбокія палітычныя змены, прызнаныя ў гэтых краінах дэмакратычнымі рэвалюцыямі. Былыя сацыялістычныя краіны зрабіліся часткай заходняга свету. Рэспубліка Беларусь непасрэдна мяжуе з ім, што істотна ўплывае на яе геапалітычнае становішча.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Савецкі гісторык Л. С. Васільеў адзначае, што заходняя цывілізацыя прайшла праз мноства этапаў развіцця, прытым каштоўнасці, мараль і памкненні людзей, інстытуты грамадства і эканоміка ў розны час і ў розных краінах часам супрацьлеглыя. Таму характэрныя прыкметы гэтай цывілізацыі вылучыць цяжка, але звычайна ўсе разумеюць, што і каго маюць на ўвазе пад тэрмінам «Захад».

1. *Выкарыстоўваючы веды, засвоеныя на ўроках сусветнай гісторыі, вызначце асноўныя этапы развіцця заходняй цывілізацыі.*
2. *Складзіце кароткую гістарычную даведку «Заходняя цывілізацыя ў другой палове XX ст.», вылучыўшы яе характэрныя прыкметы. Выкарыстайце для выканання задання тэкст параграфа.*

Рост уплыву «левых» партый

Чым, на вашу думку, тлумачыўся рост папулярнасці «левых» партый у краінах Захаду пасля Другой сусветнай вайны?

2. Палітычная сістэма краін Захаду. Адразу пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў краінах Захаду вырасла папулярнасць «левых» партый: сацыял-дэмакратаў і камуністаў. У Італіі і Францыі прадстаўнікі камуністычных партый увайшлі ў склад урадаў, але ў 1947 г. вымушаны былі іх пакінуць пад ціскам ЗША, якія патрабавалі ў абмен на фінансавую падтрымку ў рамках плана Маршала выгнання камуністаў з органаў улады. Пазіцыі сацыял-дэмакратычных партый былі моцныя ў Вялікабрытаніі, Францыі і скандынаўскіх краінах.

Пасля Другой сусветнай вайны ў ФРГ і Італіі былі створаны ўплывовыя партыі, якія ў аснову сваіх праграм паклалі хрысціянскія каштоўнасці. У ЗША працягвала функцыянаваць двухпартыйная сістэма, якая ўключала Рэспубліканскую і Дэмакратычную партыі.

У другой палове XX ст. у заходніх дзяржавах парламенты адыгрывалі галоўную ролю ў органах дзяржаўнай улады. Дзейнасць партый канцэнтра-

Правообладатель Издательский центр БГУ

валася на ўдзеле ў выбарах з мэтай прыходу да ўлады.

У Іспаніі, Партугаліі і Грэцыі да сярэдзіны 1970-х гг. захоўваліся дыктатарскія рэжымы.

Палітычныя крызісы

Аднак развіццё парламенцкай дэмакратыі не ўратавала ад палітычных канфліктаў і крызісаў дзяржавы Захаду. У 1968 г. яны сутыкнуліся з масавымі выступленнямі моладзі. Удзельнікі пратэстаў дабіваліся рэфармавання буржуазнага грамадства, якое лічылі несправядлівым і састарэлым з пункту гледжання маралі новага пакалення. У ЗША ў 1960-я гг. праходзілі масавыя выступленні афраамерыканцаў за свае грамадзянскія правы і пратэсты супраць вайны ў В'етнаме.



Адной са знакавых падзей у гісторыі амерыканскага антываеннага руху быў паход на Пентагон — акцыя пратэсту супраць вайны ў В'етнаме, арганізаваная 21 кастрычніка 1967 г.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, ці дасягнулі пратэстуючыя сваёй мэты.

Неакансерватызм

У сярэдзіне 1970-х гг. пачаўся сусветны эканамічны крызіс. У гэтых умовах палітычнай сілай, якая прапанавала перайсці да новай палітыкі больш актыўнага развіцця рынкавых адносін і падтрымкі прадпрымальніцтва, зрабіліся неакансерватары. Найбольш актыўна пераход да новай мадэлі развіцця эканомікі падтрымалі Кансерватыўная партыя ў Вялікабрытаніі і Рэспубліканская партыя ў ЗША. У 1979 г. лідар Кансерватыўнай партыі М. Тэтчар

стала прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі. У ЗША ў 1981 г. пасаду прэзідэнта заняў лідар Рэспубліканскай партыі Р. Рэйган.


Аднаўленне эканомікі пасля вайны

3. Эканамічная сістэма краін Захаду. «Дзяржава дабрабыту». Пасля Другой сусветнай вайны аб'ём вытворчасці ў краінах Заходняй Еўропы складаў 70 % ад даваеннага. У ЗША ў ваенныя гады, наадварот, назіраўся значны эканамічны рост. На момант заканчэння вайны на ЗША прыпадала больш за палову прамысловай вытворчасці капіталістычных дзяржаў.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Плакат, прысвечаны плану Маршала. «Якое б ні было надвор'е, толькі разам мы дасягнем дабрабыту»



Карыкатуры «План Маршала на практыцы»

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся ўмовы, на якіх выдавалася дапамога згодна з планам Маршала. Якія дзяржавы атрымалі гэтую дапамогу? Якія дзяржавы і чаму адмовіліся ад яе?*
2. *Разгледзьце плакат і карыкатуры, прысвечаныя плану Маршала. Вызначце стаўленне іх аўтараў да плана Маршала. У якіх краінах маглі быць створаны гэтыя карыкатуры і плакат?*
3. *Як вы лічыце, аўтары якой ілюстрацыі бліжэйшыя да праўды? Аргументуйце свой адказ.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Краіны Заходняй Еўропы досыць хутка, да пачатку 1950-х гг., аднавілі сваю эканоміку. У гэтым ім дапамог *план Маршала*. Згодна з ім 16 еўрапейскіх дзяржаў і Турцыя атрымалі амерыканскую дапамогу на суму 13 млрд долараў. СССР адмовіўся ад удзелу ў плане Маршала.

Эканамічнае развіццё ў 1950–1960-я гг.

У 50–60-я гг. XX ст. эканамічнае развіццё заходніх дзяржаў вылучалася высокімі тэмпамі росту. Важным фактарам, які спрыяў росту вытворчасці, выступіла дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі. Яно было не толькі істотным сродкам мадэрнізацыі вытворчасці, але і інструментам сацыяльнай падтрымкі дзяржавай шырокіх колаў насельніцтва. Дзяржава актыўна падтрымлівала сацыяльныя праграмы. Значна выраслі даходы насельніцтва. Вялікія сродкі выдзяляліся на будаўніцтва жылля, школ, бальніц для людзей з нізкімі даходамі.

«Дзяржава дабрабыту»

Такая палітыка прывяла да фарміравання на Захадзе мадэлі развіцця пад назвай «дзяржава дабрабыту». Гэтая мадэль характарызавалася высокім узроўнем жыцця і спажывання для абсалютнай большасці насельніцтва, сацыяльнай абароненасцю чалавека. Не толькі прадстаўнікі сярэдняга класа, але і частка тых, хто належаў да маламаёмных пластоў насельніцтва, мелі доступ да якаснай аховы здароўя, адукацыі, у тым ліку вышэйшай. У выпадку страты здароўя або працы большасць грамадзян атрымлівалі гарантаваную матэрыяльную дапамогу. Асабліва высокай ступенню сацыяльнай абароны насельніцтва вылучаліся скандынаўскія дзяржавы. Існавалі таксама дапамогі па беднасці для сем'яў з дзецьмі, пажылыя людзі атрымлівалі пенсіі.

Гэтая палітыка была адказам Захаду на тыя сацыяльныя гарантыі, якія мела насельніцтва сацыялістычных краін, у тым ліку БССР.

«ДЗЯРЖАВА ДАБРАБЫТУ»

Пашырэнне дзяржаўнага сектара эканомікі

Сацыяльныя праграмы, скіраваныя на павышэнне дабрабыту людзей

Станоўчыя наступствы

- скарачэнне беднасці, няроўнасці;
- рост узроўню жыцця насельніцтва: доступ да аховы здароўя, адукацыі, іншых сацыяльных паслуг;
- прадухіленне сацыяльных хваляванняў, павышэнне стабільнасці ў грамадстве

Адмоўныя наступствы

- павелічэнне падаткаў;
- рост дзяржаўнага доўгу;
- павелічэнне колькасці бюракратычнага апарату;
- зніжэнне ўзроўню працоўнай актыўнасці насельніцтва праз звышвысокую сацыяльную абароненасць, з'яўленне дармаедства

Як вы лічыце, чаму рэалізацыя мадэлі «дзяржава дабрабыту» прывяла да такіх наступстваў?

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, у чым заключаўся нафтавы крызіс 1973 г. і як ён паўплываў на эканамічнае развіццё краін Захаду.


У сярэдзіне 1970-х гг. краіны Захаду сутыкнуліся з глыбокім эканамічным крызісам. Яго наступствам была змена эканамічнай мадэлі развіцця, якую ажыццявілі неакансерватары.

Прыйшоўшы да ўлады, яны рэзка абмежавалі дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, прыватызавалі многія дзяржаўныя прадпрыемствы, скарацілі сацыяльныя выдаткі на медыцыну, адукацыю, дапамогу бедным пластам насельніцтва, пераклаўшы адказнасць за жыццё чалавека на яго самога.

Этапы еўрапейскай інтэграцыі

4. Еўраінтэграцыя. Пасля Другой сусветнай вайны ў Заходняй Еўропе ўзмацнілася імкненне да інтэграцыі ў самых розных галінах. Краіны гэтага рэгіёна ўсё больш збліжала праблема аднаўлення і развіцця эканомікі, усведамленне агульных духоўных і палітычных каштоўнасцей.

Правообладатель Издательский центр БГУ



5. Асноўныя этапы дэкаланізацыі. Пасля Другой сусветнай вайны пачаўся працэс распаду каланіяльных імперый вядучых дзяржаў Захаду, што атрымаў назву *дэкаланізацыі*. У выніку вайны Вялікабрытанія, Францыя і іншыя дзяржавы, якія валодалі большасцю калоній, былі аслаблены. Яны не мелі дастаткова сіл, каб утрымліваць калоніі пад сваёй уладай. Еўрапейцы, перажыўшы спусташальную вайну, не хацелі ваяваць супраць народаў калоній, што змагаліся за сваю незалежнасць. Войны, якія вялі Францыя і Нідэрланды, каб захаваць кантроль над В'етнамам (1946–1954 гг.) і Інданезіяй (1945–1949 гг.) адпаведна, скончыліся перамогай народаў гэтых калоній, што неўзабаве зрабіліся незалежнымі дзяржавамі.

Перадумовы дэкаланізацыі

Успомніце, якія яшчэ гістарычныя працэсы паскорылі дэкаланізацыю.

Значную падтрымку народам каланіяльных краін у барацьбе за незалежнасць аказаў Савецкі Саюз.

Падтрымка СССР народаў каланіяльных краін у барацьбе за незалежнасць

Яна ўключала матэрыяльную, у тым ліку ваенна-тэхнічную, дапамогу. СССР выступіў адным з ініцыятараў прыняцця ў 1960 г. Генеральнай Асамблеяй ААН Дэкларацыі аб наданні незалежнасці каланіяльным краінам і народам. Барацьба народаў калоній знаходзіла падтрымку і спачуванне сярод савецкіх людзей. У БССР у тыя гады таксама праходзілі разнастайныя масавыя мерапрыемствы, удзельнікі якіх патрабавалі надання незалежнасці каланіяльным краінам.

Дэкаланізацыю можна лічыць завершанай з моманту набыцця ў 1990 г. незалежнасці Намібіяй — апошняй калоніяй на афрыканскім кантыненце. У выніку дэкаланізацыі на карце свету з'явілася каля 100 новых незалежных дзяржаў.

Этапы дэкаланізацыі

1945 г. — сярэдзіна 1950-х гг.	Сярэдзіна 1950-х — сярэдзіна 1970-х гг.	Сярэдзіна 1970-х — пачатак 1990-х гг.
Незалежнасць атрымалі 11 дзяржаў у Азіі і 1 у Афрыцы (Лівія)	Незалежнасць атрымала значная частка краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі	Крах партугальскай каланіяльнай імперыі, завяршэнне дэкаланізацыі

Міжнародныя канфлікты

Вынікам дэкаланізацыі былі некаторыя міжнародныя канфлікты, што цягнуцца да нашых дзён.

Вызваленне Карэі з-пад улады Японіі было ажыццёўлена Чырвонай арміяй (поўнач) і войскамі ЗША (поўдзень краіны). У выніку ўтварыліся дзве дзяржавы, якія абралі розныя мадэлі развіцця. Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка (КНДР) пайшла шляхам сацыялізму, а ў Рэспубліцы Карэя зацвердзіўся капіталізм.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Супрацьстаянне паміж імі прывяло да вайны 1950–1953 гг. Канфлікт не ўрэгуляваны да цяперашняга часу.

Ад часу дэкаланізацыі бярэ свой пачатак канфлікт на Блізкім Усходзе. У 1947 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла рашэнне стварыць на тэрыторыі Палесціны, якая знаходзілася пад уладай Вялікабрытаніі, дзве дзяржавы: арабскую і яўрэйскую. Яўрэйскае насельніцтва Палесціны ў 1948 г. абвясціла дзяржаву Ізраіль. Арабы не пагадзіліся з падзелам Палесціны і не прызналі Ізраіль. Арабская дзяржава ў Палесціне так і не была створана. Блізкі Усход перажыў шэраг войнаў паміж арабскімі краінамі і Ізраілем. Ваенна-палітычнае супрацьстаянне тут не спыняецца і сёння.

6. Шляхі развіцця вызваленых краін. За новымі незалежнымі дзяржавамі Азіі і Афрыкі, а таксама краінамі Лацінскай Амерыкі замацавалася назва «краіны, якія развіваюцца», або краіны «трэцяга свету».

Краіны «трэцяга свету»

У залежнасці ад абранага шляху грамадскага развіцця іх можна падзяліць на тры асноўныя групы.

Шляхі развіцця краін «трэцяга свету»

Капіталістычны	Сацыялістычны	Краіны «сацыялістычнай арыентацыі», якія абвясцілі пра будаўніцтва сацыялізму з улікам сваіх нацыянальных умоў
Паўднёвая Карэя, Філіпіны, Сінгапур, Тайланд, Кувейт, Катар, ААЭ	Манголія, В'етнам, Кітай, Лаос, Кампучыя (Камбоджа), КНДР, Куба	Афганістан, Алжыр, Эфіопія, Ангола, Егіпет, Ірак, Нікарагуа

Найбуйнейшай дзяржавай сярод краін «трэцяга свету» з'яўляецца Кітай. У выніку перамогі Камуністычнай партыі Кітая ў грамадзянскай вайне

Асаблівы шлях развіцця КНР

ў 1949 г. была створана Кітайская Народная Рэспубліка (КНР) і краіна пайшла шляхам будаўніцтва сацыялізму. Кіраўнік КНР Маа Цзэдун абвясціў асаблівы шлях развіцця сваёй краіны. З дапамогай «вялікага скачка» ў эканамічным развіцці КНР павінна была ў самыя кароткія тэрміны пабудаваць сацыялізм, а пасля і камунізм, апярэдзіўшы Савецкі Саюз. Пасля смерці Маа Цзэдуна ў 1976 г. новае кіраўніцтва краіны адмовілася ад такой палітыкі і ўзяло курс на правядзенне рыначных рэформаў у эканоміцы пры захаванні манаполіі Камуністычнай партыі на ўладу. Ужо ў 1980-я гг. рэформы прывялі да значнага росту кітайскай эканомікі і ўзроўню жыцця людзей.

Перашкоды на шляху да прагрэсу

Краінам, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, належала вырашаць складаныя задачы будаўніцтва сваёй дзяржавы і пераадолення эканамічнай адсталасці. У вырашэнні гэтых задач большасць краін, асабліва ў Афрыцы, сутыкнуліся з праблемамі. На іх тэрыторыі, як правіла, жылі людзі, якія належалі да розных этнічных і рэлігійных груп. Нестабільны палітычны лад і нізкі ўзровень жыцця спараджалі шматлікія канфлікты, у тым ліку этнічныя і рэлігійныя. Звычайнай з'явай для краін, якія развіваюцца, былі грамадзянскія войны і дзяржаўныя перавароты. Актыўную ролю ў палітычным жыцці адыгрывала армія.

Для краін Лацінскай Амерыкі, хоць яны і здабылі незалежнасць значна раней, чым азіяцкія і афрыканскія дзяржавы, таксама была характэрная вялікая роля вайскоўцаў у палітычным жыцці. У 1960–1980-я гг. перыяды ваенных дыктатур перажылі Бразілія, Аргенціна і Чылі. Захоўвалася залежнасць эканомік маладых дзяржаў ад метраполій.

Краіны «трэцяга свету» пастаўлялі на сусветны рынак сельскагаспадарчую прадукцыю, сыравіну, а куплялі дарагія прамысловыя тавары. Шмат у якіх новых дзяржавах была наладжана вытворчасць адна-

Правообладатель Издательский центр БГУ

го-двух відаў прадукцыі, напрыклад цукру, какавы або медзі. Таму іх эканомікі знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад попыту на сусветным рынку на вельмі абмежаваны пералік тавараў. Адмоўна на эканамічнае развіццё многіх краін, асабліва Афрыкі, уплывалі неспрыяльныя ўмовы надвор'я.

Залежнасць ад попыту на рынку на абмежаваны пералік тавараў

СССР аказваў дапамогу былым каланіяльным краінам: даваў крэдыты, пастаўляў абсталяванне для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Пры садзеянні СССР у былых каланіяльных краінах будавалі прамысловыя прадпрыемствы, гідраэлектрастанцыі, навучальныя ўстановы, бальніцы, стадыёны і інш. Савецкія спецыялісты працавалі ў розных галінах эканомікі, навучалі мясцовае насельніцтва і перадавалі свой досвед. У Маскве быў створаны Універсітэт дружбы народаў для падрыхтоўкі кадраў з былых каланіяльных краін. БССР разам з іншымі рэспублікамі СССР аказвала маладым дзяржавам значную эканамічную дапамогу, рыхтавала нацыянальныя кадры.

Дапамога СССР былым калоніям

Напрыканцы 1980-х гг. шэраг краін Азіі — Рэспубліка Карэя, Сінгапур, Малайзія — здолелі дасягнуць істотных поспехаў у развіцці прамысловасці і ўвайшлі ў лік «новых індустрыяльных дзяржаў». У Лацінскай Амерыцы значны крок у эканамічным развіцці ў гэты час зрабілі Чылі і Бразілія.

Новыя індустрыяльныя дзяржавы

Досыць хутка пераадолеўшы наступствы Другой сусветнай вайны, на 1950-я гг. краіны Захаду ўжо адчувалі эканамічны бум, што дазволіла казаць пра «дзяржаву дабрабыту». У другой палове XX ст. актывізаваліся інтэграцыйныя працэсы ў Заходняй Еўропе. У выніку дэкаланізацыі з'явілася вялікая колькасць новых незалежных дзяржаў. У той час як некаторыя краіны, што вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, мелі пэўны прагрэс у развіцці, іншыя знаходзіліся ў сітуацыі палітычнай і эканамічнай нестабільнасці.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
1992 г. — падпісанне Маастрыхцкай дамовы аб утварэнні Еўрапейскага саюза (увайшла ў сілу ў 1993 г.)	1991 г. — падпісанне Пагаднення аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Што такое «заходні свет»? Пералічыце прыкметы заходняга грамадства.
2. Ахарактарызуйце асаблівасці палітычнага развіцця краін Захаду пасля Другой сусветнай вайны. Якія змены адбываліся ў іх палітычным жыцці ў той час? Чым яны былі абумоўлены?
3. Вылучыце асноўныя перыяды эканамічнага развіцця краін Захаду ў другой палове XX ст. Дайце кароткую характарыстыку кожнага з іх.
4. Назавіце фактары, якія паспрыялі актывізацыі інтэграцыйных працэсаў у Заходняй Еўропе. Якія міждзяржаўныя аб'яднанні былі створаны?
5. Назавіце фактары, якія паспрыялі працэсу дэкаланізацыі. Ахарактарызуйце яе вынікі.
6. Ахарактарызуйце шляхі развіцця вызваленых краін. Якія агульныя праблемы ім неабходна было вырашыць?

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 35. СССР у пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.)

«АДЛІГА» РЭАБІЛІТАЦЫЯ
ЦАЛІНА «ЗАСТОЙ»
ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ
ПЕРАБУДОВА ГАЛОСНАСЦЬ
«ПАРАД СУВЕРЭНІТЭТАЎ»

Успомніце асноўныя прыкметы грамадска-палітычнай сістэмы СССР у 1930-я гг. Якую ролю савецкая грамадска-палітычная сістэма адыграла ў перамозе СССР у Вялікай Айчыннай вайне?

1. Палітычная сістэма. Перамога СССР над нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі абумовіла значны рост міжнароднага аўтарытэту Савецкага Саюза і пашырыла межы яго ўплыву. Для грамадска-палітычнай сістэмы СССР было характэрнае захаванне тых самых прынцыпаў і падыходаў, якія склаліся ў даваенны час.

Вярхоўны Савет СССР	Савет Народных Камісараў СССР (у 1946 г. пераўтвораны ў Савет Міністраў)	Абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы народных дэпутатаў
Сістэма органаў дзяржаўнай улады ў СССР (паводле Канстытуцыі 1936 г.)		
Найвышэйшы орган заканадаўчай улады, выбіраўся грамадзянамі тэрмінам на 4 гады	Найвышэйшы выканаўчы і распарадчы орган	Мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання

Выбары ў Вярхоўны Савет СССР і мясцовыя Саветы

На выбарах у Вярхоўны Савет СССР (1946 г.) дэпутаты «непарушнага блока камуністаў і беспартыйных» атрымалі абсалютную падтрымку выбаршчыкаў. У 1946–1947 гг. былі абраныя дэпутаты мясцовых Саветаў, у якіх вялікую ролю пачалі адыгрываць былыя франтавікі, што павысіла аўтарытэт органаў улады на месцах.

У **1977 г.** была прынятая новая *Канстытуцыя СССР*. У яе быў уключаны артыкул 6, які абвяшчаў Камуністычную партыю Савецкага Саюза (КПСС) кіруючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы. Камуністычная партыя захоўвала ключавую ролю ў грамадска-палітычнай сістэме СССР і саюзных рэспублік. КПСС ажыццяўляла кіраўніцтва масавай маладзёжнай арганізацыяй — Усесаюзным Ленінскім Камуністычным Саюзам Моладзі (камсамолам). Камсамол быў актыўным памочнікам і рэзервам КПСС.

Выбары ў Саветы праводзіліся на безальтэрнатыўнай аснове. Дзейнасць Саветаў усіх узроўняў не была самастойнай і, як правіла, зводзілася да зацвярджэння прынятых ужо рашэнняў.

Рэформы эпохі перабудовы

Ад сярэдзіны 1980-х гг. пачалося маштабнае рэфармаванне сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сфер жыцця савецкага грамадства. У 1988 г. былі ўнесеныя змены ў Канстытуцыю СССР. Была здзейснена спроба вярнуць Саветам усю паўнату ўлады і зрабіць іх незалежнымі ад КПСС. Вышэйшым органам заканадаўчай улады рабіўся З'езд народных дэпутатаў СССР, які фарміраваў Вярхоўны Савет СССР. Быў прыняты новы выбарчы закон, паводле якога прадугледжваліся выбары ва ўсе органы прадстаўнічай улады на альтэрнатыўнай аснове (1/3 месцаў пакідалі для прадстаўнікоў дзяржаўных грамадскіх аб'яднанняў). У 1989 г. адбыліся выбары З'езда народных дэпутатаў СССР.

Напрыканцы 1980-х гг. ва ўсіх рэспубліках узніклі апазіцыйныя рухі ў форме народных франтоў. Іх выступленні насілі яскравы нацыяналістычны і сепаратысцкі характар, а дзейнасць была скіраваная на дасягненне выхаду рэспублік са складу СССР.

Правообладатель Издательский центр БГУ

III пазачарговы З’езд народных дэпутатаў СССР (сакавік 1990 г.) адмяніў арт. 6 Канстытуцыі СССР, ліквідаваўшы манаполію КПСС на ўладу ў краіне. На тым самым III пазачарговым З’ездзе народных дэпутатаў СССР М. Гарбачоў быў абраны Прэзідэнтам СССР.

Аднак многія дзеянні саюзнай улады ў спробах утрымаць сітуацыю былі запозненыя, а некаторыя, наадварот, абвастралі сацыяльна-палітычную абстаноўку. Напрыканцы 1980-х гг. у Савецкім Саюзе пачаўся *«парад суверэнітэтаў»*.

Успомніце, што такое «парад суверэнітэтаў». У чым ён выяўляўся?

2. Узаемаадносіны ўлады і грамадства: асноўныя этапы развіцця. Характар узаемаадносін савецкай улады і грамадства ў пасляваенны перыяд змяняўся, што было абумоўлена як аб’ектыўнымі, так і суб’ектыўнымі фактарамі.

Вяртанне да мірнага жыцця

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны савецкая краіна вярталася да мірнага жыцця: было адменена надзвычайнае становішча, аднаўлялі работу дзяржаўныя, навуковыя, адукацыйныя ўстановы, быў зноў уведзены 8-гадзінны рабочы дзень, паступова спыніліся звышурочныя работы. Аднак напрыканцы 1940-х гг. стала відавочным вяртанне да палітычных метадаў 1930-х гг.

«Адліга»

Пасля смерці І. В. Сталіна актывізавалася рэабілітацыя ахвяр рэпрэсій, яна паскорылася пасля XX з’езда КПСС. На закрытым пасяджэнні ў лютым 1956 г. у дакладзе «Аб культе асобы і яго наступствах» М. С. Хрушчоў рашуча асудзіў многія дзеянні сталінскага кіраўніцтва, але адказнасць за дапушчаныя памылкі, у тым ліку падчас Вялікай Айчыннай вайны, усклаў выключна на І. В. Сталіна. Такім чынам з партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў таго часу (а да іх належаў і сам М. С. Хрушчоў) адказнасць за памылкі мінулага здымалася.

Прарыў у асваенні космасу, іншыя поспехі савецкіх вучоных напачатку 1960-х гг. надалі кіраўніцтву

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Кіраўнік дзяржавы	Асноўныя рысы ўнутранай палітыкі
Да сакавіка 1953 г.	
 **І. В. Сталін** (1878–1953), генеральны сакратар ЦК КПСС, кіраўнік урада	Узмацненне аўтарытарнага рэжыму. Захаванне характэрных для перыяду вайны мабілізацыйных метадаў вырашэння праблем, што ўзнікалі, жорсткай цэнтралізацыі кіравання і размеркавання рэсурсаў
1953–1964 гг.	
 **М. С. Хрушчоў** (1894–1971), першы сакратар ЦК КПСС, ад 1958 г. — кіраўнік урада	Лібералізацыя грамадска-палітычнай сітуацыі, частковая рэабілітацыя ахвяр палітычных рэпрэсій. Непрадуманыя рэформы сталі падставай для адстаўкі з абвінавачваннем у валюнтарызме. Узмацненне кантролю над царквой
1964 — лістапад 1982 г.	
 **Л. І. Брэжнеў** (1906–1982), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР	Час стабільнасці, росту дабрабыту насельніцтва і аўтарытэту СССР на міжнароднай арэне. Запаволенне тэмпаў сацыяльна-эканамічнага росту
Лістапад 1982 — люты 1984 г.	
 **Ю. У. Андропаў** (1914–1984), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР	Пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў, укараненне дасягненняў НТП, інтэнсіфікацыя вытворчасці. Спроба ўзмацніць адказнасць кіруючых кадраў, дысцыпліну ў працоўных калектывах
Люты 1984 — сакавік 1985 г.	
 **К. У. Чарненка** (1911–1985), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР	Узмацненне ролі прафсаюзаў. Вызначэнне ў якасці галоўнага шляху інтэнсіфікацыі эканомікі НТП. Спробы правесці рэформу адукацыі

Правообладатель Издательский центр БГУ

Кіраўнік дзяржавы		Асноўныя рысы ўнутранай палітыкі
Сакавік 1985 — снежань 1991 г.		
	**М. С. Гарбачоў** (1931–2022), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР (да 1989 г.), Старшыня Вярхоўнага Савета СССР (1989–1990), Прэзідэнт СССР (1990–1991)	Беспаспяховыя спробы рэалізацыі рэформаў, накіраваных на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і рост дабрабыту насельніцтва. Дэстабілізацыя сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сітуацыі

1. *Прааналізуйце назвы пасад першых асоб СССР. Зрабіце вывады наконт змен у сістэме органаў дзяржаўнай улады СССР.*
2. *Што сведчыла пра зрошчванне ў СССР дзяржаўнага і партыйнага апарату?*
3. *Падзяліцеся ў класе на групы. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце фактамі асноўныя кірункі ўнутранай палітыкі СССР ва ўказаныя перыяды. У чым заключаліся дасягненні і пралікі ва ўнутранай палітыцы СССР у гэты час?*

краіны ўпэўненасць у бязмежных магчымасцях савецкага грамадства. Так з'явіліся лозунгі пра магчымасць «дагнаць і перагнаць Амерыку», пра пабудову камуністычнага грамадства ўжо ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі. Але пасля няўдалых рэформаў, што прывялі да крызісу ў сельскай гаспадарцы, і іншых памылак М. С. Хрушчоў страціў давер і падтрымку з боку партыйнай эліты і насельніцтва.

Успомніце, якія гаспадарчыя рэформы былі праведзены ў перыяд праўлення М. С. Хрушчова.

Разам з тым у памяці старэйшых пакаленняў перыяд знаходжання ва ўладзе М. С. Хрушчова выглядае часам аптымістычных спадзяванняў як для лёсу краіны ў цэлым, так і для жыцця кожнага савецкага чалавека. У перыяд яго кіраўніцтва палепшыліся жыллёвыя ўмовы, быў скарочаны рабочы дзень, умацаваўся савецкі рубель.


Перыяд кіраўніцтва СССР Л. І. Брэжневым часцяком характарызуюць як «перыяд застою». Аднак першыя гады брэжнеўскай эпохі не падпадаюць пад

гэтую характарыстыку. Ажыццёўленая пад кіраўніцтвам старшыні Савета Міністраў СССР А. М. Касыгіна *эканамічная рэформа* **1965 г.** дала значны эфект, дзякуючы якому восьмая пяцігодка (1966–1970 гг.) атрымала неафіцыйнае найменне «залатой» і аказалася найбольш паспяховай сярод усіх 12 пяцігадовых планаў развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Спалучэнне планавай эканомікі і матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках працы паспрыяла таму, што ў гэтыя гады валавы ўнутраны прадукт рос штогод больш чым на 10 %.

Паспяховай была аграрная палітыка: палепшылася забеспячэнне насельніцтва прадуктамі, многія калгасы і саўгасы перасталі быць стратнымі. У цэлым дабрабыт насельніцтва адчувальна павысіўся.

Для савецкіх людзей брэжнеўская эпоха была часам стабільнасці, бясплатных і якасных медыцы-



1. Успомніце, якая сістэма кіравання эканомікай была ўведзена ў СССР у 1957 г.
2. Чаму мерапрыемствы рэформы А. М. Касыгіна паспрыялі павышэнню эфектыўнасці савецкай эканомікі? Як вы лічыце, чаму рэформа была згорнута напачатку 1970-х гг.?

Правообладатель Издательский центр БГУ

ны і адукацыі, высокага статусу вучоных, настаўнікаў, працаўнікоў у цэлым, адсутнасці беспрацоўя.

Шмат у чым галоўнае дасягненне савецкага часу — стабільнасць сацыяльна-эканамічнай сферы — зрабілася магчымым дзякуючы планавай эканоміцы. Яна дазволіла дасягнуць значных поспехаў у індустрыяльным развіцці савецкай дзяржавы і падтрымліваць на высокім узроўні сацыяльную сферу. Значнай перавагай планавай эканомікі ў параўнанні з рыначнай трэба прызнаць адсутнасць крызісаў перавырабу і беспрацоўя. Апроч таго, планаванне ў маштабах краіны дазваляла падтрымліваць нізкія цэны на тавары першай неабходнасці і пазбягаць інфляцыі (абясцэньвання грашовых сродкаў).

«Застой»

Але ў 1970-я гг. асноўныя паказчыкі развіцця савецкай эканомікі панізіліся — упалі тэмпы прыросту нацыянальнага даходу, павялічылася адставанне ад краін Захаду ў сферы ўкаранення дасягненняў НТР. Прычыны былі розныя, але галоўная заключалася ў адсутнасці ў рабочых зацікаўленасці ў выніках сваёй працы.

Падтрымліваць стабільнасць у грамадстве дазволіла павышэнне сусветных коштаў на нафту: у 1975–1985 гг. ад яе продажу СССР атрымаў каля 180 млрд долараў. Нафтадолары давалі магчымасць падтрымліваць высокі ўзровень сацыяльнай сферы, але не спрыялі развіццю прамысловасці і сельскай гаспадаркі, да таго ж рабіліся прычынай беспадстаўнага аптымізму кіраўніцтва краіны, якое не заўважала нарастання крызісных з'яў.

У 1960-я гг. у СССР пачалі заяўляць пра сябе прыхільнікі іншых палітычных поглядаў. Людзей, якія не прымалі пануючую ў краіне ідэалогію, але не заклікалі да гвалтоўных дзеянняў, называлі дысідэнтамі. Частка з іх пачала фарміраваць пры падтрымцы замежных дзяржаў «праваабарончыя рухі».

Адкрытая крытыка ўлады была забаронена, але знаходзіла іншыя шляхі выражэння — праз іншасказанні і анекдоты.

Спроба выправіць сітуацыю — аднавіць кантроль над грамадствам, узмацніць адказнасць кіруючых кадраў, дысцыпліну ў працоўных калектывах, палепшыць якасць прадукцыі, якая выраблялася, — была здзейснена пры Ю. У. Андропаве. Але рэалізаваць задуманае новы генеральны сакратар партыі не паспеў.

Перабудова

У перыяд перабудовы савецкае грамадства зазнала радыкальную трансфармацыю. Яна мела на ўвазе:

- увядзенне прынцыпу канкурэнцыі ў палітычную сістэму і пераход да шматпартыйнасці;
- стварэнне незалежных сродкаў масавай інфармацыі;
- пераход да рыначнай эканомікі, якая прызнавалася найбольш эфектыўным інструментам забеспячэння балансу паміж попытам і прапановай і стварэння стымулу да мадэрнізацыі вытворчасці.

Успомніце, калі ў СССР праводзілася палітыка перабудовы. Якія традыцыйныя асновы савецкай сістэмы былі ў выніку зменены?

У савецкім грамадстве фарміравалася апазіцыя, якая мацавала свой уплыў за кошт крытыкі ўлады. Пад уплывам «перабудовачных» сродкаў масавай інфармацыі краіны Захаду пачалі ўспрымацца ў савецкім грамадстве як узор фарміравання прававога і палітычнага жыцця і больш эфектыўнай арганізацыі грамадства «роўных магчымасцей».

Камуністычная партыя, што пачала пераўтварэнні грамадства, каб пераадолець некаторыя недахопы сістэмы, у выніку зусім страціла магчымасць уплываць на сітуацыю. Неўзабаве ў шэрагу саюзных рэспублік дабіліся прыходу да ўлады апазіцыйныя сілы.

У другой палове 1980-х гг. кіраўніцтва СССР не здолела знайсці шляхоў вырашэння сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем, якія існавалі

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў краіне, не змагло прапанаваць грамадству тэарэтычна абгрунтаваную перспектыву далейшага прагрэсу існуючай сістэмы. Узяты курс на перабудову існуючай сістэмы не меў навуковага абгрунтавання. Перабудова набыла некантраляваны характар і ператварылася ў адну з перадумоў распаду СССР.

Распад СССР быў выкліканы не толькі ўнутранымі, але і знешнепалітычнымі прычынамі. У 1980-я гг. працягвалася «халодная вайна» з ЗША і іх саюзнікамі, якая патрабавала значных ваенных выдаткаў. Савецкі Саюз удзельнічаў у гонцы ўзбраенняў, падтрымліваў саюзныя рэжымы і вёў цяжкую вайну ў Афганістане, пачатую ў 1979 г., што аслабляла эканоміку і пагаршала міжнародны імідж краіны. Захад увёў эканамічныя санкцыі, абмежаваў доступ да тэхналогій і крэдытаў. Падзенне цэн на нафту ў сярэдзіне 1980-х гг. скараціла валютныя паступленні. Абвешчаная ў гады перабудовы палітыка галоснасці і дэмакратызацыі ўзмацніла міжнародны ціск на СССР у пытаннях правоў чалавека. Усё гэта абвастрыла ўнутраны крызіс, што прывёў да распаду краіны ў 1991 г.

3. Дасягненні і праблемы савецкай сацыяльнай палітыкі. У СССР вялікую ўвагу надавалі сацыяльнай палітыцы, галоўнай мэтай якой быў рост дабрабыту народа. Сістэма мерапрыемстваў у кожны перыяд залежала ад эканамічных магчымасцей Савецкага Саюза.

Дасягненні	Цяжкасці
1945 — першая палова 1950-х гг.	
У 1947 г. адменена картачная сістэма размеркавання тавараў першай неабходнасці, праведзена грашовая рэформа, ішло паступовае зніжэнне цэн	Для росту дабрабыту савецкіх людзей не хапала сродкаў, галоўная задача заключалася ў аднаўленні разбуранай у выніку вайны эканомікі і пераводзе яе на мірныя рэйкі. Неўраджай 1946 г.

Дасягненні	Цяжкасці
Другая палова 1950-х — першая палова 1960-х гг.	
Здзяйсненне захадаў для вырашэння жыллёвага пытання, усталяванне аднаго з самых нізкіх у свеце ўзроставых цэнзаў для выхаду на пенсію	Напачатку 1960-х гг. узніклі праблемы з забеспячэннем насельніцтва прадуктамі, былі паднятыя адпускныя цэны на некаторыя прадукты, узмацніўся падатковы ціск на падсобныя гаспадаркі. Гэта адбылося ў значнай ступені праз непрадуманую эканамічную палітыку савецкага кіраўніцтва на чале з М. С. Хрушчовым
Другая палова 1960-х — першая палова 1980-х гг.	
Даступнасць тавараў працяглага карыстання, у тым ліку легкавых аўтамабіляў; рост заробкаў рабочых і служачых; ад 1966 г. зарплату пачалі атрымліваць і калгаснікі; стабільнасць цэн; невысокі кошт камунальных паслуг; бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і адукацыя	Рост дэфіцыту тавараў у сувязі з нарастаннем крызісных з'яў у эканоміцы і зніжэннем тэмпаў эканамічнага росту

Годныя заробкі і працоўныя пенсіі надавалі савецкім людзям адчуванне стабільнасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

Высокія маральныя каштоўнасці

4. Маральныя нормы і маральныя каштоўнасці савецкага чалавека. Вялікая Айчынная вайна не зрабіла савецкіх людзей жорсткімі; такія высокія маральныя каштоўнасці, як калектывізм, працавітасць, самаадданасць, бескарыслівасць, патрыятызм, вытрымалі выпрабаванне часам і толькі ўмацаваліся. Салдаты і афіцэры Чырвонай арміі, што вярнуліся з палёў баёў, адказна ставіліся да даручанай справы, ставілі інтарэсы краіны вышэй за ўласны дабрабыт.

Савецкія людзі верылі ў магчымасць пабудовы ідэальнага камуністычнага ладу, пераход да якога быў абвешчаны на XXI з'ездзе КПСС (1959 г.). Абавязковым крокам да гэтага павінна было стаць маральнае ўдасканаленне чалавека.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ



Плакат СССР. 1979 г.

Камуністычная ідэалогія, агульныя палажэнні марксісцкай тэорыі, рэальны характар узаемаадносін паміж савецкімі людзьмі знайшлі адлюстраванне ў Маральным кодэксе будаўніка камунізму — зводзе прынцыпаў камуністычнай маралі, які ўвайшоў у тэкст Трэцяй Праграмы КПСС, прынятай XXII з'ездам (1961), і Статут КПСС:

1) адданасць справе камунізму, любоў да сацыялістычнай Радзімы, краін сацыялізму;

2) добрасумленная праца на карысць грамадства: хто не працуе, той не есць;

3) клопат кожнага пра захаванне і прымнажэнне грамадскага набытку;

4) высокае ўсведамленне грамадскага абавязку, нецярпімасць да парушэнняў грамадскіх інтарэсаў;

5) калектывізм і таварыская ўзаемадапамога: кожны за ўсіх, усе за аднаго;

6) гуманныя адносіны і ўзаемная павага паміж людзьмі: чалавек чалавеку сябар, таварыш і брат;

7) сумленнасць і праўдзівасць, маральная чысціня, прастата і сціпласць у грамадскім і асабістым жыцці;

8) узаемная павага ў сям'і, клопат пра выхаванне дзяцей;

9) нецярпімасць да несправядлівасці, дармаедства, несумленнасці, кар'ерызму, хцівасці;

10) дружба і братэрства ўсіх народаў СССР, нецярпімасць да нацыянальнай і расавай непрыязі;

11) нецярпімасць да ворагаў камунізму, справы міру і свабоды народаў;

12) братэрская салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін, з усімі народамі.

1. *Якія прагрэсіўныя ідэі папярэдніх эпох знайшлі працяг у маральных прынцыпах савецкіх людзей?*
2. *Апішыце грамадства, пра якое марылі савецкія людзі, будуючы камунізм.*
3. *Якія ідэі Маральнага кодэкса будаўніка камунізму з'яўляюцца актуальнымі і ў наш час?*

Студэнцкія будаўнічыя атрады

Паважлівае стаўленне да працы ў СССР, якое перадавалася маладым пакаленням, знайшло адбітак у дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў (СБА). Першы будатрад быў створаны ў 1959 г. студэнтамі-фізікамі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



Студэнты сваім удзелам у СБА зрабілі ўнёсак у найбуйнейшыя будоўлі краіны, у тым ліку ўзвядзенне прамысловых прадпрыемстваў, будаўніцтва аўтамабільных і чыгуначных магістраляў, асваенне цалінных зямель і інш. Студэнцкія будаўнічыя атрады існавалі ў СССР аж да роспуску УЛКСМ у 1991 г.

У XXI ст. у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі дзейнасць СБА была адноўлена.

1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:
— якія аб'екты былі абвешчаны ў СССР ударнымі камсамольскімі будоўлямі;
— калі адроджаны студэнцкія будаўнічыя атрады ў Рэспубліцы Беларусь;
— на якіх аб'ектах працавалі студэнцкія будаўнічыя атрады ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Даведайцеся ў членаў сваёй сям'і (бацькоў, бабулі, дзядулі), ці ўдзельнічалі яны ў студэнцкіх будаўнічых атрадах, на якіх аб'ектах працавалі.

5. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкай культуры. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і Вялікай Перамогі савецкага народа ў пасляваенныя гады была асноўнай у савецкім мастацтве.

Вялікая Айчынная вайна — вядучая тэма ў мастацтве

У літаратуру прыйшло пакаленне пісьменнікаў-франтавікоў. Аднымі з самых папулярных сталі раманы А. Фадзеева «Маладая гвардыя», К. Сіманава «Жывыя і мёртвыя».

У другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. літаратурным сімвалам зрабілася аповесць І. Эрэнбурга «Адліга». У 1960-я гг. пашырэнне атрымала творчасць маладых паэтаў Я. Еўтушэнкі, Р. Раждественскага, А. Вазнясенскага, Б. Ахмадулінай, якія збіралі на свае выступленні цэлыя залы.

У жывапісе атрымалі пашырэнне ваенны і гістарычны жанры.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



«Маладая гвардыя». Рэжысёр С. Герасімаў. 1948 г.



«Маладая гвардыя». Рэжысёр Л. Пляскін. 2015 г.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую гістарычную даведку пра камсамольскую падпольную арганізацыю «Маладая гвардыя»: час і месца дзейнасці, удзельнікі, мэты і вынікі дзейнасці.*
2. *Успомніце, дзе ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічалі падпольныя камсамольскія групы.*
3. *Паглядзіце фільм «Маладая гвардыя». Як вы лічыце, чым тлумачыцца зварот рэжысёра да гэтай тэмы ў XXI ст.? Якую ролю адыгрывае культура ў захаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну савецкага народа?*

У другой палове 1960-х — 1980-я гг. у савецкай літаратуры апроч тэмы подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны адлюстроўвалася гістарычная мінуўшчына, атрымаў развіццё жанр фантастычнай літаратуры. У гэты час былі напісаныя: «А зоры тут ціхія...» (Б. Васільеў), «У жніўні сорак чацвёртага» (У. Багамолаў), «Пяром і шпагай», «Слова і справа» (В. Пікуль), «Цяжка быць богам», «Панядзелак пачынаецца ў суботу», «Пікнік на ўзбочыне» (А. Стругацкі, Б. Стругацкі).

Адным з самых папулярных мастакоў 1970–1980-х гг. быў І. Глазуноў. У 1980 г. ён стварыў пано «Унёсак народаў СССР у сусветную культуру і цывілізацыю», якое было падорана ААН і размешчана ў будынку штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы.

Якія з твораў гэтых і іншых савецкіх аўтараў вы чыталі? Прывядзіце некалькі аргументаў на карысць прачытання гэтых твораў сучаснікамі.




Унёсак народаў СССР у сусветную культуру і цывілізацыю. Мастак І. Глазуноў. 1980 г.

Якія гістарычныя дзеячы, дзеячы культуры, з'явы прадстаўлены на пано?

Падзеям Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаныя многія савецкія фільмы: «Подзвіг разведчыка» Б. Барнета, «Вясковая настаўніца» М. Данскога, «Маладая гвардыя» С. Герасімава, «Ляцяць журавлі» С. Калатозава і інш. Савецкія фільмы пра вайну атрымалі сусветнае прызнанне.

Перыядам росквіту савецкага кінематографа зрабіліся другая палова 1960-х — 1980-я гг. Менавіта ў гэты час з'явіліся самыя вядомыя савецкія кінашэдэўры.



«Вайна і мір».
Рэжысёр С. Бандарчук.
1967 г.



«Масква слязам не верыць».
Рэжысёр У. Мяньшоў.
1979 г.



«Каўказская нявольніца».
Рэжысёр Л. Гайдай.
1967 г.

Якія з савецкіх кінафільмаў атрымалі прэмію «Оскар»?

Правообладатель Издательский центр БГУ

1945–1991 гг. у гісторыі СССР былі перыядам аднаўлення краіны пасля Вялікай Айчыннай вайны, мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі і прамысловасці, стварэння новых галін эканомікі, вялікіх дасягненняў у сацыяльнай сферы, навукі і культуры. Поспехі ў развіцці краіны дасягаліся працай многіх пакаленняў савецкіх людзей, для якіх былі характэрныя калектывізм, працавітасць, самаадданасць, патрыятызм. Разам з тым сацыяльна-эканамічны крызіс, які пачаўся ў 1970-я гг., непрадуманыя рэформы другой паловы 1980-х гг. у спалучэнні са знешнепалітычнымі фактарамі прывялі да распаду дзяржавы.

калі ў свеце…

1958 г. — заснаваная першая падземная шахта ў Канадзе, што паклала пачатак індустрыяльнаму вырабу калійных угнаенняў

на тэрыторыі Беларусі…

1963 г. — уведзена ў эксплуатацыю першая чарга Салігорскага калійнага камбіната

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця СССР у 1945–1991 гг. Канкрэтызуйце іх гістарычнымі фактамі.
2. Назавіце асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР у 1945–1991 г. Канкрэтызуйце іх фактамі.
3. Выкарыстоўваючы тэкст параграфа і дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) на тэму «Топ-10 дасягненняў СССР у пасляваенны перыяд».
4. Якія прычыны крызісу савецкага грамадства ў другой палове 1980-х гг.?
5. У чым, на ваш погляд, заключалася маральная сіла савецкага грамадства? Якія маральныя каштоўнасці савецкага чалавека важныя і сёння?

§ 36. Грамадска-палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1991 г.

«ХРУШЧОЎСКАЯ АДЛІГА»
ПЕРАБУДОВА КПСС
КПБ ЛКСМБ ААН
САВЕТЫ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
СУВЕРЭНІТЭТ

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткае паведамленне наконт дзейнасці БССР у ААН. Якое значэнне для нашай рэспублікі мела дзейнасць на міжнароднай арэне?

БССР — заснавальнік ААН

1. Асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны. Для палітычнага развіцця БССР у пасляваенны перыяд былі характэрныя тыя ж тэндэнцыі, што і для ўсяго Савецкага Саюза. Адметнасці палітычнай сітуацыі ў БССР на гэтым этапе былі абумоўлены геапалітычным становішчам рэспублікі, узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Вызначальным фактарам палітычнага развіцця Беларусі ў пасляваенны перыяд выступіла перамога над нацысцкімі захопнікамі, здабытая супольна з іншымі народамі СССР. Пасля Вялікай Айчыннай вайны змяніўся міжнародны статус рэспублікі. Прызнаннем вялікага ўнёску Беларусі ў разгром нацысцкай Германіі і зазнаных у выніку вайны велізарных людскіх і матэрыяльных страт было запрашэнне БССР стаць членам-заснавальнікам ААН. Беларуская дэлегацыя на чале з наркамам замежных спраў БССР К. В. Кісялёвым падпісала **26 чэрвеня 1945 г.** Статут ААН.

Аднаўленне органаў улады

Па меры вызвалення тэрыторыі БССР ад нацысцкіх захопнікаў аднаўляліся партыйныя і савецкія органы ўлады. Першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка, начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху ў 1942–1944 гг., падтрымліваў

Правообладатель Издательский центр БГУ

тэндэнцыю прызначэння на кіруючыя пасады былых партызанскіх камандзіраў. На іх аснове паступова сфарміраваўся склад кіраўнікоў рэспубліканскага і мясцовага ўзроўню, якіх аб'ядноўвала не этнічнае паходжанне, а агульныя гаспадарчыя і арганізацыйныя інтарэсы.

Найбольш значнай грамадска-палітычнай падзеяй першых пасляваенных гадоў былі выбары ў Вярхоўны Савет СССР (1946 г.) і Вярхоўны Савет БССР (1947 г.). Для беларусаў, якія перажылі вайну, выбары сталіся святам мірнага адраджэння.

Як вы лічыце, якое значэнне мела прызначэнне на кіруючыя пасады ў БССР былых камандзіраў партызанскага руху? Як гэта ўплывала на аўтарытэт улады? На развіццё Беларусі?

Барацьба з нацыяналістычнымі фарміраваннямі ў заходніх абласцях

Адметнасцю палітычнага развіцця БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе была барацьба супраць нацыяналістычных фарміраванняў у заходніх абласцях рэспублікі.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Пасля Вялікай Айчыннай вайны на захадзе рэспублікі дзейнічалі бандфарміраванні з украінскіх і польскіх нацыяналістаў, былых калабарацыяністаў. Іх ахвярамі рабіліся партыйныя і камсамольскія актывісты, урачы, настаўнікі, ваеннаслужачыя. Апошнія бандфарміраванні былі знішчаны органамі ўнутраных спраў толькі ў сярэдзіне 1952 г.

1. *Успомніце, хто такія калабарацыяністы.*
2. *Выкарыстоўваючы дапаможнік «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (10–11 класы), падрыхтуйце паведамленне пра дзейнасць у Заходняй Беларусі польскіх нацыяналістычных фарміраванняў у пасляваенны перыяд.*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую гістарычную даведку пра барацьбу савецкай міліцыі і органаў дзяржаўнай бяспекі супраць бандытызму ў заходніх абласцях Беларусі.*

Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця

Ад сярэдзіны 1950-х гг. пачаліся працэсы дэмакратызацыі і адраджэння калектыўных метадаў кіраўніцтва. Пашырыліся правы рэспубліканскай партыйнай арганізацыі, рэгулярнымі зрабіліся з'езды партыі, канферэнцыі і партыйныя сходы. На пасаду першага сакратара ЦК КПБ былі вылучаныя беларусы.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Кірыла Трафімавіч Мазураў (1914–1989)
Дзяржаўны і партыйны дзеяч, Старшыня Савета Міністраў БССР (1953–1956 гг.), першы сакратар ЦК КПБ (1956–1965 гг.), першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР (1965–1978 гг.). Герой Сацыялістычнай Працы (1974 г.)



Пётр Міронавіч Машэраў (1918–1980)
Дзяржаўны і партыйны дзеяч, першы сакратар ЦК КПБ (1965–1980 гг.). Герой Савецкага Саюза (1944 г.). Герой Сацыялістычнай Працы (1978 г.)

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую гістарычную даведку пра ролю К. Т. Мазурава і П. М. Машэрава ў барацьбе супраць нацысцкіх захопнікаў, пасляваенным аднаўленні і развіцці рэспублікі.*
2. *Як вы лічыце, чаму менавіта К. Т. Мазураў і П. М. Машэраў былі вылучаныя на вышэйшыя кіруючыя пасады ў БССР?*

Пашырэнне правоў саюзных рэспублік

У сярэдзіне 1950-х гг. былі значна пашыраныя правы саюзных рэспублік у сферы дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання. У адпаведнасці з новым парадкам урад СССР вызначаў толькі агульныя паказчыкі развіцця. Саюзным рэспублікам было нададзена права вырашаць пытанні заканадаўства аб судаўладкаванні, прымаць грамадзянскі, крымінальны і працэсуальны кодэксы, самастойна прымаць рашэнні адносна свайго адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Гэта паспрыяла больш актыўнай заканадаўчай дзейнасці Вярхоўнага Савета БССР.

Узмацненне цэнтралізацыі

Ад сярэдзіны 1960-х гг. у СССР пачаўся рост партыйнага і дзяржаўнага апарату. У гэты перыяд узмацнілася цэнтралізацыя кіравання прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Правы і магчымасці рэспубліканскага кіраўніцтва ў розных сферах абмяжоўваліся. Часцяком нават самыя нязначныя змены трэба было ўзгадняць з цэнтральнымі агульнасаюзнымі структурамі.

Назавіце знакавыя помнікі і мемарыялы Беларусі, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

У другой палове 1960-х — 1970-я гг. у Беларусі істотным фактарам грамадскай свядомасці становіц-

Правообладатель Издательский центр БГУ

ца памяць пра Вялікую Айчынную вайну: будуюцца знакавыя помнікі, якія сімвалізавалі трагедыю і гераізм беларускага народа ў гады вайны.

Фактары стабільнасці грамадска-палітычнага жыцця ў БССР

Напачатку 1980-х гг. асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі супадалі з агульнасаюзнымі. Аднак у пачатку перыяду перабудовы БССР заставалася адной з найбольш развітых рэспублік СССР, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у сацыяльна-эканамічным развіцці. У БССР не знізіўся ўзровень вытворчасці; да прыкладу, нацыянальны даход на душу насельніцтва, спажыванне матэрыяльных даброт і паслуг, выраб тавараў народнага спажывання пераўзыходзілі агульнасаюзныя паказчыкі. Аж да канца 1980-х гг. эканоміка БССР працягвала дэманстраваць даволі высокія тэмпы развіцця, таму і грамадска-палітычнае жыццё ў рэспубліцы адрознівалася стабільнасцю.

Ускладніла грамадска-палітычную сітуацыю ў БССР аварыя на Чарнобыльскай АЭС (тэрыторыя Украінскай ССР) 26 красавіка 1986 г. На працягу некалькіх гадоў пасля трагедыі кіраўніцтва СССР лічыла за лепшае трымаць насельніцтва ў няведанні пра яе наступствы, каб пазбегнуць крытыкі з боку грамадства. Кіраўніцтва БССР зрабілася закладнікам такой сітуацыі, яно таксама замоўчвала рэальны ўзровень радыеактыўнага забруджвання тэрыторыі рэспублікі.

Стаўленне партыйнага кіраўніцтва БССР да перабудовы

Партыйнае кіраўніцтва БССР у сярэдзіне 1980-х гг. не магло не падтрымаць курс на перабудову, але крытычна ставілася да палітычных пераўтварэнняў, якія праводзіла саюзнае кіраўніцтва, бо лічыла іх паспешлівымі і непрадуманымі.

У 1989 г. першы сакратар ЦК КПБ Я. Я. Сакалоў загадаў апублікаваць карту радыеактыўнага забруджвання Беларусі і выступіў на пленуме ЦК КПСС за пашырэнне паўнамоцтваў рэспублікі. Атачэнне М. С. Гарбачова абвінаваціла кіраўніцтва КПБ у марудных тэмпах рэфармавання.

У такіх умовах у БССР аформіўся апазіцыйны КПБ грамадска-палітычны рух — Беларускі народны фронт (БНФ), але шырокай сацыяльнай базы ў Беларусі ён не меў.

Выбары ў Вярхоўны Савет БССР на альтэрнатыўнай аснове

У сакавіку 1990 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР XII склікання, якія праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. У склад Вярхоўнага Савета былі абраныя і дэпутаты ад БНФ. Вярхоўны Савет БССР XII склікання прыняў шэраг законаў: аб пераходзе да рыначнай эканомікі, ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай аварыі, унясенні змен у Канстытуцыю БССР 1978 г. Змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю замацоўвалі шматпартыйнасць, прадугледжвалі роўныя ўмовы дзейнасці розных грамадскіх аб'яднанняў.

Абвяшчэнне суверэнітэту БССР

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

Пры гэтым варта памятаць, што рэальнае набыццё суверэнітэту, фарміраванне яго атрыбутаў, такіх як незалежная ўнутраная і знешняя палітыка, харчовая, ваенная і энергетычная бяспека, праходзілі ад сярэдзіны 1990-х гг. і былі звязаныя з увядзеннем інстытута прэзідэнцтва.

У 1991 г. у СССР паглыбіўся сацыяльна-эканамічны крызіс, што ахапіў усе сферы эканомікі. У гэты час пачаліся забастоўкі рабочых у розных гарадах Беларусі з патрабаваннямі палепшыць матэрыяльнае становішча. Да эканамічных лозунгаў дадаліся палітычныя: дэмакратызацыя грамадска-палітычнага ладу, нацыяналізацыя маёмасці КПСС-КПБ.

Стварэнне ў жніўні 1991 г. Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы (ДКНС) ускладніла сітуацыю ў беларускім грамадстве. На пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР **25 жніўня 1991 г.** былі прынятыя рашэнні аб наданні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статусу канстытуцыйнага закона і прыпыненні дзейнасці КПБ.

Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Умацаванне беларускай дзяржаўнасці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў БССР працягвала дзейнічаць Канстытуцыя 1937 г. Вышэйшым органам заканадаўчай улады быў Вярхоўны Савет БССР, які абіраўся грамадзянамі тэрмінам на 4 гады. Вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам быў Савет Народных Камісараў БССР (у 1946 г. пераўтвораны ў Савет Міністраў). На месцах кіраванне ажыццяўлялі абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы народных дэпутатаў. У 1944 г. у Канстытуцыю БССР былі ўнесеныя папраўкі наконт пашырэння паўнамоцтваў рэспублікі (стварэння рэспубліканскіх наркаматаў абароны і замежных спраў).

Органы дзяржаўнай улады ў БССР

Успомніце, якімі гістарычнымі падзеямі былі абумоўлены змены ў Канстытуцыі БССР у 1944 г.

Канстытуцыя БССР 1937 г. дзейнічала да 1978 г. Новая Канстытуцыя замацавала кіраўнічую ролю Камуністычнай партыі.

У **1951 г.** адбылося зацвярджэнне новага Дзяржаўнага сцяга БССР. У **1955 г.** быў зацверджаны Дзяржаўны гімн БССР («Мы — беларусы»).

Зацвярджэнне дзяржаўных сімвалаў БССР

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Дзяржаўны гімн БССР (1955 г.)

Музыка Н. Сакалоўскага
Словы М. Клімковіча



Дзяржаўны сцяг БССР. 1951 г.

…Сілы гартуе люд Беларусі
Ў братнім саюзе, у мужнай сям'і.
Вечна мы будзем, вольныя людзі,
Жыць на шчаслівай, вольнай зямлі!

Нас аб'яднала Леніна імя,
Партыя к шчасцю вядзе нас ў паход.
Партыі слава! Слава Радзіме!
Слава табе, наш свабодны народ!..

1. *Якія асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі знайшлі адлюстраванне ў Дзяржаўным гімне БССР?*
2. *У чым заключаецца пераемнасць дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь і БССР?*

Саветы — палітычная аснова беларускага грамадства

3. Дзейнасць Саветаў народных дэпутатаў і грамадскіх арганізацый. Палітычнай асновай савецкага грамадства былі Саветы народных дэпутатаў, якія фарміраваліся ў выніку выбараў. Да канца 1980-х гг. выбары ў Саветы праходзілі на безальтэрнатыўнай аснове.

Заканадаўчая дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР доўгі час была абмежаванай. Шмат у чым фармальнай была роля мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Саветы рэальнай улады не мелі, іх дзейнасць кантралявалася Камуністычнай партыяй. Гэтыя асаблівасці савецкай палітычнай сістэмы — зліццё дзяржаўнага і партыйнага апарату, пераход рэальнай вярхоўнай улады да вышэйшых партыйных органаў — афармілiся яшчэ ў 1930-я гг.

Грамадскія арганізацыі

Самай масавай грамадскай арганізацыяй з'яўляліся прафсаюзы. У 1958 г. на заканадаўчым узроўні было прынятае рашэнне, у адпаведнасці з якім рабочыя і служачыя маглі быць звольнены адміністрацыяй толькі са згоды прафсаюзнай арганізацыі.

Успомніце прыклады барацьбы камсамольцаў супраць нацыстаў на тэрыторыі БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Другой па масавасці арганізацыяй быў Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі (УЛКСМ, у Беларусі — Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі (ЛКСМБ)). Пераважная частка юнакоў і дзяўчат актыўна ўдзельнічала ў дзейнасці камсамольскай арганізацыі рэспублікі, якая ў 1945 г. была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга за мужнасць і самаадданасць, праяўленыя камсамольцамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Даведайцеся, за якія выдатныя заслугі ЛКСМБ быў узнагароджаны ордэнам Леніна ў 1970 г.

Значнай была роля камсамола ў далучэнні моладзі рэспублікі да працэсаў аднаўлення народнай гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны, асваення цалінных і абложных зямель Казахстана, будаўніцтва прамысловых аб'ектаў ва ўсходніх і паўночных рэгіёнах СССР.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У 2023 г. студэнты архітэктурнага факультэта БНТУ стварылі мурал.



Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:
1. Да якіх дат прымеркавана стварэнне мурала?
2. Што азначаюць элементы мурала?
3. У чым заключаецца пераемнасць ЛКСМБ і БРСМ?

4. Стаўленне да царквы. У пасляваенны час дзяржаўная канфесійная палітыка зрабілася больш цярпімай. Гэта выявілася ў росце колькасці праваслаўных прыходаў, цэркваў і святароў. Аднаўленне царкоўнага жыцця стала магчымым дзякуючы ўдзелу святароў у барацьбе з ворагам падчас Вялікай Айчыннай вайны.

У гады «хрушчоўскай адлігі» ціск і кантроль за царквой узмацніліся. Былі закрытыя многія храмы і манастыры, знішчаны шэраг помнікаў культавай архітэктуры. Аднак гэта не толькі не прывяло да перамогі атэізму, але, наадварот, выклікала спачуванне да вернікаў. У наступныя гады адбыўся адыход ад надзвычай жорсткай лініі ў дзяржаўна-канфесійных адносінах.

Важнай вяхой у справе адраджэння праваслаўя ў Беларусі было святкаванне ў 1988 г. 1000-годдзя Хрышчэння Русі. Ад гэтага часу пачалося масавае адкрыццё храмаў і стварэнне новых праваслаўных



Свята-Мікалаеўскі сабор (1843 г.). Г. Віцебск. Узарваны ў 1957 г.

Успомніце, калі была створана Полацкая епархія.

абшчын. У 1989 г. былі адноўленыя Полацкая, Магілёўская і Мінская епархіі.

Рост нацыянальнай самасвядомасці

5. Вырашэнне нацыянальнага пытання. Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне прадэманстравала згуртаванасць народаў СССР. У гады ваенных выпрабаванняў адбываўся рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.



Г. Салігорск

На будаўніцтве нафтаперапрацоўчага завода ў Наваполацку і распрацоўцы радовішчаў солі ў Салігорску працавалі прадстаўнікі 20 нацыянальнасцей. Пры гэтым у рэспубліцы не назіралася канфліктаў на нацыянальнай глебе. БССР называлі «самай савецкай» з рэспублік.

У Маскве друкаваліся беларускія газеты, частай з'явай былі вечары беларускай культуры, пленумы беларускай творчай інтэлігенцыі, гастролі беларускіх тэатраў і інш.

У якім годзе адзначалася 40-годдзе ўтварэння БССР?

Згодна з перапісам 1959 г. абсалютная большасць жыхароў БССР (78,92 %) роднай мовай назвала беларускую. На прыёме ў гонар 40-годдзя ўтварэння БССР першы сакратар ЦК КПБ К. Т. Мазураў выступаў з прамовай на беларускай мове.

Развіццё сацыялістычнага інтэрнацыяналізму

Але прынятая ў 1961 г. Праграма КПСС абвяшчала мэтай партыі развіццё сацыялістычнага інтэрнацыяналізму як найвышэйшай якасці ўсіх савецкіх людзей. Прадугледжвалася зліццё асобных народаў у адзіную сусветную камуністычную нацыю, а іх моў — у сусветную мову. Фарміраванню інтэрнацыянальных пачуццяў спрыялі інтэнсіўная міграцыя насельніцтва саюзных рэспублік СССР і імклівы рост гарадскога насельніцтва. Узмацняліся пазіцыі рускай мовы ў галіне адукацыі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Вялікі ўнёсак у захаванне і папулярызацыю беларускай мовы зрабілі «Песняры» — самы вядомы беларускі вакальна-інструментальны ансамбль (створаны ў 1969 г. У. Мулявіным). Рэпертуар ансамбля шмат у чым складаўся з рок-адаптацый беларускіх народных песень і песень, напісаных прафесійнымі кампазітарамі на словы беларускіх класікаў (Янкі Купалы, М. Багдановіча і інш.). «Песняры» актыўна ўдзельнічалі ў этнаграфічных экспедыцыях, збіралі матэрыялы пра беларускую народную музыку, знаёмілі гледача з народнымі музычнымі інструментамі і беларускімі народнымі строямі.



«Залаты» склад «Песняроў»



Уладзімір Мулявін

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне пра У. Мулявіна.*
2. *Якія песні ансамбля «Песняры», на вашу думку, з'яўляюцца «візітоўкай» Беларусі? Сваю думку растлумачце.*

Падтрымка беларускай мовы

Мерамі падтрымкі беларускай мовы з боку партыйнага кіраўніцтва БССР былі заснаванне выдавецтваў «Беларуская Энцыклапедыя» і «Мастацкая літаратура», адкрыццё Мінскага інстытута культуры. Шматтысячнымі тыражамі выходзілі кнігі на беларускай мове, у значнай ступені беларускамоўным заставалася ў БССР рэспубліканскае тэлебачанне і радыё.

У канцы 1970-х — пачатку 1980-х гг. у Беларусі назіраўся рост цікавасці моладзі да гістарычнай мінуўшчыны, беларускай мовы і фальклору, нацыянальнай культуры ў цэлым. Гэта было рэакцыяй на праявы агульнасусветнай тэндэнцыі ўзмацнення нацыянальнай самасвядомасці. Такая з'ява ў значнай ступені звязаная і з тымі станоўчымі працэсамі, якія адбываліся ў нацыянальна-культурным жыцці рэспублікі ў гэты перыяд.

Пасля Вялікай Перамогі стваральная праца ўсіх народаў СССР, у тым ліку і беларускага, была накіравана на аднаўленне краіны, стварэнне спрыяльных умоў для далейшага руху наперад у дзяржаўным будаўніцтве, развіцці эканомікі, нацыянальнай культуры і народнага дабрабыту. Галоўным вынікам савецкага перыяду было тое, што беларуская дзяржаўнасць набыла магутны сацыяльна-эканамічны базіс, які забяспечваў далейшы прагрэс рэспублікі. У пасляваенныя гады сфарміраваўся патэнцыял Беларусі як краіны з высокім тэхналагічным узроўнем. На працягу дзесяцігоддзяў вызначыўся сацыяльна арыентаваны характар эканомікі Беларусі.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
1 жніўня 1975 г. — у Хельсінкі 35 дзяржаў, у тым ліку СССР, ЗША і краіны Еўропы, падпісалі Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе	14 красавіка 1978 г. — прыняцце Канстытуцыі БССР

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Складзіце тэзісны план (або ментальную карту) «Асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця БССР у сярэдзіне 1940-х — 1991 г.».
2. Канкрэтызуйце фактамі наступны вывад: «Асаблівасці палітычнага развіцця БССР у пасляваенны перыяд былі абумоўлены яе геапалітычным становішчам і дасягнутым узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця».
3. Якую ролю адыгрывалі грамадскія арганізацыі БССР у другой палове XX ст.?
4. Пад нацыянальным пытаннем разумеюць сукупнасць палітычных, эканамічных, прававых праблем, якія праяўляюцца ва ўзаемаадносінах паміж рознымі этнічнымі групамі. Прывядзіце аргументы, якія пацвярджаюць вывад: нацыянальнае пытанне ў БССР было вырашана.
5. Ці можна казаць пра гістарычную абумоўленасць міжканфесійнай і міжнацыянальнай згоды ў беларускім грамадстве?

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 37. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1991 г.

ІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА
САЛІГОРСК НАВАПОЛАЦК
МЕЛІЯРАЦЫЯ ХІМІЗАЦЫЯ
НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
РЫНАЧНАЯ ЭКАНОМІКА

Наступствы вайны

1. Подзвіг беларускага народа па аднаўленні эканомікі. У выніку Вялікай Айчыннай вайны і нацысцкай акупацыі ў Беларусі цалкам або часткова былі разбураны 209 гарадоў, не менш чым 12 868 сельскіх населеных пунктаў, 290 з іх падзялілі лёс Хатыні.



Што значыць выраз «падзяліць лёс Хатыні»?

Беларусь страціла больш за палову нацыянальнага багацця. Па стане эканамічнага развіцця наша краіна была адкінута да ўзроўню 1928 г., а па такіх найважнейшых галінах, як прамысловасць і энергетыка, — да паказчыкаў 1913 г. У вызваленай БССР дзейнічала толькі 2 % даваенных энергетычных магутнасцей. За гады вайны была фактычна знішчана матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў і саўгасаў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны загінуў кожны трэці жыхар Беларусі. Паводле ацэнак спецыялістаў, Беларусь болей, чым якая-небудзь іншая краіна Еўропы, пацярпела ад вайны.

Пасля Вялікай Перамогі стваральная праца беларускага народа, як і ўсіх народаў СССР, была скіраваная на аднаўленне краіны, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця нацыянальнай эканомікі і культуры, павышэння народнага дабрабыту.


Аднаўленне народнай гаспадаркі

Аднаўленне прамысловасці і іншых галін эканомікі пачалося адначасова з вызваленнем Беларусі

ўвосень 1943 г. У верасні 1946 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон аб чацвёртым пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946–1950 гг., які быў складовай часткай агульнасаюзнага плана. Ён прадугледжваў не толькі аднаўленне, але і значны рост эканомікі, перш за ўсё машынабудавання. Больш хуткія тэмпы прамысловага развіцця планаваліся ў заходніх абласцях Беларусі.

Адной з найбольш істотных праблем была нястача рабочых рук. Асноўны цяжар аднаўлення лёг на плечы жанчын, падлеткаў і старых. Вялікую дапамогу Беларускай ССР аказалі іншыя рэспублікі Савецкага Саюза, якія накіравалі ў нашу рэспубліку інжынераў, тэхнікаў, кваліфікаваных рабочых. У БССР ішлі вагоны з сыравінай, станкамі і абсталяваннем.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Г. Валгаград (Расійская Федэрацыя)



Г. Гомель (другая палова 1940-х гг.)



Асабістая кніжка ўдзельніка аднаўлення Мінска (1944 г.)

1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:
— як звязаныя мемарыял «Дом Паўлава» ў г. Валгаградзе і аднаўленне беларускіх гарадоў;
— як звязаныя дом на першай ілюстрацыі і дом па адрасе: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 31.
2. Прывядзіце прыклады дапамогі савецкіх рэспублік у аднаўленні БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У надзвычай цяжкіх умовах праходзіла аднаўленне транспарту, жыллёвага фонду, бальніц і школ. Паслявае нае адраджэнне было працягам подзвігу, здзейсненага ўсім савецкім, у тым ліку і беларускім, народам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Ужо ў 1948 г. прамысловасць рэспублікі паводле аб'ёму выпуску прадукцыі перасягнула даваенны ўзровень.

2. Асноўныя этапы развіцця і структура эканомікі БССР. У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў БССР змянілася структура прамысловай вытворчасці: скарацілася ўдзельная вага харчовай, лёгкай, лясной, дрэваапрацоўчай прамысловасці, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў — галін, што пераважалі да вайны; значна павялічылася доля машынабудаўніцтва, металаапрацоўкі і электраэнергетыкі. Вядучай галіной прамысловасці рабілася машынабудаванне.

Чым, на вашу думку, было абумоўлена прыярытэтнае развіццё цяжкай прамысловасці ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе?

Поспехі пасляваеннага аднаўлення прамысловасці ў БССР

1947 г.	На Мінскім аўтамабільным заводзе выпушчаныя першыя аўтамабілі-самазвалы МАЗ-205
1950 г.	Пачатак серыйнага вырабу трактароў на Мінскім трактарным заводзе. У 1953 г. з галоўнага канвеера МТЗ сышоў першы колавы трактар «Беларусь»
1950 г.	Выпрацоўка электраэнергіі на 50 % перавысіла даваенны ўзровень
1950 г.	У заходніх абласцях БССР аб'ём прамысловай прадукцыі амаль удвая перасягнуў узровень 1940 г.

Ад сярэдзіны 1950-х гг. адначасова з захаваннем высокіх тэмпаў развіцця цяжкай прамысловасці ў БССР пачалі надаваць больш увагі развіццю вытворчасці тавараў народнага спажывання.

Аднаўленню і развіццю сельскай гаспадаркі ў БССР спрыялі захады, зробленыя савецкім кіраўніцтвам у 1953 г.: павелічэнне закупачных цэн на сельгаспрадукцыю, спісанне запазычанасці калгасаў, змяненне сістэмы падаткаабкладання асабістага надзелу селяніна (ён пачаў плаціць з памеру зямельнай пло-

Якім чынам зробленыя захады маглі паўплываць на развіццё сельскай гаспадаркі?

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У перыяд пасляваеннай індустрыялізацыі ў БССР паўсталі заводы-гіганты — гонар беларускага народа: Мінскі трактарны завод (МТЗ), Беларускі аўтамабільны завод (БелАЗ), Мінскі аўтамабільны завод (МАЗ). Яны зрабіліся асновай эканамічнай спецыялізацыі БССР. Прадукцыя гэтых прадпрыемстваў і ў нашы дні вылучаецца высокай якасцю і надзейнасцю, паспяхова канкурыруе на сусветным рынку.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія яшчэ прадпрыемствы былі пабудаваныя ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Ці ёсць такія прадпрыемствы ў вашым рэгіёне?*
2. *Складзіце топ-5 дасягненняў індустрыяльнага развіцця БССР у 1945–1991 гг. Якія фактары абумовілі дасягненні БССР у гэтай сферы ў згаданы перыяд?*
3. *Падрыхтуйце паведамленне аб гісторыі развіцця аднаго з прамысловых прадпрыемстваў Беларусі. Прааналізуйце, як яно змянілася ад моманту заснавання да нашых дзён.*

шчы, а не з таго, што на ёй вырошчвалася); павелічэнне фінансавых укладанняў у сельскую гаспадарку.

Даведайцеся, што значыць паняцце «рэнтабельнасць».

У выніку зробленых захадаў сельская гаспадарка Беларусі ўпершыню за пасляваенны перыяд зрабілася рэнтабельнай. Ужо ад 1950-х гг. БССР перастала быць датацыйнай рэспублікай і аж да распаду СССР папаўняла саюзны бюджэт.

Ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР пераважнае развіццё атрымалі галіны, якія вызначалі тэхнічны прагрэс: прыборабудаўнічая, радыётэхнічная, хімічная, нафтахімічная, паліўна-энергетычная. У 1963 г. быў уведзены ў строй першы Салігорскі калійны камбінат, у 1964 г. — Светлагорскі завод штучнага валакна. Пачалося будаўніцтва найбуйнейшага ў Еўропе лаўсанавага камбіната ў Магілёве.

Успомніце, што такое навукова-тэхнічная рэвалюцыя.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Па тэмпах развіцця прамысловасць БССР перасягала агульнасаюзныя паказчыкі.

У 1960 г. адносная доля прамысловасці ў рэспубліканскім унутраным нацыянальным даходзе склала 52 %.

Самай паспяховай для БССР і СССР у цэлым была восьмая пяцігодка (1966–1970 гг.). Валавы ўнутраны прадукт (ВУП) вырас больш чым на 50 %. У гэты час рэспубліка стала пляцоўкай для паспяховай апрабацыі (у першую чаргу ў галіне лёгкай прамысловасці) эканамічнай рэформы А. М. Касыгіна, першым намеснікам якога быў беларус К. Т. Мазураў. Значная ўвага надавалася сельскай гаспадарцы, зацікаўленасці ў выніках працы, умацаванню матэрыяльнай базы калгасаў і саўгасаў.

У 1970-я гг. рост ВУП у БССР пераўзыходзіў адпаведныя паказчыкі большасці рэспублік Савецкага Саюза, а таксама Аўстрыі, Венгрыі, Балгарыі. Аднак крыніцай росту ВУП у значнай ступені заставаўся **экстэнсіўны шлях развіцця**.

Важнае значэнне для развіцця эканомікі мела сельскагаспадарчая вытворчасць, дзе НТР спрыяла пашырэнню ў першую чаргу механізацыі і хімізацыі. У БССР будавалі буйны́я механізаваныя фермы і комплексы па вытворчасці мяса і малака, дзе ўтрымлівалі тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, але пры гэтым асноўную частку кармоў завозілі з-за межаў рэспублікі. На меліяраваных землях вырошчвалі да траціны ўсёй прадукцыі раслінагадоўлі і 40 % кармоў. Але ў шэрагу выпадкаў хімізацыю, канцэнтрацыю вытворчасці і меліярацыю праводзілі без глыбокай навуковай прапрацоўкі. Таму паўсталі новыя экалагічныя праблемы, звязаныя з забруджваннем глебы і вады, якія давялося вырашаць у другой палове 1970-х — 1980-я гг.

У 1980 г. у Беларусі дзейнічала каля 200 вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднанняў. Народнагаспадарчы комплекс БССР характарызаваўся высокім

БССР — індустрыяльная рэспубліка

Успомніце асноўныя мерапрыемствы эканамічнай рэформы 1965 г.

Экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі — шлях развіцця, пры якім рост вытворчасці забяспечваецца за кошт колькасных, а не якасных паказчыкаў.



Паштовая марка СССР. 1966 г.

Як на выяве адлюстраваныя працэсы хімізацыі і меліярацыі? Якія экалагічныя праблемы паўсталі ў выніку іх правядзення? Як іх можна было пазбегнуць?

узроўнем кваліфікацыі рабочага класа, вялікай канцэнтрацыяй інтэлекту, фундаментальнай і прыкладной навукі. Эканоміка Беларусі набыла выразны экспартаарыентаваны характар. У 1985 г. 300 прадпрыемстваў рэспублікі пастаўлялі прадукцыю больш чым у 100 краін свету.

Разам з тым укараненне навуковых распрацовак у сферу вытворчасці адбывалася марудна. Гэта, у прыватнасці, было абумоўлена тым, што для прадпрыемстваў больш выгадным было выкананне плана па валавым паказчыку пры нязначных новаўвядзеннях, не звязаных з вялікімі выдаткамі на рэалізацыю навуковых дасягненняў.

Запаволенне сацыяльна-эканамічнага развіцця

Да пачатку 1980-х гг. запаволіўся рост ураджайнасці асноўных сельскагаспадарчых культур, высокімі заставаліся страты сельскагаспадарчай прадукцыі падчас уборкі, транспарціроўкі і захавання (гублялася да 49 % бульбы, 33 % гародніны, 20 % збожжа). У выніку адтоку моладзі з вёскі скарацілася колькасць падсобных гаспадарак калгаснікаў, якія раней давалі значную колькасць малака, мяса і бульбы. Стварэнне Беларускага аграрна-прамысловага комплексу «Белагрpreпрам» дазволіла сканцэнтраваць рэсурсы, але не вырашыла асноўных праблем у сельскай гаспадарцы.

Інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі — шлях развіцця, звязаны з ростам вытворчасці на аснове паляпшэння якасных паказчыкаў, за кошт укаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі і павелічэння прадукцыйнасці працы.

У сярэдзіне 1980-х гг. было заяўлена пра неабходнасць паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэты курс прадугледжваў пераход на **інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі**. Ад лета 1987 г. асноўнай задачай ставілася ажыццяўленне пераходу ад пераважна адміністрацыйных да эканамічных (рынкавых) метадаў кіравання народнагаспадарчым комплексам краіны. Аднак спадзяванні на тое, што рынак сам усё адрэгулюе, не спраўдзіліся.

У другой палове 1980-х гг. развіццё эканомікі ў БССР было супярэчлівым. Разам з ростам эканамічнага патэнцыялу рэспублікі, нязначным дэфіцытам бюджэту, адноснай раўнавагай спажывец-

Правообладатель Издательский центр БГУ

кага рынку назіраліся зніжэнне асноўных эканамічных паказчыкаў і прыкметы крызіснай сітуацыі. Асобныя прадпрыемствы прастойвалі з прычыны недапастаўкі сыравіны, камплектуючых з іншых раёнаў СССР. Пачала расці інфляцыя, упершыню ў мірны час у БССР уводзіліся талоны на прадукты і некаторыя тавары доўгачасовага карыстання.

3. Сацыяльнае развіццё. У 1946 г. была павялічаная заработная плата ў асноўных галінах прамысловасці. Нізкааплатныя катэгорыі рабочых і служачых, студэнты і пенсіянеры атрымалі так званую хлебную надбаўку, уведзеную ў сувязі з падрыхтоўкай да адмены картачнай сістэмы (1947 г.).

Павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва

У выніку грашовай рэформы адбылося першае зніжэнне цэн. У 1949–1950 гг. цэны знізіліся на большасць тавараў.

У 1960-я гг. калгаснікі атрымалі права на пенсію і гарантаваную аплату працы.

Для пасляваеннага развіцця БССР была характэрная вялікая міграцыя насельніцтва ў іншыя рэспублікі СССР: жыхары вёсак з'язджалі ў раёны Калінінградскай вобласці, Карэла-Фінскай ССР, а пасля на асваенне цалінных і абложных зямель Казахстана, на Урал і ў Сібір. Ад сярэдзіны 1960-х гг. міграцыя насельніцтва з Беларусі значна паменшылася, а ў Беларусь, наадварот, вырасла.

Як вы лічыце, з чым было звязана змяненне напрамку міграцыйных працэсаў у БССР у сярэдзіне 1960-х гг.?

Адбыліся змены ў структуры сям'і. Сям'я, у якой было 1–2 дзіцяці, паступова пачала дамінаваць не толькі ў горадзе, але і ў сельскай мясцовасці. Дэмаграфічная сітуацыя 1960–1980-х гг. характарызавалася зніжэннем тэмпаў росту насельніцтва.

«Спажывецкая рэвалюцыя»

Рост рэальных даходаў насельніцтва прывёў у 1970-я гг. да так званай «спажывецкай рэвалюцыі». У паўсядзённым жыцці шырэй пачалі выкарыстоўваць бытавую тэхніку: пыласосы, пральныя машыны, кухонныя камбайны, электра- і газавыя пліты, халадзільнікі. У карыстанні насельніцтва

знаходзілася значная колькасць аўтамабіляў. З'яўленне новых відаў сінтэтычных матэрыялаў дазволіла асвоіць вытворчасць адзення з капрону, нейлону, штучнага футра. Аднак айчынная лёгкая прамысловасць не магла задаволіць узрослыя патрэбы насельніцтва ў якаснай прадукцыі.

Нарастанне негатыўных з'яў

Істотным фактарам, які аказаў уплыў на сацыяльнае развіццё, стала аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Аварыя нанесла Беларусі шкоду, роўную 32 рэспубліканскім бюджэтам 1985 г. У зоне радыеактыўнага забруджвання аказалася каля 20 % усіх сельгасугоддзяў рэспублікі. Саюзная праграма ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС была прынятая толькі ў 1990 г.

Крызісныя з'явы ў эканоміцы прывялі да ўнармавання спажывання на шэраг тавараў і ўвядзення напачатку 1990-х гг. картачнай сістэмы. Характэрнай адметнасцю пачатку 1990-х гг. былі велізарныя чэргі за прамысловымі і харчовымі таварамі.

4. БССР у народнагаспадарчым комплексе Савецкага Саюза. У пасляваенны перыяд роля БССР у народнагаспадарчым комплексе Савецкага Саюза змянілася. Беларусь захоўвала сваё значэнне як вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі, перш за ўсё мяса і малака, бульбы і лёну. Аднаўленне лёгкай прамысловасці ў сярэдзіне 1950-х гг. спрыяла росту вытворчасці тканін (больш за 10 % агульнасаюзнай вытворчасці льняных тканін).

Рост ролі цяжкай прамысловасці БССР

Разам з тым змяненне структуры прамысловай вытворчасці садзейнічала росту долі БССР у вытворчасці станкоў, трактароў, аўтамабіляў. Амаль палова ўсіх прамысловых рабочых рэспублікі ў сярэдзіне 1950-х гг. была занятая ў паліўна-энергетычнай галіне, машынабудаванні, металаапрацоўчай прамысловасці і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. У сярэдзіне 1950-х гг. на долю БССР прыпадала каля 12 % усёй саюзнай вытворчасці трактароў. Трактары «Беларусь» экспартавалі ў Індыю, Аб'яднаныя

Правообладатель Издательский центр БГУ

Арабскія Эміраты і інш. У вытворчасці грузавых аўтамабіляў БССР перагнала такія развітыя краіны, як Аўстрыя, Швецыя і Данія. Вытворчасць металарэзных станкоў склала каля 7 % ад іх агульнасаюзнага вырабу.

Імклівы рост прамысловасці абумовіў неабходнасць будаўніцтва ў БССР новых электрастанцый. Энергетыка краіны базавалася галоўным чынам на выкарыстанні торфу, у паліўным балансе яго адносная доля перавышала 50 %.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя прывяла да далейшых змен месца і ролі БССР у народнагаспадарчым комплексе СССР. Прыярытэтнае развіццё ў Беларусі атрымалі навукаёмістыя галіны: прыборабудаванне, электронная і радыёэлектронная прамысловасць, вытворчасць сродкаў сувязі.

Талент беларусаў, высокі ўзровень адукацыі паспрыялі фарміраванню магутнага кластара электроннай прамысловасці. Беларусь ператварылася ў высокатэхналагічны «зборачны цэх СССР».

Асаблівае значэнне набылі беларускія радыёэлектроніка, оптыка і оптаэлектроніка. Оптыка-механічнае аб'яднанне (БелОМА) займала вядучыя пазіцыі ў аптычнай галіне СССР.

Магілёўскі аўтамабільны завод (МаАЗ) выпускаў цягачы. Галоўным іх прызначэннем была буксіроўка паўпрычэпных транспартна-загрузачных машын або транспартна-ўстановачных агрэгатаў для мантажу на стартавыя пазіцыі балістычных ракет сярэдняй далёкасці.

Паводле ацэнкі экспертаў Сусветнага банка, у 1991 г. у Беларусі былі адны з найвышэйшых сярод савецкіх рэспублік паказчыкаў даходу на душу насельніцтва, развіты прамысловы сектар, які з улікам яго долі ў ВУП адпавядаў узроўню адной з самых індустрыяльных краін свету. Крызіс у беларускай эканоміцы пачаўся пазней, чым у іншых рэспубліках СССР.



Трактар «Беларусь» у Індыі. 1960-я гг.

Развіццё навукаёмістых галін прамысловасці

Як вы разумееце выраз: «БССР — высокатэхналагічны зборачны цэх СССР»?

З чым, на вашу думку, быў звязаны рост ролі прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу ў эканоміцы БССР у другой палове XX ст.?

У 1945–1991 гг. Беларусь дасягнула значных поспехаў у прамысловасці, аграрнай і сацыяльнай сферах. Дзякуючы працавітасці беларускага народа, яго еднасці і згуртаванасці ў кароткія тэрміны была адноўлена народная гаспадарка пасля Вялікай Айчыннай вайны. Пасляваенная мадэрнізацыя ў БССР была праведзена дзякуючы выкарыстанню сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу ўсяго Савецкага Саюза. На працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў фарміраваўся сацыяльна арыентаваны характар эканомікі. Менавіта ў гэтыя гады Беларусь ператварылася ў краіну з высокім навуковым і тэхналагічным узроўнем, быў закладзены падмурак унікальнай эканамічнай мадэлі развіцця.

калі ў свеце…

1974 г. — у Вялікабрытаніі праведзена першая аперацыя перасадкі ныркі прафесарам П. Морысанам

на тэрыторыі Беларусі…

1970 г. — у БССР праведзена першая аперацыя перасадкі ныркі прафесарам М. Я. Саўчанкам

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі эканамічнага і сацыяльнага развіцця БССР у 1945–1991 гг.
2. Чаму працэс аднаўлення народнай гаспадаркі БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны — гэта працоўны ўсенародны подзвіг?
3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) на тэму «Топ-5 дасягненняў БССР у сацыяльна-эканамічнай сферы ў пасляваенны перыяд».
4. Вызначце прыкметы інтэнсіўнага і экстэнсіўнага шляхоў развіцця эканомікі БССР у другой палове 1940-х — 1991 г. Чаму, нягледзячы на значныя дасягненні, сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі ў 1980-я гг. запаволілася?
5. Складзіце тэзісны план адказу на пытанне «БССР у народнагаспадарчым комплексе Савецкага Саюза».

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 38. Навука, культура, адукацыя ў БССР у другой палове 1940-х — 1991 г.

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР БДУ
«ІДЗІ І ГЛЯДЗІ» «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ»
«Я З ВОГНЕННАЙ ВЁСКІ»
СТЭФАНІЯ СТАНЮТА
МІХАІЛ САВІЦКІ «ПЕСНЯРЫ»

1. Развіццё культуры і мастацтва ў БССР у другой палове 1940-х — 1991 г. У 1945–1980-х гг. развіццё выяўленчага мастацтва ў БССР было звязанае з глыбокім асэнсаваннем гістарычных падзей. Тэмай многіх мастацкіх твораў зрабіўся гераізм беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На мяжы 1950–1960-х гг. у савецкім выяўленчым мастацтве пачынае фарміравацца кірунак, які атрымаў назву «суровы стыль». Асэнсаванне трагедыі Вялікай Айчыннай вайны, гераізацыя подзвігу і працоўных будняў, гісторыя Беларусі знайшлі адлюстраванне ў творах М. Савіцкага, В. Грамыкі,



За родную Беларусь. Мастак У. Сухаверхаў. 1948 г.



Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе. Мастак Я. Зайцаў. 1950 г.



Мінск. 3 ліпеня 1944 г.
Мастак В. Волкаў. 1945–1955 гг.



Палонных вядуць.
Мастак А. Шыбнеў. 1946 г.

Якія падзеі Вялікай Айчыннай вайны адлюстраваныя на прадстаўленых палотнах?

Г. Вашчанкі, У. Стэльмашонка, А. Кашкурэвіча, Г. Паплаўскага. Беларускія мастакі працавалі ў станковым і манументальным жывапісе, у розных жанрах — сюжэтна-тэматычная карціна, партрэт, пейзаж, нацюрморт, графіка і інш.

Архітэктура

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе перад архітэктарамі стаяла задача аднаўлення разбураных гарадоў. У архітэктуры Беларусі канца 1940-х — пачатку 1950-х гг. дамінуючым стылем быў так званы «сталінскі ампір» (савецкі класіцызм) з яго манументальнасцю, услаўленнем гераічнага мінулага. У гэтым стылі забудаваная цэнтральная частка праспекта Незалежнасці ў г. Мінску.

У другой палове 1950-х — 1980-х гг. у БССР паўстаюць новыя гарады: Салігорск, Наваполацк, Светлагорск; узводзяцца новыя жылыя раёны ў Мінску: Зялёны Луг, Серабранка, Усход, Чыжоўка і інш. Будаўніцтва было звязана з імклівым ростам прамысловасці. Так, узнікненне г. Светлагорск абумоўлена будаўніцтвам Васілевіцкай дзяржаўнай раённай электрастанцыі. З распрацоўкай буйны́х радовішчаў калійных солей (Старобінскае і Любанскае) звязанае будаўніцтва г. Салігорск.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



Міхаіл Андрэевіч Савіцкі (1922–2010)



«Праклён». З цыкла «Лічбы на сэрцы». 1979 г.



У залах мастацкай галерэі М. Савіцкага (г. Мінск)

Цыкл карцін «Лічбы на сэрцы» М. Савіцкага зрабіўся найбольш вядомай серыяй карцін пра жахі нацысцкіх лагераў смерці. Жывапісец перанёс на палатно тое, праз што прайшоў сам у гады Вялікай Айчыннай вайны: нямецкі палон, лагер смерці.

У 1997 г. М. Савіцкі стаў першым кавалерам ордэна Францыска Скарыны. У 2006 г. мастак быў ушанаваны званнем «Герой Беларусі».

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, чаму цыкл карцін называецца «Лічбы на сэрцы».*
2. *На думку адных экспертаў, карціны цыкла «Лічбы на сэрцы» ўвасабляюць трагедыю і смерць людзей, на думку іншых — сілу духу і перамогу жыцця. Паглядзіце карціны гэтага цыкла ў інтэрнэце (мастацкай галерэі М. Савіцкага, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны). Што, на вашу думку, яны сімвалізуюць?*
3. *Якія яшчэ творы М. Савіцкі прысвяціў Вялікай Айчыннай вайне? Якія падзеі на іх адлюстраваныя?*

Манументальнае мастацтва

1950–1970-я гг. зрабіліся часам росквіту савецкага і беларускага манументальнага мастацтва. Стварэнне мемарыялаў, прысвечаных подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, знайшло падтрымку на дзяржаўным узроўні. Адным з самых вядомых сімвалаў Мінска з'яўляецца Манумент Перамогі. Адкрыццё помніка адбылося ў 1954 г. Чатыры грані пастамента абеліска аформленыя бронзавымі гарэльефамі, якія стварылі беларускія скульптары.

Абеліск вянчае 3-метровы ордэн Перамогі. 4 бронзавыя вянкі вакол абеліска сімвалізуюць 4 франты,

байцы якіх удзельнічалі ў вызваленні рэспублікі ад нацысцкіх захопнікаў. 3 ліпеня 1961 г. каля манумента Перамогі быў запалены Вечны агонь, побач усталяваныя 12 гранітных блокаў з бронзавымі надпісамі-прысвячэннямі гарадам-героям.

ГАРЭЛЬЕФЫ МАНУМЕНТА ПЕРАМОГІ, Г. МІНСК



Партызаны Беларусі. Скульптар А. Глебаў



Слава загінулым героям. Скульптар З. Азгур



Савецкая Армія ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Скульптар С. Селіханаў



9 мая 1945 года. Скульптар А. Бембель

Сусветную вядомасць атрымаў мемарыяльны комплекс «Хатынь». Ён увекавечвае памяць пра жыхароў соцень беларускіх вёсак, спаленых нацыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мастацкай выразнасцю вылучаюцца мемарыяльныя комплексы «Брэсцкая крэпасць-герой» і «Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі».

Тэатр

У рэпертуары беларускіх тэатраў пераважалі тэмы Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі і быту краіны. Тэатры імкнуліся ўключыць у рэпертуар як класічныя творы, так і новыя пастаноўкі, якія адлюстроўвалі жыццё беларускага народа.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



Мемарыяльны комплекс «Хатынь»



Мемарыяльны комплекс «Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі»



Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся прозвішчы архітэктараў і скульптараў, якія ўдзельнічалі ў стварэнні гэтых мемарыяльных комплексаў.*
2. *Як вы разумееце словы А. Р. Лукашэнкі: «Як толькі забудзем шлях да Хатыні, Сталінграда, Брэсцкай крэпасці, усё вернецца зноў, імгненна. Таму мы павінны трымацца за гэтую гістарычную памяць»?*
3. *Якія мемарыяльныя комплексы, на вашу думку, павінен наведаць кожны беларус? Чаму?*

Шырокую вядомасць атрымаў Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета. Вялікі ўнёсак у станаўленне і развіццё беларускага балета зрабіў балетмайстар В. Елізар'еў.

Музыка

Былі створаныя новыя музычныя калектывы — Дзяржаўны народны хор пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча, Сімфанічны аркестр беларускага тэлебачання і радыё пад кіраўніцтвам Б. Райскага і інш. Далёка за межамі Беларусі сталі вядомыя сімфанічныя творы М. Аладава, Я. Цікоцкага, А. Багатырова.

Фарміраванню песеннага рэпертуару ў рэспубліцы паспрыяла творчасць вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры» пад кіраўніцтвам У. Мулявіна. Не менш вядомы ансамбль «Сябры» і яго мастацкі кіраўнік А. Ярмоленка. Творчасць гэтых ансамбляў вылучаюць меладычнасць, выкарыстанне народных інструментаў і шырокі рэпертуар песень на рускай і беларускай мовах. Да нашага часу ў беларусаў

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Тэма Вялікай Айчыннай вайны займала вялікае месца ў беларускай літаратуры другой паловы 1940-х — пачатку 1990-х гг. Многія беларускія пісьменнікі былі непасрэднымі ўдзельнікамі ваенных падзей: В. Быкаў, І. Мележ, І. Шамякін, І. Навуменка, А. Макаёнак, Я. Брыль. Ваеннымі карэспандэнтамі былі К. Крапіва, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка.

Успомніце літаратурныя творы гэтых аўтараў, вывучаныя на ўроках беларускай літаратуры. Якія падзеі Вялікай Айчыннай вайны атрымалі ў іх адлюстраванне? Як паказаныя ў іх подзвіг і трагедыя беларускага народа ў гады вайны?

Кіно



«Ідзі і глядзі». Рэжысёр Э. Клімаў

Як вы лічыце, якое сэнсавае «пасланне» для сучасных людзей закладзена ў фільме «Ідзі і глядзі»?

папулярныя песні І. Лучанка і Э. Ханка («Жураўлі на Палессе ляцяць», «Мой родны кут», «Майский вальс», «Шуміце, бярозы», «Малиновка» і інш.).

Да класікі савецкага кінематографа належаць фільмы, знятыя кінастудыяй «Беларусьфільм»: «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (рэжысёр М. Фігуроўскі), «Альпійская балада» (рэжысёр Б. Сцяпанаў), «Палеская хроніка» (рэжысёр В. Тураў). У фільмах В. Турава («Я родам з дзяцінства», «Сыны ідуць у бой») зняўся папулярны акцёр У. Высоцкі, які напісаў больш за 20 песень для беларускага кіно. Папулярнасць сярод дзяцей і моладзі ўсяго Савецкага Саюза атрымалі фільмы «Прыгоды Бураціна» (рэжысёр Л. Нячаеў), «Бронзавая птушка» (рэжысёр М. Калінін) і інш. Да нашага часу ўражвае гледачоў тонкім гумарам і багатай жыццёвай філасофіяй фільм «Белыя Росы» (яго паглядзела больш за 1 млн гледачоў, аўтар сцэнарыя — вядомы беларускі драматург А. Дудараў, рэжысёр І. Дабралюбаў).

На аснове дакументальнай трагедыі «Я з вогненнай вёскі», напісанай беларускімі пісьменнікамі А. Адамовічам, У. Калеснікам і Я. Брылём, зняты мастацкі фільм «Ідзі і глядзі» (рэжысёр Э. Клімаў). Гэтая карціна, на думку кінакрытыкаў, з'яўляецца адным з найлепшых фільмаў пра Вялікую Айчынную вайну.

Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Дасягненні БССР у галіне навукі. У 1944 г. аднавіла сваю дзейнасць Акадэмія навук БССР. Да пачатку 1950-х гг. была адноўлена штатная колькасць яе супрацоўнікаў. Значныя зрухі адбыліся ў развіцці прыродазнаўчых і тэхнічных навук. У 1950–1960-я гг. былі створаны інстытуты матэматыкі, фізікі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, тэхнічнай кібернетыкі, ядзернай энергетыкі і іншыя.

Вялікі ўнёсак у развіццё навукі зрабілі акадэмікі АН БССР:

В. Купрэвіч, доктар біялагічных навук; падчас кіравання Акадэміяй навук у 1952–1969 гг. прыклаў шмат намаганняў для аднаўлення даследаванняў у галіне генетыкі;

П. Альсмік, у 1951 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію за вывядзенне і ўкараненне ў вытворчасць высокапрадукцыйных сартоў бульбы;

Г. Багамолаў, у 1952 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію за разведку і адкрыццё Старобінскага радовішча калійных солей;

М. Барысевіч, доктар фізіка-матэматычных навук; кіраваў даследаваннямі ў галіне фізікі — спектраскапіі свабодных складаных малекул.



АН БССР узнагароджана ордэнамі Дружбы народаў у 1975 г. і Леніна ў 1978 г.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Дасягненні беларускіх вучоных пасляваеннага перыяду выкарыстоўваліся не толькі ў Савецкім Саюзе, але і далёка за межамі СССР. Адно з найважнейшых дасягненняў АН БССР гэтага часу — цвёрдацельны лазер.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце прэзентацыю (паведамленне) аб дасягненнях беларускіх вучоных у пасляваенны перыяд, што атрымалі сусветнае прызнанне.

Ператварэнне БССР у адзін з магутных індустрыяльных цэнтраў СССР з высокаразвітой машына-, аўтамабіле-, трактара- і прыборабудаўнічай, радыётэхнічнай і хімічнай прамысловасцю патрабавала

падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. У БССР вырасла колькасць ВНУ, яны рабіліся цэнтрамі развіцця фундаментальнай навукі. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце пад кіраўніцтвам рэктара акадэміка А. Сеўчанкі фарміраваўся магутны кластар навукі і адукацыі прыродазнаўчанавуковага кірунку, шэраг навуковых школ гэтага профілю. Шырока за межамі Беларусі сталі вядомыя распрацоўкі беларускіх медыкаў. Так, загадчыца кафедры хвароб вачэй Мінскага медыцынскага інстытута Т. Бірыч прапанавала комплекснае лячэнне траўмаў вачэй у дзяцей і шэраг іншых навукова-практычных распрацовак.

У БССР імкліва развіваліся радыёэлектроніка і інтэгральная мікраэлектроніка, вылічальная тэхніка.

Ва ўмовах *навукова-тэхнічнай рэвалюцыі* пастаянна пашыраліся кірункі навуковых даследаванняў. Беларускія навукоўцы вывучалі пытанні развіцця энергетыкі, стварэння тэхнічных сродкаў для прадпрыемстваў машынабудаўнічай прамысловасці, распрацоўвалі радовішчы карысных выкапняў, выводзілі новыя сарты сельскагаспадарчых культур, вывучалі шляхі павышэння прадуктыўнасці жывёлы. Укараненне навуковых адкрыццяў у вытворчасць спрыяла павышэнню прадукцыйнасці працы, паляпшэнню ўмоў працы і якасці прадукцыі.

У 1948–1958 гг. была падрыхтаваная канцэпцыя гісторыі Беларускай ССР, рэалізаваная ў выглядзе двухтомнай «Гісторыі Беларускай ССР», першага абагульняльнага навуковага выдання айчыннай гісторыі. Працягваліся археалагічныя раскопкі старажытных гарадоў Беларусі. Ад сярэдзіны 1960-х гг. пачынаецца актыўны перыяд адраджэння сацыялагічнай навукі.

У 50–60-я гг. XX ст. беларускія вучоныя, у прыватнасці Інстытут фізікі АН БССР, удзельнічалі ў распрацоўцы і рэалізацыі розных касмічных праграм, стварэнні ракетна-касмічнай тэхнікі. У раз-



Пётр Клімук



Уладзімір Кавалёнак

Успомніце, чым значныя для СССР даты 4 кастрычніка 1957 г. і 12 красавіка 1961 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

віццё савецкай касманаўтыкі зрабілі дастойны ўнёсак беларускія лётчыкі-касманаўты Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак.

3. Развіццё адукацыі ў БССР. Пасля вызвалення БССР ад нацысцкіх захопнікаў адной з найважнейшых задач было аднаўленне школ. Для гэтага патрабавалася адрамантаваць або нанава ўзвесці будынкі, наладзіць выраб школьнага абсталявання, вучэбнай літаратуры, падрыхтаваць настаўнікаў. Рамонтам і будаўніцтвам школ займаліся не толькі будаўнікі, але і настаўнікі, бацькі вучняў і ваеннаслужачыя. Гэта дазволіла ўжо ў 1945/1946 вучэбным годзе ўвесці ў дзеянне 80 % ад даваеннай колькасці школ. У 1950/1951 вучэбным годзе ў БССР была адноўлена даваенная сетка агульнаадукацыйных школ.

Чаму ў пасляваеннай Беларусі аднаўленне школ было адной з найважнейшых задач?

Сярэдняя адукацыя

Развіццё адукацыі ў БССР у пасляваенны перыяд суправаджалася мноствам рэарганізацый, характэрных для ўсёй савецкай сістэмы адукацыі. Рэформы былі скіраваныя на павышэнне ўзроўню і якасці адукацыі. У 1949 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову «Аб усеагульным абавязковым сямігадовым навучанні». Да сярэдзіны 1950-х гг. пераход на ўсеагульнае сямігадовае навучанне быў у цэлым завершаны.

У 1958 г. была ўведзена абавязковая васьмігадовая адукацыя. Сярэднія 10-гадовыя школы былі рэарганізаваныя ў агульнаадукацыйныя 11-гадовыя з вытворчым навучаннем. У школах вывучэнне асноў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці суправаджалася абавязковай практыкай на мясцовых прадпрыемствах або ў калгасах. У 1964 г. сярэднія школы вярнуліся да 10-гадовага тэрміну навучання, а ў 1984 г. пачалася рэформа агульнаадукацыйнай школы, якая ўводзіла 11-гадовае навучанне з 6-гадовага ўзросту.

Ад 1977 г. усеагульнай і абавязковай была сярэдняя адукацыя. БССР ператварылася ў рэспубліку ўсеагульнай пісьменнасці. У 1978 г. права грамадзян на бясплатную адукацыю было замацаванае ў Канстытуцыі БССР.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 1958 г. Джон Кенедзі (будучы прэзідэнт ЗША), гаворачы пра «халодную вайну», сказаў: «Барацьба, у якой мы цяпер удзельнічаем, будзе выйграна або прайграна ў класах Амерыкі».

Далей ён прывёў прыклады адрозненняў у савецкай і амерыканскай сістэмах, падкрэсліўшы моцныя бакі савецкай адукацыі: «У каго сёння лепшая сістэма адукацыі — у ЗША або ў СССР? Чаму рускія цяпер выйграюць? <…> Амерыканскія школьнікі праходзяць 12-гадовае навучанне, тады як рускія школьнікі вучацца толькі 10 гадоў. Але за гэты час яны атрымліваюць больш гадзін навучання, чым амерыканскія за 12. Яны наведваюць заняткі шэсць дзён на тыдзень, дзесяць месяцаў на год. У іх на аднаго настаўніка прыблізна 17 вучняў, у нас 27. Апроч некаторага выбару ў вывучэнні замежных моў, яны не маюць факультатыўных прадметаў. 10-гадовы вучэбны план уключае ў абавязковым парадку пяць гадоў фізікі, пяць гадоў біялогіі, чатыры гады хіміі, адзін год астраноміі і дзесяць гадоў матэматыкі аж да трыганаметрыі і элементарнага матаналізу. Мала якія 12-гадовыя вучэбныя праграмы ў Амерыцы ахопліваюць столькі ж матэрыялу. <…> Рускія выпускаюць у дзесяць разоў больш інжынераў, чым некалькі дзесяцігоддзяў таму, і ў два з паловай разы больш, чым выпускаюць у ЗША. Яны вучаць і выпускаюць больш вучоных. Паводле некаторых ацэнак, цягам пяці гадоў у СССР будзе ў тры разы больш вучоных і інжынераў, чым у нас».

Дж. Кенедзі, 35-му прэзідэнту ЗША, прыпісваюць такія словы: «СССР выйграў касмічную гонку за школьнай партай».

1. У чым Дж. Кенедзі бачыў перавагі савецкай сістэмы адукацыі?

2. Як вы разумееце выразы: «выйграць касмічную гонку за школьнай партай», «прайграць вайну ў класах Амерыкі»? Пра што сведчаць гэтыя выразы?

Прафесійна-тэхнічная адукацыя

У БССР ствараліся ўмовы для адукацыі працоўнай моладзі, адкрываліся школы рабочай і сельскай моладзі. Былі створаныя прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, якія рыхтавалі кваліфікаваных рабочых для розных галін народнай гаспадаркі.

Сярэдняя спецыяльная адукацыя

Сетку сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пасля вайны давялося ствараць нанава. У 1960 г. у Беларусі было 102 сярэднія спецыяльныя наву-

Правообладатель Издательский центр БГУ

чальныя ўстановы, у якіх вучылася 62,2 тыс. навучэнцаў, а ў 1985 г. у сярэдніх спецыяльных навучальных установах па 260 прафесіях навучалася 160,4 тыс. чалавек.

Вышэйшая адукацыя

Была адноўлена сістэма вышэйшай адукацыі. Адкрываліся новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, у іх ліку Мінскі радыётэхнічны інстытут, Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, Мінскі інстытут замежных моў, Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.

Патрэбы народнай гаспадаркі ў кадрах абумовілі адкрыццё шэрагу абласных профільных вышэйшых навучальных устаноў: Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута, Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі, Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута, Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці, Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. Пачалі працаваць Брэсцкі, Мазырскі і Полацкі педагагічныя інстытуты. На базе Гомельскага педагагічнага інстытута быў створаны Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, на базе Гродзенскага педінстытута — Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт. Юнакі і дзяўчаты, якія працавалі на прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы, мелі магчымасць атрымліваць вышэйшую адукацыю завочна.

Ужо да 1961 г. у Беларусі на душу насельніцтва прыходзілася больш школ і ўніверсітэтаў, чым у такіх развітых краінах, як Вялікабрытанія, Францыя, Японія, Італія і ФРГ. На сярэдзіну 1980-х гг. у рэспубліцы працавала 33 ВНУ, у якіх навучалася 188,6 тыс. студэнтаў. Беларусь займала другое месца пасля РСФСР па колькасці студэнтаў на 1000 жыхароў, а якасць падрыхтоўкі ў ВНУ рэспублікі лічылася адной з найвышэйшых у Савецкім Саюзе.

Для БССР была характэрная высокая ступень інтэграцыі ў агульную навукова-тэхнічную прастору СССР. Вучоныя БССР зрабілі значны ўнёсак у развіццё навукі. Навуковы патэнцыял рэспублікі паспяхова выкарыстоўваўся для ўдасканалення вытворчасці, павышэння сацыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця беларускага народа. Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі быў галоўным дасягненнем у развіцці народнай адукацыі. Вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы вялі падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі. У мастацтве вядучымі тэмамі былі подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, будаўніцтва сацыялізму.

калі ў свеце…

1972 г. — стварэнне шведскага поп-гурта «АББА»

на тэрыторыі Беларусі…

1969 г. — стварэнне вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры»

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Складзіце ментальную карту «Асноўныя тэндэнцыі развіцця культуры БССР у пасляваенны перыяд».
2. Дакажыце, што беларуская навука зрабіла значны ўнёсак у развіццё савецкай і сусветнай навукі.
3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце характарыстыку сістэмы адукацыі ў БССР. Знайдзіце падабенствы і адрозненні сістэм адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і ў БССР.
4. Падрыхтуйце прэзентацыю «Тэма Вялікай Айчыннай вайны (працы, паўсядзённага жыцця) у карцінах беларускіх мастакоў другой паловы XX ст.».

Правообладатель Издательский центр БГУ

Практыкум па раздзеле «Беларусь і свет у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.»

Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

1. Найважнейшай з'явай другой паловы XX ст., якая шмат у чым вызначыла развіццё сучаснага грамадства, была навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Яна змяніла вытворчасць і паўсядзённае жыццё чалавека.

Падчас навукова-тэхнічнай рэвалюцыі адбываецца працэс ператварэння навукі ў непасрэдную прадукцыйную сілу. НТР змяняе ўмовы, характар і змест працы, структуру прадукцыйных сіл, галіновую і прафесійную структуру грамадства, вядзе да хуткага росту прадукцыйнасці працы, уздзейнічае на ўсе бакі жыцця грамадства, у тым ліку на культуру, побыт, псіхалогію людзей, узаемаадносіны грамадства з прыродай.

Найважнейшую ролю ў падрыхтоўцы НТР адыгралі поспехі прыродазнаўства ў канцы XIX — пачатку XX ст., у выніку якіх склалася новая карціна свету. Гэты пераварот пачаўся з адкрыцця электрона, радыю, ператварэння хімічных элементаў, стварэння тэорыі адноснасці і квантавай тэорыі. Рэвалюцыйны зрух адбыўся ў тэхніцы, у першую чаргу пад уплывам выкарыстання электрычнасці ў прамысловасці і на транспарце. Было вынайдзена радыё і атрымала вялікае пашырэнне. У 40-я гг. XX ст. навука вырашыла праблему расшчаплення атамнага ядра, чалавецтва авалодала атамнай энергіяй.

Пачаўся рост асігнаванняў на навуку. Навуковая дзейнасць ператварылася ў масавую прафесію. У другой палове 50-х гг. XX ст. у многіх краінах пачалося стварэнне тэхнапаркаў, дзейнасць якіх скіравана на планаванне і кіраванне навуковай дзейнасцю. Узмацніліся непасрэдныя сувязі паміж навуковымі і тэхнічнымі распрацоўкамі, паскорылася выкарыстанне навуковых дасягненняў у вытворчасці.

А. Вызначце істотныя прыкметы паняцця «навукова-тэхнічная рэвалюцыя».

Б. Укажыце ключавыя змены, што адбыліся ў розных сферах жыцця грамадства ў выніку НТР. Канкрэтызуйце вылучаныя змены гістарычнымі фактамі з гісторыі Беларусі.

В. Зрабіце вывад, ці была НТР заканамернай з'явай.

Адрозненне факта ад думкі

2. «На момант перабудовы БССР была адной з найбольш развітых савецкіх рэспублік. У 1991-м паводле індэксу развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь займала 40-е месца сярод 174 краін свету і належала да групы краін з высокім узроўнем развіцця. ...ВУП на душу насельніцтва паводле парытэту пакупніцкай здольнасці ў доларах ЗША ў 1989 г. складаў: РСФСР — 10 326; Украінская ССР — 9303; Італія — 15 500; Іспанія — 10 500; БССР — 14 980». *(У. Г. Гусакоў, акадэмік НАН Рэспублікі Беларусь. «Беларусь сегодня», 2021 г.)*

Сяроднегадавыя тэмпы эканамічнага росту ў СССР і БССР у 1970–1985 гг. (%)

		1970–1975 гг.	1976–1980 гг.	1981–1985 гг.
1. ВНП (валавы нацыянальны прадукт)	СССР	6,3	4,2	3,5
	БССР	8,3	5,2	5,0
2. Прамысловая прадукцыя	СССР	7,4	4,4	3,7
	БССР	10,4	7,2	5,4
3. Прадукцыя сельскай гаспадаркі	СССР	2,5	1,7	1,1
	БССР	2,6	1,5	1,6

А. Што такое перабудова? Калі яна пачалася?

Б. Вызначце тэндэнцыі ў эканамічным развіцці СССР і БССР у 1970–1985 гг. Чым яны былі абумоўлены?

В. Падмацуйце фактамі думку пра тое, што да пачатку перабудовы БССР была адной з самых развітых савецкіх рэспублік.

Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

3. А. Выканайце заданне на выбар.

1. Складзіце топ-5 «Асоба ў гісторыі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.». Свой выбар аргументуйце.

2. Зрабіце постар, прысвечаны пэўнай асобе і яе ролі ў гісторыі.

3. Складзіце аповед ад імя пэўнай асобы аб гістарычных падзеях, у якіх яна брала ўдзел.

Б. Вызначце трох асоб, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у развіццё Беларусі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. Сваю думку аргументуйце.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

4. Разгледзьце плакаты. Выканайце заданні.



І. Ганф.
«Народы свету не хочуць паўтарэння бедстваў вайны. І. Сталін». 1949 г.



М. Гардон.
«Айчыну я слаўлю, якая ёсць, ды тройчы — якая будзе».
1957 г.



А. Какарэкін.
«Вугаль — гэта хлеб для прамысловасці!».
1946 г.



Б. Белапольскі.
«Добры догляд — высокія надоі!».
1955 г.



Н. Вігілянская.
«Нас, піянераў-сяброў, мільёны!».
1962 г.



Б. Старыс.
«Казка зрабілася быллю».
1961 г.

А. Суаднясіце час стварэння плаката і гістарычныя падзеі, што адбываліся ў гэты перыяд у свеце, у СССР і БССР.

Б. Якія асаблівасці / тэндэнцыі развіцця СССР і БССР знайшлі ўвасабленне ў сюжэтах плакатаў?

В. Плакаты ствараюцца з мэтай інфармавання, рэкламы, агітацыі. Плакат — гэта зведзенае ў выразную візуальную формулу паведамленне, прызначанае сучасніку для вывадаў і канкрэтных дзеянняў. З якой мэтай былі выраблены паказаныя плакаты?

Выяўленне прычынна-выніковых сувязей

5. У другой палове XX ст. актывізавалася міжнародная дзейнасць БССР. Наша рэспубліка зрабілася адной з краін — заснавальніц ААН, брала ўдзел у рабоце амаль 70 міжнародных арганізацый і іх органаў. У 1954 г. яна зрабілася членам Міжнароднай арганізацыі працы і ЮНЕСКА, у 1957 г. — МАГАТЭ, у 1974 г. — Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, у 1985 г. — Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па прамысловым развіцці (ЮНІДО). У 1974–1975 гг. БССР была непастаянным членам Савета Бяспекі ААН.

БССР падпісала шэраг важных дамоў, якія абмяжоўвалі гонку ўзбраенняў:

- аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой (1963);
- аб прынцыпах дзейнасці дзяржаў па даследаванні і выкарыстанні касмічнай прасторы (1967);
- аб забароне размяшчэння на дне мораў і акіянаў і ў іх нетрах ядзернай зброі (1971);
- аб забароне распрацоўкі, вытворчасці і назапашвання бактэрыялагічнага (біялагічнага) і таксічнага ўзбраення і яго знішчэнні (1972).

Важным кірункам дзейнасці дэлегацыі БССР у ААН была барацьба супраць каланіялізму. Наша рэспубліка была ў ліку ініцыятараў прыняцця Дэкларацыі аб наданні незалежнасці каланіяльным краінам і народам (1960), паслядоўна выступала за поўнае ажыццяўленне яе прынцыпаў.

А. Чым было абумоўлена павышэнне міжнароднага статусу БССР у другой палове XX ст.?

Б. Вызначце гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы другой паловы XX ст., якія абумовілі кірункі дзейнасці БССР у ААН.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Абагульненне па раздзеле «Беларусь і свет у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.»

Працуем з паняццямі

1. Прачытайце прапанаваны пералік паняццяў і падзяліце іх на групы. Крытэрыі падзелу вызначце самастойна.

Біпалярны свет, глабалізацыя, дэкаланізацыя, інтэграцыя, інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі, інфармацыйнае грамадства, мадэрнізацыя, меліярацыя, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, навукова-тэхнічны прагрэс, неакансерватызм, перабудова, постіндустрыяльнае грамадства, «халодная вайна», эканамічная рэформа, экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі.

2. Вызначце паняцці, якія адносяцца да гісторыі Беларусі. Канкрэтызуйце іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з'яў, працэсаў).

Аналізуем, тлумачым, разважаем

3. Выявіце ўзаемасувязь паміж наступнымі гістарычнымі фактамі:

А. Другая сусветная вайна — «халодная вайна».

Б. Другая сусветная вайна — дэкаланізацыя.

В. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя — глабалізацыя.

Г. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя — постіндустрыяльнае грамадства.

Д. Глабалізацыя — пагроза нацыянальнаму суверэнітэту дзяржаў.

4. Дакажыце або абвергніце наступныя тэзісы:

А. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны сфарміраваўся двухполюсны свет.

Б. Пасля Другой сусветнай вайны ў Азіі і Афрыцы адбываўся актыўны працэс дэкаланізацыі.

В. У другой палове XX ст. актывізаваліся інтэграцыйныя працэсы ў Заходняй Еўропе.

Г. 1945–1991 гг. у гісторыі БССР зрабіліся перыядам мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі і прамысловасці, стварэння новых галін эканомікі, вялікіх дасягненняў у сацыяльнай сферы, навукі і культуры.

Д. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя прывяла да змянення месца і ролі БССР у народнагаспадарчым комплексе СССР.

Е. 1950–1970-я гг. былі часам росквіту беларускага манументальнага мастацтва.

Сістэматызуем веды

5. Выкарыстоўваючы стужку часу, прадстаўленую ў пачатку раздзела III, выканайце наступныя заданні.

А. Якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу? Чаму?

Б. Прапануйце форму для іх абазначэння (карціна, картасхема, цытата, фотаздымак і інш.).

В. Прадстаўце развіццё Беларусі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. у выглядзе лагічнай схемы (ментальнай карты). Адлюструйце ў ёй эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае і духоўнае развіццё рэспублікі ў названы перыяд.

6. Работа ў міні-групах. Складзіце топ-10 дасягненняў БССР у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. Як яны змянілі жыццё беларускага грамадства? Якія сацыяльныя, эканамічныя і культурныя заваёвы вывучанага перыяду Беларусь захоўвае сёння?

Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

7. Разгледзьце картасхемы (гл. с. 167–168). На аснове іх складзіце тэзісы для адказу на пытанне: «Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у 1944–1964 гг.».

Правообладатель Издательский центр БГУ


БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1950-х гг.
Заходняя Беларусь — тэрыторыя, на якой у другой палове 1940-х гг. праводзілася калектывізацыя
Манумент Перамогі
Аб'екты культуры і спорту, створаныя да 1954 г.
Граніцы ў канцы 1945 г.
СССР
БССР
абласцей
Полацк
Віцебск
Глыбокае
Паставы
Зах. Дзвіна
Беларуская ДРЭС
Манумент Перамогі
Маладзечна
Барысаў
МІНСК
Горкі
Ліда
Акадэмія навук
Стадыён «Дынама»
Гродна
Нёман
Магілёў
Крычаў
Баранавічы
Слонім
Бабруйск
Бярэзіна
Гомель
Брэст
Пінск
Прыпяць
Дняпро
Мазыр
Аб'екты народнай гаспадаркі
адноўленыя ў 1943—1950 гг.
створаныя ў 1945—1955 гг.
Вытворчасць
грузавых аўтамабіляў
кар'ерных самазвалаў
трактароў
сельскагаспадарчых машын
будаўніча-дарожных машын
торфаздабыўных машын
матацыклаў і веласіпедаў
падшыпнікаў
станкоў
электрарухавікоў
вымяральных прылад
радыёпрыёмнікаў
тэлевізараў
хімічных валокнаў
гумавых вырабаў
Вышэйшыя навучальныя ўстановы
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
кансерваторыя
ваеннае інжынернае вучылішча
Інстытуты (ВНУ)
педагагічныя
сельскагаспадарчыя (у тым ліку акадэмія)
медыцынскія
ветэрынарны
політэхнічны і тэхналагічны
народнай гаспадаркі
інжынераў чыгуначнага транспарту
педагагічны замежных моў
тэатральны
фізічнай культуры

Найважнейшыя аб'екты прамысловасці, транспарту, навукі, адукацыі і сродкаў інфармацыі, створаныя ў БССР у 1955—1964 гг.



Вытворчасць

- грузавых аўтамабіляў
- кар'ерных самазвалаў (вытворчасць пераведзена з Мінска)
- камплектуючых для аўтамабіле- і трактарабудавання
- шматколавых цягачоў
- сельскагаспадарчых машын
- меліярацыйных машын
- суднаў
- рухавікоў унутранага згарання
- станкоў
- ліфтаў
- вымяральных прылад
- электронных вылічальных машын
- радыёдэталей
- электратэхнічных вырабаў
- халадзільнікаў
- газавых пліт
- гадзіннікаў
- пластмасавых і гумавых вырабаў
- мінеральных угнаенняў
- шкловалакна
- Нафтаперапрацоўчы завод
- Першы газаправод (1960)

Інстытуты (ВНУ)

- медыцынскі
- радыётэхнічны
- машынабудаўнічы

Правообладатель Издательский центр БГУ

Наш край у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.

1. Работа ў міні-групах. Выкарыстоўваючы матэрыял вучэбнага дапаможніка і гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» вашага раёна, вызначце:

А. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіў ваш населены пункт у 1945–1991 гг.; як змяняўся яго статус?

Б. Якія прамысловыя або сельскагаспадарчыя прадпрыемствы працавалі ў вашай мясцовасці ў 1945–1991 гг.?

В. Якія гістарычныя падзеі 1945–1991 гг. закранулі жыхароў вашага населенага пункта, раёна? Якім чынам?

Прадстаўце вынікі сваёй працы класу, параўнайце з вынікамі іншых міні-груп. Падрыхтуйце агульную прэзентацыю «Мая малая радзіма ў 1945–1991 гг.». Параўнайце яе з прэзентацыямі «Мая малая радзіма ў XIX — пачатку XX ст.» і «Мая малая радзіма ў 1917–1945 гг.», зрабіце вывад пра развіццё сваёй мясцовасці ў другой палове XX ст.

2. Экскурсія па родным краі. Складзіце каталог помнікаў гісторыі, культуры і прыроды вашай мясцовасці, заснаваных у другой палове XX ст. На аснове каталога распрацуйце план экскурсіі па сваім родным краі (населеным пункце) «Мой край — часцінка Савецкай Беларусі».

3. Славутыя землякі. З дапамогай матэрыялаў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» і дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, жыццё і / або дзейнасць якіх славутых людзей звязаныя з вашай мясцовасцю ў другой палове XX ст.

Даведайцеся, хто з вашых землякоў удзельнічаў у гістарычных падзеях 1945–1991 гг., напрыклад, быў удзельнікам вайны ў Афганістане (1979–1989 гг.) або ліквідатарам аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Прадстаўце вынік свайго даследавання ў выглядзе артыкула ў сродках масавай інфармацыі ў рубрыцы «Нашы землякі» або паста ў сацыяльнай сетцы.

4. Мая сям'я. Даведайцеся пра гісторыю сваёй сям'і ў 1945–1991 гг.: дзе жылі і чым займаліся вашы прабабулі і прадзядулі, бабулі і дзядулі, які ўдзел яны бралі ў гістарычных падзеях. Знайдзіце ў сямейных фотаальбомах здымкі, якія могуць распавесці гісторыю вашай сям'і ў кантэксце гісторыі краіны ў другой палове XX ст., а таксама рэчы (кнігі, цацкі і інш.).

Падрыхтуйце міні-выставу «Гісторыя маёй сям'і — гісторыя маёй краіны». Правядзіце экскурсію для аднакласнікаў.

РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У КАНЦЫ







1988–1991 гг. — «Парад суверэнітэтаў» у СССР


1990 г. — Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР

1991 г. — Утварэнне СНД

1993 г. — Утварэнне Еўрапейскага саюза

1994 г. — Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

1994 г. — Першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь



ДЭКЛАРАЦЫЯ

Вярхоўнага Савета
Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі







Правообладатель Издательский центр БГУ

XX — ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст.

1996 г. — І Усебеларускі народны сход

1999 г. — Стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі

2001 г. — Утварэнне ШАС

2002 г. — Утварэнне АДКБ

2014 г. — Дамова аб стварэнні ЕАЭС

2024 г. — Рэспубліка Беларусь стала паўнапраўным членам ШАС





Раздзел IV. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У КАНЦЫ XX — ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст.

§ 39. Свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.

ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ «ХАЛОДНАЯ ВАЙНА»
ІНФАРМАЦЫЙНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ПОСТІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА
АДНАПАЛЯРНЫ СВЕТ
ШМАТПАЛЯРНЫ СВЕТ
БІПАЛЯРНЫ СВЕТ

1. Геапалітычныя наступствы распаду СССР. Распад СССР у 1991 г. быў адной з ключавых падзей сучаснай гісторыі, якая вызначыла міжнародныя адносіны ў канцы XX — пачатку XXI ст. Ён азнаменаваў канец «халоднай вайны», разбурэнне ранейшага міжнароднага парадку і пачатак новага перыяду ў гісторыі — з новымі дзяржавамі, канфліктамі, саюзамі і выклікамі.

Пошук новых шляхоў супрацоўніцтва

У пошуках новых формаў узаемадзеяння дзяржавы, што ўтварыліся пасля распаду СССР, у 1991 г. заснавалі арганізацыю пад назвай Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД). Яна заклікана паспрыяць развіццю сувязей паміж рэспублікамі, умацаванню гандлёвых адносін і вырашэнню сумесных пытанняў, што асабліва важна ва ўмовах глабальных змен.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Геапалітычныя наступствы распаду СССР

З палітычнай карты свету знікла адна з дзвюх звышдзяржаў. Скончылася «халодная вайна». Пачало замацоўвацца аднапалярнае ўладкаванне свету з дамінуючай роляй ЗША

15 незалежных дзяржаў, што раней уваходзілі ў склад СССР, сталі суб'ектамі міжнародных адносін

Расія як праваперaемніца СССР атрымала ў спадчыну значную частку эканамічнага, ваеннага і палітычнага патэнцыялу, аднак страта тэрыторый і саюзнікаў істотна аслабіла яе пазіцыі і ўплыў у свеце

Адбылося пашырэнне НАТА на ўсход. У альянс увайшлі краіны, якія раней уваходзілі ў сацыялістычны блок, і некаторыя былыя рэспублікі СССР

Збліжэнне шэрагу краін былога СССР і яго саюзнікаў (краіны Прыбалтыкі, Усходняй Еўропы) з Захадам, імкненне да інтэграцыі з Еўрапейскім саюзам

Абвастрэнне нацыянальных канфліктаў на постсавецкай прасторы: Прыднястроўе (Малдова), Карабах (Азербайджан і Арменія), Абхазія і Паўднёвая Асеція (Грузія), Таджыкістан. Абвастрэнне пытанняў, звязаных са становішчам этнічных меншасцей у былых рэспубліках СССР (грамадзянства, правы, мова)

Змены ў сферы ядзернай бяспекі. Пасля распаду СССР ядзерная зброя апынулася на тэрыторыі чатырох дзяржаў — Расіі, Украіны, Беларусі і Казахстана. У 1990-я гг. яе перадалі Расіі. Украіна, Беларусь і Казахстан адмовіліся ад статусу ядзернай дзяржавы

Як вы лічыце, чаму распад СССР называюць найбуйнейшай геапалітычнай катастрофай другой паловы XX ст., наступствы якой нагадваюць аб сабе да нашага часу? Сваю думку растлумачце.

У наш час СНД адыгрывае ролю пляцоўкі для дыялогу і супрацоўніцтва, дазваляе краінам знаходзіць шляхі для ўзаемавыгаднага партнёрства.

2. Глабалізацыя. *Глабалізацыя* — адзін з найважнейшых працэсаў канца XX — пачатку XXI ст. Па сутнасці, яна з'яўляецца працягам тых працэсаў, якія зарадзіліся яшчэ ў эпоху Вялікіх геаграфічных

адкрыццяў і прамысловай рэвалюцыі, але набылі шырокі размах толькі ў Навейшы час.

Вытокі глабалізацыі

Чаму пасля заканчэння «халоднай вайны» працэсы глабалізацыі паскорыліся?

Тэрмін «глабалізацыя» шырока выкарыстоўваюць з канца 1980-х гг. Масавае выкарыстанне гэтага паняцця звязваюць з рэзкім паскарэннем тэхналагічнага прагрэсу, ростам уплыву транснацыянальных карпарацый і ўзмацненнем міжнародных сувязей. Пасля заканчэння «халоднай вайны» гэты працэс стаў больш інтэнсіўны.

Супярэчлівы характар глабалізацыі

Глабалізацыя ўтрымлівае ў сабе вострыя супярэчнасці. З аднаго боку, яна спрыяе развіццю міжнароднага падзелу працы і спецыялізацыі краін на вытвор-

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Глабалізацыя — гэта заканамерны вынік развіцця грамадства. Развіццё транспарту, тэлекамунікацый, інтэрнэту і лічбавых тэхналогій ператварыла свет у «глабальную вёску», дзе інфармацыя і тавары перадаюцца імгненна, а падзеі ў адной краіне здольныя паўплываць на ўвесь свет.

1. *Назавіце станоўчыя і негатыўныя наступствы згаданых з'яў глабалізацыі.*
2. *Якія яшчэ з'явы сучаснага грамадства, на вашу думку, з'яўляюцца сімваламі глабалізацыі?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

часці пэўных тавараў і паслуг, што павышае эфектыўнасць і прадукцыйнасць; прыводзіць да зніжэння выдаткаў і цэн на тавары і паслугі; спрыяе развіццю новых тэхналогій і паляпшэнню якасці тавараў і паслуг; аблягчае пашырэнне інфармацыі і адукацыйных рэсурсаў, павышае агульны ўзровень адукацыі і ведаў; спрыяе ўзаемадзеянню паміж рознымі культурамі і народамі; людзі атрымліваюць доступ да большай колькасці культурных каштоўнасцей, магчымасці для падарожжаў і прафесійнага росту; стварае аснову для аб'яднання намаганняў сусветнай супольнасці ў супрацьстаянні агульным выклікам, такім як экалагічныя і сацыяльныя праблемы.

З іншага боку, яна ўзмацняе залежнасць адных краін ад іншых, стварае рызыкі страты культурнай самабытнасці, паглыбляе сацыяльную няроўнасць паміж дзяржавамі і ўнутры іх. Буйны́я транснацыянальныя карпарацыі і міжнародныя арганізацыі атрымалі велізарную ўладу, якая часам пераўзыходзіць уплыў асобных дзяржаў.

Лічбавізацыя

Адным з ключавых інструментаў глабалізацыі выступіла *лічбавізацыя* — масавае ўкараненне лічбавых тэхналогій ва ўсе сферы жыцця. З аднаго боку, гэта дае новыя магчымасці: анлайн-адукацыя, электронныя паслугі, доступ да інфармацыі. З другога — прыводзіць да росту кантролю над грамадствам. Дзяржаўныя і наддзяржаўныя структуры, карпарацыі атрымліваюць доступ да велізарных аб'ёмаў звестак пра грамадзян. Гэта выклікае асцярогі наконт умяшання ў прыватнае жыццё, маніпуляцый грамадскай думкай і навязвання пэўных узораў і мадэляў паводзін.

Чаму ва ўмовах глабалізацыі робіцца асабліва актуальнай абарона персанальных дадзеных чалавека? Назавіце спосабы іх абароны.

Пашырэнне заходняй культуры

Глабалізацыя спрыяе пашырэнню заходніх каштоўнасцей пад выглядам універсальных, аднак заходні погляд на правы чалавека, свабоду асобы і талерантнасць выклікае неадназначную рэакцыю ў свеце. Адны ўспрымаюць такія працэсы як крок да адзінага чалавецтва, іншыя — як культурную экспансію,

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



З Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2024 г.)

Сучасны свет знаходзіцца ў стане глабальнай геапалітычнай напружанасці, абумоўленай працэсамі разбурэння ўсталяванага сусветнага парадку…

…Ажыццяўляецца знешняе ўмяшанне ва ўнутраныя справы дзяржаў для прасоўвання сваіх нацыянальных і калектыўных інтарэсаў у парушэнне агульнапрызнаных нормаў і прынцыпаў міжнароднага права. Побач з традыцыйнымі формамі ўзброенага процідзеяння ўсё часцей выкарыстоўваюцца інструменты «разумнай» сілы. Вядзецца актыўная барацьба за масавую свядомасць для рэалізацыі тэхналогій каляровых рэвалюцый.

Інфармацыйная сфера робіцца арэнай міждзяржаўнага супрацьстаяння. У выніку культурна-ідэалагічнай экспансіі мэтанакіравана скажаецца гістарычная праўда, ажыццяўляецца фальсіфікацыя гісторыі, разбураюцца культурная спадчына чалавецтва, традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці народаў, іх нацыянальная ідэнтычнасць, інстытут сям'і і прастора міжкультурнага ўзаемадзеяння. Электронныя сродкі масавай камунікацыі выкарыстоўваюцца для правакавання ўнутраных канфліктаў і разбурэння дзяржаў…

1. *Калі і кім зацверджана Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады крызісных з'яў у сучасным свеце, якія адлюстраваны ў дадзеным фрагменце Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.*
3. *Як вы лічыце, чаму ў якасці аднаго з асноўных нацыянальных інтарэсаў нашай краіны ў палітычнай сферы ў Канцэпцыі ўказана забеспячэнне электаральнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь? Што такое электаральны суверэнітэт?*

падрыў традыцыйных духоўных і маральных каштоўнасцей.

Абарона нацыянальных інтарэсаў

Глабалізацыя вымушае дзяржавы абараняць свае нацыянальныя інтарэсы, культуру і суверэнітэт. Адным са шляхоў абароны з'яўляецца стварэнне рэ-

Правообладатель Издательский центр БГУ

гіянальных аб'яднанняў (ЕАЭС, ШАС і інш.), а таксама развіццё лічбавага суверэнітэту — імкнення да фарміравання ўласнай інфармацыйнай прасторы.

Глабалізацыя — гістарычна заканамерны працэс. Але тое, якая яна будзе — адкрытая і справядлівая або кіраваная вузкім колам уплывовых дзяржаў, — залежыць ад рашэнняў, якія прымаюцца сёння. У сучасным свеце важна не проста быць уключаным у глабальныя працэсы, але і ўмець адстойваць свае каштоўнасці, інтарэсы і права на самастойны шлях развіцця.

Вытворчасць інфармацыі

3. Постіндустрыяльнае грамадства. *Інфармацыйная рэвалюцыя* паспрыяла паступоваму пераходу чалавецтва ў другой палове XX ст. ад індустрыяльнага да *постіндустрыяльнага грамадства*.

Успомніце, што такое постіндустрыяльнае грамадства.

У індустрыяльным грамадстве галоўнай крыніцай багацця з'яўляюцца машыны і вытворчасць. Большасць людзей працуюць на заводах, фабрыках, у будаўнічай сферы. У постіндустрыяльным грамадстве на першае месца выходзяць веды, найноўшыя тэхналогіі, інфармацыя. Для яго характэрныя памяншэнне ролі прамысловасці ў эканоміцы і ўзрастанне значэння сферы паслуг. Найважнейшым таварам робіцца інфармацыя.


Змены ў прамысловасці

Пры гэтым змяняецца і вытворчасць традыцыйных тавараў. Замест масавай стандартызаванай прадукцыі ўзрастае вытворчасць адзінкавых якасных тавараў. У сувязі з гэтым усё большую ролю ў прамысловасці адыгрываюць малыя прадпрыемствы, здольныя хутка пераналадзіцца на вытворчасць невялікай партыі новай прадукцыі. Самымі высокімі тэмпамі развіваюцца галіны прамысловасці, якія актыўна выкарыстоўваюць найноўшыя навуковыя распрацоўкі: электратэхнічная, авіякасмічная, хімічная, транспартнае машынабудаванне.

Змены ў характары працы чалавека

У постіндустрыяльным грамадстве змяняецца характар працы чалавека. Значна павялічваецца попыт на высокакваліфікаваных спецыялістаў разумовай

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



1. *Разгледзьце ілюстрацыю. Хто на ёй паказаны? Як складваюцца адносіны паміж гэтымі персанажамі?*
2. *Які працэс паказаў аўтар дадзенай ілюстрацыі? Вынікам якіх падзей ён зрабіўся?*
3. *Спрагназуйце, як гэты працэс можа змяніць рынак працы.*

працы («белыя каўнерыкі»). Павышэнне кваліфікацыі работнікаў вядзе да росту іх даходаў і павелічэння колькасці прадстаўнікоў сярэдняга класа ў грамадстве.

Патрабаванні постіндустрыяльнага грамадства да сучаснага чалавека

У постіндустрыяльным грамадстве ключавое значэнне набывае адукацыя. Для таго каб паспяхова адаптавацца ў новым грамадстве, неабходна ўвесь час вучыцца. Адрозненне паміж тымі, хто валодае сучаснымі ведамі і тэхналогіямі, і тымі, хто не мае да іх доступу, няспынна расце. Некаторыя прафесіі знікаюць, з'яўляюцца новыя, і людзям даводзіцца мяняць сферу дзейнасці. Усё гэта патрабуе гнуткасці, высокай адукацыйнай падрыхтоўкі і здольнасці да навучання на працягу ўсяго жыцця.

Як вы разумееце лозунг: «Адукацыя не на ўсё жыццё, а праз усё жыццё»?

Аднапалярны свет

4. Ад аднапалярнага свету да шматпалярнага. Пасля распаду СССР у 1991 г. і заканчэння *«халоднай вайны»* надышоў перыяд, які гісторыкі і палітолагі назвалі *аднапалярным светам* — сістэмай, дзе вядучую ролю адыгрывала адна дзяржава — Злучаныя Штаты Амерыкі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У 1990–2000-я гг. ЗША пачалі актыўна ўмешвацца ў палітычныя працэсы ў розных рэгіёнах, выступаць ініцыятарам ваенных аперацый, аказваць эканамічны і палітычны ціск, адыгрываючы ключавую ролю ў дзейнасці міжнародных арганізацый, такіх як НАТА, Сусветны банк, Міжнародны валютны фонд. Амерыканская мадэль дэмакратыі, рыначнай эканомікі і культурных стандартаў пашырылася па ўсім свеце праз глабальныя сродкі масавай інфармацыі, тэхналогіі і арганізацыі.

Аднак аднапалярная сістэма аказалася няўстойлівая. Па-першае, яна не забяспечвала роўнага ўліку інтарэсаў усіх дзяржаў. Па-другое, дзеянні ЗША часцяком выклікалі крытыку і супраціўленне, асабліва калі гаворка ішла пра прымяненне сілы без санкцыі ААН. Яскравы прыклад — агрэсія ваеннага блока НАТА ў адносінах да Югаславіі (1999 г.), Афганістана (2001 г.), Ірака (2003 г.). Гэтыя падзеі прывялі да аслаблення міжнароднага права, узмацнення нестабільнасці ў шэрагу рэгіёнаў, рэгіянальных канфліктаў і войнаў.

Фарміраванне шматпалярнага свету

У выніку з пачатку XXI ст. пачаў фарміравацца *шматпалярны свет*, пры якім некалькі краін і рэгіянальных аб'яднанняў аказваюць уплыў на глабальную палітыку і эканоміку. Такі парадак лепш улічвае інтарэсы розных цывілізацый, культур і дзяржаў.

Рэгіянальныя лідары

Імклівы эканамічны рост Кітая, развіццё Расіі, умацаванне міждзяржаўных аб'яднанняў, такіх як ШАС (Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва), БРІКС (названа паводле англамоўнай абрэвіятуры краін: Бразіліі, Расіі, Індыі, Кітая, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі (ПАР)), выступілі фактарамі, які падарвалі гегемонію адной краіны.

Кітай у першай чвэрці XXI ст. з'яўляецца першай эканомікай свету паводле парытэту пакупніцкай здольнасці, а яго ініцыятывы, такія як «Адзін пояс — адзін шлях», накіраваныя на развіццё інфраструктуры



Як вы лічыце, якія яшчэ краіны прэтэндуюць на ролю рэгіянальных лідараў?

і гандлёвых сувязей паміж Азіяй, Еўропай і Афрыкай, дэманструюць гатоўнасць да глабальнага лідарства.

Расія, абапіраючыся на багатыя прыродныя рэсурсы, абаронны патэнцыял і актыўную знешнюю палітыку, настойвае на шматпалярным падыходзе да сусветнай бяспекі, удзельнічае ў рэгіянальных канфліктах, выступае за абарону міжнароднага права, суверэнітэту іншых дзяржаў і развіццё партнёрскіх адносін з імі.

Індыя, маючы самую вялікую колькасць насельніцтва, устойлівую эканоміку і стратэгічнае становішча, таксама ўзмацняе свае пазіцыі. Яна актыўна ўдзельнічае ў міжнародных форумах, развівае ўласныя тэхналогіі і ўмацоўвае супрацоўніцтва з іншымі цэнтрамі сілы.

Усё большую ролю ў рэгіянальнай і сусветнай палітыцы адыгрываюць Іран, Турцыя, Бразілія, ПАР і іншыя краіны.

Такім чынам, з пачатку XXI ст. у свеце адбываецца пераход ад аднапалярнай мадэлі да шматпалярнай. Гэты працэс не завершаны і суправаджаецца канкурэнцыяй, канфліктамі інтарэсаў і барацьбой за ўплыў. Аднак ён адлюстроўвае аб'ектыўную рэальнасць — імкненне многіх дзяржаў да стварэння больш справядлівага і збалансаванага свету ў параўнанні з эпохай панавання адной дзяржавы.

Успомніце, што такое рэвалюцыя. У чым яе адрозненне ад рэформы?

«Каляровыя рэвалюцыі» — гэта форма палітычнай барацьбы, накіраваная на змену ўлады ў дзяржавах пад прыкрыццём дэмакратычнай рыторыкі пры актыўным знешнім умяшанні.

5. «Каляровыя рэвалюцыі». У другой палове 1990-х — пачатку 2000-х гг. у шэрагу краін адбыліся дзяржаўныя перавароты пад лозунгамі дэмакратызацыі, барацьбы супраць карупцыі, абароны правоў чалавека і з заклікамі збліжэння з Захадам. Гэтыя падзеі атрымалі назву **«каляровыя рэвалюцыі»**, хоць паўнавартаснымі рэвалюцыямі іх назваць складана. Іх рухаючымі сіламі былі не вялікія сацыяльныя групы (*класы* — паводле К. Маркса), а малыя апазіцыйныя структуры, якія імкнуліся стаць новай палітычнай элітай. Як правіла, яны атрымлівалі медыйную і фінансавую падтрымку з боку замежных дзяржаў. «Каляровымі» іх пачалі назы-

Правообладатель Издательский центр БГУ

ваць пасля вулічных акцый, дзе пратэст сімвалізаваў пэўны колер адзення, сцягоў і стужак.

«Каляровыя рэвалюцыі» ў свеце

Тэрмін «каляровая рэвалюцыя» атрымаў пашырэнне пасля падзей у Югаславіі ў 2000 г., калі ў выніку масавых пратэстаў быў зрынуты Прэзідэнт Слабадан Мілошавіч. Маладзёжны рух «Адпор!» выкарыстоўваў сімволіку белага кулака на чорным фоне, якая зрабілася пазнавальным элементам пратэстаў.

Падобны сцэнарый паўтарыўся і ў шэрагу іншых краін. Напрыклад, «рэвалюцыя руж» у Грузіі (2003 г.), «аранжавая рэвалюцыя» ва Украіне (2004 г.), «цюльпанавая» ў Кіргізіі (2005 г.), еўрамайдан ва Украіне (2014 г.). Паводле розных ацэнак, з 2000-х гг. спробы або паспяховыя «каляровыя рэвалюцыі» адбыліся больш чым у 30 краінах свету, у тым ліку ў рэгіёнах Балканаў, Закаўказзя, Цэнтральнай Азіі, Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі.

Характар «каляровых рэвалюцый»

«Каляровыя рэвалюцыі» насілі выразна выяўлены палітычны характар. Іх галоўнай мэтай была змена кіраўніцтва, якое, на думку арганізатараў, не адпавядала «дэмакратычным стандартам» і перашкаджала збліжэнню з Захадам. Практычна ва ўсіх выпадках да ўлады прыходзілі сілы, арыентаваныя на ліберальны празаходні знешнепалітычны курс і супрацоўніцтва з ЗША, ЕС і міжнароднымі фінансавымі структурамі.

Уплыў знешніх сіл

Ключавую ролю ў падрыхтоўцы і правядзенні «каляровых рэвалюцый» адыгрывалі знешнія сілы — міжнародныя арганізацыі, якія аказвалі фінансавую, арганізацыйную і інфармацыйную падтрымку. Сярод іх, напрыклад, Агенцтва міжнароднага развіцця ЗША (USAID), Фонд «Адкрытае грамадства» Дж. Сораса і інш.

Тэхналогія пратэстаў

У «каляровых рэвалюцыях» шырока выкарыстоўвалі тэхналогію негвалтоўных пратэстаў («жывыя ланцугі», ускладанне кветак, спевы, шэсці). Але як толькі пратэсты рабіліся масавымі, яны пераходзілі ў гвалтоўную фазу — захоп урадавых будынкаў

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Расійскі гісторык А. Б. Ананчанка ў сваёй кнізе «Што трэба ведаць пра каляровыя рэвалюцыі» прыходзіць да вываду, што «каляровыя рэвалюцыі» адрозніваюцца ад класічных тым, што грамадскі лад не зазнае змен. Прыход умоўна новай групоўкі да ўлады цягне за сабой толькі змяненне палітычнага курсу і змену знешнепалітычных арыенціраў. Пры гэтым замена палітычных эліт носіць абмежаваны характар: улада пераходзіць ад адной групы эліты, якая займала ў сістэме ўлады дамінуючае становішча, да разнашэрснай кааліцыі іншых сегментаў эліты.

1. *Чым адрозніваюцца «каляровыя рэвалюцыі» ад класічных?*
2. *Што, на думку А. Б. Ананчанкі, з'яўляецца галоўным вынікам «каляровых рэвалюцый»?*

і сутыкненні з сіламі правапарадку. На гэтай стадыі пачынаўся гвалт і прамое парушэнне Канстытуцыі. Пунктам пераходу ад мірных пратэстаў да пагромаў і беспарадкаў з'яўлялася гібель людзей (наўмысная або выпадковая ахвяра), што рабілася шокам для грамадства і на некаторы, як правіла, непрацяглы час узмацняла падтрымку пратэсту. На фоне штучна выкліканага крызісу заходнія дзяржавы пачыналі перамовы з уладай з мэтай дасягнуць ад яе саступак або адстаўкі.

У некаторых краінах (Грузія, Украіна) «каляровыя рэвалюцыі» скончыліся прыходам да ўлады празаходніх сіл. У іншых (Сірыя, Лівія, Егіпет) яны прывялі да грамадзянскіх войнаў, хаосу, разбурэння дзяржаўнасці.

Процідзеянне «каляровым рэвалюцыям»

Краіны, якія здолелі паспяхова супрацьстаяць падобнаму ўмяшанню ва ўнутраныя справы дзяржавы, у тым ліку Расія, Кітай, Іран і Беларусь, пачалі разглядаць «каляровыя рэвалюцыі» як форму гібрыднай вайны і рабіць адпаведныя захады для супрацьдзеяння. Пад гібрыднай вайной разумеюць спосаб вядзення канфлікту, які спалучае традыцыйныя і нетрадыцыйныя метады барацьбы — ад ваенных дзеянняў да інфармацыйных атак, эканамічнага ціску, санкцый і г. д.

Правообладатель Издательский центр БГУ

З пачатку XXI ст. у свеце адбываецца пераход ад аднапалярнай мадэлі да шматпалярнай. Гэты працэс не завершаны і суправаджаецца канкурэнцыяй, канфліктамі інтарэсаў і барацьбой за ўплыў. «Каляровыя рэвалюцыі» зрабіліся важным элементам сучаснай міжнароднай палітыкі і адлюстроўваюць імкненне адных сіл навязаць іншым сваю мадэль развіцця, часцяком у абыход нормаў міжнароднага права і суверэнітэту. У гэтых умовах асаблівую актуальнасць набываюць умацаванне нацыянальнай бяспекі дзяржавы, абарона нацыянальных інтарэсаў, культуры і суверэнітэту.

калі ў свеце…

1 студзеня 2024 г. — далучэнне да БРІКС у якасці новых паўнапраўных членаў Егіпта, Ірана, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў (ААЭ), Эфіопіі

на тэрыторыі Беларусі…

11 лістапада 2024 г. — Беларусь афіцыйна зрабілася краінай — партнёрам БРІКС

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ахарактарызуйце геапалітычныя наступствы распаду СССР.
2. Прывядзіце прыклады праяў глабалізацыі ў палітыцы, эканоміцы, духоўным жыцці. Дайце сваю ацэнку гэтай з'явы.
3. Ахарактарызуйце змены, якія адбываюцца ў розных сферах грамадскага жыцця падчас пераходу да постіндустрыяльнага грамадства.
4. У чым праяўляецца станаўленне шматпалярнага свету? Якія дзяржавы з'яўляюцца ў наш час рэгіянальнымі лідарамі?
5. Назавіце прыкметы паняцця «каляровая рэвалюцыя». Чаму яны зрабіліся важным элементам міжнароднай палітыкі ў XXI ст.?

§ 40. Краіны Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.

ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ
«ДЗЯРЖАВА ДАБРАБЫТУ»
КРАІНЫ «ТРЭЦЯГА СВЕТУ»
КРАІНЫ ГЛАБАЛЬНАГА ПОЎДНЯ
МАДЭРНІЗАЦЫЯ ІНТЭГРАЦЫЯ
НЕАКАНСЕРВАТЫЗМ

Аслабленне пазіцый традыцыйных палітычных партый

1. Сучасная палітычная сістэма краін Захаду. У 90-я гг. XX ст. у краінах Захаду слабне ўплыў неакансерватыўных партый. У Вялікабрытаніі да ўлады прыходзіць лейбарысцкая партыя, у Германіі — сацыял-дэмакратычная. Пры гэтым у заходніх дзяржавах назіралася значнае памяншэнне адрозненняў паміж рознымі партыямі ў ідэалогіі і палітыцы. Сацыял-дэмакратычныя партыі адмовіліся ад ідэі пабудовы дэмакратычнага сацыялізму і «дзяржавы дабрабыту». Іх прадстаўнікі лічылі неабходным развіваць рыначную эканоміку. Кансерватыўныя партыі прызналі важнасць хоць і абмежаванай, але падтрымкі бедных пластоў насельніцтва за кошт дзяржавы. Таму змена партый ва ўладзе не вяла да істотных змяненняў у палітыцы, якая праводзілася.

Узмацненне пазіцый папулісцкіх партый

У выніку значная частка насельніцтва ўсё больш расчароўвалася ў традыцыйных партыях. Пашырала ся перакананне, што дзяржавамі кіруе палітычная эліта, якая не звяртае ўвагі на інтарэсы простых грамадзян.

У такой сітуацыі ўмацоўваліся пазіцыі новых партый, чыё кіраўніцтва не было звязанае з ранейшай палітычнай элітай. Іх пачалі называць несістэмнымі,

Правообладатель Издательский центр БГУ

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Уздым папулярнасці папулісцкіх палітыкаў у Еўропе выклікаў павелічэнне колькасці даследаванняў, прысвечаных гэтаму феномену. Асаблівая ўвага надавалася вызначэнню прыкмет папулізму. Вучоныя вылучылі наступныя:

1) папулісцкія рухі апелююць, як правіла, да народу і простых людзей;

2) папулісты выступаюць супраць палітычных сістэм і іх уладных эліт, нібы баронячы людзей ад улад, чыноўніцкага апарату, буйнога бізнесу;

3) выступаючы за моцную дзяржаву, здольную абараніць маленькага чалавека, папулісты жадаюць паменшыць прысутнасць дзяржавы ў жыцці грамадзян;

4) папулісцкія рухі ў большасці выпадкаў скіраваныя супраць інтэлектуалаў, хоць на чале саміх гэтых рухаў часцяком стаяць інтэлектуалы;

5) як правіла, у папулісцкім руху цэнтральную ролю адыгрывае харызматычны лідар;

6) папулісцкія рухі канцэнтруюцца на некалькіх спрэчных пытаннях жыцця грамадства і дзяржавы.

1. *Чаму папулісты, як правіла, звяртаюцца за падтрымкай да простага народу?*
2. *У чым выяўляецца супярэчлівасць пазіцый папулістаў?*
3. *Чым, на ваш погляд, абумоўлена ўзмацненне папулярнасці папулістаў напачатку XXI ст.?*

папулісцкімі. Цэнтральнае месца ў іх праграмах займалі барацьба супраць нелегальнай іміграцыі, усталяванне кантролю над буйны́мі кампаніямі, адмоўнае стаўленне да паскарэння інтэграцыйных працэсаў у Еўропе. У першыя дзесяцігоддзі XXI ст. папулісцкія партыі ў шэрагу заходніх краін (Францыя, Германія) атрымалі рэальную магчымасць далучыцца да барацьбы за ўладу.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія новыя палітычныя партыі з'явіліся ў краінах Захаду. Якія ідэі яны прапануюць, імкнучыся прыйсці да ўлады?

Крызіс «дзяржавы дабрабыту»

2. Эканамічная сістэма краін Захаду на сучасным этапе. Крызіс «дзяржавы дабрабыту». Сусветны эканамічны крызіс сярэдзіны 70-х гг. XX ст. выступіў адной з перадумоў крызісу мадэлі «дзяржавы дабрабыту». Шматлікія сацыяльныя праграмы, што рэалізоўваліся ў яе межах, патрабавалі вялікіх выдаткаў з дзяржаўнага бюджэту. Каб мець грошы на сацыяльныя праграмы, дзяржава павышала падаткі. Гэта падрывала зацікаўленасць

людзей эфектыўна працаваць для атрымання высокага заробку, бо значная яго частка ішла на падаткі. Многія выбіралі жыццё за кошт сацыяльных выплат дзяржавы. Ад высокіх падаткаў памяншаўся аб'ём грошай, якія прадпрымальнікі ўкладвалі ў развіццё эканомікі. Таму «дзяржава дабрабыту» сутыкнулася з крызісам. Працэс яе дэмантажу пачалі неакансерватары яшчэ ў 1980-я гг. У 1990-я гг. ад гэтай палітыкі адмовіліся і сацыял-дэмакраты.

Неакансерватыўныя партыі ў 1980–1990-я гг. ажыццявілі пераход да новай мадэлі эканамічнага развіцця.

Неакансерватыўная мадэль эканомікі

- Адмова ад актыўнага дзяржаўнага рэгулявання эканомікі
- Наданне максімальнай свабоды прыватнаму прадпрымальніцтву
- Істотнае скарачэнне выдаткаў на сацыяльныя праграмы, у тым ліку на атрыманне бясплатнай адукацыі і медыцынскай дапамогі

Кожны чалавек для забеспячэння свайго дабрабыту павінен быў спадзявацца на ўласную працу, а не на дапамогу дзяржавы. На дапамогу маглі разлічваць толькі тыя, хто з прычыны пагаршэння здароўя, старэчага ўзросту не мог дазволіць сабе годны ўзровень жыцця.

Эканамічнае развіццё ў XXI ст.

Новая сацыяльна-эканамічная палітыка забяспечыла імклівы рост эканомікі заходніх дзяржаў у 80–90-я гг. XX ст. Аднак ад гэтага росту выйгралі ў асноўным заможныя колы насельніцтва, павялічыўся разрыў у даходах паміж найбагацейшымі і найбяднейшымі. Таму ў канцы XX — пачатку XXI ст. заходнія палітыкі сталі больш увагі звяртаць на сацыяльную абароненасць бедных пластоў насельніцтва.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У 2008 г. свет сутыкнуўся з цяжкім фінансавым крызісам. Яго маштабы часта параўноўваюць з «Вялікай дэпрэсіяй» 1929–1933 гг. Заходнія дзяржавы актывізавалі ўмяшанне ў эканоміку, аказалі вялікую фінансавую падтрымку прыватным прадпрыемствам, банкам. Яшчэ не былі цалкам пераадоленыя наступствы таго крызісу, як новы цяжкі ўдар па эканоміцы нанесла пандэмія COVID-19, якая пачалася ў 2020 г.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне пра наступствы пандэміі COVID-19 для эканомікі заходніх краін.

3. Сучасныя праблемы еўраінтэграцыі. Новы этап еўрапейскай інтэграцыі адкрыла падпісанне ў 1992 г. Маастрыхцкай дамовы.

Утварэнне Еўрапейскага саюза

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З Маастрыхцкай дамовы

Гэтай Дамовай высокія дагаворныя бакі зацвярджаюць паміж сабой Еўрапейскі саюз (далей называны «Саюз»), якому дзяржавы-члены надаюць кампетэнцыю для дасягнення сваіх агульных мэт.

1. Саюз ставіць за мэту садзейнічаць міру, сваім каштоўнасцям і дабрабыту сваіх народаў.

2. Саюз дае сваім грамадзянам прастору свабоды, бяспекі і правасуддзя без унутраных межаў, у рамках якой забяспечваецца свабоднае перамяшчэнне асоб ва ўзаемасувязі з адпаведнымі захадамі па пытаннях кантролю вонкавых межаў, давання прытулку, іміграцыі, а таксама прадухілення злачыннасці і барацьбы з гэтай з'явай.

3. Саюз стварае ўнутраны рынак. Ён імкнецца забяспечыць устойлівае развіццё Еўропы на аснове збалансаванага эканамічнага росту і стабільнасці цэн, наяўнасці ў высокай ступені канкурэнтаздольнай сацыяльнай рыначнай эканомікі, якая імкнецца да поўнай занятасці і сацыяльнага прагрэсу, а таксама высокі ўзровень аховы і паляпшэння якасці навакольнага асяроддзя. Ён спрыяе навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

4. Саюз стварае эканамічны і валютны саюз, грашовай адзінкай якога з'яўляецца еўра.

1. *Якія ўмовы дзейнасці Еўрапейскага саюза адлюстраваныя ў фрагменце дакумента?*
2. *Якія дзяржавы стаялі каля вытокаў яго стварэння? З якой мэтай гэтыя дзяржавы аб'ядналіся?*
3. *Якія аб'яднанні краін на постсавецкай прасторы маюць аналагічныя мэты?*

Маастрыхцкая дамова ўвайшла ў сілу 1 лістапада 1993 г. і прадугледжвала стварэнне на аснове існуючых еўрапейскіх супольнасцей Еўрапейскага саюза (ЕС). У яго рамках ствараўся адзіны рынак, ад 1999 г. адзіная валюта (еўра) пачала выкарыстоўвацца для міжнародных плацяжоў, а ад 2002 г. — для наяўных разлікаў у краінах ЕС. На новым этапе інтэграцыі еўрапейскія краіны значна больш увагі пачалі надаваць яе палітычнай частцы. Яны перайшлі да правядзення агульнай знешняй палітыкі.

Пашырэнне Еўрапейскага саюза

Пасля падпісання Маастрыхцкай дамовы працягнулася пашырэнне ЕС. Найбольш значнае павелічэнне колькасці яго ўдзельнікаў адбылося ў 2004 г. Сярод новых членаў ЕС былі Польшча, Літва і Латвія.

Праблемы еўрапейскай інтэграцыі

Інтэграцыйныя працэсы ў Еўропе сутыкаліся з пэўнымі праблемамі. Уступленне ў ЕС краін Усходняй Еўропы выклікала сярод насельніцтва «старых» членаў Саюза асцярогу наконт наплыву з усходу танней рабочай сілы. Шмат хто быў незадаволены тым, што для падтрымкі слабейшых эканомік новых членаў ЕС патрабаваліся значныя сродкі.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, колькі краін уваходзіць у ЕС сёння.

Найбольш моцныя антыінтэграцыйныя настроі традыцыйна існавалі ў Вялікабрытаніі. У 2016 г. у гэтай краіне адбыўся рэферэндум, на якім большасць тых, хто галасаваў, выказаліся за выхад з ЕС. У 2020 г. Вялікабрытанія спыніла членства ў ЕС.

Эвалюцыя сацыялізму

4. Праблемы незалежнага развіцця і мадэрнізацыі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. З канца 1980-х гг. істотныя змены адбываліся ў большасці сацыялістычных краін Азіі. Кітай і В'етнам заявілі пра працяг будаўніцтва сацыялізму пры захаванні манаполіі камуністычных партый на ўладу, але пры гэтым правялі рэформы, вынікам якіх быў пераход да рыначнай эканомікі. Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка прытрымліваецца ранейшай мадэлі развіцця.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Краіны «сацыялістычнай арыентацыі» пасля распаду СССР, за рэдкім выключэннем, адмовіліся ад ранейшай мадэлі і сталі на капіталістычны шлях развіцця. У Лацінскай Амерыцы выбар на карысць сацыялізму захавала Куба.

Падзенне аўтарытарных рэжымаў

У канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. у краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі стала відавочнай тэндэнцыя памяншэння колькасці аўтарытарных рэжымаў і павелічэння долі дэмакратычных дзяржаў. У Лацінскай Амерыцы ў гэты час абрынуліся ваенныя дыктатуры ў Аргенціне, Бразіліі, Чылі і іншых дзяржавах. Да ўлады прыйшлі палітычныя партыі, якія ў сваёй палітыцы рабілі стаўку на развіццё прыватнага прадпрымальніцтва і звялі дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі да мінімуму. Гэта прывяло да імклівага росту разрыву паміж даходамі багатых і бедных, падзення ўзроўню жыцця значнай часткі насельніцтва. Вынікам была перамога на выбарах у шэрагу краін Лацінскай Амерыкі ў канцы XX — пачатку XXI ст. палітычных сіл, якія абвясцілі сваёй мэтай пабудову сацыялізму. У прыватнасці, такую палітыку праводзіў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес. Ён абвясціў пабудову гуманнага сацыялізму, пры якім інтарэсы грамадзян важнейшыя за інтарэсы карпарацый.

Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж памяншэннем дзяржаўнага рэгулявання эканомікі і ростам разрыву паміж даходамі багатых і бедных колаў насельніцтва.

У Азіі станаўленне дэмакратычных рэжымаў адбывалася перш за ўсё ў краінах, якія дасягнулі поспехаў у мадэрнізацыі эканомікі. У Рэспубліцы Карэя ў другой палове 1980-х гг. абрынулася ваенная дыктатура і ўсталявалася дэмакратычная сістэма. Напрыканцы 1990-х гг. была ліквідавана аўтарытарная дыктатура ў Інданезіі.

На афрыканскім кантыненце захаваліся пераважна аўтарытарныя рэжымы. Для краін гэтага рэгіёна ў канцы XX — пачатку XXI ст. па-ранейшаму былі характэрныя палітычная нестабільнасць, шматлікія міжэтнічныя і міждзяржаўныя канфлікты. Найбуйнейшым сярод іх была Другая кангалезская, або

Вялікая афрыканская, вайна 1998–2003 гг. Яна пачалася як унутраны канфлікт у Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, пасля ў вайну ўцягнуўся шэраг афрыканскіх дзяржаў. Па колькасці ахвяр — 5,4 млн чалавек — яна стала самым буйны́м ваенным канфліктам у свеце пасля Другой сусветнай вайны.

Новыя індустрыяльныя краіны

Паводле ўзроўню эканамічнага развіцця сярод краін «трэцяга свету» напрыканцы XX ст. сфарміравалася група *новых індустрыяльных дзяржаў*. Гэта Рэспубліка Карэя, Сінгапур, Тайланд, Малайзія і інш. Яны ў значнай ступені пераадолелі адставанне ад эканамічна развітых краін Захаду, пачалі ажыццяўляць пераход да постіндустрыяльнага грамадства.

Аднак большасць краін, якія развіваліся, па-ранейшаму заставаліся эканамічна адсталымі. Яны не маглі вырашыць праблему беднасці большай часткі насельніцтва. Асабліва складанае было становішча ў Афрыцы, дзе не з'явілася ніводнай новай індустрыяльнай дзяржавы. Адной з прычын нарастання эканамічных цяжкасцей і нізкага ўзроўню жыцця быў імклівы рост насельніцтва ў большасці краін, якія развіваліся.

5. Неакаланіялізм. *Дэкаланізацыя* ў XX ст. прывяла да фармальнага вызвалення многіх дзяржаў. Аднак па сутнасці прамое каланіяльнае панаванне было заменена на новыя формы эканамічнага, палітычнага і культурнага кантролю Захаду над многімі краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Краіны «трэцяга свету» і пасля падзення каланіялізму захавалі залежнасць ад найбуйнейшых дзяржаў Захаду ў розных галінах.

Неакаланіялізм захоўвае няроўнасць, ускладняе развіццё краін, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці. Барацьба супраць неакаланіялізму застаецца ключавым выклікам для большасці краін сучаснага свету.

Неакаланіялізм — форма залежнасці краін, што развіваюцца, ад былых каланіяльных дзяржаў і буйны́х міжнародных карпарацый, якая захоўваецца пасля атрымання палітычнай незалежнасці.

Правообладатель Издательский центр БГУ

НЕАКАЛАНІЯЛІЗМ

Фінансавая залежнасць

Міжнародныя фінансавыя інстытуты (Міжнародны валютны фонд, Сусветны банк) выдаюць крэдыты на ўмовах, якія абмяжоўваюць эканамічную самастойнасць краін-даўжнікоў

Палітычны ўплыў

Развітыя краіны аказваюць ціск на палітычнае кіраўніцтва краін, якія развіваюцца, выкарыстоўваючы дыпламатычныя рычагі, санкцыі, падтрымку лаяльных рэжымаў, прамое ўмяшанне ва ўнутраныя справы для забеспячэння сваіх інтарэсаў («каляровыя рэвалюцыі»)

Кантроль над прыроднымі рэсурсамі

Буйны́я ТНК здабываюць рэсурсы ў краінах, якія развіваюцца, мінімальна ўплываючы на мясцовую эканоміку, і часцяком чыняць шкоду экалогіі

Эканамічная залежнасць

Краіны, якія развіваюцца, арыентаваныя на экспарт сыравіны і імпарт прамысловых тавараў, што ўзмацняе іх уразлівасць перад ваганнямі цэн на сусветным рынку

Культурны ўплыў

Дамінаванне заходняй культуры, мовы і каштоўнасцей, што аслабляе нацыянальную ідэнтычнасць

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце кожную праяву палітыкі неакаланіялізму фактамі.

6. Краіны «глабальнага Поўдня» і іх роля ў сучасным свеце. Тэрмін «глабальны Поўдзень» пачалі выкарыстоўваць у 1980-х гг. для абазначэння краін «трэцяга свету», якія знаходзяцца пераважна ў паўднёвай частцы свету. Ён супрацьпастаўляўся «глабальнай Поўначы», якая ўключала развітыя краіны.

«Глабальны Поўдзень» ахоплівае рэгіёны Лацінскай Амерыкі, Афрыкі і Азіі (за выключэннем Японіі, Рэспублікі Карэя, Ізраіля). Гэта вобласці з высокімі паказчыкамі беднасці, няроўнасці і палітычнай нестабільнасці, але разам з тым там растуць эканамічныя магчымасці. Краіны «глабальнага Поўдня» робяцца цэнтрамі росту дзякуючы вялікай колькасці маладога насельніцтва і прыродных рэсурсаў.

Да найбольш уплывовых краін «глабальнага Поўдня» адносяць Кітай, Індыю, Іран, Інданезію, ААЭ,


Значэнне тэрміну «глабальны Поўдзень»



Паспяховыя краіны «глабальнага Поўдня»

ПАР, Бразілію. У сучасным свеце значэнне краін «глабальнага Поўдня» расце. Гэта звязана з эканамічнымі поспехамі шэрагу з іх. Так, Кітай і Індыя ўваходзяць у пяцёрку краін свету з найбуйнейшымі эканомікамі і ператварыліся ўжо ў значныя цэнтры сілы на міжнароднай арэне. КНР выкарыстоўвае экспартаарыентаваную мадэль эканомікі, ажыццяўляе маштабныя інвестыцыі ў інфраструктуру і тэхналогіі; актыўна ўдзельнічае ў міжнароднай палітыцы, прасоўвае ініцыятывы, скіраваныя на супрацоўніцтва з іншымі краінамі «глабальнага Поўдня». Дзяржавы «глабальнага Поўдня» імкнуцца да пераадолення няроўнасці ў сусветным гандлі, выступаюць за стварэнне больш справядлівай сістэмы міжнародных адносін, у межах якой больш улічваліся б іх інтарэсы. Яны надаюць важнае значэнне наладжванню супрацоўніцтва з Расіяй, прыкладам чаго можа служыць дзейнасць БРІКС.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



1. *Што такое ВУП?*
2. *Прааналізуйце рэйтынг дзяржаў, якія паказалі найбольшыя тэмпы росту ВУП у 2024 г. Якія з іх належаць да «глабальнай Поўначы», а якія — да «глабальнага Поўдня»?*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія фактары забяспечваюць краінам «глабальнага Поўдня» хуткі рост ВУП.*
4. *З чым, на ваш погляд, звязаныя перспектывы эканамічнага развіцця дзяржаў «глабальнага Поўдня»? Сваю думку аргументуйце.*

У канцы XX — першай чвэрці XXI ст. у краінах Захаду адбыліся змены ў палітычным і эканамічным жыцці: зблізіліся ідэалогіі традыцыйных партый, узмацніўся ўплыў папулісцкіх партый, зацвердзілася неаканцерватыўная мадэль эканамічнага развіцця, далейшае развіццё атрымала еўрапейская інтэграцыя. У краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі працягнуўся працэс мадэрнізацыі, вынікам якога стаў рост ролі гэтых краін у свеце.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
2013 г. — Кітай ініцыяваў праект «Адзін пояс — адзін шлях»	2014 г. — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падпісаў Указ «Аб дзейнасці Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парку „Індустрыяльны парк «Вялікі камень»“»

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія змены адбыліся ў палітычным жыцці краін Захаду ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.?
2. Якія прычыны пераходу краін Захаду да неаканцерватыўнай мадэлі эканамічнага развіцця? Ахарактарызуйце яе прыкметы.
3. З якімі праблемамі сутыкнулася еўрапейская інтэграцыя ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.?
4. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі палітыкі неакаланіялізму.
5. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, вызначце асноўныя кірункі мадэрнізацыі краін «глабальнага Поўдня» ў канцы XX — пачатку першай чвэрці XXI ст. Ахарактарызуйце яе асноўныя вынікі.

§ 41. Расійская Федэрацыя

З'ЕЗД НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
СНД ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА
САВЕТ ФЕДЭРАЦЫІ ДКНС
«ШОКАВАЯ ТЭРАПІЯ»
ПЕРАБУДОВА РЭФЕРЭНДУМ

Успомніце, што такое перабудова. У чым яна заключалася?

1. Распад СССР. Перабудова, што пачалася спробай палепшыць эканамічныя паказчыкі, прывяла да рэзкага падзення вытворчасці і пагаршэння ўмоў жыцця большасці савецкіх людзей. Кіраўніцтву краіны рабілася зразумела, што без змен у палітычнай сферы немагчымае вырашэнне эканамічных праблем.

Палітычная рэформа 1988 г.

Улетку 1988 г. з ініцыятывы партыйнага кіраўніцтва ў СССР пачалася палітычная рэформа.

Першы этап рэформы	Другі этап рэформы
Аднаўленне паўнаўладдзя Саветаў. Была адноўлена (на ўзор Канстытуцыі 1918 г.) двухузроўневая сістэма прадстаўнічых органаў: 1) З'езд народных дэпутатаў СССР — вышэйшы заканадаўчы орган улады; 2) Вярхоўны Савет (абіраўся шляхам тайнага галасавання з дэпутатаў З'езда) — пастаянна дзеючы «парламент». З'езд пачаў сваю працу 25 мая 1989 г. Старшынёй Вярхоўнага Савета СССР быў абраны М. С. Гарбачоў	*Стварэнне новых структур органаў улады на месцах* — у рэспубліках, краях, абласцях, гарадах. Вясной 1990 г. быў сфарміраваны склад I З'езда народных дэпутатаў РСФСР, на якім 12 чэрвеня 1990 г. была прынятая Дэкларацыя аб суверэнітэце РСФСР

Прэзідэнт СССР

У 1990 г. у СССР быў уведзены інстытут прэзідэнцтва. Кіраўнік дзяржавы абіраўся не прамым галасаваннем насельніцтва, а на пасяджэнні З'езда народных дэпутатаў. На III пазачарговым З'ездзе народных дэпутатаў прэзідэнтам СССР быў абраны М. С. Гарбачоў.

Паводле задумы ініцыятараў палітычнай рэформы інстытут прэзідэнцтва закліканы быў стабілізаваць сітуацыю ў грамадстве. Ва ўмовах, калі пачыналася фарміраванне шматпартыйнасці, прэзідэнт меў стаць вышэй за ўсіх канкурэнтаў у барацьбе за ўладу і адначасова з гэтым забяспечыць роўнасць усіх перад законам. Аднак у выніку сітуацыя толькі ўскладнілася: новы інстытут прэзідэнцтва не сумяшчаўся з захаваннем уплыву Саветаў.

17 сакавіка 1991 г. у рэспубліках СССР адбыўся рэферэндум наконт пытання захавання Саюза. На рэферэндуме больш чым 76 % яго ўдзельнікаў выказаліся за захаванне СССР.

Да сярэдзіны 1991 г. у большасці рэспублік СССР ужо былі прынятыя дэкларацыі або законы аб суверэнітэце. На 20 жніўня 1991 г. было прызначана падпісанне новай саюзнай дамовы.

Аднак частка кіраўніцтва СССР на чале з віцэ-прэзідэнтам Г. І. Янаевым паспрабавалі сарваць падпісанне новай дамовы і аднавіць СССР у ранейшым выглядзе. М. С. Гарбачоў быў ізаляваны ў крымскай рэзідэнцыі — Форасе, а ў Маскве 19 жніўня 1991 г. быў створаны *Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы* (ДКНС). У задушэнні гэтага выступлення вялікую ролю адыграў Прэзідэнт Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР) Б. М. Ельцын, чыя пазіцыя пазней паскорыла распад СССР.

8 снежня 1991 г. лідары трох усходнеславянскіх дзяржаў — Расіі, Беларусі і Украіны — на сустрэчы ў Віскулях (Белавежская пушча), насуперак вынікам рэферэндуму 17 сакавіка 1991 г., заявілі пра дэнансацыю (разрыў) Дамовы аб утварэнні СССР і стварэнні СНД. На сустрэчы ў Алма-Аце **21 снежня 1991 г.** лідары 11 былых саюзных рэспублік падпісалі Дэкларацыю аб утварэнні СНД. 25 снежня 1991 г. М. С. Гарбачоў падаў у адстаўку


БЮЛЛЕТЕНЬ

для голосования на референдуме СССР

17 марта 1991 года

Считаете ли Вы необходимым сохранение Союза Советских Социалистических Республик как обновленной федерации равноправных суверенных республик, в которой будут в полной мере гарантироваться права и свободы человека любой национальности.

Оставьте один из указанных ответов, другой вычеркните

ДА НЕТ

Бюллетень в котором при голосовании вычеркнуты слова ДА и НЕТ или не вычеркнуты оба слова, признается недействительным.

Як вы лічыце, чаму ўдзельнікі рэферэндуму прагаласавалі «за» або «супраць» захавання СССР?

ДКНС

Стварэнне СНД

Пакажыце на карце дзяржавы, якія падпісалі Дэкларацыю аб утварэнні СНД.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Перадумовы распаду Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік

Эканамічныя	Палітычныя	Нацыянальныя
• скарачэнне вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы; • інфляцыя, абясцэньванне рубля; • дэфіцыт тавараў шырокага спажывання; • няўдачы эканамічных рэформаў і падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва; • сусветны абвал цэн на нафту	• аслабленне ўплыву КПСС, масавы выхад з партыі; • незбалансаванасць паўнамоцтваў цэнтра і рэспублік; • барацьба за ўладу паміж цэнтральнымі і нацыянальна-рэгіянальнымі палітычнымі элітамі	• праявы нацыянальнага сепаратызму і рэгіянальнага эканамічнага ізаляцыянізму, актывізацыя нацыянальных рухаў; • міжнацыянальныя канфлікты (Карабах, Прыднястроўе, Закаўказзе, Сярэдняя Азія)

1. Выявіце прычынна-выніковыя сувязі паміж паказанымі ў схеме з'явамі і працэсамі і распадам СССР.

2. Успомніце знешнепалітычныя фактары распаду Савецкага Саюза.

з пасады Прэзідэнта СССР — дзяржавы, якой фактычна ўжо не існавала.

Распад Савецкага Саюза меў глыбокія наступствы і для постсавецкай прасторы, і для ўсяго свету. Гэтая падзея негатыўна паўплывала на эканамічнае і палітычнае развіццё былых савецкіх рэспублік, прывяла да эканамічнага крызісу, які шмат у чым быў абумоўлены разрывам эканамічных сувязей, абвастрэннем міжнацыянальных канфліктаў на постсавецкай прасторы.

Успомніце геапалітычныя наступствы распаду СССР.

2. Дзяржаўна-палітычнае развіццё Расійскай Федэрацыі. 25 снежня 1991 г. РСФСР афіцыйна пачала называцца Расійскай Федэрацыяй (РФ). Найбуйнейшая саюзная рэспубліка выступіла праваперамніцай СССР.

Даведайцеся, што значыла для Расіі выступіць «праваперамніцай СССР».

Палітычны крызіс 1990-х гг.

Напачатку 1990-х гг. у РФ сфарміравалася апазіцыя палітыцы Урада і Прэзідэнта РФ. Паводле свайго складу яна была неаднародная — ад пры-

Па Канстытуцыі РФ 1993 г.

Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі

Фарміруе Урад, выступае гарантам выканання Канстытуцыі, Вярхоўным галоўнакамандуючым, вызначае асноўныя кірункі знешняй палітыкі, мае права распускаць парламент і прызначаць датэрміновыя выбары, карыстаецца заканадаўчай ініцыятывай

Федэральны сход Расійскай Федэрацыі — двухпалатны Парламент. Прадстаўнічы і заканадаўчы орган РФ

Верхняя палата — *Савет Федэрацыі* — фарміруецца з прадстаўнікоў заканадаўчай і выканаўчай улады асобных суб'ектаў Расійскай Федэрацыі

Ніжняя палата — *Дзяржаўная дума* — абіраецца грамадзянамі з ліку кандыдатаў, вылучаных палітычнымі партыямі, і па аднамандатных акругах (50 % месцаў)

хільнікаў адраджэння сацыялістычнага ладу і ўзнаўлення СССР да манархістаў, але ўсіх іх аб'ядноўвала негатыўнае стаўленне да палітыкі *перабудовы*, яе вынікаў і рэформаў, якія праводзіліся.

Апазіцыя Ураду і Прэзідэнту РФ карысталася значным уплывам у вышэйшых заканадаўчых органах краіны. Рашэнні, якія прымаў Урад, блакаваліся ў Вярхоўным Савеце. У снежні 1992 г. VII З'езд народных дэпутатаў РФ унёс папраўкі ў Канстытуцыю, якія абмяжоўвалі ўладу Прэзідэнта і Урада. Апазіцыйныя сілы пачалі патрабаваць адстаўкі Прэзідэнта РФ. Ва ўмовах нарастання супрацьстаяння заканадаўчай і выканаўчай галін улады Б. М. Ельцын вынес пытанне даверу Прэзідэнту на ўсенародны рэферэндум (красавік 1993 г.). Пасля яго быў падрыхтаваны праект новай Канстытуцыі, у якой значна пашыраліся паўнамоцтвы Прэзідэнта.

У верасні — пачатку кастрычніка 1993 г. супрацьстаянне галін улады ў Расіі набыло найбольш востры характар. 2–3 кастрычніка 1993 г. у Маскве адбыліся ўзброеныя сутыкненні. 4 кастрычніка

Вынікі рэферэндуму ў красавіку 1993 г.

- Удзельнічала больш за 50 % выбаршчыкаў;
- выказаліся «за» давер Прэзідэнту РФ 58,7 %;
- падтрымалі сацыяльна-эканамічную палітыку Прэзідэнта РФ 53 %

Пра што сведчылі вынікі рэферэндуму?

верныя Прэзідэнту і Ураду войскі захапілі Белы дом (Дом Саветаў РФ), які абаранялі дэпутаты Вярхоўнага Савета. Выбары ў вышэйшы заканадаўчы орган і адначасова рэферэндум наконт прэзідэнцкага праекта Канстытуцыі адбыліся 12 снежня 1993 г. 58,4 % удзельнікаў усенароднага галасавання падтрымалі новую *Канстытуцыю Расійскай Федэрацыі*, у якой былі вызначаныя асноўныя прынцыпы грамадска-палітычнага ладу краіны, структура органаў улады і кіравання.

Прыняцце новай Канстытуцыі РФ. 1993 г.

Паводле вынікаў агульнарасійскага галасавання 1 ліпеня 2020 г. у Канстытуцыю Расійскай Федэрацыі былі ўнесеныя змены, якія прадугледжвалі ўзмацненне ролі Прэзідэнта шляхам істотнага пашырэння яго паўнамоцтваў, умацаванне пазіцый Савета Федэрацыі і Дзяржаўнай думы, у тым ліку за кошт надзялення іх членаў дадатковай кампетэнцыяй, пашырэнне паўнамоцтваў Урада, кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда і органаў мясцовага самакіравання, недапушчэнне выканання міжнароднаправавых актаў, якія супярэчаць Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі.

Урэгуляванне адносін цэнтра і суб'ектаў Федэрацыі

Яшчэ адна праблема, з якой сутыкнулася расійскае кіраўніцтва ў першыя гады незалежнага існавання, была звязаная з урэгуляваннем адносін цэнтра і асобных суб'ектаў Федэрацыі. 31 сакавіка 1992 г. у Маскве была падпісаная Федэратыўная дамова, у адпаведнасці з якой значна пашырыліся паўнамоцтвы органаў улады аўтаномных рэспублік у складзе РФ. Але нават такую дамову не падпісалі Татарстан і Чачня. Некаторыя рэспублікі прынялі ўласныя канстытуцыі, якія сцвярджалі вяршэнства мясцовых законаў.

Надзвычай складаная сітуацыя адбылася ў Чачэнскай рэспубліцы, кіраўніцтва якой зрабіла стаўку на ўзброенае вырашэнне праблемы ўзаемаадносін з цэнтрам. У снежні 1994 — жніўні 1996 г. федэральныя войскі правялі першую аперацыю па

аднаўленні канстытуцыйнага парадку ў Чачні, а ў жніўні 1999 — красавіку 2000 г. — другую чачэнскую (контртэрарыстычную) аперацыю (асобныя мерапрыемствы па барацьбе з бандфарміраваннямі працягваліся да 2009 г.).

Паступова адносіны з суб'ектамі Федэрацыі былі нармалізаваныя.

Прэзідэнт РФ — У. У. Пуцін

У 1996 г. на чарговы тэрмін Прэзідэнтам РФ быў пераабраны Б. М. Ельцын, але 31 снежня 1999 г. ён добраахвотна пакінуў сваю пасаду. Выконваючым абавязкі Прэзідэнта РФ стаў Кіраўнік Урада У. У. Пуцін. На выбарах, якія адбыліся 26 сакавіка 2000 г., ён атрымаў пераканаўчую перамогу ў першым туры.

Стабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў краіне паспрыяла ўмацаванне пазіцый улады ў парламенце. На выбарах у Дзяржаўную думу ў 1999 г. большасць галасоў атрымалі рух «Адзінства» (лідар — С. К. Шайгу), члены якога выступалі пад лозунгам працягу рэформаў, і партыя «Айчына — Уся Расія» (лідары — Я. М. Прымакоў і Ю. М. Лужкоў). У 2001 г. адбылося аб'яднанне праўрадавых сіл у адну партыю «Адзіная Расія». Падтрымка ўстойлівай большасці ў парламенце дазволіла У. У. Пуціну правесці ў жыццё рашэнні, якія адпавядалі інтарэсам усіх пластоў насельніцтва.

Паспяховаму вырашэнню задач, што стаялі перад Расійскай Федэрацыяй, спрыялі рэформы ў галіне дзяржаўнага і мясцовага кіравання, якія мелі мэтай умацаванне вертыкалі ўлады: падзел краіны на 7 федэральных акруг на чале з паўнамоцнымі прадстаўнікамі Прэзідэнта; змяненне сістэмы фарміравання Савета Федэрацыі і выбараў мэраў і губернатараў; жорсткі кантроль Адміністрацыі Прэзідэнта за іх дзейнасцю; стварэнне новага кансультацыйнага органа — Дзяржаўнага Савета РФ, які фарміруецца з кіраўнікоў рэгіёнаў.

Успомніце, што такое СЭУ. Калі ён быў створаны? Якія краіны ў яго ўваходзілі?

З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, калі Расія выплаціла ўсе пазыкі СССР. Што такое «нулявы варыянт»?

3. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Расійскай Федэрацыі. Распад СССР і сусветнай сацыялістычнай сістэмы прывёў да з'яўлення мноства праблем у эканоміцы і сацыяльнай сферы. Парушыліся эканамічныя сувязі з былымі саюзнымі рэспублікамі і краінамі, што ўваходзілі ў СЭУ. Ініцыятывы па раззбраенні і скарачэнні фінансавання ваенна-прамысловага комплексу, вельмі пазітыўна ўспрынятыя ў краінах Захаду, адначасова вялі да беспрацоўя.

Расія, зрабіўшыся праваперaемніцай СССР, узяла на сябе абавязацельствы выплаціць пазыкі былога Савецкага Саюза (каля 70 млрд долараў).

«Шокавая тэрапія»

У новым урадзе РФ, сфарміраваным у 1992 г., ключавыя пасады занялі прыхільнікі рэформаў на чале з выконваючым абавязкі прэм'ер-міністра Я. Ц. Гайдарам. Прапанаваны імі шлях выхаду з крызісу, галоўным зместам якога быў хуткі пераход да рыначнай эканомікі, пачалі называць *«шокавай тэрапіяй»*.

«ШОКАВАЯ ТЭРАПІЯ»

- лібералізацыя цэн — адмова ад дзяржаўнага рэгулявання цэн на большую частку тавараў;
- зняцце абмежаванняў на прыватнапрадпрымальніцкую дзейнасць, у тым ліку ў галіне гандлю;
- правядзенне прыватызацыі — пераводу дзяржаўнай уласнасці ў рукі працоўных калектываў і прыватных асоб;
- фінансавая стабілізацыя

У 2000 г. рэальныя даходы расійскіх грамадзян у параўнанні з 1991 г. склалі толькі 47 %. Павялічыўся разрыў паміж узроўнем даходаў бедных і багатых. Паводле эканамічных паказчыкаў Расія набліжалася да найбяднейшых краін свету, што існавалі за кошт продажу прыродных рэсурсаў.

Палітыка Прэзідэнта РФ У. У. Пуціна ад пачатку новага тысячагоддзя прывяла да ажыўлення эканомікі.

Станоўчыя вынікі «шокавай тэрапіі»

- на ўнутраным рынку атрымалася збалансаваць попыт і прапанову, была вырашаная праблема таварнага дэфіцыту, ліквідаваная пагроза голаду, якая ўзнікла ў некаторых раёнах краіны ў 1989–1991 гг.;
- прыватызацыя прывяла да абуджэння гаспадарчай ініцыятывы, часткова паспрыяла вырашэнню праблемы беспрацоўя

Негатыўныя наступствы «шокавай тэрапіі»

- лібералізацыя цэн пры дэфіцыце тавараў прывяла да значнага іх росту;
- уцечка капіталаў за мяжу, куды вывозіліся дэфіцытныя матэрыялы, сыравіна і тавары;
- колькасць беспрацоўных на 1997 г. дасягнула 7 млн чалавек;
- не дала меркаваных вынікаў прыватызацыя, квітнела «ценявая» эканоміка, звязаная з крымінальнымі структурамі;
- да крытычнага ўзроўню скарацілася фінансаванне навуковых даследаванняў і сферы адукацыі;
- 17 жніўня 1998 г. Урад быў вымушаны заявіць аб дэфолце — адмове ад абавязацельстваў пагашэння знешніх і ўнутраных даўгоў краіны. Адбылася дэвальвацыя (абясцэньванне) рубля ў адносінах да замежных валют

Як вы лічыце, вынікі палітыкі «шокавай тэрапіі» ў РФ — гэта заканамерныя наступства такой эканамічнай палітыкі ці збег выпадковых фактараў?

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Рэформы У. У. Пуціна

- Падатковая рэформа: увядзенне адзінага 13 %-га падаходнага падатку;
- пенсіённая рэформа: пераход на назапашвальны прынцып фарміравання пенсіі;
- рэформа банкаўскай сферы: узмацненне кантролю над ліцэнзаваннем камерцыйных банкаў;
- рэформа жыллёва-камунальнай гаспадаркі: сыход дзяржавы са сферы камунальных паслуг;
- ільготная рэформа: перавод часткі льгот у грашовы эквівалент;
- рэалізацыя нацыянальных праектаў «Здароўе», «Адукацыя», «Даступнае жыллё», «Развіццё аграпрамысловага комплексу»



Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін

Па выніках прэзідэнцкіх выбараў за У. У. Пуціна прагаласавалі: 2004 г. — 71,3 % выбаршчыкаў; 2012 г. — 63,6 %; 2018 г. — 76,7 %; 2024 г. — 83,7 %.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце рэформы, праведзеныя ў гады прэзідэнцтва У. У. Пуціна, гістарычнымі фактамі.*
2. *Якім чынам гэтыя рэформы маглі паспрыяць стабілізацыі сітуацыі ў РФ, ажыўленню эканомікі?*
3. *Пра што сведчаць прыведзеныя вынікі выбараў Прэзідэнта РФ?*

За перыяд з 1999 да 2006 г. аб'ём ВУП вырас з 4823 млрд руб. да 26 781,1 млрд руб. Высокія цэны на нафту дазволілі Расіі назапасіць золатавалютныя рэзервы, паводле гэтага паказчыка краіна стала 3-й у свеце (пасля Кітая і Японіі). Дзяржава змагла выконваць сацыяльныя абавязацельствы, своечасова выплачваліся заробкі, былі павышаны пенсіі.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Створаная ў 2015 г. нацыянальная плацежная сістэма «Мір» — сімвал імпартазамяшчэння

Эканоміка РФ у апошнія дзесяцігоддзі аказалася пад уздзеяннем трох фактараў.

1. *Міжнародны эканамічны крызіс 2008 г.* Удалося пераадолець дастаткова хутка. Асабліва заўважным было ажыўленне ў аграрным сектары. Напачатку 2020-х гг. Расія заняла лідзіруючыя пазіцыі ў свеце па экспарце збожжа.

2. *Санкцыйны ціск краін Захаду ад 2014 г.* Санкцыі не толькі не прывялі да меркаванага краху эканомікі Расіі, але і паспрыялі яе актывізацыі і суверэнізацыі. Пазітыўныя вынікі даў курс на імпартазамяшчэнне.

3. *Пандэмія каранавіруса 2020 г.* Эканамічны спад, звязаны з пандэміяй, быў пераадолены ўсяго за год.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі:

— *канкрэтызуйце гістарычнымі фактамі ўплыў названых фактараў на эканоміку РФ і захады, якія былі зроблены расійскім Урадам для змяншэння іх негатыўнага ўздзеяння;*

— *знайдзіце вызначэнне тэрміна «імпартазамяшчэнне». Якую ролю яно адыгрывае ў эканамічным развіцці сучасных дзяржаў?*



Сімвалам маштабнага будаўніцтва зрабіўся Крымскі мост. Яго працягласць — 19 км. 2018 г.

У сучаснай расійскай эканоміцы знаходзяць адлюстраванне найноўшыя трэнды і тэндэнцыі. Ствараюцца тэхнапаркі, у якіх канцэнтруюцца распрацоўкі высокіх тэхналогій, вялікая ўвага надаецца развіццю нанатэхналогій. З улікам небяспекі залежнасці ад цэн на энерганосьбіты ў 2004 г. быў створаны Стабілізацыйны фонд (ад 2018 г. — Фонд нацыянальнага дабрабыту).

Нягледзячы на негатыўныя знешнія ўздзеянні, эканоміка Расіі на трэцяе дзесяцігоддзе XXI ст.

дэманструе высокія тэмпы росту і велізарны патэнцыял устойлівасці.

4. Расійская Федэрацыя на міжнароднай арэне. Як праваперaемніца СССР Расія захавала месца ў найбуйнейшых міжнародных арганізацыях, напрыклад у Савеце Бяспекі ААН.

Новыя прыярытэты знешняй палітыкі

Расійская Федэрацыя ад 1991 г. у якасці прыярытэтнай задачы знешняй палітыкі разглядала збліжэнне з краінамі Захаду і пераадоленне наступстваў «халоднай вайны». У працяг пачатага раней працэсу раззбраення ў 1993 г. Расія і ЗША заключылі новую Дамову аб абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў.

Нягледзячы на перакананне лідараў краін Захаду ў тым, што СССР (а значыць, і Расія) пацярпеў паражэнне ў «халоднай вайне» і Расія не можа прэтэндаваць на адстойванне сваіх інтарэсаў, з яе статусам адной з вядучых сусветных дзяржаў вымушаны былі лічыцца. Так, дэлегацыю РФ пачалі запрашаць на штогадовыя нарады лідараў «Вялікай сямёркі» («G7»), якая ў выніку ператварылася ў «G8». У 1994 г. Расія далучылася да праграмы НАТА «Партнёрства ў імя міру», а ў 1996 г. увайшла ў Савет Еўропы.

Пакажыце на карце краіны «Вялікай сямёркі». Якую ролю адыгрывае гэтая арганізацыя ў сучасным свеце?

Нарастанне міжнароднай напружанасці

Аднак адной добрай волі Расіі, яе жадання наладзіць добрасуседскія адносіны з краінамі Захаду аказалася недастаткова. Заходнія краіны надзвычай балюча ўспрымалі канкурэнцыю на сусветным рынку расійскіх тавараў і рэсурсаў. Падзеі ў Чачні зрабіліся падставай для абвінавачвання Расіі ў парушэнні правоў чалавека, у выніку быў прыпынены яе ўдзел у Савеце Еўропы.

У Расіі надзвычайнае абурэнне выклікалі дзеянні заходніх краін на чале з ЗША, такія як агрэсія НАТА супраць Сербіі ў 1999 г.; пашырэнне за кошт былых краін сацыялістычнага лагера і савецкіх рэспублік (у 2004 г. — Літвы, Латвіі і Эстоніі); выхад у 2002 г. ЗША ў аднабаковым парадку з Дамовы 1972 г. аб абмежаванні сістэм супрацьракетнай

абароны (СРА). Усё гэта запатрабавала карэкціроўкі курсу знешняй палітыкі Расіі.

Супрацоўніцтва з краінамі Азіі і Лацінскай Амерыкі

Ад канца 1990-х гг., захоўваючы стабільныя адносіны з ЗША і іх саюзнікамі, Расія ў той жа час пачала больш увагі ўдзяляць наладжванню супрацоўніцтва з такімі краінамі, як Кітай, Індыя, Іран, і традыцыйнымі саюзнікамі СССР — Кубай, Паўночнай Карэяй, В'етнамам і інш. Расія паслядоўна выступае за неабходнасць прызнання *шматпалярнасці свету*, настойваючы на раўнапраўі ўсіх дзяржаў.

У 2007 г. на Мюнхенскай канферэнцыі па пытаннях нацыянальнай бяспекі У. У. Пуцін выступіў з прамовай, у якой заклікаў да ўсталявання новага сусветнага парадку, дзе няма месца аднапалярнасці. На думку сучасных палітолагаў, прамова прэзідэнта адзначыла паварот знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, «пераход да адкрытай формы рэалізацыі расійскай знешнепалітычнай стратэгіі 21 ст.».



МКС — шматмэтавы касмічны даследчы комплекс, уведзены ў эксплуатацыю ў 1998 г.

Нягледзячы на нязгоду з палітыкай ЗША ў Іраку, Расія ў маі 2003 г. ратыфікавала Дамову аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў. У тым самым годзе пасля катастрофы амерыканскага шатла «Калумбія» Расія ўзяла на сябе забеспячэнне функцыянавання Міжнароднай касмічнай станцыі. Аднак ЗША і краіны Захаду па-ранейшаму бачылі ў Расіі палітычнага і эканамічнага канкурэнта, што было асабліва відавочна на фоне эканамічнага ўздыму, які ў ёй пачынаўся, і росту канкурэнтаздольнасці расійскай прадукцыі на сусветным рынку.

Успомніце, што такое «каляровыя рэвалюцыі».

У новым тысячагоддзі ўсё больш відавочным робіцца імкненне ЗША і краін Захаду абмежаваць уплыў Расіі, нават шляхам прамога ўмяшання ва ўнутраную сітуацыю ў суседніх краінах. «Каляровыя рэвалюцыі», што адбыліся ў шэрагу краін з падтрымкай замежных фондаў, прывялі да ўлады ў іх сілы, варожыя Расіі.

Галоўным знешнепалітычным прыярытэтам Расіі выступае развіццё ўзаемаадносін з краінамі СНД, гэта вызначана ў Канцэпцыі знешняй палітыкі, зацверджанай Прэзідэнтам У. У. Пуціным у чэрвені 2000 г. У рамках рэалізацыі гэтага кірунку была падпісаная Дамова аб заснаванні Еўразійскай эканамічнай супольнасці, створаныя Мытны саюз і Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), падпісаная дамова аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС).

Супрацоўніцтва з краінамі СНД

Падрыхтуйце прэзентацыю пра гэтыя міжнародныя арганізацыі, указаўшы дату стварэння, мэты, краіны, што ўдзельнічаюць.

Аднак ва ўзаемаадносінах Расіі з краінамі постсавецкай прасторы не ўсё складваецца спрыяльна. У міжнацыянальных канфліктах, што ўзнікалі ў суседніх краінах, Расія выступала ў ролі міратворца (Прыднястроўе, Абхазія, Таджыкістан, Паўднёвая Асеція, Карабах), прымала бежанцаў, што дадатковым цяжарам клалася на яе эканоміку. Але найбольш драматычны характар набылі расійска-ўкраінскія адносіны.

Абвастрэнне адносін з Украінай

Абвастрэнне адносін паміж Расіяй і Украінай пачалося неўзабаве пасля распаду СССР і было звязана з транзітам расійскага газу ў еўрапейскія краіны і пастаўкамі энергарэсурсаў ва Украіну. «Аранжавая рэвалюцыя» 2004 г. прывяла да ўлады ва Украіне адкрыта празаходніх палітыкаў. Узаемныя прэтэнзіі Расіі і Украіны ўзмацніліся. На тэрыторыі апошняй пачалі расці русафобскія настроі: зносілі помнікі савецкім воінам-вызваліцелям, перайменоўвалі населеныя пункты, выцяснялі рускую мову. Усё гэта выклікала абурэнне рускамоўнага насельніцтва Украіны, асабліва шматлікага на ўсходзе краіны. Чарговы палітычны крызіс ва Украіне ў 2014 г. (еўрамайдан) прывёў да ўлады радыкальных нацыяналістаў, якія ўзялі курс на гвалтоўную ўкраінізацыю. У шэрагу рэгіёнаў і гарадоў, якія засталіся ў складзе Украіны пасля распаду СССР, — у Крыме, Данецку, Луганску, Адэсе, Харкаве — узніклі стыхійныя пратэсты, пазней названыя «Рускай вясной». Адным з яе вынікаў

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, што такое Мінскія пагадненні. Дайце ацэнку міратворчай дзейнасці Рэспублікі Беларусь у спробе ўрэгулявання канфлікту.



Г. Мінск, люты 2015 г.

было ўваходжанне Рэспублікі Крым і г. Севастопаля ў склад Расійскай Федэрацыі.

У красавіку 2014 г. жыхары Данецкай і Луганскай абласцей Украіны адмовіліся падпарадкоўвацца Кіеву і абвясцілі стварэнне Данецкай і Луганскай народных рэспублік (ДНР і ЛНР). Украінскія ўлады паспрабавалі ўзброеным шляхам знішчыць рэспублікі, якія імкнуліся да незалежнасці. Умовы заключанага ў лютым 2015 г. у Мінску пагаднення аб спыненні агню не выконваліся. Карыстаючыся падтрымкай НАТА, украінскія ўлады ўзмацнялі ваенны ціск на ДНР і ЛНР, якія падтрымлівала Расія. 21 лютага 2022 г. Расія прызнала незалежнасць дзвюх рэспублік (ДНР і ЛНР), а 24 лютага пачала ажыццяўленне Спецыяльнай ваеннай аперацыі (СВА) ва Украіне. Яе мэтамі абвешчаны абарона насельніцтва ДНР і ЛНР, дэмілітарызацыя і дэнацыфікацыя Украіны.

30 верасня 2022 г. Прэзідэнт У. У. Пуцін падпісаў дамовы аб уваходжанні ў склад Расіі на правах суб'ектаў Федэрацыі Данецкай Народнай Рэспублікі, Луганскай Народнай Рэспублікі, Запарожскай і Херсонскай абласцей. Але ваеннае супрацьстаянне Расіі і Украіны працягнулася, бо дзяржавы Захаду свядома сарвалі дыпламатычнае вырашэнне канфлікту, абнуліўшы дыпламатычныя намаганні Расіі, Беларусі, краін «глабальнага Поўдня» і іншых суб'ектаў, зацікаўленых у міры ва Украіне.



На праведзеным у сакавіку 2014 г. рэферэндуме 97 % крымчан падтрымалі далучэнне Рэспублікі Крым да Расійскай Федэрацыі

Успомніце, што такое дэнацыфікацыя і дэмілітарызацыя. У адносінах да якой краіны праводзілася такая палітыка ў XX ст.?

За гады, якія прайшлі пасля распаду СССР, Расійская Федэрацыя сутыкнулася з мноствам выклікаў ва ўнутрыпалітычнай і знешнепалітычнай сітуацыях, узаемаадносінах цэнтра і рэгіёнаў, з эканамічнымі і сацыяльнымі трансфармацыямі. Годны адказ на іх дазваляе бачыць у Расіі ўнікальную дзяржаву, якая валодае магутным патэнцыялам.

калі ў свеце…

12 снежня 1993 г. — прыняцце новай Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі, у якой значна пашыраліся паўнамоцтвы Прэзідэнта РФ

на тэрыторыі Беларусі…

24 лістапада 1996 г. — правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму, на якім беларускі народ падтрымаў праект змен у Канстытуцыю, прапанаваны Прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Вызначце асноўныя этапы дзяржаўна-палітычнага развіцця Расійскай Федэрацыі пасля распаду СССР. Дайце кароткую характарыстыку кожнага з іх.
2. З якімі выклікамі сутыкнулася Расійская Федэрацыя ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця за апошнія 30 гадоў? Як вырашаліся праблемы, што ўзнікалі? Назавіце асноўныя дасягненні Расіі ў сацыяльна-эканамічнай сферы.
3. Апішыце асноўныя кірункі знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі ў канцы 1990-х — пачатку 2000-х гг. Дайце ацэнку ролі Расійскай Федэрацыі ў сучаснай сусветнай супольнасці.
4. Як вы лічыце, чым абумоўлена палітыка Расіі ва ўмовах новых выклікаў сучаснага грамадства?

§ 42. Рэспубліка Беларусь у першай палове 1990-х гг.

ДЗЯРЖАЎНЫ СУВЕРЭНІТЭТ
ГРАМАДЗЯНСТВА
БЕЛАВЕЖСКІЯ ПАГАДНЕННІ
УНІТАРНАЯ ДЗЯРЖАВА
ПРАВАВАЯ ДЗЯРЖАВА
САЦЫЯЛЬНАЯ ДЗЯРЖАВА
ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ДЗЯРЖАВА

«Парад суверэнітэтаў»



Назавіце і пакажыце на карце 15 рэспублік, што ўваходзілі ў склад СССР.

Дзяржаўны суверэнітэт — незалежнасць і самастойнасць дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае замежнага ўмяшання.

1. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту. Канфлікт М. С. Гарбачова і Б. М. Ельцына, абумоўлены прынцыповымі адрозненнямі іх поглядаў на будучыню СССР і Расіі, а таксама непрадуманае рэфармаванне савецкай сістэмы прывялі да чарады падзей, якую ў гісторыі называюць *«парадам суверэнітэтаў»*. Гэтая падзея ператварылася ў інструмент барацьбы за ўладу, каб аслабіць агульнасаюзны цэнтр, які ўзначальваў М. С. Гарбачоў, на карысць эліт у рэспубліках, што жадалі незалежнасці, інтарэсы якіх увасабляў Б. М. Ельцын. У 1988–1991 гг. рэспублікі СССР прынялі дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Першымі пра яго аб'явілі Эстонія, Латвія і Літва. 12 чэрвеня 1990 г. была прынятая Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР. Дэкларацыя «Аб **дзяржаўным суверэнітэце** Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» была прынятая Вярхоўным Саветам БССР **27 ліпеня 1990 г.**

Дэкларацыя вызначыла суадносіны ўладных паўнамоцтваў Савецкага Саюза і рэспублікі — на тэрыторыі БССР усталёўвалася вяршэнства Канстытуцыі і законаў рэспублікі. Падкрэслівалася, што ўсе грамадзяне і асобы без грамадзянства, дзяржаўныя

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»

Арт. 1

БССР — суверэнная дзяржава, якая зацвердзілася на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу.

Неад'емныя правы БССР як суверэннай дзяржавы рэалізуюцца ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права. БССР ахоўвае і абараняе нацыянальную дзяржаўнасць беларускага народа…

Арт. 5

Зямля, яе нетры, іншыя прыродныя рэсурсы на тэрыторыі БССР, паветраная прастора з'яўляюцца ўласнасцю беларускага народа, якому належаць выключныя правы па іх валоданні, карыстанні і распараджэнні…

БССР утварае Нацыянальны банк, падпарадкаваны Вярхоўнаму Савету рэспублікі, стварае сваю фінансава-крэдытную сістэму; пацвярджае правы ўласнасці на спецыялізаваныя банкі, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі на момант прыняцця гэтай Дэкларацыі, арганізуе ўласныя падатковую і мытную службы, мае права на стварэнне ўласнай грашовай сістэмы.

1. *Якія прынцыпы дзяржаўнага суверэнітэту былі абвешчаныя ў Дэкларацыі?*
2. *Як у ёй была вызначана эканамічная аснова дзяржаўнага суверэнітэту БССР?*

органы, прадпрыемствы, установы, арганізацыі, якія знаходзяцца і дзейнічаюць на тэрыторыі БССР, абавязаныя выконваць яе заканадаўства.

Вярхоўны Савет БССР вызначыў Днём Незалежнасці Беларусі дату прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Аднак большасць жыхароў Беларусі не сталі ўспрымаць гэтую дату як пачатак адліку суверэннай дзяржаўнасці, бо яна была звязаная з разбурэннем савецкай дзяржавы. На рэспубліканскім рэферэндуме 1996 г. з прапановы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларусы выказаліся за перанос святкавання Дня Незалежнасці на 3 ліпеня — дату вызвалення г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.



Урачысты сход у гонар Дня Незалежнасці. 2024 г.

Чаму менавіта 3 ліпеня зрабілася для беларускага народа сімвалам незалежнасці?

За гэта прагаласавалі 88,18 % грамадзян з ліку тых, хто ўдзельнічаў у рэферэндуме.

Як вы лічыце, пра што сведчылі высокая яўка жыхароў БССР і вынікі іх галасавання на Усесаюзным рэферэндуме 1991 г.?

Намагаючыся спыніць «парад суверэнітэтаў», кіраўніцтва СССР ініцыявала правядзенне 17 сакавіка 1991 г. Усесаюзнага рэферэндуму па пытанні захавання Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік як абноўленай федэрацыі раўнапраўных суверэнных рэспублік. Улады Грузіі, Літвы, Малдовы, Латвіі, Эстоніі і Арменіі адмовіліся праводзіць галасаванне. У БССР на ўчастках для галасавання прыйшло 83,3 % грамадзян, якія мелі права голасу. 82,7 % з іх падтрымалі захаванне СССР.

Насуперак меркаванню народаў, працэс распаду СССР працягваўся. Для большасці беларусаў развал агульнай дзяржавы (СССР) быў нечаканасцю і ўспрымаўся вельмі балюча.

Афармленне статусу незалежнай суверэннай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь

Пасля правалу спробы захаваць СССР Вярхоўны Савет БССР **25 жніўня 1991 г.** прыняў Закон «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі „Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі“».

19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне змяніць назву «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка» на «Рэспубліку Беларусь», а таксама зацвердзіў, без сур’ёзных навуковых дыскусій і правядзення рэферэндуму, новыя дзяржаўныя сімвалы (сцяг і герб). 18 кастрычніка 1991 г. быў прыняты Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь».

Прыняццем вышэйназваных законаў Рэспубліка Беларусь юрыдычна аформіла свой статус як незалежная суверэнная дзяржава.

Падпісанне Белавежскага пагаднення

8 снежня 1991 г. прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын, прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук, старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч падпісалі «Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў», вядомае як *«Белавежскае пагадненне»*. У яго прэамбуле запісана: «Саюз

ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыняе сваё існаванне». Такім чынам, насуперак вынікам Усесаюзнага рэферэндуму 1991 г. была дэнансаваная Дамова аб стварэнні СССР.

12 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь XII склікання на сваім сходзе ратыфікаваў Белавежскае пагадненне, стварэнне СНД і распад СССР.

Вынікі галасавання былі такія: 263 — «за», 2 — «устрымаліся» і ўсяго 1 — «супраць». У Авальнай зале быў адзіны дэпутат, які пры галасаванні кіраваўся вынікамі сакавіцкага рэферэндуму 1991 г., — Аляксандр Лукашэнка. Ён сваім голасам выказаў меркаванне большасці беларусаў, якія падтрымалі на рэферэндуме 1991 г. захаванне Савецкага Саюза.

2. Грамадска-палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс. З распадам СССР была разбурана і агульная сістэма кіравання гаспадаркай. Эканоміка БССР была ў вялікай ступені інтэграваная з іншымі часткамі народнагаспадарчага комплексу СССР. Разрыў эканамічных сувязей, імклівы рост цэн на энерганосьбіты і сыравіну, якая імпартавалася, выступілі прычынамі глыбокага эканамічнага крызісу, у якім апынулася рэспубліка напачатку 1990-х гг.

На момант атрымання незалежнасці БССР была лідарам сярод рэспублік СНД паводле паказчыка прыбытку на душу насельніцтва, мела развіты прамысловы сектар. Беларусь належала да самых індустрыялізаваных краін свету. Але ўжо ў 1991 г. пачалося падзенне ўзроўню вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, значна вырасла інфляцыя. У 1993–1994 гг. яе тэмпы ў Беларусі перавышалі 2000 %. Рэзка выраслі цэны на прамысловую прадукцыю, спажывецкія тавары, а рэальныя даходы насельніцтва знізіліся амаль у 2 разы. Праз вываз тавараў, цэны на якія ў БССР рэгуляваліся,



Што, на вашу думку, сімвалізуе ілюстрацыя?

Успомніце, чаму БССР называлі «зборачным цэхам» Савецкага Саюза.

Эканамічны крызіс першай паловы 1990-х гг.



Карткі на прадукты. 1993 г.

Якую прыкмету эканамічнага крызісу паказвае ілюстрацыя?

у суседнія краіны павялічыўся дэфіцыт на спажывецкім рынку рэспублікі. Былі ўведзеныя талоны на тавары, карткі спажыўца.

Крызіс ахапіў прамысловасць, сельскую гаспадарку, фінансавую і сацыяльную сферы. Узмацнілася дыферэнцыяцыя даходаў насельніцтва. З'явілася беспрацоўе, якога ў рэспубліцы не было ўжо шмат дзесяцігоддзяў. Колькасць толькі зарэгістраваных беспрацоўных у 1994 г. складала больш за 100 тыс. чалавек. Пачалі зніжацца аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва і аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння. У 1991–1994 гг. сярэдняя працягласць жыцця ў рэспубліцы знізілася з 71,1 да 68,9 года.

Палітычны крызіс першай паловы 1990-х гг.

У момант абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР з'яўлялася *парламенцкай рэспублікай*. Выканаўчая ўлада належала Кабінету Міністраў, якім кіраваў В. Ф. Кебіч. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляў Вярхоўны Савет XII склікання пад старшынствам С. С. Шушкевіча. Рэспубліка Беларусь перажывала палітычны крызіс: абмеркаванне і прыняцце рашэнняў Вярхоўным Саветам зацягваліся, узмацнілася супрацьстаянне розных палітычных груповак. Пра палітычны крызіс сведчыў і той факт, што на працягу чатырох гадоў Вярхоўны Савет не мог прыняць Канстытуцыю. Насельніцтва Беларусі ўсё мацней выказвала незадаволенасць эканамічнай сітуацыяй у краіне.

Успомніце асноўныя прыкметы парламенцкай рэспублікі як формы праўлення.

Грамадска-палітычныя змены, якія адбыліся, глыбокі эканамічны крызіс ставілі перад урадам рэспублікі складаныя задачы і патрабавалі новых метадаў кіравання. Беларуская палітычная сістэма мела патрэбу ў моцным цэнтры, які б мог узяць на сябе адказнасць за лёс дзяржавы.

3. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Пасля здабыцця краінай незалежнасці паўстала неабходнасць прыняцця ўласнага Асноў-

нага Закона — **Канстытуцыі**. У першыя гады дзяржаўнага суверэнітэту на тэрыторыі рэспублікі дзейнічала Канстытуцыя БССР 1978 г. з тымі дапаўненнямі, якія былі ўнесены Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце БССР і іншымі прававымі актамі, прынятымі ў перыяд незалежнасці.

Канстытуцыя — дакумент, які мае найвышэйшую юрыдычную сілу і вызначае будову дзяржавы, правы, свабоды і абавязкі грамадзян.

Распрацоўка праекта Канстытуцыі

Для распрацоўкі праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у ліпені 1990 г. Вярхоўны Савет стварыў Канстытуцыйную камісію. Падрыхтоўка праекта праходзіла ў гарачай дыскусіі, але ў вузкім коле, без шырокага народнага абмеркавання. У выніку першы варыянт беларускай Канстытуцыі стаў вынікам барацьбы за ўладу паміж групамі дэпутатаў Вярхоўнага Савета.

Успомніце, што такое рэспубліка.

Вострыя спрэчкі разгарнуліся наконт формы праўлення: якая мае быць рэспубліка — прэзідэнцкая ці парламенцкая? Частка дэпутатаў Вярхоўнага Савета не хацела выпускаць з рук кіраванне краінай і супраціўлялася ўвядзенню пасады Прэзідэнта з шырокімі паўнамоцтвамі, які б абіраўся ўсімі грамадзянамі. У выніку быў прыняты кампрамісны варыянт: Прэзідэнт абіраўся ўсенародна, але яго ўлада паводле першай рэдакцыі Канстытуцыі была моцна абмежаваная паўнамоцтвамі Вярхоўнага Савета.

15 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет прыняў Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь. Гэты дзень з'яўляецца дзяржаўным святам — Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.



15 сакавіка
Дзень Канстытуцыі
Рэспублікі Беларусь

У чым заключаецца значнасць гэтага свята для беларускага народа?

Рэспубліка Беларусь абвяшчалася *ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай*. Канстытуцыя ўвяла інстытут прэзідэнцтва.

Цягам свайго дзеяння Канстытуцыя ўдасканальвалася, у яе ўносіліся змяненні і дапаўненні. Кожны раз прапанаваныя змены абмяркоўваліся з беларускім народам. Важныя рашэнні наконт дапаўненняў і змен у Асноўны Закон краіны былі прынятыя на рэспубліканскіх рэферэндумах: 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г. і 27 лютага 2022 г.

4. Структура і функцыі органаў улады. У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. быў замацаваны *прынцып падзелу ўлад*.

Заканадаўчая ўлада

Згодна з ім найвышэйшым прадстаўнічым (пастаянна дзеючым) і заканадаўчым органам дзяржаўнай улады з'яўляўся *Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь*, які абіраўся тэрмінам на 5 гадоў. Працы Вярхоўнага Савета ў першай палове 1990-х гг., прыняццю ім законаў перашкаджалі барацьба паміж фракцыямі і асабістыя амбіцыі часткі дэпутатаў.

Выканаўчая ўлада

Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляў *Кабінет Міністраў*. Яго члены прызначаліся *Прэзідэнтам* і ўзгадняліся з Вярхоўным Саветам.

Судовая ўлада

Судовая сістэма Рэспублікі Беларусь будавалася на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі і складалася з Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і судоў агульнай юрысдыкцыі, да якіх належалі Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, абласныя (Мінскі гарадскі) суды, эканамічныя суды абласцей і г. Мінска і раённыя (гарадскія) суды. Судаўладкаванне вызначалася Канстытуцыяй і законам. Стварэнне надзвычайных судоў забаранялася.

Мясцовыя органы ўлады

У рэгіёнах улада належала мясцовым Саветам дэпутатаў, якія ажыццяўлялі сваю дзейнасць у межах адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (вёскі, горада, раёна, вобласці) і абіраліся жыхарамі гэтых тэрытарыяльных адзінак. Саветы зацвярджалі праграмы эканамічнага і сацыяльнага развіцця горада (раёна, вобласці), распараджаліся даходамі і тратамі мясцовых бюджэтаў, камунальнай уласнасцю, усталёўвалі мясцовыя падаткі і зборы, вырашалі іншыя пытанні, звязаныя з развіццём сваёй тэрыторыі.

Структура мясцовых органаў улады ў Рэспубліцы Беларусь мянялася. З зацвярджэннем пасады Прэзідэнта ў 1994 г. *мясцовыя выканаўчыя камітэты*

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 г.

Арт. 6

Дзяржава заснаваная на прынцыпе падзелу ўлад: заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя: яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго.

Арт. 79

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь з'яўляецца вышэйшым прадстаўнічым пастаянна дзеючым і адзіным заканадаўчым органам дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь.

Арт. 95

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады.

Арт. 106


Для рэалізацыі паўнамоцтваў выканаўчай улады ў галінах эканомікі, знешняй палітыкі, абароны, нацыянальнай бяспекі, аховы грамадскага парадку і іншых сферах дзяржаўнага кіраўніцтва пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ствараецца Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

1. *Які прынцып рэалізацыі дзяржаўнай улады быў замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.? У чым ён заключаецца?*
2. *Якую ролю ў сістэме дзяржаўнай улады адыгрываў Вярхоўны Савет?*
3. *Якія функцыі выконваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь?*
4. *Для чаго ствараўся Кабінет Міністраў?*

перасталі быць органамі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Кіраўнікі выканкамаў (раённых, абласных) пачалі прызначацца Кіраўніком дзяржавы. У рэспубліцы сфарміравалася «прэзідэнцкая вертыкаль» — сістэма дзяржаўнага кіравання, у якой уся выканаўчая ўлада сканцэнтравана ў органах, падпарадкаваных Прэзідэнту, што забяспечвае моцную цэнтралізацыю ўлады і строгі кантроль за выкананнем рашэнняў на ўсіх узроўнях.

Пачатак прэзідэнцкага праўлення

5. Прэзідэнцкія выбары 1994 г. **10 ліпеня 1994 г.** Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў абраны **Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка**. Ад гэтага моманту



20 ліпеня 1994 г. у Авальнай зале Дома ўрада адбылася інаўгурацыя першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі

ў навейшай гісторыі Беларусі пачаўся этап прэзідэнцкага праўлення.

А. Р. Лукашэнка, нягледзячы на шматлікія эканамічныя цяжкасці ў краіне, не пагадзіўся на правядзенне рэформаў метадам так званай «шокавай тэрапіі», які прадугледжваў рэзкі перавод сацыяльнай сферы на рыначныя адносіны.

У Беларусі ў той перыяд існаваў мінімальны ўзровень сацыяльных гарантый у такіх сферах, як ахова здароўя, адукацыя, культура, жыллёва-камунальная гаспадарка. Дзяржава захоўвала кантроль за рознічнымі цэнамі на асноўныя спажывецкія тавары і паслугі для насельніцтва, у тым ліку на паліва, газ, электраэнергію.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У 1994 г. А. Р. Лукашэнка сфармуляваў сваю асноўную задачу як Прэзідэнта наступным чынам:

«Адвесці дзяржаву і народ ад прорвы — вось першачарговая задача Прэзідэнта. Наперадзе вялікая і цяжкая работа, якую ніхто, апроч нас самі́х, не зробіць. Я веру ў мудрасць і працавітасць беларускага народа. Перакананы, што рашэнне гэтай задачы нам па плячы».

Паводле матэрыялаў афіцыйнага сайта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2025 г.):

…за 2010–2024 гг. ВУП краіны павялічыўся ў супастаўных цэнах на 25,2% пры росце прадукцыйнасці працы за названы перыяд на 41,8%.

Валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва паводле парытэту пакупніцкай здольнасці вырас з 15,3 тыс. долараў у 2010 г. да 33,0 тыс. долараў у 2024 г.

Як вы лічыце, якія фактары сталі вырашальнымі ў выкананні пастаўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь першачарговай задачы развіцця беларускай дзяржавы? Сваю думку аргументуйце.

З абраннем першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пачынаецца этап развіцця сапраўднага суверэнітэту, заснаванага на строгай вертыкалі ўлады з выразна размежаванымі паўнамоцтвамі і прамым волевыяўленнем народа. Шлях да пабудовы такой мадэлі быў няпросты, але быў абумоўлены гістарычным выбарам беларускага народа ў 1994 г.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
12 чэрвеня 1990 г. — прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР	27 ліпеня 1990 г. — прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У чым праяўляўся палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс у Беларусі ў першай палове 1990-х гг.? Якія былі яго прычыны?
2. Складзіце тэзісны план (або храналагічную табліцу) «Этапы ўтварэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь».
3. Назавіце асноўныя прынцыпы, на якіх заснаваная Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.
4. У чым праяўляецца прынцып падзелу ўлад у Рэспубліцы Беларусь? Ахарактарызуйце структуру органаў улады ў краіне ў першай палове 1990-х гг. Як паўнамоцтвы асобных галін улады супольна забяспечваюць эфектыўнае развіццё нашай дзяржавы?

§ 43–44. Прэзідэнцкая рэспубліка — гістарычны выбар беларускага народа

ПРЭЗІДЭНТ КАНСТЫТУЦЫЯ
КАБІНЕТ МІНІСТРАЎ
ВЯРХОЎНЫ САВЕТ
ПАРЛАМЕНЦКАЯ РЭСПУБЛІКА
ПРЭЗІДЭНЦКАЯ РЭСПУБЛІКА
УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ
СХОД

Першы рэспубліканскі рэферэндум

Рэферэндум — народнае галасаванне з мэтай выяўлення грамадскай думкі для прыняцця рашэння па якім-небудзь важным дзяржаўным пытанні.

1. Рэферэндум 1995 г. У Рэспубліцы Беларусь з 1994 г. фарміравалася мадэль улады, пры якой народ рэалізуе сваю функцыю крыніцы дзяржаўнай улады шляхам прамога волевыяўлення. Выкарыстанне ў Рэспубліцы Беларусь такой формы волевыяўлення народа, як **рэферэндум**, сведчыць пра дэмакратычны характар беларускай дзяржавы.

Першы ў гісторыі суверэннай Беларусі рэспубліканскі рэферэндум адбыўся **14 мая 1995 г.**, у ім узялі ўдзел 64,8 % грамадзян, якія валодалі выбарчым правам. Кіраўнік дзяржавы вынес на народнае галасаванне чатыры пытанні, што мелі важнае значэнне для далейшага развіцця маладой суверэннай дзяржавы: наконт статусу рускай мовы, дзяржаўнай сімволікі, эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, магчымасці датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі.

Беларусы падтрымалі стратэгію Прэзідэнта і яго курс на стабільнасць, парадак і адказнасць.

ВЫНІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ 14 мая 1995 г.

Ці згодны Вы з наданнем рускай мове роўнага статусу з беларускай?	«Так» — 83,3 %
Ці падтрымліваеце Вы прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь?	«Так» — 75,1 %
Ці падтрымліваеце Вы дзеянні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй?	«Так» — 83,3 %
Ці згодныя Вы з неабходнасцю ўнясення змен у дзеючую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у выпадку сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі?	«Так» — 77,7 %

Новыя дзяржаўныя сімвалы

Згодна з вынікамі рэферэндуму Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падпісаў указы «Аб зацвярджэнні эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Палажэння аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь» і «Аб зацвярджэнні Палажэння аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь». Так былі прынятыя дзяржаўныя сімвалы краіны, якія дзейнічаюць сёння.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь



Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь

1. *Якое значэнне маюць чырвоны, зялёны і белы колеры Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь? Што сімвалізуе арнамент?*
2. *Што сімвалізуюць асноўныя элементы Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь: контур Беларусі, вянок з залатога калосся, кветак ільну і канюшыны; зямны шар, узыходзячае сонца, зорка?*
3. *Параўнайце дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь і БССР. У чым заключаецца іх пераемнасць?*

Палітыка-прававы статус інстытута прэзідэнцтва

2. Гістарычнае значэнне рэферэндуму 1996 г.

Інстытут прэзідэнцтва, які ўвяла Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г., падкрэсліваў незалежны і суверэнны характар краіны. У адпаведнасці з Канстытуцыяй 1994 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляўся Кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады.

Аднак у Канстытуцыі 1994 г. палітыка-прававы статус інстытута прэзідэнцтва не быў дастаткова прапрацаваны, адсутнічаў прававы механізм узаемадзеяння Прэзідэнта і іншых уладных структур, у першую чаргу Вярхоўнага Савета. Апошні валодаў значна большымі паўнамоцтвамі.

Рэферэндум 1996 г.

Дзейнасць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі, які атрымаў падтрымку народа падчас прамых выбараў, сутыкнулася з процідзеяннем з боку Вярхоўнага Савета. Гэта тлумачыцца тым, што падчас палітычнага крызісу першай паловы 1990-х гг. у Вярхоўны Савет трапіла шмат дэпутатаў-папулістаў, некаторыя з іх прытрымліваліся крайніх нацыяналістычных поглядаў.

Для вырашэння рознагалоссяў паміж выканаўчай (Прэзідэнт) і заканадаўчай (Вярхоўны Савет) галінамі ўлады Прэзідэнт звярнуўся да беларускага народа як крыніцы дзяржаўнай улады і ініцыяваў правядзенне ў лістападзе 1996 г. рэспубліканскага рэферэндуму.

На рэферэндум акрамя іншых пытанняў былі вынесеныя два праекты новай рэдакцыі Канстытуцыі. Адзін варыянт быў прапанаваны Прэзідэнтам і прадугледжваў рэфармаванне ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады і пашырэнне паўнамоцтваў Прэзідэнта. Другі варыянт быў распрацаваны групай дэпутатаў Вярхоўнага Савета і прапаноўваў адмену пасады Прэзідэнта і вяршэнства Парламента. Пазіцыя дэпутатаў Вярхоўнага Савета наконт адмены пасады Прэзідэнта супярэчыла Канстытуцыі, якую яны ж і прынялі ў 1994 г.

ВЫНІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ 24 лістапада 1996 г.

Перанесці Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) на 3 ліпеня — дзень вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне	«Так» — 88,18 %
Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прапанаванымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам	«Так» — 70,45 %
Ці выступаеце Вы за свабодную, без абмежаванняў, куплю і продаж зямлі?	«Не» — 82,88 %
Ці падтрымліваеце Вы адмену смяротнага пакарання ў Рэспубліцы Беларусь?	«Не» — 80,44 %

Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г.

24 лістапада 1996 г. адбыўся другі рэспубліканскі рэферэндум. У галасаванні ўзялі ўдзел 84,14 % грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодалі выбарчым правам.

Стварэнне Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Пасля прыняцця на рэспубліканскім рэферэндуме прэзідэнцкай рэдакцыі Канстытуцыі ў нашай краіне быў створаны двухпалатны Парламент — *Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь*.



ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Абраная мадэль кіравання краінай — **прэзідэнцкая рэспубліка** — аптымальная для беларускага грамадства з улікам гістарычных традыцый і геапалітычнага становішча.

За гады суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і прэзідэнцкай сістэмы праўлення выбудавана нацыянальная мадэль дэмакратыі, шчыльна звязаная са стваральнай і валявой асобай Прэзідэнта, мэтанакіраванай дзейнасцю народа, яго эліты, структур і ўстаноў улады.

1. *Як вы лічыце, якія гістарычныя традыцыі беларускага народа прадвызначылі выбар прэзідэнцкай рэспублікі як формы праўлення?*
2. *Як геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь магло паўплываць на выбар у якасці мадэлі кіравання краінай прэзідэнцкай рэспублікі?*
3. *Вызначце элементы (прыкметы) нацыянальнай мадэлі дэмакратыі, якая сфарміравалася ў Рэспубліцы Беларусь.*

Галоўная функцыя Парламента — прыняцце законаў. Эфектыўнасць гэтай дзейнасці забяспечваюць пастаянныя камісіі, якія фарміруюцца з дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі. Усякі законапраект спачатку разглядаюць у Палаце прадстаўнікоў, а пасля ў Савеце Рэспублікі. Ён робіцца законам пасля прыняцця ніжняй і ўхвалення верхняй палатамі Парламента.

Асаблівую ролю ў вызначэнні прынцыпаў працы Нацыянальнага сходу выконвае Кіраўнік дзяржавы — яго рэгулярныя сустрэчы з дэпутатамі сталі вызначальнымі ў развіцці беларускага парламентарызму.

Змены і дапаўненні ў Канстытуцыю 1994 г., унесеныя па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 1996 г., сведчылі пра канчатковае змяненне формы праўлення ў Рэспубліцы Беларусь з парламенцкай рэспублікі на **прэзідэнцкую**.

Прэзідэнцкая рэспубліка — форма дзяржаўнага праўлення, якая характарызуецца значнай роляй Прэзідэнта ў сістэме дзяржаўных органаў.

Месца Прэзідэнта ў сістэме дзяржаўнага кіравання

3. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Паўнамоцтвы, функцыі і дзейнасць. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь займае асаблівае месца ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Пасля рэферэндуму 1996 г. Прэ-

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь ПАВОДЛЕ НАРАДЖЭННЯ:

- не маладзейшы за 40 гадоў;
- які валодае выбарчым правам;
- які стала жыве ў Рэспубліцы Беларусь не менш за 20 гадоў непасрэдна перад выбарамі;
- які не мае і не меў раней грамадзянства замежнай дзяржавы або пасведчання на права пражывання ці іншага дакумента замежнай дзяржавы, што дае права на льготы і іншыя перавагі

зідэнт з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, сімвалізуе адзінства беларускага народа, гарантуе рэалізацыю асноўных кірункаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе краіну ў адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі, падпісвае міжнародныя дамовы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь як Кіраўнік дзяржавы арганізацыйна не ўваходзіць ні ў адну галіну ўлады, а выступае арбітрам паміж рознымі палітычнымі сіламі. Прэзідэнт закліканы аб'яднаць усе ўлады і спрыяць іх эфектыўнаму функцыянаванню.

Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Паўнамоцтвы Прэзідэнта шырокія і датычацца ўсіх кірункаў арганізацыі і ажыццяўлення дзяржаўнай улады: рэалізацыя выканаўчай улады, удзел у заканадаўчым працэсе, фарміраванне судовай сістэмы і дзяржаўнага апарату.

Прэзідэнт робіць захады па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць. Прэзідэнт фарміруе і ўзначальвае Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца галоўнакамандуючым Узброеных Сіл. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь замацаваныя ў арт. 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Лідар беларускага народа

Прэзідэнт валодае недатыкальнасцю, яго гонар і годнасць абаронены законам.

Інстытут прэзідэнцкай улады трывала ўвайшоў у палітычную сістэму Беларусі, зрабіўся найважнейшай часткай беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай бяспекі. Прэзідэнцкая рэспубліка ў нашай краіне — гэта мадэль улады, дзе ёсць лідар, дзяржаўны дзеяч, які здолеў закласці трывалы падмурак у справе пабудовы суверэннай і незалежнай дзяржа-

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка

«Здольнасць лідара глыбока асэнсоўваць маштабныя праекты, валявая настойлівасць пры іх вырашэнні, мужнае ўспрыняцце калізій, якія паўстаюць, згуртоўваюць людзей, вакол яго фарміруецца стрыжань нацыі, пад яго кіраўніцтвам краіна набірае сілу і ўпэўнена займае годнае месца ў сусветнай супольнасці» (з кнігі «Наш прэзідэнт»).


Да найважнейшых («прарыўных») рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, што вызначылі эфектыўнае развіццё сучаснай Беларусі, вучоныя адносяць:

- рашэнне аб неабходнасці максімальна захаваць эканоміку Беларусі, якая дасталася нам ад Савецкага Саюза, і на яе базе ўжо ў незалежнай краіне развіваць прамысловы патэнцыял, сельскую гаспадарку, сферу паслуг;
- захаванне калектыўных гаспадарак; прыняцце Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі; стварэнне аграгарадкоў;
- падтрымку вытворчасці высокатэхналагічных вырабаў: касмічнай і камп'ютарнай тэхнікі, аптычных вырабаў, лятальных апаратаў;
- фарміраванне энергетычнай незалежнасці рэспублікі;
- падтрымку фундаментальных і прыкладных даследаванняў, развіццё акадэмічнай, універсітэцкай і галіновай навукі, навуковых даследаванняў у галіне космасу;
- сістэмны клопат пра сем'і, маці, дзяцей;
- захаванне гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа і інш.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія менавіта дзеянні Прэзідэнта стаялі за кожным «прарыўным» рашэннем.*
2. *Якое з пералічаных вышэй рашэнняў Прэзідэнта, на ваш погляд, з'яўляецца самым значным? Сваю думку абгрунтуйце.*

вы, забяспечыць паспяховае сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі, зрабіць яе пазнавальнай і аўтарытэтнай удзельніцай міжнародных працэсаў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка — не толькі юрыдычны, але і фактычны лідар беларускай дзяржавы, які карыстаецца вялікай падтрымкай насельніцтва краіны.



4. Рэферэндумы 2004 і 2022 гг. На рэспубліканскім рэферэндуме 17 кастрычніка 2004 г. на разгляд беларускага народа было вынесена адно пытанне: «Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А. Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзідэнта і ці прымаеце частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: „Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні“?» У такой фармулёўцы артыкул 81 дазваляў абірацца на пасаду Прэзідэнта без абмежавання колькасці тэрмінаў.

Рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г.

У галасаванні ўзяло ўдзел 90,28 % выбаршчыкаў. З іх 87,97 % выказаліся ў падтрымку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

Пасля 2004 г. Прэзідэнт неаднаразова ўзнімаў пытанне наконт новай канстытуцыйнай рэформы, тлумачачы сваю ініцыятыву патрабаваннямі часу. Найбольш грунтоўна яна была анансаваная Кіраўніком дзяржавы падчас спробы дзяржаўнага перавароту 2020 г. Адным з галоўных пасылаў Прэзідэнта была рэалізацыя прынцыпу прамой нарады з народам шляхам рэферэндуму і склікання прадстаўнічага сходу.

На VI Усебеларускім народным сходзе (люты 2021 г.) была прынятая рэзалюцыя аб правядзенні канстытуцыйнай рэформы.

Канстытуцыйная рэформа

Створаная Канстытуцыйная камісія распрацавала прапановы па змяненні Канстытуцыі і забяспечыла іх усенароднае абмеркаванне. Было праведзена абмеркаванне прапаноў ва ўсіх працоўных калектывах, кожны грамадзянін Беларусі меў магчымасць выказаць сваю думку. Па праекце новай Канстытуцыі паступіла амаль 5 тыс. водгукаў і прапаноў.

Рэспубліканскі рэферэндум 27 лютага 2022 г.

27 лютага 2022 г. адбыўся чацвёрты рэспубліканскі рэферэндум, дзе на абмеркаванне было вынесена адно пытанне: «Ці прымаеце Вы змены і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?». Удзел у рэферэндуме прынялі 78,63 % грамадзян, якія валодалі выбарчым правам. Станоўча адказалі 82,86 % удзельнікаў.

У новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь былі скарэктаваныя прэамбула і 85 артыкулаў, з'явілася 11 новых артыкулаў, выключаны два. Асноўны Закон дапоўнены раздзелам 3 «Усебеларускі народны сход». У адказ на выклікі сучаснага грамадства ў Канстытуцыі замацаваныя абарона гістарычнай памяці пра подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і абарона традыцыйнага інстытута сям'і як саюзу жанчыны і мужчыны.

Новая рэдакцыя Асноўнага Закона зрабілася яшчэ адным крокам да ўмацавання суверэнітэту дзяржавы. Яна грунтуецца на найважнейшых прын-

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Змены і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, унесеныя па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 2022 г., замацавалі каштоўнасныя арыенціры беларускага грамадства.

• **Імкненне вырашаць найважнейшыя пытанні калектыўна.** Гэтая традыцыя бярэ пачатак ад народных сходаў — веча ў Полацкім княстве.

• **Традыцыйныя сямейныя каштоўнасці.** Трывалая сям'я — аснова моцнай дзяржавы.

• **Здароўе беларускай нацыі** — гэта залог яе ўстойлівага развіцця і росквіту.

• **Узаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы.**

• **Захаванне памяці пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, гераізм і самаадданасць беларускага народа.**

1. *У якіх артыкулах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь знайшлі адлюстраванне пералічаныя каштоўнасці беларускага грамадства?*
2. *«Наша Канстытуцыя дае магчымасць годна жыць, развівацца, адчуваць сябе ў бяспецы, рэалізаваць самыя смелыя планы і пачынанні на роднай зямлі. Так і мае быць у сучаснай дэмакратычнай, па-сапраўднаму дэмакратычнай краіне» (А. Р. Лукашэнка). Абапіраючыся на тэкст Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прывядзіце 2–3 аргументы, якія пацвярджаюць гэтае выказванне.*

цыпах: вяршэнства права, гарантыя правоў чалавека і грамадзяніна, суверэннае права беларускага народа самастойна вызначаць свой лёс і быць паўнапраўным суб'ектам сусветнай супольнасці. Новая рэдакцыя Канстытуцыі — гэта адказ на спробы замаху на дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь з боку заходніх дзяржаў, якія праводзяць санкцыйную палітыку, намагаюцца актыўна ўмяшацца ў ход электаральных працэсаў, а таксама робяць іншыя захады негатыўнага ўздзеяння на нашу краіну з мэтай падпарадкавання сваім інтарэсам.

5. Усебеларускі народны сход. Упершыню Усебеларускі народны сход быў скліканы ў кастрычніку 1996 г. Дэлегатамі сходу былі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны і розных сацыяльных груп, прафесій і ўзростаў. Дэлегаты ўзялі ўдзел у абмеркаванні

I Усебеларускі народны сход

першай 5-гадовай Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 1996–2000 гг. Кіраўнік дзяржавы А. Р. Лукашэнка прадставіў далейшую стратэгію развіцця краіны з акцэнтам на фарміраванне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. На сходзе ўпершыню шырока абмяркоўваўся і праект змен у Канстытуцыю, вынесены пазней на рэспубліканскі рэферэндум. Назва даклада Прэзідэнта «Толькі народ мае права вырашаць свой лёс» зрабілася дэвізам сходу і замацавала стратэгію далейшай дзейнасці Кіраўніка дзяржавы і грамадска-палітычнага развіцця беларускага грамадства.

Пасля 1996 г. Усебеларускі народны сход праводзіўся рэгулярна. На Усебеларускіх народных сходах, якія праходзілі ў 2001, 2006, 2010, 2016, 2021 гг., пазначаліся арыенціры і прыярытэты дзяржавы, зацвярджаліся праграмы развіцця нашай краіны на наступныя пяць гадоў. Лозунгі, пад якімі праходзіў Усебеларускі народны сход, вызна-

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З даклада Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі «Толькі народ мае права вырашаць свой лёс»

«Менавіта на фарміраванне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі нацэленая Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі да 2000 года… Некаторыя яе палажэнні могуць не задавальняць Урад, дзелавыя колы, прамыслоўцаў і г. д. Галоўнае ў тым, што яна задавальняе народ у цэлым і здольная стаць падмуркам кансалідацыі ўсіх пластоў грамадства. Гарантам выканання праграмы з'яўляецца Кіраўнік дзяржавы».

1. *Што такое сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка? У інтарэсах якіх колаў грамадства яна рэалізуецца?*
2. *Што Кіраўнік дзяржавы лічыў галоўным крытэрыем ацэнкі Праграмы развіцця рэспублікі да 2000 г.?*
3. *Як вы лічыце, чаму сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка можа стаць падмуркам кансалідацыі ўсіх пластоў грамадства?*

чалі сэнс і асноўныя кірункі маючых адбыцца пераўтварэнняў:

- 2001 г. *«За моцную і квітнеючую Беларусь»*;
- 2006 г. *«Дзяржава для народа»*;
- 2010 г. *«Наш гістарычны выбар — незалежная, моцная і квітнеючая Беларусь»*;
- 2016 г. *«Разам — за моцную квітнеючую Беларусь!»*.

VI Усебеларускі народны сход праходзіў у складаных грамадска-палітычных умовах, якія былі выкліканыя спробай дзяржаўнага пераварота ў 2020 г. Ён адбыўся ў лютым 2021 г. пад лозунгам *«Адзінства! Развіццё! Незалежнасць!»*. На шматлікіх пляцоўках абмяркоўваліся актуальныя для Рэспублікі Беларусь пытанні: стабільнасць у грамадстве, рост дабрабыту грамадзян, мадэрнізацыя эканомікі, пераход да новага тэхналагічнага ўкладу, павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі, стварэнне камфортных умоў для жыцця, працы і самарэалізацыі чалавека. У выніку было прынятае рашэнне аб неабходнасці ўнясення змен у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Змяненне статусу Усебеларускага народнага сходу

Згодна са зменамі і дапаўненнямі, унесенымі ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 27 лютага 2022 г., статус Усебеларускага народнага сходу змяніўся — ён зрабіўся канстытуцыйным органам. Былі сфармуляваныя нормы, што вызначылі яго статус, парадак фарміравання і паўнамоцтвы.

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, прынятай у 2022 г., *Усебеларускі народны сход* — вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, які вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы і забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду.

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (2022 г.)

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу з'яўляюцца:

• Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

• Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў у сувязі з заканчэннем тэрміну яго знаходжання на пасадзе або датэрмінова ў выніку яго адстаўкі;

• прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;

• прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў;

• прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці.

Прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці на Усебеларускі народны сход абіраюцца ад кожнай вобласці і г. Мінска ў парадку, вызначаным законам.

Найбольшая колькасць дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу складае 1200 чалавек.

Тэрмін паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу складае пяць гадоў.

1. *Хто можа быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу?*
2. *Абапіраючыся на артыкул Канстытуцыі, аргументуйце меркаванне: «Усебеларускі народны сход — інстытут дэмакратыі ў Рэспубліцы Беларусь».*
3. *Дакажыце, што дэлегаты Усебеларускага народнага сходу прадстаўляюць усё беларускае грамадства.*

Усебеларускі народны сход:

- зацвярджае асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, ваенную дактрыну, канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;
- дае абавязковыя для выканання даручэнні дзяржаўным органам і службовым асобам, атрымлівае інфармацыю ад дзяржаўных органаў і службовых асоб;
- заслухоўвае справаздачу Прэм'ер-міністра аб выкананні праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;
- усталёўвае дзяржаўныя святы і святочныя дні;
- ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, устаноўленыя Канстытуцыяй і законам.

Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу

Перыядычнасць пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу — не радзей чым адзін раз на год. У перыяд паміж пасяджэннямі аператыўнае вырашэнне пытанняў забяспечваецца Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу.

Усебеларускі народны сход стаіць вышэй за ўсе галіны ўлады. Ён прымае рашэнні, якія з'яўляюцца абавязковымі для выканання і могуць адмяняць прававыя акты, іншыя рашэнні дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія супярэчаць інтарэсам дзяржаўнай бяспекі, за выключэннем актаў судовых органаў.

VII Усебеларускі народны сход

У красавіку 2024 г. адбылося пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу ў новым канстытуцыйным статусе. Яно прайшло пад лозунгам *«Час выбраў нас!»*. Падчас работы дэлегатамі быў абраны Старшыня Усебеларускага народнага сходу — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, намеснікам Старшыні — А. М. Касінец, а таксама пастаянна дзеючы Прэзідыум у складзе 13 чалавек.



Дэлегаты зацвердзілі *Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь* і *Ваенную дактрыну Рэспублікі Беларусь* — асноватворныя дакументы, якія рэгламентуюць падыходы да забеспячэння ўласнай бяспекі ў розных сферах з улікам геапалітычных змен у свеце.

Усебеларускі народны сход — нацыянальная форма беларускага народаўладдзя, наша ўнікальная мадэль развіцця грамадзянскай супольнасці. Яна афармілася ў суверэннай Беларусі, але заснаваная на векавых традыцыях народаўладдзя беларускага народа. Усебеларускі народны сход у XXI ст. даказаў сваю эфектыўнасць і запатрабаванасць грамадствам. Ён паляпшае ўзаемадзеянне паміж дзяржавай і грамадствам, дазваляе максімальна ўлічваць баланс інтарэсаў розных сацыяльных груп.

За гады незалежнасці ў Рэспубліцы Беларусь пабудаваная нацыянальная мадэль дэмакратыі, якая спалучае ў сабе прэзідэнцкую рэспубліку як форму праўлення і прамы ўдзел беларускага народа ў прыняцці найважнейшых дзяржаўных рашэнняў. Інстытут прэзідэнцтва дазволіў зрабіць дзяржаўны суверэнітэт Беларусі рэальным. Знешняя і ўнутраная палітыка краіны вызначаецца Канстытуцыяй, а не чужымі дырэктывамі. Рэспубліка Беларусь сёння — у поўным сэнсе нацыянальная незалежная дзяржава. Усебеларускі народны сход — унікальная форма народаўладдзя. Ён дазваляе максімальна ўлічваць баланс інтарэсаў розных сацыяльных груп.

калі ў свеце…

1994 г. — правядзенне рэферэндуму ў Кыргызстане. Амаль 90 % тых, хто прагаласаваў, падтрымалі ўмацаванне ўлады Прэзідэнта і стварэнне двухпалатнага парламента

на тэрыторыі Беларусі…

1994 г. — абранне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ахарактарызуйце вынікі рэспубліканскага рэферэндуму 1995 г. Якое значэнне яны мелі для ўмацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і прэзідэнцкай улады?
2. Чым была абумоўленая трансфармацыя Рэспублікі Беларусь з парламенцкай у прэзідэнцкую рэспубліку?
3. Канкрэтызуйце фактамі вывад: «Прэзідэнцкая рэспубліка — гістарычны выбар беларускага народа».
4. Ахарактарызуйце ролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сістэме дзяржаўнага кіравання.
5. Канкрэтызуйце фактамі вывад: «Рэспубліканскія рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь паспрыялі ўмацаванню сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў грамадстве і дзяржаве».
6. Ахарактарызуйце месца Усебеларускага народнага сходу ў грамадска-палітычным жыцці суверэннай Рэспублікі Беларусь. Як змяніўся яго статус у 2022 г.? Пацвердзіце прыкладамі вывад: «Усебеларускі народны сход дазваляе максімальна ўлічваць баланс інтарэсаў розных сацыяльных груп».

§ 45. Эканамічнае развіццё сучаснай Беларусі

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ
ІНФЛЯЦЫЯ
УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД
АГРАГАРАДОК
«ШОКАВАЯ ТЭРАПІЯ»
РЫНАЧНАЯ ЭКАНОМІКА

1. Беларуская мадэль эканамічнага развіцця. Пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспубліка Беларусь сутыкнулася з рэзкім пагаршэннем эканамічных паказчыкаў: ВУП у 1992 г. панізіўся на 9,2 %, у 1993 г. — на 7,6 %, у 1994 г. — на 11,7 %, прамысловая вытворчасць — на 9,2, 9,4 і 14,6 % адпаведна, інвестыцыі ў асноўны капітал — на 29, 15 і 11 % адпаведна. Спад вытворчасці спалучаўся з ростам інфляцыі. Рэальныя даходы насельніцтва за адзін толькі 1992 г. паменшыліся на 19 %.

Палажэнне аб неабходнасці захаваць эканоміку Беларусі і на яе базе ўжо ў незалежнай дзяржаве развіваць прамысловы патэнцыял, сельскую гаспадарку і сферу паслуг зрабілася ключавым тэзісам А. Р. Лукашэнкі ў яго перадвыбарнай прэзідэнцкай праграме.

Пра беларускую мадэль **сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі** было ўпершыню заяўлена ў Асноўных кірунках сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг. Галоўнымі яе характарыстыкамі выступаюць вядучая роля дзяржавы ў эканамічным жыцці і забеспячэнне высокага ўзроўню сацыяльнай абароны грамадзян. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага

Сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка — мадэль эканамічнага развіцця, пры якой дзяржава адыгрывае вызначальную ролю ў рэгуляванні эканамічных працэсаў і фарміраванні ўмоў для забеспячэння патрэб насельніцтва.

Асаблівасці беларускай мадэлі эканамічнага развіцця	
1. Моцная і эфектыўная дзяржаўная ўлада, якая забяспечвае палітычную стабільнасць, сацыяльную справядлівасць і бяспеку	Дзяржаўнае рэгуляванне спрыяе развіццю эканомікі, забяспечвае яе стабільнасць і надзейнасць, а таксама сацыяльныя гарантыі для насельніцтва
2. Роўнасць розных формаў уласнасці	Галоўны крытэрый развіцця эканомікі — эфектыўнасць вядзення гаспадаркі; прыватызацыя выступае не як самамэта, а як сродак пошуку зацікаўленых інвестараў
3. Шматвектарнасць знешнеэканамічнай палітыкі ва ўмовах глабалізацыі гаспадарчых сувязей	Шматвектарная палітыка дазваляе пашырыць гандлёвыя і інвестыцыйныя магчымасці, паменшыць залежнасць ад аднаго рынку
4. Актывізацыя інтэграцыйных працэсаў, перш за ўсё эканамічных, з Расіяй і краінамі СНД	Доступ да расійскага рынку з'яўляецца важным для беларускага экспарту і дапамагае падтрымліваць стабільнасць эканомікі. У рамках ЕАЭС забяспечваюцца свабода руху тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы, правядзенне скардынаванай палітыкі ў ключавых галінах эканомікі
5. Моцная сацыяльная палітыка дзяржавы, інвестыцыі ў здароўе, адукацыю, прафесійнае і культурнае развіццё асобы, а таксама адрасная сацыяльная дапамога	Чалавек — цэнтральны аб'ект эканамічнай палітыкі. Сацыяльныя праграмы дзяржавы ў галіне адукацыі, аховы здароўя, аховы мацярынства і дзяцінства, абароны пажылога насельніцтва, развіцця фізкультуры і спорту складаюць сацыяльны сэнс беларускай мадэлі развіцця

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце фактамі асаблівасці беларускай мадэлі эканамічнага развіцця.

развіцця была замацаваная рашэннямі Усебеларускіх народных сходаў.

Захады па стабілізацыі эканомікі

2. Стратэгічныя кірункі развіцця эканомікі. Распрацаваная з ініцыятывы Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі ў 1994 г. *«Праграма неадкладных мер па выхадзе эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу»* прадугледжвала комплекс радыкальных захадаў, накіраваных на стабілізацыю эканомікі краіны.

Праграма неадкладных захадаў па выхадзе эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу

- Спыненне спаду вытворчасці і падзення жыццёвага ўзроўню народа;
- аздараўленне крэдытнай сістэмы;
- памяншэнне ўзроўню інфляцыі, стабілізацыя нацыянальнай валюты;
- удасканаленне аплаты працы;
- узмацненне дзяржаўнага рэгулявання эканомікі;
- строгі кантроль над прыватнай гаспадарчай дзейнасцю

Як дадзеныя захады маглі паспрыяць выхаду эканомікі з крызісу?

Першыя вынікі з'явіліся ўжо ў 1995–1996 гг.: удалося спыніць спад вытворчасці, пачалі расці рэнтабельнасць прамысловасці, экспарт тавараў і паслуг, памяншалася інфляцыя, расла заработная плата.

Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця

У гэты перыяд беларуская дзяржава апроч вырашэння бягучых праблем перайшла да стратэгічнага планавання развіцця ў сацыяльна-эканамічнай сферы. За аснову было ўзятае планаванне па пяцігодках. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця абмяркоўваліся на Усебеларускіх народных сходах. У кожнай Праграме былі вызначаныя прыярытэты развіцця рэспублікі на бліжэйшыя пяць гадоў.

Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь

Гады	Прыярытэты развіцця
1996–2000 гг.	Экспарт тавараў і паслуг, будаўніцтва жылля, развіццё аграпрамысловага комплексу
2001–2005 гг.	Харчовая бяспека, экспарт, будаўніцтва жылля, развіццё інавацый і прыцягненне інвестыцый
2006–2010 гг.	Інавацыйнае развіццё эканомікі, энерга- і рэсурсазберажэнне, адраджэнне вёскі, павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, развіццё малых гарадоў
2011–2015 гг.	Паляпшэнне інвестыцыйнага і бізнес-клімату, развіццё высокатэхналагічных вытворчасцей, рост экспарту
2016–2020 гг.	Рост канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягненне інвестыцый і інавацыйнае развіццё
2021–2025 гг.	Шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнёр

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У якасці прыярытэтаў развіцця Беларусі ў 2021–2025 гг. былі вызначаныя шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнёр.

Шчаслівая сям'я. Гэта папулярызацыя традыцыйных сямейных каштоўнасцей. Сям'я з дзецьмі павінна стаць у нашым грамадстве не проста сацыяльнай нормай, а ідэалам сямейных адносін.

Моцныя рэгіёны. Маюцца на ўвазе эфектыўная занятасць, дастойныя даходы, высокая мабільнасць, камфорт і бяспека людзей ва ўсякім месцы Беларусі.

Інтэлектуальная краіна. Беларусь — гэта краіна разумных, адукаваных, творчых людзей, здольных здзяйсняць інавацыйныя прарывы і рухацца наперад.

Дзяржава-партнёр. Гэта выбудоўванне празрыстых, адкрытых, даверлівых адносін дзяржавы, грамадства і бізнесу.

1. *Правядзіце аналіз прыярытэтаў развіцця Рэспублікі Беларусь з 1996 да 2025 г. Дакажыце, што прыярытэты развіцця Рэспублікі Беларусь, сфармуляваныя ў кожнай Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, з'яўляюцца лагічным працягам выкананых задач, пастаўленых у папярэдняй Праграме.*
2. *Суаднясіце асноўныя прыярытэты развіцця Беларусі ў 2021–2025 гг. з тэндэнцыямі развіцця сучаснага свету (гл. Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь). Як вы лічыце, на якія выклікі сучаснага грамадства адказваюць прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў згаданы перыяд?*
3. *Якімі, на вашу думку, могуць быць прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў 2026–2030 гг.?*

Вынікі рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі

Якія прыярытэты эканамічнага развіцця сведчаць пра сацыяльны характар беларускай дзяржавы?

Рэалізацыя праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь забяспечвае рост нацыянальнай эканомікі, захаванне палітычнай стабільнасці, павышэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей. Ужо ў 2000 г. у Рэспубліцы Беларусь быў перавышаны ўзровень дакрызіснага 1990 г. у найважнейшых эканамічных паказчыках. Валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва на аснове парытэту (роўнасці) пакупніцкай здольнасці вырас з 15,4 тыс. долараў у 2010 г. да 20,2 тыс. долараў у 2020 г.

Асноўнае значэнне для развіцця эканомікі Беларусі мелі рашэнні Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі, накіраваныя на захаванне эканомікі нашай краіны, якая дасталася нам ад Савецкага Саюза, і развіццё на яе базе сучаснага прамысловага патэнцыялу, сельскай гаспадаркі, сферы паслуг.

Сёння Рэспубліка Беларусь — экспартаарыентаваная дзяржава з развітымі прамысловасцю, сектарам паслуг і сельскай гаспадаркай.

Найважнейшай адметнасцю беларускай эканомікі з'яўляецца яе сацыяльная арыентацыя, якая прадугледжвае недапушчэнне істотнага сацыяльнага расслаення грамадства, падтрыманне на належным узроўні сістэмы сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, адукацыі і культуры. Сацыяльная накіраванасць беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі выяўляецца ў даступнасці асноўных грамадскіх даброт для ўсіх колаў насельніцтва без выключэння. Дзяржава рэгулюе тарыфы на сацыяльна значныя даброты: жыллёва-камунальныя паслугі, тавары і паслугі (транспарт, энерганосьбіты) і г. д.

Развіццё прамысловай вытворчасці

3. Найважнейшыя эканамічныя дасягненні Рэспублікі Беларусь у канцы XX — першай чвэрці XXI ст. Да найважнейшых эканамічных дасягненняў суверэннай Рэспублікі Беларусь можна аднесці дастаткова высокі ўзровень развіцця прамысловай вытворчасці, якая фарміруе больш за чвэрць ВУП Беларусі.

У нашай краіне паспяхова развіваюцца машынабудаванне; вытворчасць прадуктаў харчавання; дрэваапрацоўчая, нафтахімічная і фармацэўтычная галіны прамысловасці; працуюць сотні прадпрыемстваў, якія вырабляюць аўтамабілі і аўтакампаненты, сельскагаспадарчыя машыны і станкі, складаныя прыборы, оптыку, электратэхнічнае абсталяванне, ліфты, бытавую тэхніку і электроніку. Рэспубліка Беларусь уваходзіць у шэраг лідараў сярод сусветных экспарцёраў грузавых аўтамабіляў, трактароў,

дарожна-будаўнічай і камунальнай тэхнікі. Прадукцыю нашых заводаў пастаўляюць больш чым у 65 краін свету.

Мадэрнізацыя эканомікі на інавацыйнай аснове

Беларуская эканоміка развіваецца на інавацыйнай аснове. Зацверджаная Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця прадугледжвае ўвядзенне ў эксплуатацыю новых прадпрыемстваў, мадэрнізацыю рабочых месцаў.

Развіццё ўласнай атамна-энергетычнай праграмы

З мэтай забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны рэспубліка развівае ўласную энергетычную праграму. У 2021–2023 гг. у Беларусі пабудаваная першая атамная электрастанцыя. Дзякуючы БелАЭС наша краіна мае надзейную крыніцу экалагічна чыстай электраэнергіі; пасля яе запуску Беларусь цалкам адмовілася ад імпарту электрычнай энергіі, скараціла аб'ём увозу прыроднага газу.

Забеспячэнне харчовай бяспекі краіны


У глабальным рэйтынгу харчовай бяспекі Беларусь характарызуецца як краіна са спрыяльнымі ўмовамі забеспячэння насельніцтва харчаваннем. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі на душу насельніцтва ў Беларусі адпавядае ўзроўню развітых краін і па многіх пазіцыях перавышае паказчыкі, дасягнутыя ў краінах СНД. Беларусь не толькі цалкам пакрывае ўнутраныя патрэбы ў збожжы, свініне, агародніне, бульбе, раслінных алеях, цукры і яйках, але і трывала ўваходзіць у лік сусветных лідараў па экспарце прадуктаў харчавання.


Развіццё IT-сферы

Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідараў па экспарце IT-паслуг. Мабільныя прыкладанні, створаныя рэзідэнтамі беларускага Парку высокіх тэхналогій, выкарыстоўваюць каля мільярда чалавек больш чым у 190 краінах свету.

Беларусь першая сярод краін СНД ажыццявіла поўны пераход на лічбавае эфірнае вяшчанне і паспяхова завяршыла тэсціраванне сеткі 5G. Рэсурсы апошняй адкрываюць перспектывы для развіцця інавацыйных праектаў: беспілотнага транспарту,

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ









1. Прааналізуйце дыяграмы. На аснове прадстаўленых статыстычных даных зрабіце вывады наконт эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

2. Пра вырашэнне якіх задач, вызначаных у праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, сведчаць прыведзеныя даныя?

канцэпцыі «Разумны горад». У краіне імкліва развіваюцца тэхналогіі на базе штучнага інтэлекту. Беспілотныя лятальныя апараты «Бусел МКР» і «Гексакоптар-1», аснашчаныя найноўшым апаратна-праграмным комплексам айчыннай распрацоўкі,

дапамагаюць выяўляць узгаранні, ахоўваць дзяржаўную мяжу, змагацца супраць браканьераў і злачынцаў, шукаць людзей, якія заблукалі ў лесе.

Эканамічная бяспека

4. Выклікі і пагрозы эканамічнай бяспецы. *Эканамічная бяспека* — гэта стан абароненасці галін і сфер эканомікі ад уздзеяння пагроз, якія перашкаджаюць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю Рэспублікі Беларусь. Яе структурнымі элементамі выступаюць фінансавая, харчовая, экалагічная, вытворчая, навукова-тэхналагічная і інфармацыйна-прававая бяспека.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Абарона ад знешніх пагроз нацыянальнай бяспецы ў эканамічнай сферы забяспечваецца шляхам:

- правядзення шматвектарнай знешнеэканамічнай палітыкі;
- недыскрымінацыйнай інтэграцыі Рэспублікі Беларусь у глабальную эканамічную прастору праз развіццё супрацоўніцтва з міжнароднымі эканамічнымі арганізацыямі і інтэграцыйнымі аб'яднаннямі;
- удзелу ў міжнародных дамовах, накіраваных на скасаванне няроўных умоў у знешнім гандлі;
- умацавання пазіцый нацыянальных таваравытворцаў на знешніх рынках за кошт пашырэння таварнай наменклатуры і геаграфіі экспарту;
- пераарыентацыі экспартных плыняў на рынкі дружалюбных краін, выбудоўвання новых транспартна-лагістычных маршрутаў ва ўмовах увядзення абмежавальных мер асобнымі дзяржавамі або групамі дзяржаў;
- дыверсіфікацыі імпарту сыравінных і энергетычных рэсурсаў;
- імпартазамяшчэння, арыентаванага ў тым ліку на паскоранае развіццё нацыянальных і сумесных высокатэхналагічных вытворчасцей;
- дзяржаўнай інфармацыйна-юрыдычнай падтрымкі суб'ектаў гаспадарання ў прасоўванні прадукцыі на новых рынках збыту і пошуку партнёраў для вытворчай кааперацыі.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце фактамі кірункі абароны Рэспублікі Беларусь ад знешніх пагроз у эканамічнай сферы.

Знешнія і ўнутраныя выклікі і пагрозы

Напачатку 2020-х гг. наша краіна сутыкнулася з многімі знешнімі і ўнутранымі выклікамі і пагрозамі: пандэмія COVID-19, закрытыя межы, гандлёвыя бар'еры і абмежаванні, спроба дзяржаўнага перавароту, эканамічныя санкцыі з боку заходнееўрапейскіх дзяржаў, пагаршэнне ўмоў знешняга гандлю.

У сучасных геапалітычных рэаліях найбольш імавернымі выклікамі і знешнімі пагрозамі ў забеспячэнні эканамічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь застаюцца:

- новая тэхналагічная рэвалюцыя, у аснове якой знаходзяцца эканоміка ведаў, эфектыўнасць выкарыстання чалавечага і навукова-тэхнічнага капіталу, пераход да нанатэхналогій, тэхналогій геннай інжынерыі, вадароднай энергетыкі, тэхналогій штучнага інтэлекту;
- рызыка новага сусветнага фінансавага і эканамічнага крызісу, звязанага са знешнеэканамічнай палітыкай ЗША і іх саюзнікаў, наяўнасцю велізарнага знешняга доўгу ў шэрагу краін;
- абвастрэнне энергетычна-сыравіннай і харчовай праблем у большасці развітых краін і краін, якія развіваюцца, на фоне ўскладнення барацьбы за новыя сыравінныя рынкі і эканамічную прастору — Арктыка, космас, марскія і акіянічныя рэсурсы;
- адсутнасць стабільнай сістэмы міжнароднай эканамічнай бяспекі і адпаведных эфектыўных міжнародных інстытутаў яе забеспячэння.

Ва ўмовах распаду савецкай эканамічнай сістэмы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, па сутнасці, увёў у краіне антыкрызіснае кіраванне, здолеў захаваць эканамічны патэнцыял краіны. Мадэль сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, якая рэалізуецца ў Беларусі, даказала сваю жыццяздольнасць. Поўнай мерай забяспечваецца харчовая бяспека, дынамічна развіваюцца прамысловасць і сфера паслуг. Істотна ўмацаваўся ўзровень энергетычнай бяспекі. Эканоміка паступальна развіваецца, што забяспечвае павышэнне якасці жыцця беларускага народа. Ва ўмовах росту канкурэнцыі ў свеце вызначальнай для Беларусі робіцца стратэгія развіцця, арыентаваная на барацьбу за знешнія рынкі і стымуляванне ўнутранага спажывання.

калі ў свеце…

2022 г. — амаль 258 млн чалавек у 58 краінах зазналі вострую нястачу харчавання (Глабальная справаздача аб харчовых крызісах — 2023)

на тэрыторыі Беларусі…

2023 г. — Беларусь уваходзіць у топ-5 краін-лідараў у экспарце малочнай прадукцыі. Айчынная прадукцыя пастаўляецца ў больш чым 100 краін свету

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ахарактарызуйце беларускую мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прывядзіце канкрэтныя прыклады праяўлення кожнай з яе прыкмет.
2. Складзіце ментальную карту «Дасягненні эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь». Якія фактары, на вашу думку, абумовілі поспехі ў эканамічным развіцці суверэннай Беларусі?
3. Назавіце асноўныя выклікі і знешнія пагрозы ў забеспячэнні эканамічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Якія асноўныя кірункі абароны нацыянальнай бяспекі краіны ад знешніх пагроз у эканамічнай сферы?
4. У верасні 2022 г. А. Р. Лукашэнка адзначыў: «Нават ва ўмовах беспрэцэдэнтнага санкцыйнага ціску Беларусь паспяхова развіваецца. Асабліва гэта датычыцца традыцыйных для нас галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Мы здолелі пераарыентаваць экспарт, займаемся імпартазамяшчэннем, павялічылі пастаўкі ў Расію, Кітай і іншыя краіны». Прывядзіце доказы паспяховай рэалізацыі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, абапіраючыся на факты, прыведзеныя ў тэксце параграфа.
5. У чым заключаецца пераемнасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця з савецкай сацыяльна-эканамічнай сістэмай?
6. Якія эканамічныя дасягненні нашай краіны, на вашу думку, могуць быць прадметам гонару беларускага народа? Падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю пра іх.

§ 46. Сацыяльная палітыка ў сучаснай Беларусі

САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА
САЦЫЯЛЬНА АРЫЕНТАВАНАЯ ЭКАНОМІКА СІСТЭМА АДУКАЦЫІ
САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА
АХОВА ЗДАРОЎЯ
МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА

Сацыяльна арыентаваная дзяржава

1. Рэспубліка Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава. У аснове сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь ляжыць клопат пра чалавека і яго дабрабыт. У адпаведнасці з Канстытуцыяй чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы; кожны мае права на годны ўзровень жыцця, у тым ліку на дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў.

Прыярытэты сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка вызначыў галоўную стратэгічную мэту сацыяльнай палітыкі — павышэнне жыццёвага ўзроўню беларускага народа.


У суверэннай Беларусі распрацоўваюць і рэалізоўваюць дзяржаўныя праграмы, накіраваныя на развіццё аховы здароўя, адукацыі, будаўніцтва жылля і інш. («Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Будаўніцтва жылля», «Дарогі Беларусі» і інш.).

Рэалізацыя сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь

Наша рэспубліка займае адну з першых пазіцый сярод краін СНД па забяспечанасці насельніцтва жыллём: на 2024 г. яна склала 30,4 м^2 на аднаго жыхара (для параўнання: у Расіі — 28,8 м^2 на аднаго чалавека, у Казахстане — 23,9 м^2). Ад 1991 да 2024 г. суверэнная Беларусь павялічыла свой жыллёвы фонд практычна ў 1,5 раза.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ





У Рэспубліцы Беларусь рэалізуецца шэраг праграм, што прадугледжваюць дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу людзям, якім патрэбная асаблівая сацыяльная абарона: малазабяспечаным грамадзянам, сем'ям, якія выхоўваюць малалетніх дзяцей, людзям старэйшага ўзросту і інвалідам.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю пра дзяржаўныя праграмы Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на выдзяленне адраснай сацыяльнай дапамогі розным катэгорыям грамадзян.*
2. *Даведайцеся ад сваіх бацькоў, якія сацыяльныя выплаты атрымлівае ваша сям'я.*

Узаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваная ўзаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы: дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы; грамадзянін адказны перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго Канстытуцыяй. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь павінен праяўляць сацыяльную адказнасць, рабіць пасільны ўнёсак у развіццё грамадства і дзяржавы.

Задачы і прынцыпы нацыянальнай сістэмы адукацыі

2. Палітыка дзяржавы ў галіне адукацыі і аховы здароўя. За гады суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь сфарміравалася нацыянальная сістэма адукацыі, якая дазваляе рэалізаваць канстытуцыйнае права грамадзян на атрыманне адукацыі. Адукацыйныя

адносіны рэгулюе Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Галоўныя задачы сістэмы адукацыі

Ва ўстановах адукацыі рэалізуецца прынцып інклюзіі, згодна з якім роўны доступ да атрымання адукацыі маюць усе навучэнцы з улікам разнастайнасці індывідуальных адукацыйных патрэб і індывідуальных магчымасцей кожнага.

Узроўні асноўнай адукацыі

У Рэспубліцы Беларусь рэалізуецца прынцып «адукацыя праз усё жыццё». Асноўная адукацыя ўключае дашкольную, агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і навукова арыентаваную.

Кожнае дзіця ва ўзросце ад 1 да 6 гадоў мае магчымасць атрымліваць якасную бясплатную дашкольную адукацыю. Дзіцячыя дашкольныя ўстановы наведваюць каля 90 % дзяцей, гэта адзін з найвышэйшых узроўняў ахопу малых дашкольнай адукацыяй сярод краін СНД. 100 % дзяцей 5-гадовага ўзросту ахопленыя падрыхтоўкай да школы.

Сучасны чалавек павінен няспынна вучыцца. Ці згодныя вы з гэтым меркаваннем? Сваю думку растлумачце.

Агульная сярэдняя адукацыя ў краіне з'яўляецца абавязковай. Паспяхова скончыўшы базавую школу (I–IX класы), маладыя людзі маюць магчымасць працягнуць навучанне ў каледжах, дзе адначасова атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю і прафесійную падрыхтоўку. У каледжах краіны ажыццяўляецца падрыхтоўка па 200 прафесіях на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі, па 200 спецыяльнасцях на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Агульную сярэднюю адукацыю можна атрымаць і ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, дзе ў X–XI класах уведзена профільнае навучанне: навучэнцы могуць вывучаць асобныя вучэбныя прадметы на павышаным узроўні. У старшых класах адкрытыя таксама класы прафесійнай накіраванасці. Выпускнікі гэтых класаў маюць магчымасць паступаць у ВНУ на зацверджаны пералік спецыяльнасцей без экзаменаў.

Вышэйшая адукацыя ў рэспубліцы з'яўляецца прэстыжнай і даступнай. Паводле колькасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў на 10 тыс. насельніцтва Беларусь з'яўляецца адным з лідараў у Еўропе і свеце. Выпускнікам гарантуецца атрыманне першага рабочага месца шляхам размеркавання. Маладыя спецыялісты, што працуюць па размеркаванні, маюць шэраг сацыяльных гарантый.

У развіцці сістэмы вышэйшай адукацыі найважнейшым прынцыпам з'яўляецца інтэграцыя адукацыі, навукі і вытворчасці. На прадпрыемствах рэспублікі, у інстытутах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дзейнічаюць філіялы кафедраў устаноў вышэйшай адукацыі. У іх працуюць навукова-тэхналагічныя паркі, галіновыя лабараторыі, студэнцкія навукова-даследчыя аб'яднанні. Для забеспячэння сувязі ўстаноў вышэйшай адукацыі з заказчыкамі кадраў у ВНУ арганізаваны прыём абітурыентаў па мэтавым накіраванні ад прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый.



Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Г. Мінск

У краіне створаная сістэма падтрымкі таленавітай і адоранай моладзі. Па ініцыятыве А. Р. Лукашэнкі ад 1996 г. функцыянуюць спецыяльныя фонды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. У 2021 г. створаны Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Штогод у ім праходзяць навучанне звыш 1500 навучэнцаў па 15 сучасных кірунках, сярод іх «Авіякасмічныя тэхналогіі», «Біятэхналогіі», «Нанаіндустрыя і нанатэхналогіі» і інш.

Беларуская адукацыя запатрабаваная і ў іншых краінах. У 2010 г. у нашай краіне навучалася каля 10 тыс. замежных грамадзян, у 2025 г. — больш за 35 тыс. са 110 дзяржаў.

Права на ахову здароўя

Канстытуцыя гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на ахову здароўя, у тым ліку на бясплатнае лячэнне за кошт дзяржаўных сродкаў у парадку, устаноўленым законам. Пры гэтым грамадзяне мусяць клапаціцца пра захаванне ўласнага здароўя.

Гэты абавязак прадугледжаны Канстытуцыяй. Дзяржава стварае ўмовы для даступнага ўсім грамадзянам медыцынскага абслугоўвання.

Для забеспячэння канстытуцыйных гарантый на ахову здароўя грамадзян прынцыпова важнае значэнне мела рашэнне Кіраўніка дзяржавы аб захаванні бюджэтнага фінансавання аховы здароўя. Наша рэспубліка — адна з нямногіх краін постсавецкай прасторы і еўрапейскага рэгіёна, дзе яно захавалася. На забеспячэнне сістэмы аховы здароўя з дзяржаўнага бюджэту выдзяляецца больш за 4 % ВУП, што адпавядае рэкамендацыям Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і прадугледжана Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Беларуская медыцына ў свеце

Наша краіна ўваходзіць у лік сусветных лідараў паводле ўзроўню развіцця медыцыны і аховы здароўя. Дзеючая сістэма дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў дазваляе аказваць медыцынскую дапамогу ў роўнай ступені гарадскому і вясковаму насельніцтву.

Прыярытэты і асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі на пленарным пасяджэнні, прысвечаным урачыстаму адкрыццю 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ

«Наша дзяржава ўвайшла ў лік сусветных лідараў паводле ўзроўню развіцця аховы здароўя і медыцыны. Кожны грамадзянін незалежна ад даходаў мае магчымасць бясплатна атрымаць усякі від медыцынскай дапамогі, у тым ліку самай высокатэхналагічнай».

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце топ-5 дасягненняў сучаснай беларускай медыцыны. Аргументуйце свой выбар.*
2. *Досвед беларускай сістэмы аховы здароўя аказаўся эфектыўны ва ўмовах пандэміі COVID-19. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю аб перавагах беларускай медыцыны ў барацьбе з пандэміяй.*

адлюстраваныя ў Стратэгіі навукова-тэхнічнага і інавацыйнага развіцця аховы здароўя Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 гг. і на перыяд да 2040 г.

Арганізацыя медыцынскай дапамогі маці і дзецям

Галоўнай мэтай сістэмы аховы здароўя краіны выступае фарміраванне здаровай нацыі, захаванне здароўя насельніцтва. Вялікая ўвага ўдзяляецца арганізацыі медыцынскай дапамогі маці і дзецям. Рэспубліка займае 25-ю пазіцыю ў рэйтынгу самых камфортных для мацярынства краін свету, апярэдзіўшы многія краіны ЕС і нават ЗША, якія займаюць 33-е месца.

Беларускія медыкі выконваюць самыя складаныя аперацыі па мікрахірургіі вока, пратэзаванні суставаў, перасадцы печані, нырак, касцявога мозгу, сэрца і лёгкіх і іншыя высокатэхналагічныя аперацыі.

Медыцынскія паслугі замежным грамадзянам

Магчымасць атрымаць якасную медыцынскую дапамогу і прайсці рэабілітацыю прываблівае замежных грамадзян. У 2024 г. беларускія дактары аказалі медыцынскія паслугі больш чым 160 тыс. замежнікаў са 159 краін, у тым ліку Расіі, Кітая, Казахстана, Узбекістана, Туркменістана, Літвы, Латвіі, Ізраіля, Босніі і Герцагавіны, Сербіі, ЗША, Грузіі.

Права грамадзян Рэспублікі Беларусь на ахову здароўя забяспечваецца таксама развіццём фізічнай культуры і спорту, захадамі па аздараўленні навакольнага асяроддзя, магчымасцю карыстання аздараўленчымі ўстановамі, удасканаленнем аховы працы.

Канстытуцыйнае замацаванне дзяржаўнай падтрымкі інстытута сям'і

3. Дзяржаўная падтрымка інстытута сям'і. У Рэспубліцы Беларусь падтрымка інстытута сям'і з'яўляецца нацыянальным прыярытэтам. У Асноўным Законе дзяржавы замацавана, што шлюб як саюз жанчыны і мужчыны, сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства знаходзяцца пад абаронай дзяржавы; сужэнцы маюць роўныя правы ў шлюбе і сям'і; дзяржава забяспечвае прыярытэт выхавання дзяцей у сям'і, аказвае падтрымку сем'ям з дзецьмі, дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў.

У 1998 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі былі зацверджаны «Асноўныя кірункі дзяржаўнай сямейнай палітыкі». За тры дзесяцігоддзі сфарміравалася сістэма дзяржаўнай дапамогі сям'і.

Падтрымка шматдзетных сем'яў

У краіне рэалізуецца шэраг захадаў, накіраваных на падтрымку шматдзетных сем'яў. Гэта выплаты дапамог у сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей, прадастаўленне сямейнага капіталу шматдзетным сем'ям, сацыяльнае абслугоўванне сем'яў з дзецьмі, дзяржаўная падтрымка ў будаўніцтве жылля.

Дапамогі па доглядзе дзіцяці

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» дапамогу па доглядзе дзіцяці выплачваюць да дасягнення ім 3 гадоў. Гэта самы працяглы адпачынак сярод краін свету. На заканадаўчым узроўні сям'і дадзена права самастойна вызначаць, хто з працуючых бацькоў будзе ажыццяўляць догляд дзіцяці і знаходзіцца ў такім адпачынку. Усталяваныя памеры аднаразовых дапамог: пры нараджэнні першага дзіцяці — 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14.

Праграма «Сямейны капітал»


Падтрымка шматдзетных сем'яў ажыццяўляецца ў рамках праграмы «Сямейны капітал», якая дзейнічае ад 2015 г. і прадугледжвае аднаразовую выдачу сем'ям безнаяўных грашовых сродкаў пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга і наступнага дзіцяці. Права на распараджэнне сямейным капіталам даецца па заканчэнні 18 гадоў ад даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем (усынаўленнем, удачарэннем) якога сям'я атрымала права на яго прызначэнне.

У Рэспубліцы Беларусь на дзяржаўным узроўні высока цэняць працу шматдзетнай маці, якая годна выхавала пяць і болей дзяцей: заснаваная дзяржаўная ўзнагарода — ордэн Маці, якім узнагароджаны больш за 13,4 тыс. беларускіх маці.



Ордэн Маці

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



1. *Выкарыстоўваючы ілюстрацыю, разлічыце сярэдні памер дэпазітнага рахунку сямейнага капіталу.*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, у якіх выпадках сямейны капітал можа быць выкарыстаны датэрмінова.*
3. *На якія мэты найчасцей датэрмінова выкарыстоўваюць сямейны капітал?*

Права на працу

4. Рынак працы. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе грамадзянам права на працу як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека, права на выбар прафесіі, роду заняткаў і працы ў адпаведнасці з пакліканнем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэб, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.

Палітыка дзяржавы ў галіне занятасці насельніцтва

Забеспячэнне эфектыўнай занятасці насельніцтва, фарміраванне кадравага патэнцыялу з улікам рэальных патрэб вытворчасці, забеспячэнне сацыяльнай падтрымкі часова не занятага насельніцтва — важныя кірункі сацыяльнай палітыкі рэспублікі.

Дзяржава стварае ўмовы для поўнай занятасці насельніцтва. У 2024 г. увайшла ў сілу новая рэдакцыя Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь». Яго дзеянне накіраванае на стварэн-

не ўмоў для развіцця і падтрымкі высокай матывацыі беспрацоўных да актыўнага пошуку працы і ўзмацненне ролі наймальнікаў на рынку працы.

Узровень беспрацоўя ў нашай краіне — адзін з самых нізкіх у свеце. Адначасова ў Беларусі існуе ўстойлівы попыт на рабочую сілу.

Падтрымка прадпрымальніцкай ініцыятывы

Адным з важных кірункаў палітыкі ў галіне садзеяння занятасці насельніцтва выступае падтрымка прадпрымальніцкай ініцыятывы грамадзян — беспрацоўным аказваюць фінансавую падтрымку на бязвыплатнай і беззваротнай аснове для пачатку прадпрымальніцкай і рамесніцкай дзейнасці, дзейнасці па аказанні паслуг у галіне аграэкатурызму.

Стымуляванне працоўнай мабільнасці

У мэтах садзеяння занятасці беспрацоўных грамадзян і забеспячэння наймальнікаў работнікамі рэалізуюцца захады па стымуляванні працоўнай мабільнасці грамадзян. Пры жаданні беспрацоўнага ажыццяўляецца садзеянне ў перасяленні яго і членаў яго сям'і на новае месца жыхарства і працы.

Дзяржаўная маладзёжная палітыка

5. Асновы маладзёжнай палітыкі. Важным кірункам сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы з'яўляецца падтрымка моладзі. З ініцыятывы Кіраўніка дзяржавы распрацаваная дзяржаўная маладзёжная палітыка — сістэма сацыяльных, эканамічных, палітычных, арганізацыйных, прававых і іншых захадаў, накіраваных на падтрымку маладых грамадзян, іх станаўленне і развіццё, найбольш поўную рэалізацыю іх патэнцыялу ў інтарэсах усяго грамадства.

У Беларусі маладых людзей актыўна ўцягваюць у прыняцце і рэалізацыю кіраўніцкіх рашэнняў, што датычацца жыцця і дзейнасці моладзі, абароны яе правоў і інтарэсаў. Пры Савеце Рэспублікі і Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь дзейнічаюць маладзёжныя саветы.

Пры Міністэрстве адукацыі дзейнічае кансультацыйна-дарадчы орган — Савет маладых вучоных.



Кірункі маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь

Садзеянне рэалізацыі права моладзі на працу

- Забеспячэнне гарантаванага першага працоўнага месца маладым спецыялістам;
- працаўладкаванне студэнтаў і навучэнцаў;
- падтрымка руху студэнцкіх атрадаў;
- развіццё сістэмы цэнтраў занятасці і прафарыентацыі моладзі;
- стварэнне неабходных умоў працы, побыту і адпачынку для моладзі, якая працуе на вёсцы і ў малых гарадах (маладым спецыялістам даюць жыллё, стымулююць маладзёжнае прадпрымальніцтва і фермерства)

Падтрымка маладых сем'яў

- Выплата дапамогі маладым сем'ям з дзецьмі;
- выдача субсідый і доўгатэрміновых ільготных крэдытаў маладым сем'ям для будаўніцтва жылля

Сацыяльная падтрымка адоранай моладзі

Маладыя людзі, якія маюць пэўныя дасягненні ў вучобе, спорце, грамадскай дзейнасці, атрымліваюць ільготы пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі, стыпендыі, у тым ліку са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі

Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет

У Рэспубліцы Беларусь створаны Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет, у які ўваходзяць старшыні студэнцкіх саветаў установ вышэйшай адукацыі краіны.

Валанцёрскі рух

У Беларусі развіваецца маладзёжны валанцёрскі рух — добраахвотная дзейнасць, якая ажыццяўляецца на бязвыплатнай аснове і накіраваная на аказанне дапамогі розным сацыяльным групам. Удзельнікі валанцёрскіх атрадаў навучаюць равеснікаў асновам здаровага ладу жыцця, аказваюць дапамогу пажылым людзям і інвалідам, удзельнічаюць у правядзенні адукацыйных акцый, мерапрыемстваў.

Рэспубліка Беларусь, нягледзячы на выклікі звонку, нязменна рушыць абраным курсам, застаецца сацыяльна арыентаванай дзяржавай, праводзіць актыўную сацыяльную палітыку, накіраваную на павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва. Галоўнай мэтай сацыяльнай палітыкі выступае наданне кожнаму працаздольнаму чалавеку магчымасці сваёй працай і прадпрымальнасцю стварыць свой сямейны дабрабыт, а непрацаздольным і незаможным грамадзянам — надзейнай сацыяльнай абароны.

Рэспубліка Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідараў паводле ўзроўню развіцця аховы здароўя і медыцыны. Наша краіна — адна з нямногіх краін постсавецкай прасторы і еўрапейскага рэгіёна, дзе захаваная бюджэтная сістэма фінансавання аховы здароўя.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
У Францыі аплатны адпачынак па доглядзе дзіцяці складае 4 месяцы	У Рэспубліцы Беларусь аплатны адпачынак па доглядзе дзіцяці складае 3 гады

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце прыкметы сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Дакажыце, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца сацыяльна арыентаванай дзяржавай.
2. Што значыць прынцып «адукацыя праз усё жыццё»?
3. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы здароўя.
4. Складзіце тэзісны план адказу пра сацыяльную палітыку Рэспублікі Беларусь, накіраваную на падтрымку інстытута сям'і.
5. Прааналізуйце сацыяльную палітыку беларускай дзяржавы па спрыянні занятасці насельніцтва. Якія вынікі яе рэалізацыі?
6. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Канкрэтызуйце іх фактамі.

§ 47. Сучаснае беларускае грамадства

ІДЭАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ
РЭФЕРЭНДУМ
КАНФЕСІЯ
ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ
ПАРТЫЯ НАЦЫЯ
ГРАМАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі

1. Міжнацыянальныя адносіны. Большасць сучасных дзяржаў з'яўляюцца поліэтнічнымі. Асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі сталі прычынай з'яўлення на нашых землях прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей. Згодна з вынікамі перапісу 2019 г., у Беларусі жывуць прадстаўнікі 130 нацыянальнасцей.

Наяўныя звесткі дазваляюць казаць пра дынаміку нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі — паступова расце колькасць людзей, якія лічаць сябе беларусамі: у 1999 г. такіх было 81,2 %, у 2009 г. — 83,7 %, у 2019 г. — 84,9 %; доля прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, за выключэннем кітайцаў, туркменаў і таджыкаў, за прайшоўшыя два дзесяцігоддзі паменшала.

Міжэтнічныя канфлікты зрабіліся часткай палітычнага жыцця многіх сучасных дзяржаў. У шэрагу выпадкаў яны выступаюць сродкам «каляровых рэвалюцый», нагодай для знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў і ціску на іх. Рэспубліка Беларусь — адна з нямногіх рэспублік былога Савецкага Саюза, на тэрыторыі якой не было зафіксавана ніводнага міжнацыянальнага канфлікту.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У лістападзе 1992 г. у нашай краіне быў прыняты Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь». Згодна з ім пад нацыянальнымі меншасцямі разумеюцца асобы, якія стала пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, маюць яе грамадзянства, якія паводле свайго паходжання, мовы, культуры або традыцый адрозніваюцца ад асноўнага насельніцтва рэспублікі.

У адпаведнасці з Законам:

- ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання сваёй нацыянальнай прыналежнасці, а таксама да даказвання нацыянальнай прыналежнасці або адмовы ад яе;
- грамадзяне Рэспублікі Беларусь незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці карыстаюцца абаронай дзяржавы на роўных падставах;
- усякія дзеянні, накіраваныя на дыскрымінацыю па нацыянальнай прыкмеце, стварэнне перашкод у рэалізацыі нацыянальнымі меншасцямі сваіх правоў, распальванне міжнацыянальнай варожасці, цягнуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам;
- грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права карыстацца іх нацыянальнай мовай;
- помнікі гісторыі і культуры нацыянальных меншасцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца часткай культуры Рэспублікі Беларусь і ахоўваюцца дзяржавай у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

1. *Якія гістарычныя перадумовы шматнацыянальнага складу насельніцтва Беларусі?*
2. *На аснове фрагмента Закона сфармулюйце ўмовы міжнацыянальнага міру і згоды ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь.*

Дзяржаўная палітыка ў сферы міжнацыянальных адносін

Адным з найважнейшых фактараў стабільнасці міжнацыянальных адносін выступае паслядоўная палітыка беларускай дзяржавы ў гэтай сферы грамадскага жыцця. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе грамадзянам, якія адносяць сябе да нацыянальных меншасцей, роўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы і свабоды. Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, а абраза нацыянальнай годнасці пераследуецца законам.

Каардынацыяй дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы міжнацыянальных і міжканфесійных

адносін у Беларусі, а таксама ажыццяўленнем дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне займаецца Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей і яго апарат, які знаходзіцца ў падпарадкаванні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Развіццё мовы і культуры нацыянальных меншасцей

Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у дачыненні да нацыянальных меншасцей грунтуецца на прынцыпах культурнай разнастайнасці і захавання міжнацыянальнай згоды ў беларускім грамадстве. У краіне створаны спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця культуры і мовы нацыянальных меншасцей, дзейнасці іх арганізацый, устаноў культуры і адукацыі. На 1 снежня 2024 г. у Беларусі было зарэгістравана 140 нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў прадстаўнікоў 25 нацыянальнасцей. Пры аб'яднаннях створаныя творчыя калектывы, працуюць нядзельныя школы па вывучэнні мовы і культуры сваёй гістарычнай радзімы. Пачынаючы з 1996 г. раз на 2 гады ў г. Гродна праводзіцца рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Яго галоўная ідэя — паказаць самабытнасць народаў, што насяляюць Беларусь, іх культурныя каштоўнасці.



Фестываль нацыянальных культур. Г. Гродна. 2024 г.

2. Канфесійная палітыка дзяржавы. Рэспубліка Беларусь — шматканфесійная дзяржава, маральным падмуркам якой з'яўляюцца хрысціянскія каштоўнасці. Як і шматнацыянальнасць, шматканфесійнасць абумоўлена асаблівасцямі гістарычнага развіцця Беларусі.

Дзяржаўная канфесійная палітыка

Канстытуцыя і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» сцвярджаюць роўнасць усіх рэлігій і веравызнанняў перад законам. Пры гэтым дзяржава не ўмешваецца ў пытанні асабістага веравызнання, ва ўнутраныя справы канфесій; кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый абмяжоўваецца сферай выканання імі заканадаўства рэспублікі.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Па стане на 1 студзеня 2024 г. у Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 25 канфесій і рэлігійных кірункаў.

Беларуская праваслаўная царква	15 епархій, 1737 праваслаўных прыходаў
Рымска-каталіцкая царква	4 епархіі, 500 абшчын
Пратэстанцкая царква	1038 абшчын
Грэка-каталіцкая царква	16 абшчын

У Рэспубліцы Беларусь таксама зарэгістраваныя 34 рэлігійныя абшчыны старабрадцаў, 24 мусульманскія абшчыны, 51 іўдзейская рэлігійная абшчына.

1. *Якія гістарычныя перадумовы шматканфесійнага складу насельніцтва Беларусі?*
2. *Якія, на вашу думку, умовы міжканфесійнага міру і згоды ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь?*

Канфесійная палітыка беларускай дзяржавы скіраваная на падтрымку і ўмацаванне міжканфесійнага міру і згоды ў беларускім грамадстве, аб'яднанне намаганняў розных груп вернікаў вакол канструктыўных, стваральных мэт, развіццё ўзаемадзеяння з гістарычна традыцыйнымі канфесіямі. У першую чаргу гэта датычыцца Беларускай праваслаўнай царквы, бо духоўныя і культурныя каштоўнасці, якія яна захоўвае, уяўляюць сабой асноватворную частку гістарычнай спадчыны Беларусі і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

У 2003 г. падпісанае Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой. Прыярытэтнымі кірункамі супрацоўніцтва выступаюць фарміраванне асобы чалавека, духоўна-маральнае і патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, садзеянне ў аднаўленні і развіцці гістарычнай і культурнай спадчыны, падтрымка інстытута сям'і, мацярынства і дзяцінства.



Герой Беларусі Мітрапаліт Філарэт (Вахрамееў)

Беларуская дзяржава ў поўнай меры забяспечвае рэалізацыю права на свабоду сумлення, дае

грамадзянам свабоду ў выбары веры або нерэлігійнага светапогляду. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь кожны грамадзянін мае права самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, асобна або супольна з іншымі грамадзянамі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, удзельнічаць у выкананні рэлігійных культаў, абрадаў, не забароненых законам.

У нашай краіне забаронена дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая накіравана супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу, грамадзянскай згоды або звязаная з парушэннем правоў і свабод грамадзян, перашкаджае выкананню грамадзянамі дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў, чыніць шкоду здароўю людзей.

Значэнне каштоўнасных арыентацый у сучасным свеце

3. Каштоўнасныя арыентацыі. Сучасная геапалітычная сітуацыя робіць надзвычай важным пытанне наконт каштоўнасцей грамадства. З аднаго боку, сусветная супольнасць сутыкнулася са спробай

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Супрацоўнікі Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў правялі даследаванне «Каштоўнасны партрэт сучаснага беларускага грамадства» (https://bisr.gov.by). Паводле яго вынікаў вылучаныя дзве групы каштоўнасцей беларусаў: асабова-сямейныя (індывідуальныя) і калектыўныя (дзяржаваўтваральныя). Да самых значных для беларусаў належаць:

Дзяржаваўтваральныя	Індывідуальныя
Мір	Здароўе
Бяспека	Бацькі
Свабода	Душэўны спакой і камфорт
Парадак	Муж (жонка)
Справядлівасць	Дзеці

1. *Якімі асаблівасцямі гістарычнага развіцця нашай краіны, на вашу думку, абумоўлены такія каштоўнасныя прыярытэты беларусаў?*
2. *Як вы лічыце, чаму такія каштоўнасці, як мір, бяспека, свабода, парадак, справядлівасць, аднесены да дзяржаваўтваральных?*

пераацэнкі гістарычнай і культурнай спадчыны цэлых пакаленняў, штучнага супрацьпастаўлення «дэмакратычных» і «традыцыйных» каштоўнасцей, дэфармацыяй гістарычнай памяці — наўмысным і мэтанакіраваным скажэннем гісторыі. З другога боку, вырасла грамадзянская самасвядомасць і цікавасць да ўласнай гісторыі і культуры. Часцей сталі гучаць пытанні: «Куды мы ідзём?», «Якія каштоўнасці нас аб'ядноўваюць?».

Традыцыйныя сямейныя каштоўнасці

Сучаснае беларускае грамадства захоўвае *прыхільнасць да традыцыйных каштоўнасцей*: сям'я як саюз жанчыны і мужчыны, мір, здароўе, дабрабыт сям'і і краіны, душэўны камфорт, імкненне забяспечыць сваім дзецям і ўнукам больш высокія стандарты жыцця. Грамадства адвяргае скажэнне гістарычнай памяці пра подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, навязванне ўсялякіх чужых нормаў і мадэляў паводзін. Гэта атрымала адлюстраванне ў абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Якім чынам традыцыйныя сямейныя каштоўнасці замацаваныя ў Асноўным Законе Рэспублікі Беларусь?

Хрысціянскія каштоўнасці

У іерархіі духоўных каштоўнасцей беларускага народа асаблівае значэнне маюць *хрысціянскія каштоўнасці*: любоў да бліжняга, цярпімасць, выкананне хрысціянскіх запаведзяў. Беларусы ўмеюць дараваць, але ніколі не дапусцяць здрады і падступнасці, заўсёды гатовыя адэкватна адказаць тым, хто прыходзіць да нас, «трымаючы камень за пазухай».

Спалучэнне індывідуальных і грамадскіх каштоўнасцей

Сучасныя беларусы жадаюць, каб дабрабыт пашыраўся не толькі на матэрыяльны бок жыцця, але і на ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Таму *індывідуальныя каштоўнасці беларусаў гарманічна спалучаюцца з грамадскімі* ў дзейнасці, скіраванай на карысць роднай краіны.

Беларусам чужыя яскрава выражаны індывідуалізм і эгаізм, да якіх хіліцца заходняя цывілізацыя. Важнае месца займаюць традыцыі ўзаемадапамогі і супольнай працы. Яшчэ ад часоў старажытнасці беларусы аб'ядноўваліся для вырашэння бытавых

пытанняў (гэтая практыка вядомая пад назвай «талака»), што дазваляла паспяхова пераадольваць цяжкасці.

Працавітасць

Беларускі народ вылучаюць *працавітасць і працаздольнасць*, адказнае стаўленне да справы, гаспадарлівасць і грунтоўнасць. Сучасныя беларусы гатовыя дэманстраваць здольнасць да самарэалізацыі, чакаюць ад дзяржавы забеспячэння роўных стартавых умоў для руху наперад. Пры гэтым наша разуменне правоў чалавека адрозніваецца ад заходняга, дзе правы меншасцей робяцца важнейшыя за правы большасці, дзе індывідуальнае вышэйшае за грамадскае.

Патрыятызм

Важнай каштоўнасцю беларускага грамадства з'яўляецца *патрыятызм*. Для беларусаў патрыятызм — гэта перш за ўсё любоў да сваёй краіны, яе гісторыі, культуры, мовы і актыўная дзейнасць, стваральная праца на карысць краіны.



Карват Уладзімір Мікалаевіч
(1958–1996 гг.)
Герой Беларусі. Падпалкоўнік авіяцыі. 23 мая 1996 г. адвёў самалёт, які падаў, ад населенага пункта, ахвяраваўшы жыццём



Нічыпарчык Андрэй Уладзіміравіч
(1987–2021 гг.)
Герой Беларусі. Ваенны лётчык, маёр. 19 мая 2021 г. адвёў самалёт, які падаў, ад населенага пункта, ахвяраваўшы жыццём



Куканенка Мікіта Барысавіч
(1998–2021 гг.)
Герой Беларусі. Ваенны лётчык, лейтэнант. 19 мая 2021 г. адвёў самалёт, які падаў, ад населенага пункта, ахвяраваўшы жыццём

1. Як вы лічыце, якія каштоўнасці, матывы вызначылі ўчынкі гэтых герояў?
2. Як бы вы адказалі на пытанне: якія галоўныя каштоўнасці чалавека?

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Другая нядзеля мая

1. *Якія гістарычныя падзеі прадвызначылі гэтыя дзяржаўныя святы?*
2. *Якія каштоўнасныя арыенціры беларускага народа адлюстроўваюць дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь?*

У 2020 г. беларускі народ сутыкнуўся са спробай дзяржаўнага перавароту з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам і зразумеў, як лёгка страціць мір і бяспеку. У выніку менавіта гэтыя каштоўнасці зрабіліся прыярытэтнымі для насельніцтва. Наша адметная рыса — міралюбства.

Свабода і сацыяльная адказнасць

Беларусы цэняць *свабоду*. Аднак свабода — гэта не ўсёдазволенасць. Здаровае грамадства — калектыў грамадзян з высокаразвітой сацыяльнай адказнасцю, якія разумеюць, што акрамя правоў яны маюць яшчэ і абавязкі.

Гістарычная памяць

Важная каштоўнасць беларускага грамадства — *гістарычная памяць*. Асаблівасцю яе для нашага народа з'яўляецца ўзважанае ўспрыняцце гістарычнага мінулага праз прызму Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Унёсак беларускага народа ў Вялікую Перамогу — гэта прадмет нацыянальнага гонару.

Каштоўнасці беларускага грамадства — гэта тое, што сёння аб'ядноўвае розныя пакаленні, падмурак, які дазволіць нашай краіне выстаяць у сучасных геапалітычных умовах.

Аб'ектыўная ацэнка гістарычнай мінуўшчыны

4. Гістарычная палітыка Рэспублікі Беларусь. Асноўнае прызначэнне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі — не дапусціць скажэння і фальсіфікацыі гістарычных падзей на шкоду нацыянальнай самасвядомасці, аўтарытэту нацыі, фарміраваць аб'ектыўныя ацэнкі гістарычнай мінуўшчыны і забяспечваць іх пазітыўнае ўспрыняцце грамадствам.

Беларуская гістарычная палітыка атрымала штуршок да развіцця ў 1995 і 1996 гг., калі грамадзяне краіны падчас рэспубліканскіх рэферэндумаў падтрымалі прынцыповыя падыходы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да дзяржаўнай сімволікі, дзяржаўных моў, святкавання Дня Незалежнасці ў адну з самых знакавых для Беларусі дат у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 3 ліпеня.

Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы

У лютым 2022 г. у Беларусі быў створаны Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта пастаянна дзеючы міжведамасны кансультацыйны і каардынуючы орган па правядзенні адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы гістарычнай памяці.

Канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці

Беларускія гісторыкі распрацавалі Канцэпцыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці. У адпаведнасці з ёю беларуская дзяржаўнасць у працэсе эвалюцыі была рэалізаваная ў дзвюх формах — гістарычнай і нацыянальнай. Полацкае і Тураўскае княствы, Старажытная Русь, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Расійская імперыя — гэта гістарычныя формы дзяржаўнасці на нашых землях, у рамках якіх паступова фарміравалася дзяржаўнасць беларускага народа. У XX ст. яна знайшла рэальнае ўвасабленне ў нацыянальных формах:

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Нарада ў Кіраўніка дзяржавы. 6 студзеня 2022 г.:

«Мы павінны прызнаць, што старонкі айчыннай гісторыі ператварыліся ў інфармацыйнае поле бою. Сёння гістарычная палітыка з'яўляецца для нас стратэгіяй самазахавання ва ўмовах глабальнага перадзелу сфер уплыву ў свеце. Гэта фактар нацыянальнай бяспекі».

А. Р. Лукашэнка

Прэзідэнт паказаў на неабходнасць даць адэкватную ацэнку ўсіх гістарычных перыядаў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку часоў Полацкага і Тураўскага княстваў, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, СССР, выпрацаваць дакладную канцэпцыю ацэнкі падзей і ролі асоб у гісторыі беларускай дзяржавы.

Пасланне беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Сакавік 2023 г.

«<…> Людзі мусяць ведаць, хто нашы героі, выхоўваць на іх прыкладах новыя пакаленні беларусаў. Хатынь, Ола, Боркі, Брэсцкая крэпасць і ўсе месцы трагедыі і подзвігу беларускага народа, народаў СССР павінны зрабіцца месцам паломніцтва і пакланення».

Прэзідэнт даручыў Савету па гістарычнай палітыцы ўкараніць канцэпцыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці ва ўсе сферы жыцця грамадства.

1. *Як вы разумееце меркаванне: «Гістарычная палітыка зрабілася неад'емнай часткай нацыянальнай бяспекі»?*
2. *Чаму сёння важна ўкараніць канцэпцыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці ва ўсе сферы жыцця грамадства?*
3. *Чаму важна фарміраваць і захоўваць гістарычную памяць беларускага народа?*
4. *Пра якія гістарычныя падзеі, на вашу думку, павінен ведаць і памятаць кожны беларус?*

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, Рэспубліка Беларусь.

З мэтай рэалізацыі прынцыпаў гістарычнай палітыкі беларускай дзяржавы і фарміравання аб'ектыўных ацэнак гістарычнай мінуўшчыны ва ўсіх установах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі



Мемарыяльны комплекс «Курган Славы». 3 ліпеня 2025 г.

ўведзена новая гістарычная дысцыпліна — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».

Найважнейшае месца ў гістарычнай палітыцы Рэспублікі Беларусь займае захаванне памяці пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, гераізм і самаадданасць беларускага народа. Згодна з арт. 54 Канстытуцыі захаванне гістарычнай памяці пра гераічную мінуўшчыну беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

5. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі ў сучаснай Беларусі. Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь накіраваная на пабудову дзяржавы з развітой **грамадзянскай супольнасцю**, якая прадугледжвае шырокі ўдзел грамадзян у грамадскім жыцці і прыняцці важных рашэнняў.

Грамадзянская супольнасць — асаблівая сфера грамадскіх адносін, сістэма самастойных і адносна незалежных ад дзяржавы інстытутаў, грамадскіх інтарэсаў, адносін.

Важным механізмам рэалізацыі правоў грамадзян на выказванне сваіх грамадска-палітычных поглядаў і інтарэсаў выступаюць грамадскія аб'яднанні — палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі.

У 1994 г. Вярхоўным Саветам быў прыняты Закон «Аб палітычных партыях», які замацаваў парадак стварэння і дзейнасці палітычных партый.

Умовы дзейнасці палітычнай партыі

Заснавальнікамі палітычнай партыі могуць быць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі ўзросту 18 гадоў, валодаюць выбарчым правам, не абмежаваныя судом у дзеяздольнасці,

не знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Для стварэння палітычнай партыі неабходна не менш за 1000 членаў. Стварэнне ў Беларусі палітычных партый іншых дзяржаў забаронена. Забаронена дзейнасць палітычных партый, мэта якіх — гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу, прапаганда вайны, рэлігійнай, нацыянальнай і расавай варожасці.

Па стане на студзень 2025 г. у Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваныя чатыры палітычныя партыі: Беларуская партыя «Белая Русь», Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі, Камуністычная партыя Беларусі, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, якія ў поўнай меры падтрымліваюць унутраную і знешнюю палітыку дзяржавы.

На нарадзе з кіраўнікамі палітычных партый у лістападзе 2023 г. Кіраўнік дзяржавы вызначыў умовы партыйнага будаўніцтва ў Беларусі: партыі павінны зрабіцца памочнікам улады ў тлумачэнні, прасоўванні і ўдзеле ў рашэннях, якія прымаюцца: «Не змагацца з дзяржавай, а канкурыраваць паміж сабой на ўзроўні праектаў, заканадаўчых ініцыятыў».

Грамадскія арганізацыі

Грамадскія арганізацыі, у адрозненне ад палітычных партый, не ставяць за мэту ўдзел у палітычнай барацьбе за ўладу, але адыгрываюць вялікую ролю ў грамадскім жыцці краіны.

Сярод найбольш значных грамадскіх арганізацый у Беларусі — прафесійныя саюзы, якія бароняць працоўныя, сацыяльна-эканамічныя правы і інтарэсы грамадзян (паляпшэнне ўмоў працы, павышэнне заработнай платы). Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) аб'ядноўвае каля 4 млн чалавек. Прафсаюзы ажыццяўляюць грамадскі кантроль за выкананнем заканадаўства аб працы: выплата заработнай платы, захаванне працоўных гарантый, выкананне наймальнікам калектыўных дамоў; ажыц-

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленні-прэзентацыі аб мэтах, асноўных кірунках дзейнасці і праектах грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь.

цяўляюць на бязвыплатнай аснове прававую дапамогу.

Важную ролю ў грамадскім жыцці краіны адыгрываюць рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні «Белая Русь» і «Беларускі саюз жанчын» (БСЖ), ветэранскія і спартыўныя арганізацыі, самыя масавыя маладзёжныя аб'яднанні — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ) і Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя (БРПА). У 2022 г. апошняя была ўшанаваная высокай узнагародай — спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» — за значны ўнёсак у грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, рэалізацыю сацыяльна значных дзіцячых праектаў і ініцыятыў.

Галоўнымі мэтамі БРСМ з'яўляюцца стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця моладзі, раскрыццё яе творчага патэнцыялу, садзеянне развіццю ў рэспубліцы грамадзянскай супольнасці, заснаванай на патрыятычных і духоўна-маральных каштоўнасцях.

Сучаснае беларускае грамадства з'яўляецца шматнацыянальным і шматканфесійным. Найважнейшай умовай захавання міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды ў рэспубліцы выступае паслядоўная дзяржаўная палітыка ў гэтых пытаннях. Ва ўмовах сучасных глабальных выклікаў для беларускага грамадства прынцыпова важна захаваць каштоўнасці, якія адпавядаюць нацыянальным інтарэсам: непарушнасць асноў канстытуцыйнага ладу, баланс інтарэсаў асобы і дзяржавы, павага і давер да легітымнай улады, стваральнасць, прыярытэт нацыянальных інтарэсаў над прыватнымі, справядлівасць, непрыняцце ціску звонку. Дзяржаўная гістарычная палітыка — важны фактар забеспячэння нацыянальнай бяспекі, захавання суверэнітэту і незалежнасці.

калі ў свеце…

2022 г. — Год культурнай спадчыны народаў Расіі

на тэрыторыі Беларусі…

2022 г. — Год гістарычнай памяці

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Сфармулюйце ў выглядзе тэзісаў асноўныя палажэнні беларускага заканадаўства, якія забяспечваюць міжнацыянальную і міжканфесійную згоду ў беларускім грамадстве.
2. Якімі дасягненнямі ў галіне міжнацыянальных і міжканфесійных адносін могуць ганарыцца грамадзяне нашай краіны?
3. Чаму пытанне аб каштоўнасных арыентацыях грамадства асабліва значнае ў сучасным свеце? Ахарактарызуйце каштоўнасці сучаснага беларускага грамадства. Якія з іх, на ваш погляд, асабліва важныя для захавання адзінства грамадства?
4. Якая асноўная мэта дзяржаўнай гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь?
5. Ахарактарызуйце ролю палітычных партый і грамадскіх арганізацый у рэспубліцы.

§ 48. Рэспубліка Беларусь у свеце

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА
ШМАТВЕКТАРНАСЦЬ
САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА САДРУЖНАСЦЬ
НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ
ЕЎРАЗІЙСКІ ЭКАНАМІЧНЫ САЮЗ
ШАНХАЙСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ
СУПРАЦОЎНІЦТВА БРІКС

Асаблівасці геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь

1. Геапалітычнае становішча Беларусі. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь фарміруецца зыходзячы з яе геапалітычнага становішча. Яно вызначаецца тэрыторыяй дзяржавы і яе геаграфічным размяшчэннем.

Беларусь мяжуе з пяццю дзяржавамі. Ні з адной з іх наша краіна не мае тэрытарыяльных спрэчак. У сувязі з пашырэннем НАТА на ўсход і прыняццем новых членаў у Еўрапейскі саюз Беларусь пачала межаваць з гэтымі найбуйнейшымі аб'яднаннямі заходніх дзяржаў.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



1. *З якімі дзяржавамі мяжуе Рэспубліка Беларусь? Якія з іх уваходзяць у склад ЕС і НАТА?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якое месца займае Беларусь паводле плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва сярод еўрапейскіх краін.*
3. *Ахарактарызуйце перавагі і недахопы геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь.*

Важным элементам геапалітычнага становішча рэспублікі выступае тое, што цераз яе праходзяць зручныя транспартныя шляхі, якія злучаюць Расію і азіяцкія краіны з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Расія надае Беларусі адну з найважнейшых роляў у забеспячэнні сваёй бяспекі. Адпаведна, і Беларусь мае надзейны саюзны шчыт ад магчымых пагроз з боку краін НАТА, з якімі наша краіна непасрэдна мяжуе.

2. Шматвектарны характар знешняй палітыкі. Рэспубліка Беларусь — суверэнная еўрапейская дзяржава, якая праводзіць самастойную, міралюбную знешнюю палітыку, актыўна развівае супрацоўніцтва са стратэгічнымі саюзнікамі і замежнымі партнёрамі ў розных частках зямнога шара, кіруючыся нацыянальнымі інтарэсамі.

Шматвектарнасць знешняй палітыкі

Ад моманту здабыцця незалежнасці Беларусь пазіцыянавала сваю знешнюю палітыку як шматвектарную. Але пры гэтым значнасць розных знешнепалітычных вектараў для Беларусі неаднолькавая.

У знешняй палітыцы нашай краіны стратэгічнае значэнне маюць адносіны з Расіяй і Кітаем. Актыўна

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

Арт. 18

Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, неўжывання сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права.

Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў дачыненні да іншых дзяржаў.

1. *Якімі прынцыпамі ў сваёй знешняй палітыцы кіруецца наша краіна? Растлумачце значэнне гэтых прынцыпаў.*
2. *Дакажыце, што Рэспубліка Беларусь праводзіць міралюбную знешнюю палітыку і імкнецца да актыўнага супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі.*

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Расійская Федэрацыя

Галоўны эканамічны партнёр і ключавы ваенна-палітычны саюзнік

Кітайская Народная Рэспубліка

Беларусь і Кітай маюць агульную пазіцыю ў асноўных пытаннях міжнародных адносін і падтрымліваюць адно аднаго на сусветнай арэне. Актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, гандлю

РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ


Краіны Еўрапейскага саюза

Напачатку XXI ст. ЕС займаў у гандлёвым абароце Беларусі другое месца пасля Расіі. Аднак уведзеныя напачатку 2020-х гг. краінамі ЕС санкцыі супраць Беларусі прывялі да зніжэння аб'ёмаў узаемнага гандлю

Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі

Пасля ўведзеных Захадам санкцый Беларусь паспяхова замясціла долю гандлю з ЕС рынкамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Наладжванне эканамічнага супрацоўніцтва з «глабальным Поўднем» будзе працягвацца

Аб'ём знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь



«Беларуская дзяржава працягне праводзіць шматвектарную палітыку, і яна заключаецца не толькі ў выбудоўванні адносін з Усходам і Захадам. Мы прытрымліваемся гэтай шматвектарнасці з прычыны нашага эканамічнага становішча, нашай эканамічнай палітыкі… Вы памятаеце наш тэзіс: наша шматвектарнасць зыходзіць з эканамічных інтарэсаў. Мы экспартаарыентаваная краіна. Мы прадаём значна больш, чым спажываем з выраблення. Таму эканоміка дыктуе нашу шматвектарнасць».

А. Р. Лукашэнка

1. *У чым выяўляецца шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь? Якія задачы заклікана вырашаць шматвектарная знешняя палітыка?*
2. *Параўнайце аб'ёмы знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь у 1995 і 2024 гг. Як змяніліся суадносіны экспарту і імпарту тавараў і паслуг?*
3. *Дакажыце, што шматвектарная знешняя палітыка станоўча ўплывае на эканамічнае развіццё краіны.*
4. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія эканамічныя ініцыятывы звязваюць Рэспубліку Беларусь і Кітайскую Народную Рэспубліку.*

развіваюцца адносіны з краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

3. Удзел Беларусі ў інтэграцыйных працэсах. Наша краіна выступае як актыўны ўдзельнік інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы.

Садружнасць Незалежных Дзяржаў

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца адным з заснавальнікаў *Садружнасці Незалежных Дзяржаў*. Пагадненне аб стварэнні СНД было падпісана **8 снежня 1991 г.** кіраўнікамі трох саюзных рэспублік — Расіі, Украіны і Беларусі. 21 снежня 1991 г. Белавежскае пагадненне падтрымалі кіраўнікі яшчэ васьмі былых рэспублік СССР.



Эмблема СНД

Саюзная дзяржава

Важным элементам эканамічнай інтэграцыі дзяржаў — удзельніц СНД з'яўляецца функцыянаванне зоны свабоднага гандлю з ёмістасцю рынку больш за 280 млн чалавек. Кіраўніцтва нашай краіны імкнецца дасягнуць максімальнай інтэграцыі паміж краінамі СНД перш за ўсё ў эканамічнай сферы, забяспечыць сацыяльныя гарантыі грамадзянам усіх дзяржаў Садружнасці на яе тэрыторыі.

Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя з'яўляюцца дзяржавамі — удзельніцамі Дамовы аб стварэнні *Саюзнай дзяржавы*, заключанай **8 снежня 1999 г.** Партнёрства Беларусі і Расіі будуецца на прынцыпах безумоўнага захавання дзяржаўнага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці, адказнага выканання бакамі сваіх міжнародных абавязацельстваў, развіцця сумеснай дзейнасці і фарміравання агульнай прасторы ва ўсіх ключавых для развіцця дзяржаў сферах: эканамічнай, сацыяльнай, навукова-тэхнічнай, ваеннай і ваенна-тэхнічнай, культурнай, інфармацыйнай і інш.

Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы

Беларусь з'яўляецца членам *Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ)*, створанай у **2002 г.** Яна ўключае Беларусь, Расію, Арменію, Казахстан, Кыргызстан і Таджыкістан. Мэта арганізацыі — развіццё супрацоўніцтва ў знешнепалітычнай, ваеннай і ваенна-тэхнічнай галінах, каардынацыя



Эмблема АДКБ

і аб'яднанне намаганняў у барацьбе супраць міжнароднага тэрарызму і іншых сучасных пагроз бяспецы.

У 1995 г. прэзідэнты Расіі, Беларусі і Казахстана падпісалі дамову аб стварэнні Мытнага саюза, да якога пазней далучыліся Кыргызстан і Таджыкістан. З апорай на гэты саюз у 2000 г. была створана *Еўразійская эканамічная супольнасць (ЕўрАзЭС)*. З 1 студзеня 2012 г. на тэрыторыі ЕўрАзЭС пачала дзейнічаць Адзіная эканамічная прастора, якая зрабілася важнай умовай стабільнага і эфектыўнага развіцця эканомік дзяржаў-удзельніц і павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва.

Еўразійская эканамічная супольнасць

Еўразійскі эканамічны саюз



Эмблема ЕАЭС

У 2014 г. у сталіцы Казахстана Астане была падпісаная дамова аб стварэнні *Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС)*, які пачаў функцыянаваць з 1 студзеня 2015 г. Гэтая арганізацыя з'яўляецца інтэграцыйным аб'яднаннем, якое актыўна развіваецца. Для Беларусі з яе развітой прамысловасцю ЕўрАзЭС і ЕАЭС адкрылі шэраг рынкаў збыту многіх відаў прадукцыі. Беларускі бок выступае за пашырэнне знешняга гандлю дзяржаў — членаў ЕАЭС шляхам заключэння пагадненняў аб зонах свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і трэцімі краінамі.

Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва



Эмблема ШАС

З 2010 г. Рэспубліка Беларусь у статусе партнёра па дыялогу, а ад 2024 г. — у статусе паўнапраўнага члена ўдзельнічае ў *Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС)*. Гэтая арганізацыя была створана ў 2001 г. КНР, Расіяй, Казахстанам, Узбекістанам, Кыргызстанам і Таджыкістанам. Членства ў ёй стварае добрыя перспектывы для асваення нашай краінай важных рынкаў Азіі. Беларусь разглядае ШАС таксама ў якасці важнай міжнароднай пляцоўкі для развіцця супрацоўніцтва ў сферы процідзеяння пагрозам тэрарызму, экстрэмізму, арганізаванай злачыннасці і выступае за ўмацаванне эканамічнага супрацоўніцтва ў еўразійскім рэгіёне.

БРІКС



Эмблема БРІКС

У лістападзе 2024 г. Рэспубліка Беларусь афіцыйна стала краінай — партнёрам БРІКС — міждзяржаўнага нефармальнага аб'яднання буйны́х краін, якія развіваюцца найбольш дынамічна, чые эканомікі маюць высокі патэнцыял для росту і якія выступаюць важнымі гульцамі на міжнароднай арэне. На долю БРІКС прыпадае каля траціны сусветнага ВУП і 45 % насельніцтва планеты.

Асноўнымі мэтамі гэтага міждзяржаўнага аб'яднання з'яўляюцца развіццё эканамічнага супрацоўніцтва, умацаванне палітычных сувязей паміж краінамі-ўдзельніцамі і садзеянне рэформам у міжнародных фінансавых інстытутах. Статус партнёра ў БРІКС азначае, што краіна мае магчымасць удзельнічаць у розных мерапрыемствах арганізацыі, абменьвацца досведам і найлепшымі практыкамі, супрацоўнічаць з іншымі краінамі-ўдзельніцамі. Партнёрства дазваляе атрымаць доступ да рэсурсаў і тэхналогій, удзельнічаць у сумесных праектах, адкрывае дадатковыя магчымасці для гандлю і інвестыцый.

Удзел у рабоце ААН

4. Дзейнасць Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях. Беларусь ад самага пачатку сваёй знешнепалітычнай дзейнасці пацвердзіла прыхільнасць да прынцыпаў Статута ААН і Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. У 1992 г. у Мінску адкрылася прадстаўніцтва ААН. Удзел у рабоце гэтай арганізацыі, сістэме яе органаў і спецыяльных устаноў дазваляе больш эфектыўна вырашаць задачы забеспячэння знешнепалітычнага развіцця беларускай дзяржавы. Дэлегацыя Рэспублікі Беларусь пастаянна ўдзельнічае ў сесіях Генеральнай Асамблеі, Эканамічнага і Сацыяльнага Савета ААН.

У рамках дзейнасці ААН Беларусь вялікую ўвагу надае пытанням раззбраення, барацьбы супраць тэрарызму. Наша краіна была ініцыятарам прыняцця Генеральнай Асамблеяй ААН рэзалюцыі

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Беларусь з'яўляецца членам шэрага спецыялізаваных устаноў ААН і міжурадавых арганізацый, якія ажыццяўляюць узаемадзеянне з ААН на падставе спецыяльных пагадненняў. Афіцыйныя дэлегацыі Рэспублікі Беларусь бяруць удзел у рабоце розных міжнародных форумаў, што праходзяць пад эгідай ААН.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, з якімі арганізацыямі і ўстановамі сістэмы ААН супрацоўнічае Рэспубліка Беларусь. Прывядзіце прыклады такога супрацоўніцтва.

аб стварэнні ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе зоны, свабоднай ад ядзернай зброі. Беларусь ініцыюе і падтрымлівае намаганні ААН, скіраваныя на забарону распрацоўкі новых відаў зброі масавага знішчэння. У 2005 г. на сусветным саміце ААН Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка вылучыў ініцыятыву аб актывізацыі міжнародных намаганняў у барацьбе супраць адной з найвастрэйшых праблем сучаснасці — гандлю людзьмі. У 2010 г. на аснове гэтай ініцыятывы Генеральная Асамблея ААН прыняла Глабальны план дзеянняў па барацьбе з гандлем людзьмі.

Супрацоўніцтва з АБСЕ

У 1992 г. Рэспубліка Беларусь першая сярод краін СНД падпісала Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, а таксама Парыжскую хартыю для новай Еўропы. Такім чынам, беларуская дзяржава зрабілася членам Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). У 1999 г. беларуская дэлегацыя на чале з А. Р. Лукашэнкам узяла ўдзел у саміце АБСЕ ў Стамбуле. Кіраўнік дзяржавы падпісаў Хартыю еўрапейскай бяспекі. У 2003 г. Парламенцкая асамблея АБСЕ прызнала Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь у якасці паўнавартаснага беларускага парламента. Беларускія парламентарыі пачалі браць удзел у рабоце сесій Асамблеі на афіцыйным узроўні, што паспрыяла пашырэнню міжпарламенц-

кага дыялогу Беларусі ў рамках АБСЕ. Гэтая арганізацыя высока ацаніла намаганні нашай краіны ў мірным урэгуляванні ўкраінскага крызісу. Аднак пасля 2020 г. адносіны Рэспублікі Беларусь з АБСЕ пагоршыліся.

5. Спробы ўмяшання замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь у 2020 г.

Абвастрэнне міжнародных адносін

2020 г. характарызуецца маштабным і глыбокім крызісам, выкліканым пандэміяй COVID-19, на якую розныя краіны адрэагавалі ўвядзеннем абмежаванняў практычна ва ўсіх сферах. Гэта прывяло да змянення звыклага ладу жыцця, наладжаных транспартных сувязей. Пандэмія каранавіруса абвастрыла міжнародныя адносіны, узмацніла дэзінтэграцыю ў ЕС. Беларусь, для якой характэрная адкрытая эканоміка, таксама адчула наступствы крызісу.

Прэзідэнцкія выбары 2020 г.

У 2020 г. у Рэспубліцы Беларусь адбылася найважнейшая палітычная кампанія — выбары Прэзідэнта. Выбарчая кампанія праходзіла ва ўмовах неаднаразовых спроб шэрага замежных дзяржаў і недзяржаўных арганізацый умяшацца ў ход выбараў і паўплываць на іх вынікі. У краіне адпрацоўвалася адна з формаў «каляровых рэвалюцый». Асабліва моцны ціск аказваўся ў інфармацыйнай прасторы (інтэрнэт-парталах, сацыяльных сетках).

Успомніце, што такое «каляровыя рэвалюцыі».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка ацаніў падзеі жніўня 2020 г. як спробу мяцяжу з мэтай захопу канстытуцыйнай улады. Вынікі галасавання загадзя былі аб'яўленыя незаконнымі, каб яшчэ да абвяшчэння вынікаў выбараў справакаваць масавыя беспарадкі. Мэтай сутыкненняў з міліцыяй, мітынгаў і шэсцяў была спроба стварыць альтэрнатыўныя, г. зн. незаконныя і пазаканстытуцыйныя, органы ўлады, каб ад іх імя звярнуцца па дапамогу да ЗША і ЕС для правядзення новых выбараў ці прамога ваеннага ўмяшання. Аднак мяцеж поспеху не меў. Пратэстная дзейнасць паступова была

выцесненая за межы Рэспублікі Беларусь. У выніку краіны Захаду пачалі ажыццяўляць палітычны і эканамічны ціск на нашу краіну.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2020 г. і іх наступствы атрымалі розныя ацэнкі ў міжнароднай супольнасці. З перамогай на выбарах А. Р. Лукашэнку павіншавалі старшыня КНР Сі Цзіньпін, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін, Прэзідэнт Рэспублікі Казахстан К.-Ж. Такаеў, Прэзідэнт Турцыі Р. Эрдаган і іншыя.

Пагаршэнне адносін з краінамі Захаду

Рэакцыя ЗША і краін ЕС праявілася ў прыняцці шэрага пакетаў эканамічных санкцый у дачыненні да некаторых фізічных і юрыдычных асоб Беларусі. На фоне надзвычай моцнага палітычнага і эканамічнага ціску ЕС і ЗША на Беларусь адносіны з імі трансфармаваліся з партнёрскіх і ўзаемавыгадных у жорсткае супрацьстаянне. У гэтых умовах Рэспубліка Беларусь узмацніла інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй у рамках Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

Разам з тым Рэспубліка Беларусь застаецца адкрытай для дыялогу з заходнімі краінамі з мэтай выхаду на пазітыўную траекторыю супрацоўніцтва, у першую чаргу ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах. Нягледзячы на выклікі апошніх гадоў, наша краіна ў сваёй знешняй палітыцы працягвае рэалізоўваць прынцып шматвектарнасці.

Рэспубліка Беларусь праводзіць самастойную знешнюю палітыку. Актыўна развівае супрацоўніцтва з дзяржавамі ў розных частках зямнога шара, выступае адным з ініцыятараў і актыўным удзельнікам рэгіянальных інтэграцыйных структур і праектаў. Робіць істотны ўнёсак ва ўмацаванне міжнароднай бяспекі і стабільнасці насуперак недружалюбнай санкцыйнай палітыцы краін калектыўнага Захаду. У сваёй знешняй палітыцы Рэспубліка Беларусь рэалізуе прынцып шматвектарнасці.

калі ў свеце…	на тэрыторыі Беларусі…
2001 г. — стварэнне Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва	2024 г. — Рэспубліка Беларусь зрабілася паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ахарактарызуйце геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. Як геапалітычнае становішча ўплывае на знешнюю палітыку нашай краіны?
2. Дайце характарыстыку асноўным прынцыпам і кірункам знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Дакажыце, што знешняя палітыка Беларусі мае шматвектарны характар.
3. У склад якіх міждзяржаўных аб'яднанняў уваходзіць Рэспубліка Беларусь? Ацаніце ролю нашай краіны ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы.
4. Вылучыце асноўныя кірункі дзейнасці Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях.
5. Якія прыкметы «каляровых рэвалюцый» праявіліся ў Беларусі ў 2020 г.? Якія фактары дазволілі нашай краіне паспяхова супрацьстаяць спробе «каляровай рэвалюцыі»?
6. Як змянілася знешняя палітыка нашай краіны пасля падзей 2020 г.?

§ 49. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі

ПАЛІТЫЧНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ
ЭКАНАМІЧНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ
СУПОЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСІ І РАСІІ
САЮЗ БЕЛАРУСІ І РАСІІ
САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА
ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Працэс стварэння Саюзнай дзяржавы

1. Асноўныя этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Беларусі і Расіі пасля распаду СССР. Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя пасля распаду Савецкага Саюза дэманструюць унікальны прыклад інтэграцыі дзвюх незалежных дзяржаў. Шчыльныя саюзныя адносіны паміж Беларуссю і Расіяй абумоўленыя геаграфічнай і культурна-гістарычнай блізкасцю дзвюх краін і народаў, узаемадапаўняльнасцю эканомік, шчыльнымі каапераційнымі сувязямі беларускіх і расійскіх кампаній.



Мурал «Масква–Мінск». Мастак А. Кашак. Г. Мінск. 2016 г.

Да стварэння Саюзнай дзяржавы Беларусь і Расія рухаліся паэтапна. Важным этапам саюзнай інтэграцыі была ініцыятыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі аб эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, падтрыманая беларускім народам на рэспубліканскім рэферэндуме 1995 г.

Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы вызначыла раней не бачанае ў сусветнай практыцы шчыльнае збліжэнне дзвюх дзяржаў ва ўмовах, калі Беларусь і Расія заставаліся самастойнымі ўдзельнікамі міжнароднай супольнасці.

25 чэрвеня 1992 г.	Усталяванне дыпламатычных адносін суверэнных дзяржаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі
21 лютага 1995 г.	Падпісанне Дамовы аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй
2 красавіка 1996 г.	Дамова аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі
2 красавіка 1997 г.	Дамова аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі
8 снежня 1999 г.	Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі

Якое свята адзначаецца народамі Беларусі і Расіі 2 красавіка?

Органы, якія рэгулююць дзейнасць Саюзнай дзяржавы

Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы мае на ўвазе не зліццё дзвюх дзяржаў або паглынанне адной дзяржавай іншай, а іх аб'яднанне для рэалізацыі ўзаемавыгадных для абодвух бакоў задач. Дамова прадугледжвае стварэнне:

- органаў, якія рэгулююць дзейнасць Саюзнай дзяржавы (Вышэйшы Дзяржаўны Савет, Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі, Савет Міністраў Саюзнай дзяржавы, Пастаянны Камітэт Саюзнай дзяржавы);
- бюджэту, які фарміруецца штогод адлічэннямі з бюджэтаў краін-удзельніц і выдаткоўваецца на рэалізацыю супольных праграм і праектаў Саюзнай дзяржавы.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Выкарыстоўваючы інфармацыю інфармацыйна-аналітычнага партала Саюзнай дзяржавы:

- *вызначце склад Вышэйшага Дзяржаўнага Савета, Парламенцкага Сходу, Савета Міністраў, Пастаяннага Камітэта і іх ролю ў рэалізацыі палажэнняў Дамовы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, распрацоўцы асноўных кірункаў агульнай палітыкі Саюзнай дзяржавы;*
- *складзіце схему, якая адлюстроўвае ўсе пералічаныя вышэй пытанні.*

2. Фарміраванне адзінай эканамічнай, сацыяльнай і тэхналагічнай прасторы. Дамова аб Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі ў якасці адной з найважнейшых мэт новага інтэграцыйнага аб'яднання пазначыла павышэнне ўзроўню жыцця народаў, устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржаў — удзельніц Саюза на аснове аб'яднання іх матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў.

Значнасць эканамічнага партнёрства

Менавіта шчыльныя эканамічныя адносіны выступаюць падмуркам для беларуска-расійскай інтэграцыі ў межах Саюзнай дзяржавы. Расія трывала замацавала за сабой месца асноўнага знешнеэканамічнага партнёра Беларусі, найважнейшага спажыўца прадукцыі, якую вырабляюць беларускія прадпрыемствы. На Расію прыпадае больш за 50 % беларускага знешняга гандлю. Яна выступае практычна адзіным пастаўшчыком энергарэсурсаў на беларускі рынак. Для нашай краіны істотна, што ў рамках Саюзнай дзяржавы яна атрымлівае газ і нафту з Расіі па цэнах, блізкіх да ўнутрырасійскіх.

Супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі

Сімвалам беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі зрабілася будаўніцтва беларускай атамнай электрастанцыі. На рэалізацыю гэтага праекта Расія дала Беларусі крэдыт у 10 млрд долараў.



БелАЭС. Г. Астравец

Для Расіі супрацоўніцтва з Беларуссю таксама мае істотнае эканамічнае значэнне. Праз нашу краіну праходзяць асноўныя транзітныя шляхі, якія звязваюць Расію з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

Па беларускіх транспартных камунікацыях напрыканцы 2010-х гг. ажыццяўлялася да 70 % знешнегандлёвага абароту Расіі. Наша краіна забяспечвала транзіт прыблізна 50 % расійскай нафты і 30 % расійскага газу ў еўрапейскія краіны, прычым тарыфы на транзіт па тэрыторыі нашай краіны значна ніжэйшыя, чым у іншых дзяржавах.

Расія атрымлівае з Беларусі многія неабходныя ёй тавары, у прыватнасці грузавыя аўтамабілі, сельскагаспадарчыя машыны, халадзільнікі, мэблю, адзенне, абутак, прадукцыю харчовай прамысловасці. Асаблівае значэнне для Беларусі мае тое, што на Расію прыпадае асноўная частка экспарту прадукцыі беларускага машынабудавання.

Умацаванне эканамічнай інтэграцыі

Ва ўмовах заходніх санкцый Беларусь і Расія напачатку 2020-х гг. зрабілі захады, накіраваныя на далейшую інтэграцыю сваіх эканомік. У лістападзе 2021 г. прэзідэнты Беларусі і Расіі падпісалі пагадненне, якое зацвердзіла 28 інтэграцыйных праграм у рамках Саюзнай дзяржавы. Для Беларусі вельмі істотна, што гэтыя праграмы прадугледжваюць фарміраванне адзінага рынку газу, нафты, нафтапрадуктаў, электрычнай энергіі, развіццё атамнай энергетыкі. У 2022 г. Беларусь і Расія пачалі рэалізацыю супольных праектаў па вырабе імпартазамяшчальнай прадукцыі на базе найбуйнейшых беларускіх прамысловых прадпрыемстваў.

> «Гаворачы пра інтэграцыю, мы павінны дакладна разумець — усякая інтэграцыя магчымая, але без страты дзяржаўнасці і суверэнітэту».
>
> *А. Р. Лукашэнка*

Супрацоўніцтва ў сферы асваення космасу

Сферай навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў з'яўляецца космас. Знакавым вынікам расійска-беларускага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы стаў палёт на Міжнародную касмічную станцыю першай касманаўткі Рэспублікі Беларусь,



Першая беларуская жанчына-касманаўт, Герой Беларусі Марына Васілеўская і ўраджэнец Беларусі, Герой Расійскай Федэрацыі Алег Навіцкі перад стартам да Міжнароднай касмічнай станцыі 23 сакавіка 2024 г.

Героя Беларусі М. Васілеўскай у складзе міжнароднага экіпажа пад камандаваннем лётчыка-касманаўта, Героя Расіі, ураджэнца Беларусі А. Навіцкага.

Роўнасць правоў грамадзян Беларусі і Расіі

У Саюзнай дзяржаве замацаваная роўнасць правоў грамадзян Беларусі і Расіі. Паміж дзвюма краінамі падпісанае пагадненне, якое забяспечвае беларусам даступнасць медыцынскай дапамогі ў Расіі і наадварот.

У Беларусі і Расіі ўзаемна прызнаюцца дакументы аб адукацыі. Грамадзяне дзвюх краін маюць роўныя правы на працаўладкаванне, аплату працы. Яны могуць свабодна выбіраць месца жыхарства на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Пры перасячэнні беларуска-расійскай мяжы беларусам і расіянам не патрабуецца праходжанне памежнага кантролю, мытнага надгляду.

Супольныя праграмы Саюзнай дзяржавы, якія зацвярджаюцца рашэннем Вышэйшага Дзяржаўнага Савета і фінансуюцца з бюджэту Саюзнай дзяржавы, ахопліваюць розныя сферы, у тым ліку наву-

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



У лютым 2025 г. выканаўчы дырэктар праграмы Саюзнай дзяржавы «Комплекс — СГ» С. Караняка адзначыў, што запланаванае стварэнне арбітальнай групоўкі спадарожнікаў: «У апошнія гады ў свеце намецілася тэндэнцыя мініяцюрызацыі касмічных апаратаў, каб запускаць у космас не толькі асобныя ўзоры, але і цэлыя арбітальныя групоўкі. Цяпер паводле новай саюзнай праграмы ствараецца арбітальная групоўка касмічных апаратаў».

1. *У чым значнасць супольных праграм Беларусі і Расіі па асваенні касмічнай прасторы?*
2. *Выкарыстоўваючы матэрыялы інфармацыйна-аналітычнага партала Саюзнай дзяржавы, даведайцеся, якія супольныя праграмы і праекты рэалізуюцца зараз, якія іх мэты і значэнне для Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.*

ковую і навукова-тэхнічную, прамысловасць, будаўніцтва, інавацыі і новыя тэхналогіі, космас, ІТ-тэхналогіі, авіябудаванне, вытворчасць беспілотных лятальных апаратаў і інш. Яны выступаюць эфектыўным сродкам паглыблення беларуска-расійскай інтэграцыі. Нашы краіны імкнуцца да адзінай прамысловай палітыкі, якая заключаецца ў роўных умовах гаспадарання для беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў.

Аб'яднанне намаганняў у галіне бяспекі

3. Узаемадзеянне ў сферы знешняй палітыкі і бяспекі. Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы скіроўвае Беларусь і Расію на аб'яднанне намаганняў па забеспячэнні бяспекі і падтрыманні высокай абараназдольнасці. Супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі ў ваеннай сферы прадугледжвае ажыццяўленне супольнай абароннай палітыкі, каардынацыю дзейнасці ў галіне ваеннага будаўніцтва, распрацоўку і размяшчэнне сумеснага абароннага заказу на прадпрыемствах.

Важным элементам супрацоўніцтва ў галіне абароны выступае наяўнасць супольнай беларуска-расійскай рэгіянальнай групоўкі войскаў. Яна забяспечвае абарону Саюзнай дзяржавы на заходнім напрамку. Дзве краіны стварылі сумесную сістэму супрацьпаветранай абароны.

Паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй заключаныя пагадненні па розных кірунках ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. У інтарэсах рэгіянальнай групоўкі войскаў сумесна выкарыстоўваюцца аб'екты ваеннай інфраструктуры на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Супрацоўніцтва паміж ваеннымі ведамствамі ахоплівае практычна ўсе пытанні ваеннай сферы. Яно грунтуецца на прынцыпах роўнасці і ўліку інтарэсаў партнёра. У снежні 2001 г. прынятая Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы, у якой вызначаныя асноўныя палажэнні яе абароннай палітыкі. Ва ўмовах узмацнення канфрантацыі з Захадам пасля 2020 г.

Беларусь і Расія пайшлі на значнае ўзмацненне ваеннага ўзаемадзеяння. У 2021 г. міністэрствы абароны дзвюх краін падпісалі праграму стратэгічнага партнёрства на пяць гадоў. У лістападзе 2021 г. была прынята абноўленая Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы, а ў 2022 г. — разгорнута рэгіянальная групоўка войскаў.

Узаемная падтрымка на міжнароднай арэне

У рамках Саюзнай дзяржавы Беларусь і Расія каардынуюць свае дзеянні на міжнароднай арэне. Кожныя два гады партнёры падпісваюць праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі. Па асноўных пытаннях міжнароднай палітыкі Беларусь і Расія займаюць аднолькавыя або вельмі блізкія пазіцыі. Наша краіна неаднаразова атрымлівала

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



Эмблема III Міжнароднага антыфашысцкага кангрэса «За адзінства ўсіх антыфашысцкіх сіл, за поўную перамогу над нацызмам». Расійская Федэрацыя, 2025 г.



Урачыстае шэсце «Беларусь памятае». 9 мая 2019 г.

1. *Прывядзіце прыклады сумеснай барацьбы народаў Беларусі і Расіі супраць варожых захопнікаў.*
2. *Якую ролю адыгрываюць Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя ў справе захавання гістарычнай памяці і барацьбы з пашырэннем нацызму ў сучасным свеце?*

падтрымку з боку Расіі ў рамках міжнародных арганізацый (ААН, АБСЕ, Савет Еўропы).

Беларусь рэгулярна галасуе супраць антырасійскіх рэзалюцый у ААН і іншых міжнародных арганізацыях. Агульныя намаганні дзвюх краін на міжнароднай арэне скіраваныя на пабудову шматпалярнага сусветнага парадку з улікам інтарэсаў усіх дзяржаў.

4. Рэгіянальнае супрацоўніцтва. У рамках Саюзнай дзяржавы актыўна развіваюцца беларуска-расійскія сувязі на рэгіянальным узроўні. Наша краіна падтрымлівае ўзаемавыгадныя гандлёва-эканамічныя, навукова-тэхнічныя і культурныя сувязі з расійскімі рэгіёнамі.

На рэгіянальным узроўні заключана больш за 170 дамоў, пагадненняў і пратаколаў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве. У Беларусі дзейнічае 8 прадстаўніцтваў адміністрацый расійскіх рэгіёнаў. Рэгулярнымі з'яўляюцца візіты кіраўнікоў расійскіх рэгіёнаў у Беларусь з мэтай наладжвання непасрэднага супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі.

Форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Важнай формай канструктыўнага ўзаемадзеяння на рэгіянальным узроўні зрабілася правядзенне маштабных *форумаў рэгіёнаў* Беларусі і Расіі, на якіх заключаюцца шматмільённыя бізнес-кантракты, падпісваюцца пагадненні аб супрацоўніцтве ў адукацыйнай, навуковай і іншых сферах. Першы з іх прайшоў у 2014 г. у Мінску. Ад тых часоў форумы праходзяць штогод.

Прывядзіце прыклады сумесных прадпрыемстваў Беларусі і Расіі.

Эфектыўнай формай супрацоўніцтва рэгіёнаў Беларусі і Расіі з'яўляецца наладжванне сумесных вытворчасцей прадпрыемствамі дзвюх краін.

Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі зрабілася заканамерным вынікам супольнага гістарычнага шляху братніх народаў, злучаных агульнасцю культурных традыцый. Высокі ўзровень супрацоўніцтва дазваляе забяспечыць эканамічную і палітычную бяспеку суверэнных дзяржаў. У рамках Саюзнай дзяржавы захоўваюцца дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць яе ўдзельнікаў.

калі ў свеце…

29 сакавіка 1996 г. — прэзідэнты Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі падпісалі ў Маскве пагадненне аб паглыбленні інтэграцыі ў эканамічнай і гуманітарнай галінах

на тэрыторыі Беларусі…

2 красавіка 1996 г. — падпісанне Дамовы аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У чым заключаецца ўнікальнасць Саюзнай дзяржавы для агульнасусветнай практыкі?
2. Складзіце ментальную карту (або схему) «Фарміраванне адзінай эканамічнай, сацыяльнай і тэхналагічнай прасторы Беларусі і Расіі».
3. Якое значэнне мае ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі для забеспячэння бяспекі дзяржаў?
4. У чым заключаецца значнасць рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі для развіцця абедзвюх дзяржаў?

§ 50. Навука і культура сучаснай Беларусі

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
СУСВЕТНАЯ СПАДЧЫНА ЮНЕСКА
«БЕЛАРУСЬФІЛЬМ»

1. Прыярытэтныя кірункі развіцця навукі. Інавацыйнае і навукова-тэхналагічнае развіццё. Навука — важны фактар умацавання дзяржаўнага суверэнітэту, яна інтэлектуальна забяспечвае дасягненне ключавой мэты — пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі. Наша рэспубліка ўваходзіць у лік дзяржаў з высокім узроўнем навукова-тэхнічнага развіцця. За гады суверэнітэту навуковы патэнцыял краіны значна вырас. У Беларусі паспяхова развіваецца акадэмічная, універсітэцкая, галіновая навука.

Арганізацыя навуковых даследаванняў

Арганізацыю, каардынацыю навуковых даследаванняў, інавацыйнага развіцця забяспечваюць *Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.* Нацыянальная акадэмія навук Беларусі з'яўляецца базавай арганізацыяй Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук, актыўна развівае міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва з найбуйнейшымі навуковымі цэнтрамі свету. Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях ажыццяўляе рэгуляванне і кіраванне ў сферах навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, ахову правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці.

Успомніце, калі была створана Акадэмія навук БССР. Якімі дасягненнямі праславіліся беларускія вучоныя?

Кадравы патэнцыял беларускай навукі — гэта звыш 17 тыс. даследчыкаў. Вышэйшую навуковую кваліфікацыю па стане на 1 студзеня 2024 г. маюць 3,2 тыс. вучоных, у тым ліку 519 дактароў і 2687 кандыдатаў навук. У навуковыя даследаванні і распрацоўкі актыўна ўцягваецца моладзь. Пятая частка кадравага складу акадэмічнай і ўніверсітэцкай навукі — маладыя вучоныя.

Беларускія вучоныя праводзяць даследаванні і распрацоўкі ў шырокім спектры кірункаў.

Да найбольш значных дасягненняў сучасных беларускіх вучоных адносяць дасягненні ў касмічнай галіне.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Прыярытэтныя кірункі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2021–2025 гг., зацверджаныя Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2020 г.:

1) лічбавыя інфармацыйна-камунікацыйныя і міждысцыплінарныя тэхналогіі, заснаваныя на іх вытворчасці;
2) біялагічныя, медыцынскія, фармацэўтычныя і хімічныя тэхналогіі і вытворчасці;
3) энергетыка, будаўніцтва, экалогія і рацыянальнае прыродакарыстанне;
4) машынабудаванне, машынабудаўнічыя тэхналогіі, прыборабудаванне і інавацыйныя матэрыялы;
5) аграпрамысловыя і харчовыя тэхналогіі;
6) забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства, дзяржавы.

1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады дасягненняў беларускай навукі ў названых кірунках.

2. Растлумачце, які ўнёсак гэтыя навуковыя даследаванні робяць у павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, паскарэнне эканамічнага росту і забеспячэнне нацыянальнай бяспекі краіны.

Дасягненні ў касмічнай галіне

На калязямной арбіце працуюць Беларускі касмічны апарат дыстанцыйнага зандавання Зямлі, спадарожнік сувязі «Белінтэрсат-1», нанаспадарожнік БДУ. На іх базе створаныя Беларуская касмічная сістэма дыстанцыйнага зандавання Зямлі, На-

цыянальная сістэма спадарожнікавай сувязі і вяшчання. Ад 2012 г. Беларусь уваходзіць у лік касмічных дзяржаў, у 2013 г. стала паўнапраўным членам Камітэта ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах. Палёт у 2024 г. у космас першага касманаўта суверэннай Беларусі М. В. Васілеўскай умацаваў статус Беларусі як касмічнай дзяржавы.

Даследаванні біятэхналогій

У Рэспубліцы Беларусь праводзяцца даследаванні ў галіне біятэхналогій. Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя (БНБК) — адзін з самых маштабных тэхналагічных праектаў, запушчаны з ініцыятывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у лістападзе 2022 г. БНБК рэалізуе праект па глыбокай перапрацоўцы зерня, ядром якога з'яўляюцца інавацыйныя прадукты — амінакіслоты, а таксама збалансаваныя камбікармы і кармавыя дабаўкі, што адпавядаюць найвышэйшым міжнародным стандартам. У свеце такія тэхналогіі маюць толькі сем краін.

Даследаванні ў галіне медыцыны, фармацыі

У Беларусі распрацаваныя метады клетачнай імунатэрапіі анкалагічных захворванняў. Іх выкарыстанне значна павялічвае выжывальнасць пацыентаў і прадухіляе вяртанне хваробы. Створаныя новыя метады дыягностыкі хвароб чалавека і жывёл паводле інфармацыі, зашыфраванай у ДНК.

Развіццё атамнай энергетыкі

Пасля запуску ўласнай атамнай электрастанцыі Беларусь цалкам адмовілася ад імпарту электрычнай энергіі, скараціла імпарт прыроднага газу. Увод у эксплуатацыю БелАЭС выступіў моцным стымулам для развіцця энергаёмістых вытворчасцей, інфраструктуры для электратранспарту, цэнтраў апрацоўкі даных, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і г. д.

Развіццё IT-тэхналогій

У Беларусі рэалізуецца курс на пабудову IT-краіны і пераход да лічбавай эканомікі. Рэспубліка ўваходзіць у лік сусветных лідараў у экспарце IT-паслуг на душу насельніцтва. Айчынныя IT-навінкі

ўкараняюць у сферы аховы здароўя, адукацыі, транспарту і лагістыкі, прамысловасці, аховы навакольнага асяроддзя, біятэхналогій, будаўніцтва. Рэсурсы сеткі 5G, што распрацоўваюць беларускія вучоныя, адкрыюць перспектывы для развіцця інавацыйных кірункаў: беспілотны транспарт, канцэпцыя «Разумнага горада».

Дасягненні сучаснай беларускай навукі прадстаўленыя ў Міжнародным выставачным цэнтры ў Мінску.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю «Топ-10 дасягненняў беларускіх вучоных у XXI ст.».

Задачы дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры

2. Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне культуры. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Мэты, задачы і асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры вызначаныя ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры. Гэты дакумент увайшоў у сілу ў 2017 г. і з'яўляецца першым на постсавецкай прасторы.

Асноўныя задачы дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры:
- захаванне гістарычнай памяці беларускага народа, яго нацыянальна-культурнай самабытнасці і традыцый;
- актыўнае ўцягванне грамадзян у культурнае жыццё краіны, рэалізацыя творчага патэнцыялу нацыі.

У сферы культуры функцыянуе каля *5 тыс. дзяржаўных арганізацый*: клубы, публічныя бібліятэкі, музеі, тэатры, канцэртныя арганізацыі, цыркі, паркі культуры і адпачынку.

Рэспубліка Беларусь захавала і паспяхова развівае *сістэму адукацыі ў сферы культуры*, якая ўключае дзіцячыя школы мастацтваў, установы сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Падтрымка дзяржавы

Культура атрымлівае *падтрымку з боку дзяржавы*. Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва штогод фінансуе 5–10 найбольш значных творчых праектаў. Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі вядзе работу па стварэнні спрыяльных умоў для выяўлення і развіцця творчых здольнасцей дзяцей і моладзі, арганізуе міжнародныя і рэспубліканскія конкурсы. Ад 1997 г. штогод праходзіць уручэнне прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Цырымонія ўручэння прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». 2025 г.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся імёны лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» ў бягучым годзе. За якія дасягненні ім прысуджана прэмія?*
2. *Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Унёсак лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь „За духоўнае адраджэнне“ ў развіццё Беларусі».*

Фестывальны рух

Найважнейшым кірункам дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры выступае *фестывальны рух*. Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» аб'ядноўвае мільёны людзей і дзясяткі краін на розных кантынентах. Сярод іншых найбуйнейшых фестывальных брэндаў Беларусі — свята «Александрыя збірае сяброў», Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі, Міжнародны тэатральны фестываль «Белая Вежа», Міжнародны фестываль мастацтваў «Беларуская музычная восень» і інш.

Даведайцеся, калі і дзе праходзяць гэтыя фестывалі.

Кінематаграфія

У Рэспубліцы Беларусь развіваецца *кінематаграфія*. Пачынаючы з 1993 г. пры падтрымцы дзяржавы праходзіць Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад». Асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». У 2021 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ «Аб развіцці кінематаграфіі», які прадугледжвае фінансаванне вытворчасці фільмаў і правядзення кінематаграфічных мерапрыемстваў.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



У 2023–2025 гг. «Беларусьфільм» прадставіў гледачам шэраг прэм'ер, якія маюць важнае значэнне для фарміравання гістарычнай памяці беларускага народа, павагі да яго гістарычнай мінуўшчыны, сістэмы каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Якім гістарычным падзеям прысвечаныя фільмы на ілюстрацыях? Якія каштоўнасці яны транслююць гледачам?

Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны

Беларусь мае багатую духоўную і культурную спадчыну, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца часткай дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, што жывуць у Рэспубліцы Беларусь (арт. 15); кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці (арт. 54). Частка найбольш выбітных для айчыннай і сусветнай культуры аб'ектаў уключаная ў спісы Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Якія аб'екты матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ўключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА?

Даведайцеся, якія гісторыка-культурныя каштоўнасці ёсць у вашым рэгіёне.

Захаваць гісторыка-культурную спадчыну нашай краіны шмат у чым удаецца дзякуючы Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь штогод папаўняецца і ўключае больш за 5 тыс. гісторыка-культурных каштоўнасцей. Сярод іх палацава-паркавы ансамбль у г. Гомель, Барысаглебская (Каложская) царква

ў г. Гродна, Аўгустоўскі канал у Гродзенскім раёне, царква абароннага тыпу ў в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна, комплекс былога кляштара езуітаў у г. Нясвіж, Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква ў г. Полацк, комплекс фартыфікацыйных збудаванняў Брэсцкай крэпасці, Камянецкая вежа ў г. Камянец і інш.

Захаванне і папулярызацыя культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа, яго самабытнасці, далучэнне насельніцтва да нацыянальных каштоўнасцей з'яўляюцца важнымі задачамі паводле Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 ад 9 красавіка 2025 г. «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы».

3. Спартыўныя дасягненні. Рэспубліка Беларусь упэўнена заявіла пра сябе на сусветнай спартыўнай арэне і па праве ганарыцца званнем спартыўнай краіны. Падрыхтоўка будучых прафесійных спартсменаў у Беларусі ажыццяўляецца ў розных навучальных установах: ад дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, спецыялізаваных школ і вучылішчаў алімпійскага рэзерву да Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. У краіне створаныя ўмовы для заняткаў спортам і фізкультурай, прадстаўленыя ў больш чым 23 тыс. фізкультурна-спартыўных аб'ектаў.

За гады суверэнітэту ў Беларусі з'явілася шмат новых спартыўных збудаванняў. Сярод найбольш значных — комплексы «Чыжоўка-Арэна», «Мінск-Арэна», Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы, цэнтр фрыстайла і інш.

Правядзенне чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 г. у Беларусі пацвердзіла высокі ўзровень развіцця гэтага віду спорту ў краіне і наяўнасць сучаснай базы для яго развіцця. У 2019 г. у Беларусі адбыліся II Еўрапейскія гульні. Беларускія спартсмены на іх здабылі 69 медалёў (24 залатыя, 16 срэбраных і 29 бронзавых).

У чэрвені 2024 г. беларускія спартсмены ўпершыню выступілі на міжнародных спаборніцтвах «Спартыўныя гульні краін БРІКС». Па выніках турніру Рэспубліка Беларусь заняла другое месца



Брэсцкая крэпасць. Пяты форт

Даведайцеся гісторыю гэтага гістарычнага збудавання.



Басейн, адкрыты ў 2024 г. у Мінску, цалкам адпавядае стандартам Міжнароднай федэрацыі плавання

Дасягненні беларускіх спартсменаў

ў агульнакамандным заліку, здабыўшы 247 медалёў (55 залатых, 85 срэбраных і 107 бронзавых).

Пачынаючы з 1994 г. беларускія спартсмены прадстаўляюць нашу краіну на Алімпійскіх гульнях асобнай камандай. За гэты час Беларусь дасягнула значных поспехаў у спорце, што дазволіла ёй заняць годнае месца сярод вядучых спартыўных краін свету.

Асабліва памятныя для беларусаў першае алімпійскае золата, якое здабыла для суверэннай краіны Кацярына Карстэн (веславанне), золата Аляксея Грышына — першага ў гісторыі беларускага спорту чэмпіёна зімовых Алімпійскіх гульняў (фрыстайл), сенсацыйная перамога на 100-метроўцы бягунні з Брэста Юліі Несцярэнка, перамога Сяргея Мартынава, які ўстанавіў на Алімпіядзе новы сусветны рэкорд па стральбе з вінтоўкі. У 2024 г. Іван Літвіновіч зрабіўся першым двухразовым алімпійскім чэмпіёнам у гісторыі мужчынскіх скачкоў на батуце. Яўген Залаты ўпершыню за ўсю суверэнную гісторыю Беларусі здабыў алімпійскі медаль у мужчынскім акадэмічным веславанні.

У 2014 г. Зімовыя Алімпійскія гульні ў Сочы сталі самымі паспяховымі ў гісторыі беларускага спорту. Нашы спартсмены здабылі 5 залатых медалёў. Трохразовай алімпійскай чэмпіёнцы Дар'і Домрачавай нададзена званне Героя Беларусі.

Усё больш людзей з абмежаванымі магчымасцямі далучаюцца да спорту. У Беларусі функцыянуюць спартыўныя ўстановы фізкультурна-аздараўленчага прызначэння для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама створаныя ўмовы для заняткаў спортам у спартыўных установах агульнага карыстання.

Гонар і павагу выклікаюць высокія вынікі беларускіх паралімпійцаў. На XV летніх Паралімпійскіх гульнях-2016 у Рыа-дэ-Жанейра беларуская зборная здабыла 10 медалёў: 8 залатых (Ігар Бокій — 6, Андрэй Праневіч — 1, Уладзімір Ізотаў — 1), 2 бронзавыя (Аляксандр Трыпуць, Ігар Бокій).



Ю. Несцярэнка



Д. Домрачава



І. Бокій

Культурнае развіццё суверэннай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца працягам духоўнага развіцця беларускага народа. Захоўваючы гісторыка-культурную спадчыну мінулых стагоддзяў, наш народ развівае сучасную сістэму адукацыі, дасягае вышынь у навуковых даследаваннях і рэалізацыі творчага патэнцыялу кожнага грамадзяніна краіны.

калі ў свеце…

1992 г. — пачатак правядзення фестывалю папулярнай музыкі «Белыя ночы» ў Санкт-Пецярбургу (Расійская Федэрацыя)

на тэрыторыі Беларусі…

1992 г. — пачатак правядзення музычнага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску»

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Прывядзіце не менш чым 5 доказаў высокага ўзроўню навукова-тэхнічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.
2. Назавіце галоўныя задачы дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Прывядзіце прыклады іх рэалізацыі.
3. Складзіце калаж «Гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь», уключыўшы ў яго славутасці ўсіх абласцей краіны.
4. Раскажыце пра дасягненні беларускіх спартсменаў у адным з відаў спорту (на ваш выбар).

Практыкум па раздзеле «Рэспубліка Беларусь і свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.»

Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

1. Адной з найважнейшых геапалітычных падзей XX ст. з'яўляецца распад СССР. Гэта прывяло да карэнных змен у Еўропе і свеце: разбурэння сацыялістычнага блока, узнікнення новых незалежных дзяржаў. Праблема прычын распаду СССР дагэтуль уяўляе велізарную цікавасць для гісторыкаў і палітолагаў. Галоўнае пытанне заключаецца ў тым, ці была гэтая падзея гістарычна абумоўлена, ці справакавана палітычнымі сіламі.

«Белавежская пушча стала выпадковым месцам распаду СССР і прадэманстравала няздольнасць таго кіраўніцтва Саюза кіраваць краінай». *(Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка)*

Гісторык С. В. Чэшка ў сваёй рабоце «Распад Савецкага Саюза: этналагічны аналіз» адзначае, што «аб'ектыўныя фактары не адыгрывалі ключавой ролі ў працэсе разбурэння Савецкага Саюза, бо напярэдадні перабудовы СССР яшчэ не знаходзіўся „ў перадсмяротным стане“ і цалкам мог быць рэфармаваны як у палітычным, так і ў сацыяльна-эканамічным плане. Менавіта нацыяналізм, які з'яўляўся „мінай запаволенага дзеяння“ і выбухнуў у апошні перыяд жыцця СССР, выступіў галоўнай прычынай распаду савецкай дзяржавы».

А. Пра якія прычыны распаду СССР ідзе гаворка ў прыведзеных цытатах?

Б. Растлумачце прычынна-выніковыя сувязі паміж згаданымі з'явамі і распадам СССР.

В. Якія яшчэ прычыны распаду СССР вы можаце назваць?

Г. Зрабіце вывад наконт таго, быў распад СССР выпадковасцю ці заканамернасцю.

Адрозненне факта ад думкі

2. «Сутнасць мадэлі Саюзнай дзяржавы, якая рэалізуецца, заключаецца ў паглыбленай інтэграцыі, імкненні да стварэння адзінай эканамічнай прасторы з захаваннем палітычнага суверэнітэту кожнай краіны.

<...> Беларусь і Расія паспяхова супрацьстаяць санкцыйнаму ціску. Калі шчыра, санкцыі нават пайшлі нам на карысць. Літаральна за тры гады мы пабудавалі контуры прамысловага і тэхналагічнага суверэнітэту на дзесяцігоддзі наперад.

<...> Мы зрабілі стаўку на работу з рэгіёнамі, і дзякуючы гэтаму мы захавалі наша адзінства». *(Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, 14 сакавіка 2025 г.)*

Саюзныя праграмы — аснова для выбудоўвання адносін з Расіяй. Ад моманту стварэння Саюзнай дзяржавы рэалізаваныя 82 праграмы. У іх ліку — праграмы ў сферы абароны і бяспекі, аховы здароўя, мікраэлектронікі, транспарту, космасу. *(Д. Ф. Мезенцаў, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы, 30 сакавіка 2023 г.)*

А. У чым заключаецца асаблівасць інтэграцыі Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы?

Б. Якія гістарычныя перадумовы інтэграцыі Беларусі і Расіі?

В. Выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка і дадатковыя крыніцы інфармацыі, зрабіце вывад наконт ролі Саюзнай дзяржавы ва ўмовах глабальных выклікаў сучаснасці. Пацвердзіце сваю думку фактамі.

Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

3. Частка найбольш выбітных для айчыннай і сусветнай культуры аб'ектаў уключана ў спісы Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

А. Суаднясіце ілюстрацыі і назвы аб'ектаў, уключаных у спісы Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.



1



2



3



4



5



6



7



8



9



10

1) Нацыянальны парк «Белавежская пушча»;
2) замкавы комплекс «Мір»;
3) архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы;
4) Дуга Струвэ;
5) святочны калядны абрад «Калядныя цары» ў в. Семежава (Капыльскі раён, Мінская вобласць);

6) урачыстасць у гонар шанавання іконы Маці Божай Будслаўскай (Будслаўскі фэст) у г. Будслаў (Мядзельскі раён, Мінская вобласць);
7) вясновы абрад «Юр'еўскі карагод» у в. Пагост (Жыткавіцкі раён, Гомельская вобласць);
8) культура ляснога бортніцтва;
9) беларускае саломапляценне;
10) выцінанка (традыцыйнае мастацтва выразання з паперы).

Б. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі выявіце, колькі аб'ектаў знаходзіцца ў спісе Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА на цяперашні момант. Якія яшчэ культурныя дасягненні Беларусі ўключаны ў гэты спіс?

В. Падрыхтуйце прэзентацыю «Культурныя традыцыі суверэннай Беларусі».

Устанаўленне прычынна-выніковых сувязей

4. Працэс глабалізацыі імкліва развіваецца, ахоплівае ўсе сферы грамадскага жыцця.

А. Вызначце 3 ключавыя змены, якія адбыліся ў розных сферах жыцця грамадства ў выніку глабалізацыі.

Палітычная сфера	Эканамічная сфера	Сацыяльная сфера	Духоўная сфера

Б. Растлумачце прычынна-выніковыя сувязі паміж вылучанымі зменамі.

В. Ці характэрныя вылучаныя вамі змены для беларускага грамадства? Канкрэтызуйце свой адказ фактамі.

Г. Дайце ацэнку вылучаным зменам. Аргументуйце свой пункт погляду.

Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

5. З красавіка 1995 г. была зацверджаная найвышэйшая дзяржаўная ўзнагарода Беларусі — званне «Герой Беларусі». Яно даецца за выключныя заслугі перад дзяржавай і грамадствам, звяза-

ныя з подзвігам, здзейсненым у імя свабоды, незалежнасці і росквіту Рэспублікі Беларусь.

А. Выкарыстоўваючы матэрыял вучэбнага дапаможніка і дадатковыя крыніцы інфармацыі, назавіце ўсіх, хто ўшанаваны званнем «Герой Беларусі».

Б. У вырашэнне якіх задач развіцця суверэннай Беларусі зрабілі ўнёсак гэтыя людзі?

В. З якімі гістарычнымі падзеямі, з'явамі, працэсамі звязаная дзейнасць гэтых людзей?

Абагульненне па раздзеле «Рэспубліка Беларусь і свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.»

Працуем з паняццямі

1. Падзяліце прапанаваныя паняцці на групы. Крытэрыі падзелу вызначце самастойна.

Белавежскія пагадненні, БРІКС, глабалізацыя, грамадзянская супольнасць, дзяржаўны суверэнітэт, інстытут прэзідэнцтва, інфармацыйная рэвалюцыя, «каляровыя рэвалюцыі», канстытуцыя, лічбавізацыя, неакаланіялізм, парламенцкая рэспубліка, постіндустрыяльная дзяржава, прававая дзяржава, прэзідэнцкая рэспубліка, рэферэндум, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, сацыяльна арыентаваная эканоміка, сацыяльная дзяржава, Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, унітарная дзяржава, Усебеларускі народны сход, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, шматпалярны свет.

2. Вызначце паняцці, якія адносяцца да гісторыі Беларусі. Канкрэтызуйце іх прыкладамі раней вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з'яў, працэсаў).

Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

3. З абраннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 1994 г. пачаўся этап развіцця сапраўднага суверэнітэту беларускай дзяржавы, заснаванага на строгай вертыкалі ўлады з дакладна размежаванымі паўнамоцтвамі і шырокім, прамым волевыяўленнем народа.

Прачытайце прапанаваныя тэксты і выканайце заданні.

А. Сёння на сусветным харчовым рынку складваецца няпростая сітуацыя, справакаваная экспартнымі абмежаваннямі і геапалітычнай нестабільнасцю. Гэта сур'ёзна ўскладняе вырашэнне праблем харчовай бяспекі як у глабальным маштабе, так і ў асобных краінах. Час у чарговы раз пацвярджае слушнасць абранай Рэспублікай Беларусь стратэгіі забеспячэння харчовай бяспекі на аснове ўстойлівай уласнай аграпрамысловай вытворчасці

і разумнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі, накіраванай на дасягненне высокай якасці харчавання насельніцтва.

«У краіне цалкам вырашаны праблемы харчовай бяспекі. Узровень самазабяспечанасці Беларусі малаком і малочнымі прадуктамі складае звыш 260 %. Гэта магчымасць накарміць дзве з паловай Беларусі. Амаль паўтары Беларусі можам забяспечыць мясам і мясапрадуктамі. Мы ўваходзім у пяцёрку лідараў сярод краін СНД паводле сяроднедушавой вытворчасці збожжа і агародніны. Больш за тое, мы гатовыя рабіць свой важкі ўнёсак у забеспячэнне харчовай бяспекі ва ўсім свеце». *(А. Р. Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, 24 красавіка 2024 г.)*

Б. БелАЭС вывела на новы ўзровень эканоміку Беларусі і ўмацавала незалежнасць краіны.

«Мы значна прасунуліся ў пытаннях забеспячэння энергетычнай незалежнасці. Беларуская АЭС — гэта наш моцны брэнд і наш суверэнітэт. І гэта якасць нашага жыцця, якая забяспечваецца развіццём электражылля, электратранспарту, скарачэннем выкідаў парніковых газаў на 7 млн тон. Лічба ўражвае». *(А. Р. Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, 24 красавіка 2024 г.)*

В. «Я, як Кіраўнік дзяржавы, ужо неаднаразова казаў: школа — гэта храм. У гэтым, калі хочаце, увесь сакральны сэнс. Тут павінен быць жалезны парадак і дысцыпліна як у арганізацыі адукацыйнага працэсу, так і ў матэрыяльным плане... Школа закладвае падмурак не проста будучыні. Чалавека!..». *(А. Р. Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, 2023 г.)*

Г. У Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, зацверджанай VII Усебеларускім народным сходам, упершыню з'явіўся тэрмін «электаральны суверэнітэт». Гэта неад'емнае і выключнае права нашай дзяржавы самастойна і незалежна арганізоўваць і праводзіць выбары, рэферэндумы ў мэтах забеспячэння рэалізацыі паўнаўладдзя народа і свабоды яго выбару пры вяршэнстве Канстытуцыі і нацыянальнага заканадаўства, недапушчэння ўмяшання ў выбарчы працэс.

«У гэтай сувязі мы выбудавалі для сябе чатыры асноўныя кірункі, якія дазваляюць нам забяспечваць электаральны суверэнітэт. Першы кірунак — стварыць эфектыўную заслону знешняму ўмяшан-

ню ў электаральныя працэсы: інфармацыйную, фінансавую, юрыдычную, арганізацыйна-тэхнічную. Другі кірунак — не дапусціць выкарыстання службовых паўнамоцтваў абранай асобы насуперак нацыянальным, дзяржаўным інтарэсам. Трэці кірунак — забеспячэнне бяспекі ўдзельнікаў электаральнага працэсу. Чацвёрты кірунак — работа з міжнароднымі арганізацыямі, на міжнароднай арэне ў плане выпрацоўкі стандартаў ацэнкі выбараў». *(І. В. Карпенка, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь, 6 лістапада 2024 г.)*

Д. «Міністэрства адукацыі Беларусі ставіць перад сабой задачу, каб выпускнік кожнай установы адукацыі быў патрыётам нашай краіны. <...> Сёння проста выпусціць адукаванага чалавека недастаткова. Гэта павінен быць чалавек, які любіць сваю Радзіму і гатовы сваёй працай рабіць нашу краіну лепшай і прыгажэйшай. Кожны з нашых навучэнцаў павінен разумець, што незалежнасць краіны каштуе вельмі дорага. Кошт вылічваецца не толькі фінансавымі рэсурсамі, але і шэрагам іншых складнікаў. Мы павінны разумець, што, калі будзе неабходнасць, кожны з нас мае быць гатовы абараняць сваю Радзіму, у тым ліку і са зброяй у руках». *(А. І. Іванец, Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь, 24 сакавіка 2022 г.)*

Е. У Беларусі зацверджана Канцэпцыя забеспячэння суверэнітэту Рэспублікі Беларусь у сферы лічбавага развіцця да 2030 г. Канцэпцыя вызначае лічбавы суверэнітэт як неад'емнае права дзяржавы кіраваць дзяржаўнай інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктурай і інфармацыйнымі рэсурсамі, ажыццяўляць над імі кантроль; абараняць свае інтарэсы, праводзіць незалежную знешнюю і ўнутраную дзяржаўную палітыку ў сферы лічбавага развіцця.

Для дасягнення лічбавага суверэнітэту плануецца развіваць нацыянальную IT-індустрыю ў частцы распрацоўкі айчыннага праграмнага забеспячэння; прамысловы патэнцыял для распрацоўкі і вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі (мікра- і радыёэлектроніка, апаратныя і праграмна-апаратныя рашэнні); фарміраваць інфармацыйна-камунікацыйную інфраструктуру, якая забяспечыць неабходныя ўмовы для стварэння і выкарыстання лічбавых тэхналогій пры неспрыяльных знешніх уздзеяннях. *(Паводле матэрыялаў https://etalonline.by, 24 студзеня 2025 г.)*

На аснове прапанаваных тэкстаў складзіце схему «Складнікі дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і фактары, якія іх забяспечваюць».

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія новыя заканадаўчыя нормы дапамагаюць абараніць электаральны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь.

Ці згодныя вы з меркаваннем, што патрыятызм беларусаў — найважнейшы фактар забеспячэння дзяржаўнага суверэнітэту? Сваю думку растлумачце.

Аналізуем, тлумачым, разважаем

4. Устанавіце ўзаемасувязь паміж гістарычнымі фактамі:

А) дэкаланізацыя — узмацненне краін «глабальнага Поўдня»;

Б) праявы нацыянальнага сепаратызму — распад СССР;

В) рэспубліканскі рэферэндум 1996 г. — ператварэнне Рэспублікі Беларусь у прэзідэнцкую рэспубліку;

Г) захаванне традыцыйных беларускіх каштоўнасцей — умацаванне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

5. Дакажыце або абвергніце наступныя тэзісы:

А) «каляровыя рэвалюцыі» парушаюць нормы міжнароднага права і суверэнітэту дзяржаў;

Б) ад пачатку XXI ст. у свеце пачаўся пераход ад аднапалярнай мадэлі да шматпалярнай;

В) беларуская мадэль дэмакратыі пабудаваная на прамым удзеле беларускага народа ў прыняцці найважнейшых дзяржаўных рашэнняў;

Г) палітыка беларускай дзяржавы накіраваная на падтрымку і ўмацаванне міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды ў беларускім грамадстве;

Д) дзяржаўная гістарычная палітыка — важны фактар забеспячэння нацыянальнай бяспекі;

Е) у сваёй знешняй палітыцы Рэспубліка Беларусь рэалізуе прынцып шматвектарнасці.

Сістэматызуем веды

6. Выкарыстоўваючы стужку часу, прадстаўленую ў пачатку раздзела IV, выканайце наступныя заданні.

А. Паразважайце, якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу. Чаму?

Б. Прапануйце форму для іх абазначэння (карціна, картасхема, цытата, фотаздымак і інш.).

В. Прадстаўце развіццё Рэспублікі Беларусь у канцы XX — першай чвэрці XXI ст. у выглядзе лагічнай схемы (ментальнай карты). Адлюструйце ў ёй эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае і духоўнае развіццё краіны.

7. Работа ў міні-групах. Складзіце топ-10 дасягненняў Рэспублікі Беларусь у канцы XX — першай чвэрці XXI ст. Што, на вашу думку, можна аднесці да ўжо сталых традыцый суверэннай Беларусі?

Наш край у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.

1. Работа ў міні-групах. Выкарыстоўваючы карты і картасхемы атласа, матэрыял вучэбнага дапаможніка і афіцыйныя сайты гарадскіх (раённых, абласных) выканаўчых камітэтаў, вызначце:

А. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіць ваш населены пункт пасля 1991 г.? Ці адбываліся ў гэты перыяд змены ў яго статусе?

Б. Якія прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы працуюць у вашым рэгіёне? Які ўнёсак робіць ваш рэгіён у эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь?

В. Якія перспектывы прамысловага, сельскагаспадарчага і культурнага развіцця вашага рэгіёна?

Прадстаўце вынікі сваёй працы класу, параўнайце з вынікамі іншых міні-груп.

Падрыхтуйце агульную прэзентацыю «Мая малая радзіма ў канцы XX — першай чвэрці XXI ст.». Параўнайце яе з прэзентацыямі «Мая малая радзіма ў XIX — пачатку XX ст.», «Мая малая радзіма ў 1917–1945 гг.», «Мая малая радзіма ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг.». Зрабіце вывад наконт дынамікі развіцця вашага рэгіёна.

2. Экскурсія па родным краі. З дапамогай афіцыйнага сайта Рэспублікі Беларусь Belarus.by (https://www.belarus.by/ru) і планаў экскурсій, распрацаваных вамі пасля вывучэння раздзелаў I–III, складзіце план турыстычнага маршруту па родным краі «Мая малая радзіма ў гістарычнай мінуўшчыне і сучаснасці».

3. Славутыя землякі. З дапамогай матэрыялаў, змешчаных на афіцыйных сайтах гарадскіх (раённых, абласных) выканаўчых камітэтаў, дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, хто з'яўляецца ганаровымі грамадзянамі вашага горада, раёна або вобласці; узнагароджаны вышэйшымі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Падрыхтуйце паведамленне пра аднаго са славутых землякоў.

4. Мая сям'я. Даведайцеся пра гісторыю сваёй сям'і пасля 1991 г.: як прайшло дзяцінства вашых бацькоў? Якую ролю адыгралі ў іх жыцці гістарычныя падзеі канца XX — першай чвэрці XXI ст.? Які ўнёсак яны робяць у развіццё Рэспублікі Беларусь? Падрыхтуйце прэзентацыю «Я і мая сям'я ў гісторыі суверэннай Беларусі».

ЗАКЛЮЧЭННЕ. СВЕТ У ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст.

У першай чвэрці XXI ст. чалавецтва працягвае сутыкацца з мноствам глабальных выклікаў, большасць з якіх уяўляюць прамую або патэнцыйную пагрозу яго існаванню. Адной з самых сур'ёзных застаецца небяспека глабальнага ваеннага канфлікту з выкарыстаннем ядзернай зброі. Пасля заканчэння «халоднай вайны» пашырэнне гэтага віду зброі выйшла далёка за межы традыцыйнага «ядзернага клуба», што павялічвае верагоднасць яго выкарыстання ў лакальных канфліктах.

Не меншую небяспеку ўяўляе хімічная і біялагічная (бактэрыялагічная) зброя. Нягледзячы на міжнародныя забароны, параўнаўчая прастата і нізкі сабекошт яе вытворчасці не выключаюць з'яўлення такой зброі ў арсеналах нестабільных дзяржаў і экстрэмісцкіх груповак. Захаванне міру, умацаванне сістэмы міжнароднай бяспекі, спыненне гонкі ўзбраенняў і зніжэнне ўзроўню глабальнай ваеннай напружанасці застаюцца найважнейшымі задачамі для ўсяго чалавецтва.

Выступаючы на Сусветным саміце па барацьбе са змяненнем клімату ў Дубаі ў 2023 г., Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падкрэсліў, што імкненне да ваеннага першынства і ўзброеныя канфлікты, якія працягваюцца, з'яўляюцца ключавымі крыніцамі сучасных глабальных праблем. Пазіцыя нашай краіны адлюстроўвае міралюбную знешнепалітычную лінію Беларусі, арыентаваную на прадухіленне канфліктаў, развіццё дыялогу і ўмацаванне міжнародных інстытутаў.

Адным з найбольш вострых выклікаў застаецца міжнародны тэрарызм. Ва ўмовах нестабільнасці і ўзмацнення ідэалагічнага радыкалізму расце верагоднасць выкарыстання тэрарыстамі зброі масавага паражэння. Сучасныя тэрарыстычныя арганізацыі актыўна выкарыстоўваюць гібрыдныя формы барацьбы: інфармацыйныя і кібердыверсіі, распаўсюджванне дэзінфармацыі. Іх дзеянні скіраваныя на дэстабілізацыю дзяржаў, разбурэнне грамадскіх сувязей, запалохванне насельніцтва.

Да ліку глабальных праблем належыць і пагаршэнне экалагічнай абстаноўкі. Забруджванне атмасферы і вод Сусветнага акіяна,

дэградацыя глеб, знікненне лясоў і рост аб'ёмаў цвёрдых адыходаў патрабуюць тэрміновых і скаардынаваных дзеянняў на міжнародным узроўні. Усё большую значнасць набывае пераход да «зялёнай энергетыкі», якая ўключае развіццё аднаўляльных крыніц энергіі (атамнай, вадароднай, сонечнай, ветравой, геатэрмальнай і інш.), бо яны не ўтвараюць парніковых газаў падчас эксплуатацыі. Аднак выкарыстанне такіх тэхналогій (атамнай і вадароднай) патрабуе выканання высокіх стандартаў бяспекі і міжнароднага кантролю. Беларусь, валодаючы ўласнай атамнай электрастанцыяй, таксама ўдзельнічае ў агульнасусветным энергетычным пераходзе, падтрымліваючы прынцыпы ўстойлівага развіцця.

Сур'ёзнай пагрозай застаецца змяненне клімату. Рост сярэдняй тэмпературы Зямлі, пачашчэнне прыродных катастроф, раставанне ледавікоў, павышэнне ўзроўню вод Сусветнага акіяна і апустыньванне цэлых рэгіёнаў аказваюць прамое ўздзеянне на ўсе сферы жыцця. Беларусь таксама сутыкаецца з наступствамі гэтых змен — ад засух і нестабільных сезонаў да пагрозы страты біяразнастайнасці. Міжнародныя намаганні па абмежаванні глабальнага пацяплення рэалізуюцца ў межах Рамачнай канвенцыі ААН, Кіёцкага пратакола, Парыжскага пагаднення, дзе Беларусь выступае бокам і ўдзельнікам перамоў.

Вострай застаецца праблема голаду. Нават напачатку 2020-х гг. каля 10 % насельніцтва Зямлі пакутуюць ад хранічнай нястачы харчавання. Сітуацыя ўскладняецца ўзброенымі канфліктамі, кліматычнымі зменамі, ростам цэн і хуткім ростам колькасці насельніцтва, асабліва ў найбяднейшых краінах Афрыкі і Азіі. Беларусь, валодаючы аграрным патэнцыялам, спрыяе ўмацаванню глабальнай харчовай бяспекі, развівае ўстойлівую сельскую гаспадарку і ўдзельнічае ў міжнародных гуманітарных ініцыятывах.

Пандэмія COVID-19 стала сур'ёзным выпрабаваннем для ўсяго свету, нагадаўшы, наколькі чалавецтва ўразлівае перад глабальнымі эпідэміямі. Яна агаліла слабыя месцы сістэм аховы здароўя, закранула ўсе сферы жыцця, ад эканомікі да адукацыі, і паказала неабходнасць міжнароднай салідарнасці і абмену досведам. Беларусь, нягледзячы на абмежаванні, захавала сацыяльную стабільнасць і забяспечыла даступнасць медыцынскай дапамогі для насельніцтва.

Выклікі сучаснасці фарміруюцца і пад уплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу. На парадак дня выходзяць пытанні этыкі і рэ-

гулявання ў сувязі з развіццём штучнага інтэлекту, геннай інжынерыі, лічбавізацыі. Гэтыя працэсы патрабуюць своечасовага прававога і грамадскага асэнсавання, каб пазбегнуць тэхналагічнай няроўнасці і забяспечыць захаванне базавых гуманістычных каштоўнасцей.

Вырашэнне глабальных праблем магчымае толькі на аснове міжнароднага партнёрства і салідарнасці. У гэтым кантэксце асаблівую ролю адыгрывае Канцэпцыя ўстойлівага развіцця, якая рэалізуецца пад эгідай ААН. Яна скіраваная на ліквідацыю беднасці, забеспячэнне эканамічнага росту, роўны доступ да адукацыі і медыцынскай дапамогі, барацьбу супраць змянення клімату, абарону навакольнага асяроддзя. Беларусь як адказная дзяржава і ўдзельнік міжнародных ініцыятыў зацікаўлена ў пабудове справядлівага, бяспечнага і ўстойлівага свету для цяперашняга і будучых пакаленняў.

ВЫНІКОВАЕ АБАГУЛЬНЕННЕ

Працуем з паняццямі

1. Размяркуйце прапанаваныя гістарычныя факты па графах табліцы. Растлумачце свой выбар.

«Амерыканскі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, аперацыя «Баграціён», Белавежскія пагадненні, Брэсцкая мірная дамова, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, генацыд, глабалізацыя, дзяржаўны суверэнітэт, індустрыялізацыя, інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, «каляровыя рэвалюцыі», метад сацыялістычнага рэалізму, Мюнхенская дамова, нацыянальная самасвядомасць, неакаланіялізм, НТР, перабудова, рэферэндум, сталыпінская аграрная рэформа, сусветны эканамічны крызіс, утварэнне СНД, шматпалярны свет.

Гістарычная падзея	Гістарычная з'ява	Гістарычны працэс

2. Дапоўніце табліцу гістарычнымі фактамі з гісторыі Беларусі XIX — першай чвэрці XXI ст.

Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

3. З Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2024 г.)

...*палітычная бяспека* — стан абароненасці палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь ад унутраных і знешніх пагроз, які забяспечвае рэалізацыю незалежнай дзяржаўнай палітыкі, гарманічнае развіццё грамадства і дзяржавы, захаванне традыцыйных асноватворных каштоўнасцей беларускага народа, канстытуцыйных правоў і свабод асобы;

эканамічная бяспека — стан абароненасці галін і сфер эканомікі ад уздзеяння пагроз, якія перашкаджаюць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю Рэспублікі Беларусь;

інфармацыйная бяспека — стан абароненасці інфармацыйнай прасторы, інфармацыйнай інфраструктуры і інфармацыйных рэсурсаў ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы;

ваенная бяспека — стан абароненасці нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь ад ваенных пагроз, існуючых і тых, што зараджаюцца;

электаральны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь — неад'емнае і выключнае права дзяржавы самастойна і незалежна арганізоўваць і праводзіць выбары, рэферэндумы ў мэтах забеспячэння рэалізацыі паўнаўладдзя народа і свабоды яго выбару пры вяршэнстве Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і нацыянальнага заканадаўства, недапушчэння ўмяшання ў выбарчы працэс.

Выкарыстоўваючы засвоеныя веды і дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце табліцу, адлюстраваўшы ў ёй палітычныя, эканамічныя і ваенныя выклікі (праблемы), з якімі сутыкнулася Рэспубліка Беларусь у першай чвэрці XXI ст., і адказы (рашэнні) беларускай дзяржавы на іх.

Сістэматызуем веды

4. Выкарыстоўваючы стужкі часу, змешчаныя ў пачатку кожнага раздзела, і інфармацыю, якая змяшчаецца ў параграфах вучэбнага дапаможніка, выканайце наступныя заданні.

А. Назавіце асноўныя тэндэнцыі сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага і духоўнага развіцця Беларусі ў згаданыя перыяды. Даныя запішыце ў табліцу.

Перыяд	Асноўныя тэндэнцыі
XIX — пачатак XX ст.	
1917–1945 гг.	
Другая палова 1940-х — пачатак 1990-х гг.	
Канец XX — першая чвэрць XXI ст.	

Б. Ахарактарызуйце асноўныя змены ў адной са сфер жыцця грамадства — сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай, духоўнай, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў XIX — першай чвэрці XXI ст.

Аналізуем, тлумачым, разважаем

5. Паразважайце над наступнымі праблемнымі пытаннямі і заданнямі.

А. Расійскі гісторык В. В. Ключэўскі лічыў, што гісторыя не вучыць людзей наўпрост, а хутчэй карае за няведанне ўрокаў мінулага. Што такое ўрокі гісторыі (мінулага)? Якія ўрокі мусіць здабыць сучаснае грамадства з гісторыі XIX — першай чвэрці XXI ст.?

Б. «Народ, які не ведае сваёй гісторыі, не мае будучыні» (М. В. Ламаносаў). Чаму важна захоўваць гістарычную памяць народа? Якія падзеі XX — першай чвэрці XXI ст. павінен памятаць кожны беларус?

В. Як вы разумееце сцвярджэнне: «Каштоўнасці сучаснага беларускага грамадства гістарычна абумоўлены»? Ці згодны вы з ім? Канкрэтызуйце сваю думку прыкладамі.

6. Напішыце эсэ на тэму «Нам ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што берагчы» ў дачыненні да вывучанага ў 11 класе перыяду гісторыі.

ХРАНАЛАГІЧНАЯ ТАБЛІЦА

па гісторыі Беларусі (1939–2025 гг.)

Дата	Падзея
28–30 кастрычніка 1939 г.	Пасяджэнне Народнага сходу Заходняй Беларусі ў Беластоку
22 чэрвеня 1941 г.	Пачатак Вялікай Айчыннай вайны
25–28 чэрвеня 1941 г.	Абарона г. Мінска
3–26 ліпеня 1941 г.	Абарона г. Магілёва
6–10 ліпеня 1941 г.	«Лепельскі контрудар»
14 ліпеня 1941 г.	Першае прымяненне батарэі рэактыўнай артылерыі («Кацюша») для ўдару па згуртаванні варожай сілы на чыгуначным вузле ў Оршы
30 мая 1942 г.	Стварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР)
Верасень 1942 г.	Стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР)
22 сакавіка 1943 г.	Знішчэнне нацыстамі і калабарацыяністамі в. Хатынь
23 верасня 1943 г.	Чырвоная армія вызваліла ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў першы раённы цэнтр БССР — г. Камарын
26 лістапада 1943 г.	Чырвоная армія вызваліла ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Гомель
23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.	Аперацыя «Баграціён». Вызваленне Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў
3 ліпеня 1944 г.	Чырвоная армія вызваліла г. Мінск
26 чэрвеня 1945 г.	Падпісанне Статута ААН у Сан-Францыска
1951 г.	Зацвярджэнне новага Дзяржаўнага сцяга БССР
1955 г.	Зацвярджэнне Дзяржаўнага гімна БССР
1974 г.	Наданне г. Мінску звання «Горад-герой»
14 красавіка 1978 г.	Прыняцце Канстытуцыі БССР
27 ліпеня 1990 г.	Прыняцце Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»

Дата	Падзея
17 сакавіка 1991 г.	Правядзенне Усесаюзнага рэферэндуму па пытанні захавання СССР
25 жніўня 1991 г.	Наданне Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» статусу канстытуцыйнага закона
19 верасня 1991 г.	Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне аб змяненні назвы дзяржавы на «Рэспубліка Беларусь»
8 снежня 1991 г.	Падпісанне «Пагаднення аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў» («Белавежскае пагадненне»)
1992 г.	Рэспубліка Беларусь зрабілася членам Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ)
1992 г.	Пачатак правядзення музычнага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску»
15 сакавіка 1994 г.	Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь
10 ліпеня 1994 г.	Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абраны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка
14 мая 1995 г.	Рэспубліканскі рэферэндум
2 красавіка 1996 г.	Падпісанне Дамовы аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі
Кастрычнік 1996 г.	I Усебеларускі народны сход
24 лістапада 1996 г.	Рэспубліканскі рэферэндум
2 красавіка 1997 г.	Падпісанне Дамовы аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі
8 снежня 1999 г.	Падпісанне Дамовы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі
2001, 2006, 2010, 2015, 2020, 2025 гг.	Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
17 кастрычніка 2004 г.	Рэспубліканскі рэферэндум
2014 г.	Падпісанне Дамовы аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза
2021 г.	Увядзенне ў эксплуатацыю першага блока Беларускай атамнай электрастанцыі

Дата	Падзея
5 студзеня 2022 г.	Прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа»
27 лютага 2022 г.	Рэспубліканскі рэферэндум па пытанні ўнясення змен і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь
2024 г.	VII Усебеларускі народны сход
	Рэспубліка Беларусь зрабілася краінай — партнёрам БРІКС
	Рэспубліка Беларусь зрабілася паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС)
	Палёт у космас першага касманаўта суверэннай Беларусі М. В. Васілеўскай

ПАКАЗАЛЬНІК АБРЭВІЯТУР

ААН — Арганізацыя Аб'яднаных Нацый 82, 84

АВД — Арганізацыя Варшаўскай дамовы 84

АДКБ — Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы 205

АН БССР — Акадэмія навук Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі 155

БРІКС — аб'яднанне дзяржаў: Бразіліі, Расіі, Індыі, КНР, ПАР і інш. (англ. **BRICS** — скароч. ад Brazil, Russia, India, China, South Africa) 179

БШПР — Беларускі штаб партызанскага руху 56

ДКНС — Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы 132, 195

ЕАЭС — Еўразійскі эканамічны саюз 205

ЕС — Еўрапейскі саюз 197

КПСС — Камуністычная партыя Савецкага Саюза 114

ЛКСМБ — Ленінскі Камуністычны саюз моладзі Беларусі 32, 134

Наркамат — народны камісарыят 24, 61

Наркамздароўя — народны камісарыят аховы здароўя 24

НАТА — Арганізацыя Паўночнаатлантычнай дамовы (англ. **NATO** — скароч. ад North Atlantic Treaty Organization) 84

НКУС — народны камісарыят унутраных спраў 24

НТП — навукова-тэхнічны прагрэс 90

НТР — навукова-тэхнічная рэвалюцыя 91

Саўінфармбюро — Савецкае інфармацыйнае бюро 24

Саўнаркам СССР (СНК СССР) — Савет Народных Камісараў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік 29

СНК БССР — Савет Народных Камісараў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі 61

СЭУ — Савет эканамічнай узаемадапамогі 84

ТНК — транснацыянальная карпарацыя 96

УЛКСМ — Усесаюзны Ленінскі Камуністычны саюз моладзі (камсамол) 114, 124, 134

ЦК КП(б)Б — Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі 32, 61

ЦК КПСС — Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза 116

ЦК ЛКСМБ — Цэнтральны камітэт Ленінскага Камуністычнага саюза моладзі Беларусі 32

ЦК УКП(б) — Цэнтральны камітэт Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) 24

ЦК УЛКСМ — Цэнтральны камітэт Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага саюза моладзі 32

ЦШПР — Цэнтральны штаб партызанскага руху 31

ШАС — Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва 179

ПАКАЗАЛЬНІК ТЭРМІНАЎ

Агрэсія 6
Грамадзянская супольнасць 208
Дзяржаўны суверэнітэт 264
Інтэнсіўны шлях развіцця 144
Інфармацыйная рэвалюцыя 93
Калабарацыянізм 13
«Каляровыя рэвалюцыі» 180
Канстытуцыя 213
Навукова-тэхнічная рэвалюцыя 91
Навукова-тэхнічны прагрэс 90
Неакаланіялізм 190
Постіндустрыяльнае грамадства 94
Прэзідэнцкая рэспубліка 222
Рэферэндум 218
Сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка 233
Экстэнсіўны шлях развіцця 143

Вучэбнае выданне

Каханоўскі Аляксандр Генадзевіч
Кошалеў Уладзімір Сяргеевіч
Цемушаў Сцяпан Мікалаевіч і інш.

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

ў кантэксце сусветнай гісторыі

Вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

У дзвюх частках
Частка 2

Адказны за выпуск *Т. Ф. Рослік*
Рэдактар *Н. Б. Кучмель*
Дызайн вокладкі *Н. Ф. Овад*
Картасхемы *С. М. Цемушава*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *І. П. Грышынай*
Карэктар *А. М. Краўчанка*

Падпісана ў друк 05.12.2025. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 23,4+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 16,6+0,4+8,0 (электрон. дадат.).
Тыраж 7 860 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

(Назва ўстановы адукацыі)

Вучэбны год	Імя і прозвішча навучэнца	Клас	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 / 20				
20 / 20				
20 / 20				
20 / 20				
20 / 20				